Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»

Лагойскі раённы выканаўчы камітэт

# *Благаслаўлёнай зямлі неўміручыя скарбы*

## *Народная духоўная культура Лагойшчыны*

У 3 кнігах

**Кніга 2**

Пад агульнай рэдакцыяй: В. С. Новак (гал. рэд.),
А. А. Кастрыцы, С. А. Вяргеенка, В. К. Шынкарэнка

Гомель
ГДУ імя Ф. Скарыны
2013

УДК 39 (476.1 Лагойшчына)

**Аўтарскі калектыў:**
д-р філал. навук, праф. *В. С. Новак*;
д-р гіст. навук, д-р архітэктуры, член-кар. НАН Беларусі *А. І. Лакотка* ;
д-р філал. навук, дац. *В. К. Шынкарэнка*; д-р філал. навук, праф. *А. Ф. Рогалеў*;
д-р філал. навук, праф. *А. А. Станкевіч*; д-р філал. навук, праф. *А. М. Ненадавец*;
канд. філал. навук, дац. *С. А. Вяргеенка*; канд. філал. навук, дац. *А. А. Кастрыца*;
канд. філал. навук, дац. *А. М. Палуян*; канд. філал. навук, дац. *У. А. Бобрык*;
канд. філал. навук *А. Г. Алфёрава; Т. М. Дубяк* і інш.

**Бласлаўлёнай зямлі неўміручыя скарбы** : Народная духоўная культура Лагойшчыны : у 3 кн. Кн. 2 / пад агул. рэд. В. С. Новак (гал. рэд.), А. А. Кастрыцы, С. А. Вяргеенка, В. К. Шынкарэнка ; М-ва адукацыі РБ, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2013. – 214 с. : іл.
ISBN 978-985-439-813-6 (Кніга 2)
ISBN 978-985-439-824-2

У выданні, якое складаецца з трох кніг і падрыхтавана ў выніку выканання навуковага праекта «Сучасны стан духоўнай культуры Лагойшчыны: гістарычныя падзеі, знакамітыя асобы, абрады, звычаі і песні» (№ дзяржрэгістрацыі 20082066), прадстаўлена духоўная культура Лагойскага краю.

Змест другой кнігі складаюць архіўныя і экспедыцыйныя фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы з захаваннем асаблівасцей мясцовай гаворкі.

Адрасуецца фальклaрыстам, этнографам, краязнаўцам, гісторыкам, работнікам устаноў культуры і адукацыі, настаўнікам, студэнтам і ўсім тым, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю і дбае пра захаванне яго гісторыка-культурнай спадчыны.

Рэкамендавана да выдання навукова-тэхнічным саветам установы адукацыі
«Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»
23 сакавіка 2010 года, пратакол № 2

Пад агульнай рэдакцыяй: *В. С. Новак (гал. рэд.),*
*А. А. Кастрыцы, С. А. Вяргеенка, В. К. Шынкарэнка*

**Рэцэнзенты***:*
д-р філал. навук, праф. *У. І. Коваль;*
д-р філал. навук, праф. *А. У. Марозаў*

**ISBN 978-985-439-813-6** (Кніга 2)
**ISBN 978-985-439-824-2**

© УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны», 2013

*Валянціна НОВАК*

# МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАГА ФАЛЬКЛОРУ ЛАГОЙШЧЫНЫ

Фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, запісаныя на Лагойшчыне, пацвярджаюць факт добрай захаванасці ў народнай памяці традыцый духоўнай культуры, якую ў 19 ст. рупліва вывучалі знакамітыя нарадазнаўцы, фалькларысты, этнографы Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы. Сучасны фактычны матэрыял, які з'яўляецца аб'ектам даследавання, быў зафіксаваны ў наступных населеных пунктах Лагойскага раёна: Пушчанка, Расохі, Праходы, Завішына, Крайск, Акцябр, Сукневічы, Цыннае, Корань, Лагаза, Пасадзец, Стрый, г. п. Плешчаніцы, Жардзяжжа, Рэпішча, Малыя Нястанавічы, Слабада, Глыбачаны, Хадакі, Дзераўно і інш. Засяродзім увагу на зімовым калядна-навагоднім комплексе Лагойшчыны і прааналізуем яго структурныя кампаненты. Як і ў іншых рэгіёнах Беларусі, зімовы цыкл земляробчага календара Лагойшчыны ўключае такія структурныя часткі, як звычай абходу калядоўшчыкамі хат, ваджэнне казы, падрыхтоўка абрадавай стравы – куцці, варожбы, шлюбныя гульні («Ката пячы») і ігрышчы («Жаніцьба Цярэшкі»), выкананне велічальна-віншавальных песень. Спынімся на асобных кампанентах зімовай абраднасці. Адзначым, што ў вёсках Сукневічы і Церахі за перыядам, звязаным з надыходам Ражаства, замацавалася, як і ў рускай традыцыі, назва «сачэльнік»: «Ой, к сачэльніку, к 6 января, мы ўкрашалі хату. А затым рыхтавалі стол. Там пяклі многа чаго. Самае інтарэснае, што ў гэта свята мы падшучвалі над саседзямі. Закідвалі дзеравяшкамі ўхадныя дзверы, а другі раз з прыгрэбніку дровы выкідвалі і раскідвалі па ўсём двары» (запісана ў в. Церахі ад Шаршунь Ніны Канстанцінаўны, 1940 г. н.); «Вясёлае ўрэмя было. Не як цяпер. Гатавалі стол, смачнасці ўсякія, каўбасы, квас, пірагі. Дом украшалі. А чым весела было? Дык гулялі, пелі, падшучвалі над суседзямі. Забор разбяром ці лаўку, ці дровы з навесу параскідваем па двару» (запісана ў в. Сукневічы ад Зіневіч Настассі Яўгенаўны, 1931 г. н.).

Да святкавання Каляд сур'ёзна рыхтаваліся ва ўсіх вёсках Лагойскага раёна. І гэта невыпадкова, бо лічылася, што «калядныя абрады своеасаблива распачынаюць падрыхтоўчы этап да новага ўраджаю, пакуль што некалькі пасіўны, бо рознымі сродкамі яго наклікаюць, імкнуцца ўгадаць будучае» [1, с. 149]. Паводле ўспамінаў вяскоўцаў, падрыхтоўцы да святкавання Каляд яны надавалі вялікае значэнне: «Мы да Калядаў рыхтаваліся так: прыбіралі ў хаце, варылі куццю, засцілалі абрус, пад абрус лажылі сена. Куццю ставілі пад абраз, куцця лічылася галоўнай стравай на Каляды» (запісана ў в. Асінцы ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.).

Падрыхтоўка абрадавай стравы – куцці – важны кампанент у сістэме мясцовага зімовага цыкла земляробчага календара. Рыхтавалі яе звычайна з ячных круп: «Рабілі куццю з ячневых круп» (в. Пушчанка), «Варылі куццю – пярловую кашу» (в. Корань). Паводле ўспамінаў вяскоўцаў, менавіта рэшткі куцці, якой надавалі аграрна-магічнае значэнне, «кідалі ў двару, каб куры несліся дома» (запісана ў в. Пушчанка ад Шлыкевіч Алены Уладзіміраўны, 1939 г. н.), «курэй абсыпалі зернем, каб далёка ад двара не хадзілі» (запісана ў в. Корань ад Закрэўскага Івана Аляксандравіча, 1931 г. н.); «гэту куццю (або не даелі крупу гэту) усыпалі, дзе куры ядуць. І каб куры паелі ету куццю» (запісана ў в. Акцябр ад Міхневіч Валянціны Мікалаеўны, 1938 г. н.); «куццю зверху знімалі і аддавалі скату, каб радзіла скаціна» (запісана ў в. Корань ад Шыла Лідзіі Нікіфараўны, 1937 г. н.); «потым бацька браў вярхушку з куцці і прыносіў курам, каб куры неслі яйцы і ўсягда былі пры сваім двары» (запісана ў в. Закалюжжа ад Емяльянавай Надзеі Пятроўны, 1937 г. н.).

Жыхары розных вёсак Лагойскага раёна пацвердзілі факт святкавання поснай, багатай і беднай куцці: «Было тры куцці: первая куцця – посная, другая куцця – багатая, трэцяя – бедная» (в. Хадакі). «Тры куцці ёсць: вот гэта посная ў нас была куцця, потым перад Новым годам, 31-га, была багатая куцця, тады ўжо не пасцілі… каўбасы пяклі на куццю, гарэлку пілі. І тады яшчэ была 6-га – ужо зноў посная куцця – бедная куцця» (запісана ў в. Акцябр ад Міхневіч Валянціны Мікалаеўны, 1938 г. н.); «Тры куцці бывае: куцця перад Ражаством і перад Новым годам – ужо багатая куцця, там ужо і калбаса і ўсё гэта, а первая куцця – посная. І перад Крашчэннем куцця тожэ посная» (запісана ў в. Акцябр ад Залуцкай Таццяны Міхайлаўны); «Куццю варылі. Адразу посную галодную, а потом – на Новы год» (в. Рэпішча). «З 24 на 25 дзекабра гэта перадкалядкі. На стол ставілі ўсё поснае: паліўку з грыбамі, сялёдку» (в. Мятлічыцы). Паводле ўспамінаў

Сцяпана Антонавіча Падбярозкі, 1933 г. н., з в. Мятлічыцы, калі «варылі куццю з пярлоўкі, то нябожчыкаў запрашалі на вячэру». Паводле сведчанняў Валянціны Акуловіч, 1933 г. н., з в. Пуцілава, адсутнасць мясных страў на першую куццю тлумачыцца тым, што ў гэту ноч нарадзіўся Ісус Хрыстос: «На стале не павінна быць нічога жырнага, бо ў гэту ноч нарадзіўся Ісус Хрыстос». Прысутнасць пэўнай колькасці страў мела магічна-сімвалічнае значэнне і «рытуальнае прызначэнне» (А. І. Гурскі). «Паводле старажытнай народнай традыцыі, лічбы 3, 5, 7, 9, 12 з'яўляюцца сімвалічнымі і ў каляднай рытуальнай вячэры, сімвалізавалі поспех, шчасце, удачу ў наступаючым годзе» [2, с. 67]. Невыпадковасць «поліўкі з грыбамі» сярод калядных страў звязана з тым, што «паколькі грыб лічыўся зямной праслінай, то грыбны адвар сімвалізаваў сокі зямныя, якія пад уздзеяннем сонца абуджаюць жыццё ў прыродзе» [2, с. 67]. З куццёй быў звязаны рытуальны дыялог заклінання марозу. «Надзвычай распаўсюджаным ва ўсіх усходніх славян быў абрад заклінання марозу, клікання яго на вячэру. Звычайна яго клікалі на ўсе тры куцці. Мароз запрашалі ў самым пачатку вячэры, падышоўшы да акна, стукнуўшы ў дзверы або нават выйшаўшы на вуліцу» [1, с. 152]. У в. Акцябр заклікалі мароз на першую куццю: «Пасля захада сонца, калі спаць лажыліся, звалі мароз куццю есці» (запісана ад Залуцкай Таццяны Міхайлаўны, 1922 г. н.). У в. Асінцы спачатку заклінaлі мароз на вячэру, а затым звярталіся да памерлых продкаў: «Бацька адкрываў дзверы і гаварыў тры разы: «Мароз, мароз, прыдзі к нам куццю есці, ды не марозь наша жыта, садавіну і агародніну» (запісана ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.). У в. Корань рытуал заклінання марозу таксама выконваў гаспадар, які «выходзіў на ганкі і казаў: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці. Хто будзе ў дарозе, каб не замарозіў» (запісана ад Шыла Лідзіі Нікіфараўны, 1937 г. н.). У гэтай вёсцы заклінанне марозу лагічна дапаўнялася прачытаннем малітвы і зваротам да дзядоў: «Прыходзьце ўсе на Дзяды, і свае і чужыя, багатыя і бедныя, здаровыя і знямоглыя». Прыведзеныя прыклады пацвярджаюць высновы даследчыцы Л. М. Вінаградавай аб тым, што «ў аснове просьбаў да марозу некалі ляжалі ўяўленні пра ўсемагутнасць памёрлых, якія нібыта ўздзейнічаюць на надвор'е, ураджай, засуху, поспех і няшчасці» [3, с. 196]. У в. Закалюжжа з першай куццёй быў звязаны рытуал заклікання «дзядоў» на вячэру: «Радзіцелі, хадземце к нам есці». Адметнымі дзеяннямі (страляніна з ружжа) суправаджаўся рытуал заклінання марозу ў в. Пуцілава: «Калі садзіліся за стол, бацька браў ложку куцці, выходзіў на вуліцу і гаварыў: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці. Не марозь маё збожжа, маю скацінку. Потым браў ружжо і некалькі раз страляў» (запісана ад Акуловіч Валянціны Адольфаўны, 1933 г. н.). Як адзначыла С. М. Талстая, «у тым жа значэнні, што стук і біццё, як яго ўзмоцнены варыянт, сустракаецца на Палессі і стральба з ружжа» [4, с. 461]. Прыведзенае даследчыцай асэнсаванне семантыкі дзеянняў, звязаных з заклінаннем Марозу, дало падставы зрабіць вывады наконт іх варыянтных значэнняў: «1) прэвентыўнага выгнання марозу (або іншага персанажа), што мае адносіны да ўсяго наступаючага года…; 2) сімвалічных праводзін запрошанага госця пасля завяршэння вячэры і 3) каляндарных праводзін (выгнання) святак» [4, с. 462].

Адметнае месца ў сістэме калядна-абрадавых святкаванняў Лагойшчыны належыць шлюбным гульням («Ката пячы») і ігрышчам («Жаніцьба Цярэшкі»). Звернемся да адной з найбольш цікавых форм каляднага абрадавага ігрышча моладзі, якая дасягнула шлюбнага ўзросту. Асноўныя дзеянні ігрышча – падбор шлюбных пар, жаніцьба маладых – маюць тут умоўна карнавальны, гульнёвы характар, уласцівы для падобных абрадавых звычаяў многіх еўрапейскіх народаў. Аднак распрацаванасць сцэнарыя «Жаніцьбы Цярэшкі» ў беларусаў, багацце песеннага, танцавальнага, музычнага кампанентаў, асаблівая ўзрушанасць і «прынцыповасць» удзельнікаў дзейства ў пары паказваюць, што для шэрагу пакаленняў нашых продкаў гэтае ігрышча было нечым большым, чым проста святочнай забавай. За ім хаваецца, відаць, яшчэ язычніцкі і вельмі важны для народа абрад, які рэгуляваў фарміраванне новых сямейных гнёздаў [5, с. 5].

Ігрышча «Жаніцьба Цярэшкі» – з'ява, у якой знайшлі адлюстраванне рэшткі язычніцтва, і характэрна яна найперш для фальклору Паўночнай Беларусі. Паводле сведчанняў жыхароў Лагойшчыны, на Каляды заўсёды ладзілі ігрышча, звычайна ўдзельнічала ў ім моладзь: «Маладзёж вадзіла. Выбіралі свата і сваху (хлопца і дзяўчыну), маладых, якія ўжо ўстрачаліся. Акручваліся хлопец з дзеўкай. Ладзілі стол: хто што мог, тое і прыносіў (гарэлку, сала, капусту). Танцавалі, пелі песні: «Цярэшка валочыцца, жаніцца не хочыцца» (запісана ў в. Корань Лагойскага р-на ад Шыла Лідзіі Нікіфараўны, 1937 г. н., перасяленкі з Віцебскай вобласці).

Памятаюць пра «Жаніцьбу Цярэшкі» і жыхары г. п. Плешчаніцы: «У нас сабіралась маладзёж у хаце: падружкі, дружкі. Тады ж не было, што цяпер дзіскацекі. Што ў каго было, тое сабіралі на стол. Мама з малодзіва пякла яешню такую. Вот і выбіралі пару з тых ужо, хто каму нравіцца. І астальныя на пары разбіваліся. Калі дружка табе не нравіцца, можна была і адмовіцца. І спявалі песню. Я толькі некалькі слоў памятаю: «Цярэшка, Цярэшанька, шырака дарожанька». Вот такую песню пелі, а патом там пают, як ён яе да шлюбу вядзе. І гэта пара абыходзя ў кругу, і гульні гулялі, песні пелі. Назаўтра тож такі абрад паўтаралі. Дажа некаторыя і жаніліся пасля гэтага» (запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на ад Сансевіч Ніны Фёдараўны, 1938 г. н.).

Структурныя кампаненты класічнага каляднага ігрышча «Жаніцьба Цярэшкі» наступныя: падрыхтоўчы перыяд, выбар «маткі» і «бацькі» на ролю бацькоў маладых, «скручванне» іх у танцы, падбор пары для так званага вяселля, «перакручванне» маладых у танцы, выкананне песень-«цярэшак». Больш поўнае апісанне каляднай гульні «Жаніцьба Цярэшкі» было зроблена ў в. Сукневічы ад Міхайлоўскай Валянціны Іванаўны, 1930 г. н.: «Сабіраліся ў першы дзень Раждзяства ў доме ў каго-небудзь. Дагаварываліся з узрослымі, выбіралі бацьку і матку. Потым ішлі на танцы, но толькі па прыглашэнню. Ну, прыезжалі прыглашоныя. Утрам мама мая пела на клерасе ў цэркві. После службы прыглашалі хлопцаў. Бацька з маткай выбіраюць пару па свайму ўсматрэнню. Інагда самі сабе выбіралі пару. Ну, дзеўкі былі свае, з дзярэўні, а хлопцы – прыглашоныя. Паводле сводаў накрывалі сталы, гулялі ўсю ноч. Ну, мне гэта мама ўсё расказвала. Ана гаварыла, што патом былі какіе-то ігры, песні. А патом, як усю ноч пагуляюць, расходзіліся».

Дадзены мясцовы варыянт калядна-абрадавага дзейства «Жаніцьба Цярэшкі» – яскравае сведчанне захаванасці асноўных структурных кампанентаў. Бытуе на Лагойшчыне і шлюбная гульня, вядомая пад рознымі назвамі: «Спраўляць ката», «Жаніцьба ката» (в. Расохі), «Кот» (в. Зарэчча, в. Хадакі) і інш.

Сутнасць гульні можна зразумець, калі звярнуцца да канкрэтных яе мясцовых апісанняў. Паводле ўспамінаў Ніны Аляксандраўны Данілевіч, 1938 г. н. і Любові Андрэеўны Казаноўскай, 1928 г. н., «на ката выбіралі хату. Дагаворваліся: хлопцы – гарэлку. А мы – закуску. Ну, якая тады была закуска, што ў каго было, сабралі ды і ўсё. У хаце сядзелі толькі са сваёй вёскі, а потым на танцы прыходзілі з другіх вёсак. Чаму называлі катом, я не ведаю. Кот спраўляўся раз у год пасля посту, а тады ўжо да следуюшчего. Песні пелі, якія ўмелі. Ката жанілі так: выбіралі нейкую пару, садзілі на кут і вродзе гэта былі маладыя». З прыведзенага апісання вынікае, што ёсць блізкасць паміж гульнёй «Кот» і ігрышчам «Жаніцьба Цярэшкі». «Выбіралі маладога і маладую, вакол іх танцавалі, пелі. Маладых выбіралі з цех, хто влюблённые былі, каторыя ўжо встрэчаліся. І тады вакол іх танцавалі – вот і кот» (запісана ў в. Расохі ад Данілевіч Ніны Аляксандраўны, 1938 г. н.). У в. Стрый гулялі ў гульню «Карча драць»: «Лажацца бабы на сена, кладуцца адна і другая і тады ногі зачэпліваюць. І каторая каторую пабядзіць» (запісана ад Крэнь Ганны Канстанцінаўны, 1940 г. н.).

Арганічную частку калядна-навагодняга комплексу Лагойшчыны складаюць традыцыйныя зімовыя варожбы, запісы якіх засведчылі такія выдатныя якасці менталітэту беларусаў, як паэтычнасць успрымання свету, багацце фантастычных уяўленняў, назіральнасць і інш. Варожбы на Каляды былі звязаны як з вызначэннем добрай ураджайнасці на будучы год, так і з прагназаваннем лёсу. У в. Скарады выкарыстоўвалі воск і па атрыманай фігуры на вадзе варажылі пра суджанага: «Запальвалі свечку, дзяржалі над міскай з вадой, капаў са свечкі ў ваду воск і глядзелі, якая фігура атрымаецца. Па этаму вызначалі, ці хутка выйдзеш замуж» (запісана ў в. Скарады ад Умэцкай Ніны Антонаўны, 1930 г. н.). Жыхары г. п. Плешчаніцы меркавалі аб суджаным, гледзячы на выяву, што атрымалася пасля спальвання паперы: «Бралі бумагу, спальвалі яе. Далей высвятлялі, якая выява атрымалася з попелу. Напрыклад, калі нешта падобнае да вяночка, то хутка выйдзеш замуж» (запісана ад Акуліч Ганны Сяргееўны, 1936 г. н.). З якога боку будзе будучы муж, вызначалі па абутку, які «перакідвалі праз пабудову: у які бок галянішчам ляжа, там жаніх» (запісана ў в. Скарады ад Пракопчык Жаны Канстанцінаўны, 1968 г. н.). У в. Малыя Нястанавічы, калі варажылі на суджанага, то «цягалі блюдцэ, па старанах тарэлкі було напісана, за каго замуж выйдзеш. Хто што хацеў выцягнуць, то і стараўся цягнуць» (запісана ў в. Малыя Нястанавічы ад Івашкевіч Соф'і Антонаўны, 1914 г. н.). Паводле ўспамінаў Валянціны

Мікалаеўны Навойчык, 1943 г. н., з в. Малыя Нястанавічы, «забор абнімалі: калі абнімеш у пару, то ў пары будзеш»; «мылі ліцо, але не выціралі. Клалі пад падушку новае палаценца і лічылі, што доўжэн прысніцца суджаны». Варажылі дзяўчаты і на блінах, калі імкнуліся даведацца, хто з іх першай замуж выйдзе: «На Каляды маладыя дзеўкі пеклі бліны, клалі іх на парог, патом выпускалі сабаку. У якой паслядоўнасці сабака з'ядаў бліны, у такой дзяўчаты выйдуць замуж» (запісана ад Акуліч Ганны Сяргееўны, 1936 г. н.). У мясцовай традыцыі была вядома і варажба, звязаная са сном дзяўчыны, якому папярэднічалі наступныя дзеянні маці: «Каб дзяўчына не ведала, маці брала стакан з вадою, лажыла на яго дзве палачкі і ставіла пад ложак, а ў сне дзяўчыне павінен быў прысніцца суджаны, які правядзе яе праз мост» (запісана ў г. п. Плешчаніцы ад Акуліч Ганны Сяргееўны, 1936 г. н.).

Вельмі сціплыя звесткі запісаны на Лагойшчыне пра Хрышчэнне (Вадохрышча), сакральнае значэнне якога пацвердзілі жыхары розных вёсак. Адметнымі з'яўляюцца наступныя дзеянні: «У пруб крыжыкі маленькія, дзеланыя з дзерава, брасалі» (запісана ў в. Сукневічы ад Зіневіч Настассі Яўгенаўны, 1931 г. н.). Калі ў в. Сукневічы, як пацвердзілі вяскоўцы, у «рачной палонцы» не купаліся, то ў в. Церахі «на Хрышчэнне пруб рубілі, купалісь у ім», а таксама, як і ў в. Сукневічы, «кідалі ў пруб ці калодзеж дзірывянныя крэсцікі» (запісана ад Шаршунь Ніны Канстанцінаўны, 1940 г. н.). Жыхары в. Церахі выпякалі і абрадавае печыва («Матка мая пекла хрэсты»), іх трэба было з'есці самім і даць свойскай жывёле, каб не хварэла. Апырскванне святой вадой хаты крыж-накрыж – абавязковы рытуал святкавання «Хрышчэння» ў гэтай вёсцы.

Першым па часе веснавым абрадам было гуканне вясны. Тыя нешматлікія этнаграфічныя звесткі пра гэты абрад, зафіксаваныя на Лагойшчыне, даюць магчымасць назваць яго структурныя кампаненты: запальванне вогнішча, на якім «палілі living розвае смецце» (запісана ў в. Асінцы ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.), гушканне на арэлях (гушкаліся і маленькія дзеткі, і дарослыя). Гушканне дарослых на арэлях звязвалі са здароўем: «Дзеткі маленькія каталіся на арэлях, а потым узрослыя хоць раз также павінны катацца на арэлях, штоб здаровыя былі» (запісана ў в. Асінцы ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.).

На Лагойшчыне паўсюдна святкавалі Вялікдзень (Пасху) і называлі яго вялікім хрысціянскім святам. Адметнасцю святкавання Вялікадня з'яўлялася хаджэнне валачобнікаў і выкананне валачобных песень, а таксама «васольных». Валачобнікамі называлі гурт, што складаўся з мужчын і жанчын, якія пад вокнамі спявалі песні, а пасля абыходжання хат вяскоўцаў збіраліся ў якой-небудзь адной хаце і частаваліся тымі дарамі, што атрымлівалі ад гаспадароў падчас услаўлення іх песнямі. Сярод рытуалаў велікоднага абрадавага комплексу вылучаюцца наступныя: фарбаванне яек у чырвоны колер, бо «красны цвет – сімвал крыві, васкрашэння Хрыстова» (запісана ў в. Акцябр ад Лісоўскай Алены Міхайлаўны, 1936 г. н.), падрыхтоўка «булак, кулічоў», гульня ў біткі, качанне яек у лубках, асвячэнне ў царкве яек і паскі, абменьванне яйкамі, бо гэта «сімвал сустрэчы» (запісана ў в. Кацялі ад Ярашонак Сафіі Анатольеўны, 1943 г. н.) і інш. Адорванне валачобнікаў было абавязковым: «Пасля таго, як яны спелі, то прасілі жачкі (тое, што давалі). Часам яны прасілі іх такім выслоўем: «Бабка, не дасі яйка – здохне авечка, // Не дасі кока – вылезе вока» (запісана ў в. Кацялі ад Ярашонак Сафіі Анатольеўны, 1943 г. н.). Паводле ўспамінаў Галіны Сцяпанаўны Альсімовіч, 1925 г. н., з г. п. Плешчаніцы, былой жыхаркі в. Чэркасава Міёрскага раёна Віцебскай вобласці, у іх мясцовасці, калі хадзілі валачобнікі, то называлі гэты абрад «хадзіць у Хрыстос»: «Збіралася некалькі чалавек з гармошкай. Хадзілі, паздраўлялі і пеялі. Адзін быў пачынальнікам. Усю ноч ходзяць у другую дзярэўню (песні спяваюць. Пастукаюцца ў акно і спрашываюць, ці можна з празнікам паздравіць, і пяюць, граюць). У некаторых вёсках, паводле сведчанняў інфарматараў, «валачобнікі не хадзілі» (запісана ў в. Цыннае ад Булыга Надзеі Пятроўны, 1935 г. н.).

Паводле сведчанняў Ніны Іванаўны Гуніч, 1913 г. н., з в. Хадакі, «на Вяліканне ў хаце, дзе памёр чалавек, не спявалі». На пытанне, якія звычайна стравы былі на велікодным стале, інфарматары адказвалі: «У гэты дзень быў багаты стол: сыр, масла, каўбаса, мяса варонае» (запісана ў в. Хадакі ад Рыбчак Яўгеніі Нікандраўны, 1941 г. н.); «Абавязкова на стале павінны быць свяцоная соль і яйкі. Патом ужо пілі гарэлку і елі» (запісана ў в. Малыя Нястанавічы ад Івашкевіч Соф'і Антонаўны, 1914 г. н.). На Вялікдзень у некаторых вёсках абавязкова наведвалі могілкі: «На могілкі і насілі эці яйкі і свянцоныя булкі туды» (запісана ў в. Цыннае ад Булыга Надзеі Пятроўны, 1935 г. н.). Сачылі за гульнёй сонца: «Назіралі на Пасху, як гуляе сонейка.

Угледзішся, а яно, і праўда, пачынае скакаць туды-сюды» (запісана ў в. Новае Чэрнева ад Акуліч Ядвігі Аляксандраўны, 1931 г. н.). У в. Асінцы могілкі на Вялікдзень не наведвалі, бо лічылі, што «Вялікдзень – гэта дзень Хрыста, а Радуніца – гэта дзень памёршых» (запісана ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.). Як адзначылі жыхары г. п. Плешчаніцы, калі яны прыходзілі з царквы з пасвечанымі яйкамі і паскай, то адразу «садзіліся снедаць, яйка пасвяцонае рэзалі на столькі кусочкаў, колькі было чалавек у сям'і. Кажды доўжан быў з'есці кусочак» (запісана ад Петрашко Лідзіі Лявонцьеўны, 1932 г. н.). Шкарлупкам ад велікодных яек надавалі аграрна-магічнае значэнне, невыпадкова «бралі скарлупу і выносілі на агарод, каб быў добры ўраджай» (запісана ў г. п. Плешчаніцы ад Петрашко Лідзіі Лявонцьеўны, 1932 г. н.); «Шкарлупкі з яек давалі курам, каб добра яйко неслі» (запісана ў г. п. Плешчаніцы ад Арцем'евай Ліліі Васільеўны, 1939 г. н.).

Надзвычай акуратна падыходзілі да выканання рытуалаў, звязаных з падрыхтоўкай абрадавага хлеба – «паскі»: «Паску выпякалі вельмі асцярожна, бо лічылася, калі корка ў пасці патрэскаецца – чакай вялікага гора» (запісана ў в. Асінцы ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.). З Вялікаднем былі звязаны шматлікія міфалагічныя ўяўленні. Верылі, што «хто першы прыйдзе з царквы, той закончыць першым жніво» (запісана ў г. п. Плешчаніцы ад Арцем'евай Ліліі Васільеўны, 1939 г. н.). У в. Акцябр падрыхтоўкай велікодных страў займаліся ў суботу: «У васкрэсенье нічога не гатовілі. Нельзя было жарыць у гэты дзень яйцы, бо куры несціся не будуць» (запісана ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.). Лічылі, калі «на Паску многа снегу на заборах, то будзе шмат грыбоў і ягад» (запісана ў в. Мятлічыцы ад Падбярозка Сцяпана Антонавіча, 1933 г. н.).

Юраўскі абрадавы комплекс Лагойшчыны захоўвае агульнатрадыцыйную аснову і ўключае абрады як жывёлагадоўчай, так і земляробчай скіраванасці. У розных вёсках Лагойшчыны менавіта з Юр'ем быў звязаны абрад першага выгану жывёлы ў поле: «Юр'я – гэта празнік, на яго першы раз выганялі жывёлу». Калі выганялі першы раз карову ў поле, то апырсквалі пасвечанай вадой хлеў, абыходзілі карову з хлебам і свечкай, чыталі замову: «Бралі свечку і пасвяцоную ваду, запальвалі свечку, і абыходзілі карову, і пасвяцонай вадой палівалі яе, і чыталі загавор» (запісана ў в. Закалюжжа ад Емяльянавай Надзеі Пятроўны, 1937 г. н.).

Веснавы цыкл земляробчага календара завяршаўся святкаваннем Тройцы, або Сёмухі. «Тут практычна праглядваюць сляды старажытнага (язычніцкага) культу расліннасці. На Сёмуху хату і падвор'е ўбіралі «маем»: у брамцы ставілі прынесеныя з лесу маладыя бярозкі, галінкамі бярозы і клёну (ліпы) аздаблялі сцены і вокны ў хатах. «Май» ставілі перад ганкам. Дарожкі на падворышчы, якія папярэдне чыста вымяталі, пасыпалі жоўтым пяском, падлогу ў хаце – «яварам» (аерам)» [6, с. 52]. Аб тым, як святкавалі Тройцу на Лагойшчыне, сведчаць канкрэтныя фактычныя матэрыялы, зафіксаваныя ў розных вёсках, жыхары якіх пацвердзілі, што менавіта з Тройцай звязана ўшанаванне зеляніны, якой упрыгожвалі падвор'і, клалі ў хаце на падлогу: «Хадзілі ў лес, ламалі бярэзнік і клалі веткі на іконы» (запісана ў в. Казыры ад Ермаковіч Марыі Сцяпанаўны, 1925 г. н.), «Хадзілі ў лес, сабіралі траву, прыносілі яе дамоў і рассцілалі на пол» (запісана ў в. Акалова ад Смаляка Алеся Мікалаевіча, 1937 г. н.). Галінкі бярозы, што прыносілі на Тройцу, выкарыстоўвалі як прафілактычны сродак ад мышэй: «Ветачкі бярозы ламалі, прыносілі ў хату, лажылі пад сена ў сарай, каб мышы не вадзіліся» (запісана ў в. Акалова ад Акуліч Марыі Віктараўны, 1932 г. н.). Траецкую траву, з жыццядайнай сілай якой сімвалічна звязвалі моц будынка, паводле ўспамінаў Рыгора Станіслававіча Шуркевіча, 1930 г. н., з в. Акалова, выкарыстоўвалі, калі будавалі хату: «Пад цэмент лажылі траву, каб дом быў крэпкім». Па бярозках, якімі ўпрыгожвалі на Тройцу падвор'і, варажылі аб ураджайнасці ў надыходзячым годзе: «Калі засыхала быстра бярозка, то год будзе сухі, галодны, а калі доўга – то ўраджайны» (запісана ў г. п. Плешчаніцы ад Петрашко Лідзіі Лявонцьеўны, 1932 г. н.). Каб засцерагчы сена ад мышэй, «ламают бярозкі і ставяць у сена» (запісана ў в. Мятлічыцы ад Падбярозка Сцяпана Антонавіча, 1933 г. н.). Паводле ўспамінаў Алены Мікалаеўны Руткоўскай, 1928 г. н., з в. Дзераўно, «на Тройцу да крыжа ездзілі, ваду бралі, у два рады бярозкі ставілі, каб мышы сена не елі, клалі май». Кацярына Мікалаеўна Багуцкая, 1928 г. н., з в. Акцябр пацвердзіла, што ў іх мясцовасці таксама выкарыстоўвалі траецкую зеляніну з мэтай засцярогі сена ад мышэй: «Ламалі галінкі бярозы на Тройцу і ставілі іх на двары, у паталок таркалі, расстаўлялі каля сцяны ў хляве каля сена, каб не елі мышы сена».

«Купалле» на Міншчыне – з'ява жывая, шматколерная. Гэта свята адзначаецца з 6 на 7 ліпеня, усё часцей аднаўляецца і там, дзе пра яго забыліся, існуе ў розных відах: то гэта фестываль

народных талентаў (як на Лагойшчыне, калі ля вогнішча збіраюцца разам спевакі з розных куткоў Беларусі і госці), то больш лакальная з’ява (як на Ракаўшчыне, калі на маляўнічы бераг Іслачы сыходзяцца жыхары навакольных вёсак), то звычайны купальскі агонь на ўзлеску ці ўскраіне вёсачкі. На Мядзельшчыне ў гэты час спальваюць траецкі май, маладыя бярозкі, якія захоўваліся каля хат ад Сёмухі да Купалля» [7, с. 52]. Купальская абраднасць Лагойшчыны захоўвае традыцыйную агульнаэтнічную аснову і ўключае такія структурныя кампаненты, як распальванне вогнішча, пляценне вянкоў, варажбу, скокі праз касцёр, пошукі папараці-кветкі, ваджэнне карагодаў і інш. Мясцовыя жыхары шчыра верылі, кідаючы сплеценыя вянкі на ваду, што калі «вянок дзяўчыны сыдзецца з вянком хлопчыным, значыць, пойдзеш замуж за яго» (запісана ў г. п. Плешчаніцы ад Зялёнка Ніны Апалінараўны, 1938 г. н.). У в. Церахі дзяўчаты варажылі на трыпутніку, які трэба было «ротам сарваць, прыгаворваючы: «Трыпутнік, трыпутнік, ты расцеш пры дарозе, пакажы мне дарогу к міламу». Пры гэтым забаранялася размаўляць (запісана ад Бынкоўскай Ганны Пятроўны, 1938 г. н.). З пошукамі папараці-кветкі мясцовыя жыхары звязвалі не толькі надзеі на асабістае сямейнае шчасце («Калі дзяўчына або хлопец знойдуць папараць-кветку, то знойдуць сваё шчасце» (запісана ў в. Акалова ад Смаляка Алеся Мікалаевіча, 1937 г. н.); «Шукалі на Купалле папараць-кветку. Калі знойдзеш, замуж выйдзеш» (запісана ў в. Акцябр ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.), але і на дабрабыт («На праздні́к Купалле была традыцыя – шукаць папараць-кветку. Той, хто яе сарве, будзе ў дастатку» (запісана ў в. Асінцы ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.)). Магічнае значэнне надавалася скокам праз купальскае вогнішча: «На Купалле хлопец з дзяўчынай прыгалі праз вогнішча разам, тады яны ўвесь год будуць разам» (запісана ў в. Асінцы ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.). Лекавымі лічыліся тыя травы, што збіраліся зранку на Купалле: «Збіралі лячэбную траву, таму што ёй прыдавалася больш лячэбнай сілы» (запісана ў г. п. Плешчаніцы ад Петрашко Лідзіі Лявонцьеўны, 1932 г. н.). Крапіва-жычка, паводле ўяўленняў жыхароў Лагойшчыны, з’яўлялася надзейным сродкам засцярогі свойскіх жывёл ад ведзьмы: «Крапіву-жычку падтырківалі куды-небудзь у сараі, каб ведзьмы малако не забіралі ў кароў» (запісана ў в. Пуцілава ад Акуліч Валянціны Адольфаўны, 1933 г. н.).

Асэнсаваны намі фактычны матэрыял сведчыць аб устойлівасці захавання ў памяці жыхароў Лагойшчыны звестак пра розныя жанры каляндарна-абрадавай паэзіі.

**Літаратура**

1. Барабанава, Л. П. Узроўні агульнасці фальклору ўсходніх славян / Л. П. Барабанава, Г. А. Барташэвіч, К. П. Кабашнікаў [і інш.]. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 477 с.

2. Каляндарна-абрадавая паэзія / А. С. Ліс [і інш.]; навук. рэд. А. С. Фядосік – Мн.: Бел. навука, 2001. – 515 с.

3. Виноградова, Л. Н. Зимняя календарная поэзия западных и восточных славян: Генезис и типология коледования / Л. Н. Виноградова. – М., 1982. – 206 с.

4. Толстая, С. М. Полесский народный календарь / С. М. Толстая. – М.: Индрик, 2005. – 600 с.

5. Жаніцьба Цярэшкі / уклад. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Л. М. Салавей; уклад., сістэм. і расшыфроўка муз. матэрыялаў, уступ. арт. і камент. І. Дз. Назінай. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – 519 с.

6. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / уклад., класіф., сістэм. матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага, А. С. Ліса; рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

7. Беларускі каляндар у сучасных запісах: Традыц. жанры: Мінск. вобл. / уклад. В. Д. Ліцвінка; уклад. муз. часткі Г. Р. Кутырова. – Мн.: Універсітэцкае, 1995. – 477 с.

## ЗІМОВЫЯ АБРАДЫ, ЗВЫЧАІ І ПЕСНІ

### Піліпаўка

На Піліпаўку галодны воўк вые. У гэты дзень жанчыны пралі, а мужчыны дровы рубілі.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на***
***ад Шыла Лідзіі Нікіфараўны, 1937 г. н.***
***(раней пражывала ў Віцебскай вобл.),***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

На Піліпаўку песні не пелі. Быў вялікі Спас.У гэта свята ваўкі выюць.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Петрашко Лідзіі Лявонцьеўны, 1932 г. н.,***
***(нарадзілася ў в. Хадакі Лагойскага р-на),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

Пилиповка – когда волк воит. Отмечают, сабираются деньгами, дзевчаты готовили закуску, хлопцы водку. Ходили по деревням, пели песни, танцавали.

Па чарзе, па кругу ходили.

***Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на***
***ад Мінкувіч Антона Антонавіча, 1928 г. н.***

На Піліпаўку пачынаецца год у ваўкоў. Ваўкі збіраюцца стаямі, выюць цэлымі начамі.

***Запісана ў в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Акуловіч Валянціны Адольфаўны, 1933 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

### Каляды

Вадзікі казу. Калядоўшчыкі выварачвалі шубы найзнанку. Вадзілі казу, і насілі з сабою звязду. Звычайна калядоўшчыкі пелі:

Каляда, Калядзіца,
Красная дзявіца,
Дай нам падарункаў:
Хлеба, аладак, гатункаў.
Сып паболей грошай,
І жывіце, хазяева, ў раскошы!

Вось такую песенку пелі калядоўшчыкі, як я помню.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Анішкевіч Анжэлы Усеваладаўны,1964 г. н.***
***Новак В. С.***

Куцця звычайна гатовілася з пярловай крупы, утрам. Клалі на стол сена. Вечарам збіралася ўся сям'я і мы саджаліся за стол. Запальвалі свечкі. Памолімся Богу. Бацька пачынаў першы есць куццю. Аладкі прывозілі з касцёла. Аладкі елі вмесце з куццёй. Гарэлкі не было. Багатая куцця была скаромная. Яе ставілі на стол. Пеклі ржаныя булкі. Калядоўшчыкі спявалі песні хазяіну. Хазяін угашчаў іх. «Жаніцьба Цярэшкі» ў нас была. Маладзёж збіралася і дагаворвалася. Хлопцы прыносілі гарэлку, а дзеўкі – закусь. Выбіралі ненастаяшчых бацьку і маці. Бацька прыводзіў дзяўчыну, а маці – хлопца. Потым іх жэнюць, іграе гармошка. Потым хлопец павінен адвезці дзяўчыну да яе бацькоў.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Марыі Віктараўны, 1932 г. н.***
***Новак В. С.***

Абычна рыхтавалі куццю з пярлоўкі. Ставілі на стол. Лажылі на стол сена. Первых за стол запрашалі дарослых, а потым усіх астальных. Адчынялі дзверы і клікалі мароз: «Мароз, мароз, хадзі к нам за стол куццю есці». Калядоўшчыкі пераапраналіся ў казу і вадзілі яе па дамам. Калядоўшчыкі звычайна хадзілі гуртам. Дзякавалі калядоўшчыкаў хлебам, зярном, а бывалі і нальюць чарачку гарэлкі.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Смаляка Алеся Мікалаевіча, 1937 г. н.***
***Новак В. С.***

**Гаданія**

Бярэцца ліст бумагі. На лісце патрэбна нарысаваць круг. Напісаць на ім буквы і цыфры. Бяруць іглу і дзержаць на магніце. Пасярод круга вісіць іголка, і патрэбна гаварыць: «Я там якая-то. Якім у мяне будзе суджаны (імя)?» Перастае кружыцца іголка і стане. Напрыклад, Цімафей. Гадаць патрэбна было пры выключаным свеце.

На захадзе сонца патрэбна запоўніць стакан на 1/3 вадой і дабавіць ложку цукру. Потым патрэбна паставіць стакан на фатаграфію каханага, помешваць цукар і прыгаворваць: «Пусць усе будзе гладка і сладка паміж мною і табой (імя каханага)». Патрэбна гэта паўтараць да тых пор, пакуль атнашэнія между вамі не пахарашэюць.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Марыі Віктараўны, 1932 г. н.***
***Новак В. С.***

На Каляды накрывалі стол увечары. Садзіліся, елі. Калядавалі хадзілі. Дзядзька іграў, а мы хадзілі пелі. Каля хаты спявалі.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Луцкай Зінаіды Мікалаеўны, 1941 г. н.***
***Новак В. С.***

На Каляды хадзілі пад вокны, пелі. Пелі калядныя песні. Перад Калядамі на стале клалі сена, тады накрывалі, ставілі яду, куццю. Такую варылі пярлоўку, ставілі кашу. Ужо павячэраеш, тада з-пад гэтай скацеркі выцягвалі сяніну, каб вызначыць, які будзе лён. Выцянеш вялікі – будзе вялікі, а малую выцянеш – малы будзе лянок.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Андрушкевіч Зінаіды Канстанцінаўны, 1925 г. н.***
***Новак В. С.***

Перад Калядамі чатыры нядзелі пасту. Не елі ні мяса, ні малака. Таўклі канаплю, сушылі і ляпілі ўжо такія ляпёшкі. 25 дзекабра ўжо ішлі ў касцёл, маліліcь. Перад Калядамі была куцця. Рабілі куццю і гадалі. Ну вот сыпалі, прымерна пяцёх ці колькі нас сабярэцца, кучкі ячменя, ставілі петуха, чыю кучку стане першай кушаць, той замуж першы выйдзе. На Каляды мяса, сала, каўбасы жарылі. Водку ў тыя часы мы не пілі. Куццю варылі з крупы ячменнай. Пяклі з пшанічнай мукі такія маленькія-маленькія клёцкі-галушачкі. Цёрлі мак з сахарам і туды ўжо лажылі гэтыя галушачкі. Куцця была посная, без сахара і без солі. Калі сядалі есці куццю, маліліся. Сядалі ўсе гуртом за стол. На Каляды хадзілі паздраўляць. Адзяваліся і ў авечку, і ў козачку. Спявалі песні і тады ўжо за гэта давалі гасцінцы.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Шаўчэнка Ганны Іосіфаўны, 1934 г. н.***
***Новак В. С.***

На Каляды варылі куццю, паліўку з грыбамі. Куццю варылі з груцы. Груца – ячмень, адтоўчаны ў ступе. Пасцілалі на стол сена. Першым дзелам прыносілі сена, засцілалі стол скацерцю. Сена абазначае тое, што спасіцель міра Ісус Хрыстос радзіўся і яго палажылі ў яслі з сенам. Асобенна нада, шоб была перловая каша. Пасля захада сонца, калі спаць лажыліся, звалі мароз куццю есці. Раней маразы ж былі, як пачне страляць у сценах. Дык дзеці гаварылі: «Мароз,

Мароз! Хадзі куццю есці. Гэта была куцця перад Ражством – 6 числа вечарам куццю варылі. Тры куцці бывае: куцця перад Раждэством і перад Новым годам – ужо багатая куцця: там ужо і калбаса і ўсё гэта, а первая куцця – посная. І перад Крашчэннем куцця тожэ посная.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Залуцкай Таццяны Міхайлаўны, 1922 г. н.***
***Новак В. С.***

На Каляды куццю варылі. Пасцілі, а тады ўжо на куццю кашу ставілі пярловую. Усё рабілі поснае. Гэта было 24 дзекабра. І сялёдка нада каб была, і бліны, і масла з баранкамі. Тры куцці ёсць: вот гэта посная ў нас была куцця, потым перад Новым годам, 31-га была багатая куцця, тады ўжо не пасцілі. Каўбасы пяклі на куццю, гарэлку пілі. І тады яшчэ была 6-га – ужо зноў посная куцця – бедная куцця. На 3-ю посную апяць рабілі. А на другую каўбасу, сала рабілі ўжо, гарэлку пілі.

Бывала, выймеш, паставіш куццю. На кут ставілі, пакуль есці. У хаце ж многа было маладзёжы, гадаць нада было: хто первы ўкрадзе куццю і схавае, пад падушку ложа. Ёй суджаны павінен прысніцца. На стол абязацельна сцялілі сена і на сена – абрус белы. А тады гэта сена наўтра бралі і неслі карове давалі. А гэту куццю, калі недаелі крупу гэту, усыпалі, дзе куры ядуць, і каб куры паелі ету куццю. Калядаваць не хадзілі. Гадалі: забор абнімеш і пашчытаеш – ці ў пары. Тады ахапак дроў прынясём нешчытваючы – пашчытаем, ці ў пары. Тады ў ложку воску расплавім – і ў ваду. Тады ўжо паглядзім, што там, то брычка якая, то асёл, то казёл, то такое зробіцца, што смяёмся вечар. То сабачая галава, то чалавечая. То сыпалі, колькі там дзяўчат ці хлопцаў саберэцца, у адну то хату сабіраліся, кожны сыпе купку зярна. Выпускаюць з-пад печы куру. І чыю купку перву ухваціць, то ўсё: «Замуж, замуж, замуж!» Як первая куцця была, дык малыя былі, паляцім туды, скачам, там пад вокны, стукаем у вакно, дык хай ужо атвячаюць: «Ідзі!» Ідзі – гэта каб замуж пашла. А калі чуеш: «Сядзь, сядзь!», дык гэта каб замуж не пайшла.

Хату памяцеш і смецце скарэй нясеш высыпаць. І глядзіш, дзе ж там сабака брахаў, у тую сторану і замуж пойдзеш.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Міхневіч Валянціны Мікалаеўны, 1938 г. н.***
***Новак В. С.***

Перад Калядамі пасцілі, а потым была куцця посная. Варылі кашу з ячменных круп. На стол клалі сена, засцілалі белую скацерку, ставілі ўсё поснае: грыбы, рабілі з мёду сыту, аладкі мачалі ў канаплянае масла, быў і кісель аўсяны або з журавін, клалі печаныя сухарыкі ў цёрты мак. Раніцай аддавалі сена карове, каб вёўся скот. Спачатку елі куццю, абавязкова трэба было пакінуць рэшткі куцці да раніцы. Калі яны будуць некранутыя, то лічылі, што будзе весціся гаспадарка добра. Была ў нас і багатая куцця. На стале было ўсякае яства: мяса, каўбасы, сала. Хадзілі калядоўшчыкі, кажухі навыварат вываречвалі, але казу не вадзілі. Віншавалі гаспадароў каляднымі песнямі. На трэцюю куццю ваду свяцілі. Верылі мы і ў вадохрышчынскую ваду, прыносілі яе дахаты, брызгалі свяцонай вадой у хаце, у хлеве.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

Мы да Калядаў рыхтаваліся так: прыбіралі ў хаце, варылі куццю, засцілалі абрус, пад абрус лажылі сена. Куццю ставілі пад абраз. Куцця лічылася галоўнай стравай на Каляды. Пасля ўсе садзіліся за стол, бацька адкрываў дзверы і гаварыў тры разы: «Мароз, мароз, прыдзі к нам куццю есці, ды не марозь наша жыта, садавіну і агародніну».

Потым бацька стаў зваць усіх памершых дзядоў. Потым выходзілі з-за стала і ішлі калядаваць. Калі да нас прыходзілі калядоўшчыкі, то пелі песні, у якіх усхвалялі бацьку як добрага гаспадара, маці як гаспадыню, дачку параўноўвалі з краснай рабінай, сына – з дубам.

Калі захадзілі калядоўшчыкі, то гаварылі такія словы:

Калядуем, калядуем,
Каўбасу чуем.
Дайце каўбасу, я дадому занясу.
Дайце другую – яшчэ пашчадрую.
Дайце трэцюю, хоць авечую.
Святы вечар!

Маці давала калядоўшчыкам розныя падаркі, запрашала іх за стол.

А пасля таго, як яны ўжо выходзілі, то жалалі гаспадарам добрага ўраджаю.

На Каляды таксама яшчэ варажылі. Дзеўкі выходзілі на вуліцу ў 12 гадзін ночы, слухалі, у якім баку забрэша сабака – у той бок і замуж пойдзеш.

Была і такая варажба: дзеўкі бралі і абнімалі забор, калі парнае калічаства – то будзеш у гэтым гаду ў пары, еслі непарнае – не.

Потым бралі сапагі і кідалі за сябе і глядзелі – куды дзюбка паказвае, туды і замуж пойдзеш.

Яшчэ варажба была адна: падыходзіць да акна і слухаць, што гавораць. Еслі там ругаюцца – то ўвесь год сварыцца і плакаць будзеш, калі не – то ўсё будзе добра.

Бралі рашчоску або грэбень, лажылі яе пад падушку і перад сном ты ні з кім не павінна гаварыці. Пасля бярэш рашчоску – рашчэсваешся і гаворыш тры разы: «З кем мне век дажываць, прыдзі мяне рашчасаць». Рашчоску ложаць зноў пад падушку і лажацца спаць. Хто табе прысніцца і будзе рашчосваць цябе ва сне, той і будзе тваім мужам.

***Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на***
***ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

**Варажба**

Выключалі свет, запальвалі свечку, дзяржалі кальцо, іменно обручальнае і ўглядаліся ў него. Павінен быў паказацца ў ім суджаны.

***Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на***
***ад Солуб Лідзіі Іванаўны, 1946 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

**Цярэшка**

Сабіралася маладзёж са ўсіх дзеравень. Выбіралі з пажылых людзей «бацьку» і «матку». І маладых, якія сябравалі або падабаліся адзін аднаму. Дзеўку вяла «маці», а хлопца – «бацька». Зводзілі рукі, каб патанцавалі. Усе зносілі па троху: хлопцы гарэлку, а дзеўкі закуску. Пасля ізноў ішлі танцаваць.

**Варажба**

Кожная дзеўка несла аладкі, ложыць на парозе, завуць сабаку. Каторую аладку схваціць, тая пойдзе замуж, а чыю закапае, тая памрэ.

Прыносілі ў хату петуха, ставілі перад ім зеркала, зёрны і ваду. Яго закруцяць, а тады, калі зёрны клюе – багаты, ваду – п'яніца, а зеркала – фарсун.

Ставілі 2 свечкі, зеркала, у стакан з вадою – кальцо вянчальнае. Свечкі запальвалі, вада перад зеркалам. Усё гэта ў 12 гадзін. Казалі: «Суджаны-раджаны, аб'явіся». І глядзець у зеркала.

Волава растоплівалі ў міску з вадой над галавой дзяўчыны, дзеўка на каленях. Вылівалі волава, глядзелі на свет, што вылілася: вянок – замуж пойдзеш, конь – пераезд на новае месца жыхарства, гроб – памрэ.

Бралі парубень, стаялі на гары і кідалі, куды ўпадзе – туды і замуж выйдзеш.

**парубень – палка, якой падпіраюць сена.*

***Запісана ў в. Атрубак Лагойскага р-на***
***ад Пустаход Марыі Афанасьеўны, 1929 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Акуліч А. (2000 г.)***

**Калядная песня**

– Го-го-го, козанька,
Го-го-го, шэра!
Дзе ж ты бывала?
– А я бывала
Да й у шчырым бору,
Да й ягодкі брала.
Як прыбег ваўчок,
Да за козаньку – хоп.
А ваўчанятка –
Да за казанятка.
– Го-го-го, козанька,
Як ты крычала?
– А я крычала: ме-ме-ме,
Так я крычала.
– Го-го-го, козанька,
Як ты ўцякала?
– А я ўцякала:
Туп-туп-туп.
Так я ўцякала.
– Дайце казе грэчкі
Не перапечкі,
Рэшата аўса,
А наверх – каўбасы.
Ты, козанька, расходзіся, развесяліся,
Старшаму хазяіну
У ногі пакланіся.

***Запісана ў в. Аўгустова Лагойскага р-на***
***ад Мельнік Паліны Іванаўны, 1920 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Хадаровіч Т. (1997 г.)***

**Калядная песня**

Ідуць, ідуць калядкі.
Вязуць бліны й аладкі.
У маляваненькім вазочку,
Па беленькім сняжочку,
– А дзе ж каня паставіць?
– А ў суседа на дварэ.
– А дзе ж блінкі палажыць?
– У суседа на стале.
Кружком, кружком ды селі,
Усё застолля абселі,
Усё застолля абселі.
І ўсе блінкі паелі.

***Запісана ў в. Баяры Лагойскага р-на***
***ад Ярчак Надзеі Гаўрылаўны, 1922 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляшчук Н. (2002 г.)***

**Калядная песня**

А ляцеў сакол з узгор на двор,
Каліда!
Махнуў крылцам па каморцы,
Каліда!

Чаму ты, каморачка, ды ня мецена?
Каліда!
Чаму ты, дзевачка, ды нявесела?
Каліда!
А як жа мне жыці, весялой быці,
Каліда!
Абяцаў бацька трыццаць кароў – 2 р.
Каліда! – 2 р.
А як прышло, ды на дно сышло,
Каліда!

***Запісана ў в. Баяры Лагойскага р-на***
***ад Ярчак Надзеі Гаўрылаўны, 1922 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляшчук Н. (2002 г.)***

**Варажба**

У Стары Новы год (Каляды) дзяўчына ноччу падыходзіла да акна якой-небудзь хаты і слухала гаворку. Калі чула словы «ідзі, пойдзеш, возьмуць, вазьмі», тады выйдзе замуж.

***Запісана ў в. Буда Лагойскага р-на***
***ад Грынкевіч Івана Міхайлавіча, 1923 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Шавель Т. (2000 г.)***

**Варажба**

Запаленую свечку ці лучыну быстра апускаюць у ваду. Калі яна адразу гасне – будзе бедная жызнь, калі агонь перайдзе вышэй – суджаны будзе багаты.

***Запісана ў в. Буда Лагойскага р-на***
***ад Жук Ніны Мікалаеўны***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Савіцкай Ю.***

**Варожбы**

Клалі блін пад левую паху, к сэрцу, ідут па дзірэўні, пакуда не встрэціцца мужчына. Яго нада спрасіць, як яго завуць, такое імя будзе і ў мужа. А еслі мужчына не встрэціцца па дарозе, то ў етым годзе яшчэ замуж не выйдзе.

***Запісана ў в. Бурыя Лагойскага р-на***
***ад Лапцэвіч Ніны Іванаўны, 1924 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бярдычавец Т., Домінам А., Елавой Н. (2008 г.)***

**Раство Хрыстова**

Учора з вячора
Засвяціла зора.
Зора засвяціла,
Свет узвесяліла.
Свет узвесяліўся,
Хрыстос нарадзіўся,
Хрыстос нарадзіўся.
Хрыстова раджэнне –
Людзям на збаўленне.
Людзі, выбягайце,
Нам каляды дайце.
Нам каляды дайце,
Здаровы святкуйце,
Дайце, не шкадуйце.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Шышко Любові Мікалаеўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Грушэўскай Н.***

### Калядная песня

Добры вечар таму, – 2 р.
Хто ў гэтаму даму. – 2 р.
Мы самі з сабою, – 2 р.
З дзяцьмі і з жаною. – 2 р.
Сталы засцілаем, – 2 р.
Каляды спраўляем. – 2 р.
А па гэтай мове – 2 р.
Будзем усе здаровы, – 2 р.
А па гэтай казцы – 2 р.
Жывіце ў ласцы. – 2 р.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Кохан Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Рубін Ж.*

Я маленькі дылец,
З-пад печыку вылез
У белым кажушку,
Паўзе вош па брушку.
Я тую вош – шлоп,
А там клоп.
Я таго клапа біць,
А ён смярдзіць!
Я маленькі жачык,
Паўзу, як рачык,
Скачу, як жаба,
Дай яйцо, баба!
Не дасі яечка – здохне авечка!
Не дасі кока – вылезе вока!
Не дасі жака – згарыць хата!

*Запісана ў в. Гарадзішча Лагойскага р-на*
*ад Шалковіч Н. К., 1912 г. н.,*
*студенткай БДПУ імя М. Танка Шолкавіч Н.*

### Калядная песня

Едуць-едуць калядкі,
Вязуць бліны, аладкі.
На белым канёчку
Па беламу сняжочку.

*Запісана ў в. Гасцілавічы Лагойскага р-на*
*ад Сімаковіч Марыі Пятроўны, 1920 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Хабаравай Т.*

### Цярэшка

Цярэшка валочыцца,
Жаніцца не хочыцца.
Цярэшка, каху-каху,
Што ў цябе ў мяху, у мяху?
Шпілечкі, іголачкі,
Залатыя пярсцёначкі.

*Запісана ў в. Глебаўшчына Лагойскага р-на*
*ад Усцін Веры Васільеўны, 1939 г. н.,*
*студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Беланоўскай М.*

**Калядная песня**

Як пайду я кароўку даіць,
А за мной Давыдка бяжыць.
Як пушчу даёначку
Да ў Гавылу ў галёначку.
А можа ты Давыдзела,
Я ж цябе не відзела.

*Запісана ў в. Горна Лагойскага р-на*
*ад Слуцкай Ганны Пятроўны, 1927 г. н.,*
*студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Харэвіч Т.*

**Цярэшка**

Цярэшка-Цярэшачка,
Цераз бор дарожачка
Бітая, таптаная,
Я ў цябе ўкатаная.
На печы ў кутку, у кутку,
Сямёра штаноў вытку.
Вольную кашулечку
Я свайму дзядулечку.

*Запісана ў в. Горна Лагойскага р-на*
*ад Слуцкай Ганны Пятроўны, 1927 г. н.,*
*студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Харэвіч Т. В.*

Пяклі бліны, на парог клалі. У якім канцы забрэша сабака, туды і замуж пойдзіш.

Чабот кідалі праз вароты. Куды нос глядзіць, з той стараны і сватоў чакай.

Стакан з вадой ставілі пад кравадь. Рабілі масток. Лажыліся спаць. Калі прысніцца, як нехта праводзіць цябе праз гэты масток, той і мужам будзе.

*Запісана ў в. Дрыла 1-я Лагойскага р-на*
*ад Міклашэўскай Ганны Паўлаўны, 1927 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А. (2008 г.)*

**Варожбы на Каляды (куццю)**

Варажылі, на вуліцы абдымалі жэрдзі. Калі ў пару, то пойдзеш замуж, калі не – то не пойдзеш пакуль што замуж.

Ставілі ваду пад койку на куццю, і на гэту ваду шчэпачку лажылі. І павінен сасніцца суджаны, той, хто прыйдзе пераводзіць па гэтай шчэпачцы.

*Запісана ў в. Дрыла 1-я Лагойскага р-на*
*ад Сімко Кацярыны Іосіфаўны, 1932 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А. (2008 г.)*

**Калядная песня**

Пайду я каля саду,
Найду курэй стаду,
Курачак ганяючы,
Дзядульку шукаючы.
Дзядулька ўцёк, уцёк
У цемен куток, куток.
Запалю я свечачку,
Знайду ў запечачку.

*Запісана ў в. Баяры Лагойскага р-на*
*ад Ярчак Надзеі Гаўрылаўны, 1922 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляшчук Н. (2002 г.)*

### Калядная песня

Дзед бабу тапіць вядзе,
А баба крычыць, не ідзе.
Дзед бабе кажух мые,
А ў бабы дух ные.
Прападзі ты з кажушком,
Пусці ты мяне з душком.

*Запісана ў в. Баяры Лагойскага р-на*
*ад Ярчак Надзеі Гаўрылаўны, 1922 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляшчук Н. (2002 г.)*

### Калядная песня

А я дзеда як люблю, ды люблю,
А ён мяне а ні трошачкі,
А я дзеду чаравічкі куплю,
І шаўковыя панчошачкі –
Любі мяне хаця трошачкі.

*Запісана ў в. Жасцінае Лагойскага р-на*
*ад Жук Юзэфы Іванаўны, 1913 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Курак Н. (1992 г.)*

На Каляды павінна быць 12 блюд, а галоўная еда – куцця. Калі мы ўсе садзіліся за стол – маці прыносіла куццю. Спачатку куццю пробываў бацька, а потым усе мы. Первая куцця называлася посная, бацька запрашаў дзядоў к нам на вячэру, ён гаварыў: «Радзіцелі, хадзіце к нам есці». Потым бацька браў вярхушку з куцці і адносіў курам, каб куры неслі яйцы і ўсегда былі пры сваім двары. Казалі, еслі на Каляды мароз, то лета будзе гарачае, сухое. А калі на Каляды многа звёзд, то ў лесе будзе многа грыбоў.

На Каляды варажылі. Я выходзіла на вуліцу, падышла к вішні, рукі дзяржала за спіной, а зубамі адкусіла галінку, і прынесла яе дадому і палажыла пад падушку. Сказала: «Хто прыйдзе па галінку, той будзе маім сужаным». І прысніўся мне салдат з рванай шынелью ў зялёнай фуражцы. І я праснулася. А праз некалькі дней стаім мы з падругай, пад'язжае машына і выходзіць хлопец у рванай шынелі з майго сна. Так і было, клянуся вам. Забраў её і мяне, пасадзіў у машыну і павёз у сваю вёску. Жылі мы з ім харашо.

Яшчэ ведала такое гаданне. Збіраліся мы з дзеўкамі, садзіліся і лажылі на салому пад скацерку розныя вешчы: ключы, хлеб, углі, чарку. Я дастала ключы, гэта значыць, будзеш хазяйкай у хаце. Мая падруга дастала чарку, то яе мужык выпіваў, да і добра выпіваў. Адна дастала ўгаль – бедная была, а тая, што дастала хлеб – яе мужык быў багаты і працавіты. Так усё, дзеткі, збылось.

*Запісана ў в. Закалюжжа Лагойскага р-на*
*ад Емяльянавай Надзеі Пятроўны, 1937 г. н.,*
*студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.*

На Каляды гулялі, варажылі. Да бэлькі прывязвалі ніткі і запальвалі. Чыя быстрэй згарыць, тая і замуж скора пойдзе. Смецце вымяталі, выносілі з хаты, слухалі, дзе сабакі забрэшуць. А яшчэ лёталі па сялу. Фортачкі здымалі, камяны затыкалі. Маладым хлопцам ляляк на вокны чаплялі.

*Запісана ў в. Заполле Лагойскага р-на*
*ад Крэнь Марыі Станіславаўны, 1938 г. н.*
*студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Саўчанка Г. П.*

### Калядная песня

Добры дзень людзям,
Мы казу вядзем!
Кланяйся таму, хто ў гэтым даму,
А потым таму ты гаспадару,
А потым таго і гаспадыні яго.

Лезь, каза, на куст,
Есць гарэлка тут.
Лезь на паліцу па калбасіцу.
Досыць казе гуляць, можна і пагуляць,
А дайце сала, каб каза ўстала.
Досыць казе гуляць, можна і пагуляць,
Прынеслі сала, дык каза ўстала.
Дзеньку, козачка, за гэта сала,
А каб на лета болей за гэта,
Дзе каза ходзіць, там пшанічка родзіць.
Дзе каза рогам, там пшаніца стогам.

*Запісана ў в. Засоўе Лагойскага р-на*
*ад Кушнярэвіч Гілены Лявонцьеўны, 1908 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Бардушка Г.*

**Цярэшка**

Цярэшка валочыцца,
Жаніцца не хочацца.
Цярэшцы бяда стала,
З кім мая жана спала:
У полі пад ліпкаю –
З маладым Піліпкаю,
У полі пад елкаю –
З маладою дзеўкаю.
Пайду цялуху даіць,
А Давід за мной бяжыць,
Як пушчу даёначку –
Давіду ў галёначку.
А мой жа Давідзейка,
Я ж цябе не відзела,
А я ў цёмным кутку
Чацвёра штаноў натку,
Пятую – кашулечку,
Я свайму дзядулечку,
А мой ты дзядулечка,
Я ж твая бабулечка.

*Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на*
*ад Кізіны Ніны Макараўны, 1926 г. н.,*
*студэнткамі БДПУ імя М. Танка Гайчук С., Глатковай І.*

Варылі куццю. Звычайна звалі да сябе ў хату мароза: «Мароз, мароз, хадзі куццю з намі есці». Сена лажылі на стол. Варажылі мы. Зловім курыцу, ставілі яе ў ваду. Калі яна будзе стаяць у вадзе, то муж будзе п’яніца, а калі будзе хлеб кляваць – то не будзе. Казу вадзілі. Заўсёды пераварачвалі кажух. Хадзілі збіралі каляду. Пелі песні.

*Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на*
*ад Ліс Марыі Андрэеўны, 1928 г. н.*

Вадзілі казу. Пелі песні пад акном. Звычайна калядоўшчыкі налівалі, а не ўгашчалі іх. Звычайна ў нас гадалі вот так. У нас з 13 на 14 января, перад цем, как пайсці спаць, лажылі ў ізгалаўе ветачку елі і казалі: «Ложуся я спаць ў краваць, прысніся, мой суджаны».

Хто прысніўся, той і суджаны.

*Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на*
*ад Ермаковіч Марыі Сцяпанаўны, 1925 г. н.*

**Жаніцьба Цярэшкі**

На першы дзень Каляд, сёмага студзеня, са старэйшых людзей выбіраліся бацька і маці. Бацька павінен быў з хлопцаў выбраць жаніха, а маці – нявесту. Жаніха і нявесту абкручвалі ручніком і спявалі ім песні, і прыгаворвалі: «Цярэшка валочыцца, жаніцца не хочыцца».

Потым хлопцы неслі гарэлку, дзяўчыны – закуску, і пачыналі спраўляць гэта вяселле.

*Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на*
*ад Шыла Лідзіі Нікіфараўны, 1937 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Ясяновіч Л.*

* * *

Ах, свадзьбу, свадзьбу Бог нам даў,
Ах, свадзьбу, свадзьбу Бог нам даў.
Жаніўся мяшок, торбу ўзяў,
Жаніўся мяшок, торбу ўзяў.
А торба, торба – Манечка,
А торба, торба – Манечка,
А мяшок, мяшок – Ванечка,
А мяшок, мяшок – Ванечка.

*Запісана ў в. Алекшыцы Лагойскага р-на*
*ад Бурак Ірыны Васільеўны, 1928 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Вендзінай П. (2005 г.)*

24 дзекабра па каталічаскаму. Пасціліся от Андрэя (30 наябра) да 24 дзекабра. Варылі куццю – пярловую кашу. На посную куццю гатовілі капітальны стол, але без мяса. Была рыба (сялёдка), канапляніца, мак, аладзіі, яшчэ сухія баравікі варылі (без жыра). На стол клалі сена (Іісус нарадзіўся ў сене). На ўтра яго аддавалі скаціне, курэй абсыпалі зернем, каб далёка ад двара не хадзілі. Да куцці ў бані мыліся.

Хадзілі з песнямі і паздраўленнямі:

Каб усё ў вас вялося
У хаце, агародзе,
У садзе радзіла,
У сям'і ўсё добра была.
Каб вы ніколі не хварэлі.
І гаспадарку сваю мелі,
І шчаслівымі былі.
Штоб жылося і маглося,
Елася і пілося.

Дзелалі звязду (кагда в Віфліеме радзіўся Ісус Хрыстос, над ім зажглася звязда) і хадзілі з ёй. Яшчэ пелі:

А ўчора звячора
Прышла нам навіна …

*Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на*
*ад Закрэўскага Івана Аляксандравіча, 1931 г. н.,*
*студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,*
*Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)*

Варылі куццю з ячневых круп, з мукі клёцкі, як сушкі, канаплянку.

Хадзілі пераапранутыя ад хаты да хаты, пелі шчадроўкі:

Шчадровачка шчадравала,
Да вакенца прыпадала.

Што ты, цётка, пякла,
Нясі нам да вакна.

*Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на*
*ад Акуліч Соф'і Іосіфаўны, 1935 г. н.,*
*студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,*
*Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)*

Вадзілі казу: пераадзяваліся ў казу, кажух выварочвалі і хадзілі па хатах, і казалі:

Добры дзень людзям,
Козачку вядзём.
Гэй, гэй, каза,
Гэй, гэй, шэрая!
Лезь, каза, на печ,
Там жыта капец.
Лезь, каза, на кут,
Гарэлачка тут.
Лезь, каза, на паліцу
Па калбасіцу.
Дзе ж каза ходзіць,
Там жыта родзіць.
Дзе ж каза нагой,
Там жыта капой.

І хазяева хаты адаралі чым-небудзь.

*Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на*
*ад Шыла Лідзіі Нікіфараўны, 1937 г. н.,*
*(раней пражывала Віцебскай вобл.)*
*студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,*
*Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)*

**Жаніцьба Цярэшкі**

Маладзёж вадзіла. Выбіралі свата і сваху (хлопца і дзяўчыну), маладых, якія ўжо ўстрачаліся. Акручваліся хлопец з дзеўкай. Ладзілі стол: хто што мог, тое і прыносіў (гарэлка, сала, капусту). Танцавалі, пелі песні:

Цярэшка валочыцца,
Жаніцца не хочыцца…

На Каляды варажылі. Ішлі дзяўчаты да таго, у каго дочкі ёсць. Станавіліся на парогі, чакалі. Што скажуць, калі ідзі далей – замуж пойдзе, ідзі сядзь – дрэнна будзе. Дзяўчаты пяклі аладкі, кідалі на парог і звалі сабаку. Чыю аладку з'есць, тая замуж скора пойдзе. Кралі дровы: нячотна – адна будзе, чотна – у пары. Вылівалі на ваду гарачы воск і глядзелі, якая фігура атрымлівалася: вянок – добра, крэст – плоха. Уціхара залой дарогу ад жаніха да нявесты рабілі. Хлопцы і дзеўкі абменьваліся каліткамі (варотамі), каб пажаніцца.

Варылі куццю. Усяго іх тры: посная – куцця пярловая, абавязкова капуста з грыбамі, мядовы напітак, мак цёрты з мёдам. Кісель аўсяны і бліны. Посная – перад Хрышчэннем, багатая – перад Новым годам, з мясам, калбасой і салам.

Быў спецыяльны гаршчок для поснай куцці. Пад скацерць сена лажылі (Ісус урадзіўся на сене). Потым цягалі саломіны: длінная – лён будзе добры.

Бацька выходзіў на ганкі і казаў: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці…», «Хто будзе ў дарозе, каб не замарозіў…». Потым гаварыў малітву «Отчэ наш» і зваў усіх дзядоў: «Прыхадзіце

ўсе на дзяды і свае, і чужыя, багатыя і бедныя, здаровыя і знямоглыя».

Куццю зверху снімалі і аддавалі скату, каб радзіла скаціна.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на***
***ад Шыла Лідзіі Нікіфараўны, 1937 г. н.,***
***(раней пражывала ў Віцебскай вобл.)***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

**Калядная песня**

Каляда, Каляда, дзед на бабу заглядай.
– Злязай, баба, з печы, надзявай кажух на плечы.
Ідзі, баба, у камору, нясі, баба?
Палезь, баба, на паліцу, прынясі нам паляніцу.
Палезь, баба, прынясі нам кусок сала.
Бяры, бабушка, талерку, нясі чарку ды гарэлку.
Прынясі нам кусок хлеба, нам выпіць з табой трэба.
Добры вечар, Каляда, каб не знала вас бяда.

***Запісана ў в. Крайск Лагойскага р-на***
***ад Вышынскай Раісы Віктараўны, 1939 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Клімантовіч В. (1999 г.)***

**Калядная песня**

Я табе, дзядзька, пакалядую на прызбе.
Калядую, каўбасу чую,
Прыйду я ўначы, каўбаса ў печы,
Прыйду я ўдзень, каўбаса як пень.

***Запісана ў в. Крайск Лагойскага р-на.***
***ад Ульяш Вольгі Мікалаеўны, 1920 г. н.,***
***студэнткамі БДПУ імя М. Танка Гpraванс В., Атрашкевіч Н.***

А я маленькі пажачык,
А я поўзаю як рачык.
Не дасі, баба, кока –
Вылезе ў цябе вока,
Не дасі, баба, яечка –
Здохне ў цябе авечка.

***Запісана ў в. Крайск Лагойскага р-на***
***ад Крэнь В. У., 1928 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Ліхачовай С.***

**Жаніцьба Цярэшкі**

Цярэшка валочыцца,
Жаніцца не хочыцца.
Цярэшцы бяда стала.
З кім яго жана спала?
Пад кусцікам зеляненькім,
З казачком маладзенькім.

***Запісана ў в. Літвічы Лагойскага р-на***
***ад Леановіч Ядзвігі Паўлаўны, 1932 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляшчынскай Ю. (2004 г.)***

**Жаніцьба Цярэшкі**

Цярэшка, Цярэшка,
Цераз бор дарожачка,
Бітая, таптаная,
Я ў мамкі каханая.
Ванечка гару капаў,
Чорную сцежку таптаў,
Да Анечкі ходзячы,
Гасціначкі носячы.

*Запісана ў в. Літвічы Лагойскага р-на*
*ад Леановіч Ядзвігі Паўлаўны, 1932 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляшчынскай Ю. (2004 г.)*

**Песня Цярэшкі**

Дзед бабу тапіць вядзе,
А баба крычыць, ня йдзе:
– Мой жа ты дзядулечка,
Я ж твая бабулечка!

*Запісана ў в. Літвічы Лагойскага р-на*
*ад Леановіч Ядзвігі Паўлаўны, 1932 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляшчынскай Ю. (2004 г.)*

Варажылі: кідалі туфлі, калі яны разам упадуць, то хутка выйдзеш замуж.

Спявалі песні:

Калядын, Калядын,
Я ў бацькі адзін.
Па калена кажушок,
Дайце мне піражок.
Не дасце піражка,
Дайце грошай паўмяшка.

Калядую, калядую,
Каўбасу чую.
Святы вечар добрым людзям!
Дайце каўбасу,
А то хату разнясу.

*Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на*
*ад Навіцкай Галіны Канстанцінаўны, 1961 г. н.,*
*Пятроўскай Канстанцыны Іванаўны, 1931 г. н.,*
*студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

На Каляды спраўлялі заўсёды «Ката». Спраўлялі старыя дзяды і бабы сваёй кампаніяй, а маладыя – сваёй кампаніяй. Нясуць каўбасы, сала, гарэлку. Тады танцы да ўпаду. Хадзілі па хатам і калядавалі. Пелі:

Прыйшла Каляда,
Увечары, увечары.
Прынясла піражкі
У рэшаце, у рэшаце.
А вы, хлопчыкі,
Скачыце, скачыце.
Па піражку
Бярыце, бярыце.

А вы, дзевачкі,
Гуляйце, гуляйце,
Па піражку
Збірайце, збірайце.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Лапцэвіч Ганны Антонаўны, 1931 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С. (2008 г.)***

Перад Калядамі адзяваліся ў розныя маскі, а тады ў вакно стукалі хазяйкам. Калі яна скажа: «ідзі», то ў гэтым годзе замуж выйдзеш, а калі: «сядзь», то не скора выйдзеш. На багатую куццю вароты цягалі: хлопец любіцца з дзяўчынай, то гэтыя вароты мы ім памяняем. На бедную куццю пярловую кашу елі. А на багатую – абязацельна калбасу.

**Варожбы**

Забор абнімалі: калі абнімеш у пару, то ў пары будзеш.

Обув снімалі, кідалі і глядзелі: у які бок нос паверне, туды і замуж выйдзеш.

Мылі ліцо, але не выціралі. Клалі пад падушку новае палаценца і доўжэн прысніцца суджаны.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Навойчык Валянціны Мікалаеўны, 1943 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Рэзалі кумпячкі і клалі на тарэлкі. На Каляды сена на стол клалі, так як Ісус Хрыстос на гэтым сене нараджаўся. Наверх абрус клалі. Потым гэта сена з-пад абруса цягнулі, каб даведацца, які будзе лён. Гаршчок з куццёй ставілі пасярод стала. Куццю елі, а што аставалася, аддавалі скаціне, курам. Каб кароўкі не балелі, а куркі каля дома несліся. Заклікалі мароз: «Мароз, мароз! Хадзі куццю есці». На багатую куццю варажылі: боты перакідвалі, дзверы кралі, цягалі вароты, ад хлопца нясуць да дзеўкі. Ну, а трэцця куцця – гэта ўжо бажэственная – Вадохрышчанская.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Лапцэвіч Ганны Антонаўны, 1931 г. н.***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Саўчанка Г. П.***

**Гульня «Кот»**

Госці прыносілі закуску, самагонку. Маладыя – у адной хаце, старэйшыя – у другой хаце, ну, а самыя старыя – у трэцяй. Сала неслі. Калядавалі, свайго ката спраўлялі. Старыя не пускалі на сваё свята. І менавіта старыя пеклі з цеста «ката». А моладзі абы вечарынка была. Усюды гулі гулялі. Пад язык пелі і танцавалі. На куццю нічога сытнага на стол не ставілі. На стале сена, абрус і каша посная з круп, і мароз клікалі. Дзяўчаты варажылі, дровы прыносілі. Калі цотная колькасць дроў, то ў гэтым годзе выйдзе замуж. Плот абдымалі. Калі цотную колькасць абхваціў, то ў гэтым годзе будзеш у пары. Абутак праз плот кідалі. Ваду маці ставіла пад ложак. Сена няслі ў хлеў і давалі карове. На багатую куццю кресты на дзверах ставілі.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Лапцэвіч Ганны Антонаўны, 1931 г. н.***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Саўчанка Г. П.***

Нияк раз гадалі: цягалі блюдцэ, па старанах тарэлкі було напісано, за каго замуж выйдзеш. Хто што хацеў выцягнуць, то і стараўся цягнуць.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Івашкевіч Соф'і Антонаўны, 1914 г. н.,***
***Амбражэй Алы Аляксандраўны, 1936 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

– Як спраўлялі жаніцьбу Цярэшкі? А як жа, а як жа!

Цярэшка, Цярэшка, Цярэшанька,
Цераз двор дарожанька,
Бітая, таптаная,
Дзе ж ты, мая каханая?

От, Цярэшку гулялі. Вот хлопцы складаюць гарэлку, мы складаем закуску, сходзім у адну хату, тады там пячом, гатовім. Выбіраем бацьку і матку. Яны будуць жаніць Цярэшку, бацька бярэ хлопца, матка бярэ дзеўку, акручваюцца вальсам і тады сводзюць адно з адным, ужо ані пажаніліcь, вот тады другую пару, ну, дык тады ж гуляюць Цярэшку.

Чаму так называецца свята – не знаю. У нас як зрабілі ў старое врэмя, адзін яўрэй быў і таго выгналі з Цярэшкі.

Яшчэ была гульня «Кот». У Баброве быў адзін яўрэй, і дзяржаў ён карчму. У гэтай карчме гарэлка была. Ну, бабам гэта надаела. Узяў адзін дзядзька, злаўчыўся, і залез да яго. А яўрэі ядуць піражкі, толька задкі не ядуць. Узялі хлопцы і задкі гэтыя паўпраталі ў мяшкі.

**Цярэшка, Цярэшачка**

Цярэшка, Цярэшачка,
Ціраз бор дарожачка,
Бітая, таптаная,
Я ў мамкі каханая.

Ванячка гару капаў,
Чорную сцежку таптаў,
Да Анячкі ходзючы,
Гасцінчыкі носючы.

*Запісана ў в. Мяхеды Лагойскага р-на*
*ад Мароз Марыі Сцяпанаўны, 1933 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Нагулевіч Т. (1995 г.)*

**Зімовая песня**

Ой, у лузе, лузе,
На перавозе.
Добры вечар,
Святы вечар!

Расла Дунечка,
Перавоз трымала.
Добры вечар,
Святы вечар!

Перавоз трымала,
Перавозіла.
Добры вечар,
Святы вечар!

Як прыйшлі ды к ёй
Два хлопцейкі.
Добры вечар,
Святы вечар!

Красна Дунечка,
Перавязі нас.
Добры вечар,
Святы вечар!

Раскажу табе
Дзіва дзіўнае,
Добры вечар,
Святы вечар!

Дзіва дзіўнае,
Ды дзіўнейшае,
Добры вечар,
Святы вечар!

Што ў нашым растве
Ружа расцвіла.
Добры вечар,
Святы вечар!

***Запісана ў в. Манчакі Лагойскага р-на***
***ад Яцкевіч Зінаіды Канстанцінаўны, 1931 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Цішэвіч Ю. (2001 г.)***

**Калядная песня**

Паехала Каляда з канца ў канец,
Каляда, Каляда, Калядзіца мая.
Прыехала Каляда да Янкі ў двор,
Каляда, Каляда, Калядзіца мая.
Ой, ты, Янка, нам скажы, чым даруеш,
Каляда, Калядзіца мая.
Калі, Янка, не дасі бочку пшаніцы,
Каляда, Каляда, Калядзіца мая.
Дык, Янка, аддасі млоду Ганульку,
Каляда, Каляда, Калядзіца мая.
Паехала Каляда з канца ў канец,
Каляда, Каляда, Калядзіца мая.

***Запісана ў в. Манчакі Лагойскага р-на***
***ад Баброўскай Надзеі Фёдараўны, 1929 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Хабаравай Т.***

**Калядная песня**

Мы не самі ішлі, нас Гасподзь прыслаў,
З Ісусам Хрыстом, святым Ражаством.
Прачыстая маць вялела гуляць,
Па ўсялякаму двару, па гаспадару.
А ў тым двары
Жылі слаўныя тры стральцы.
Яны меліся казу ўбіць,
Шкуру злупіць, кажух пашыць.
Наша козачка спужалася,
Легла спаць, не магла ўстаць.
Прося аўса, наверх каўбаса,
Два кускі сала, каб каза ўстала.

***Запісана ў в. Мачужычы Лагойскага р-на***
***ад Ванзанак Надзеі Мікалаеўны, 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Турбал Л. (1999 г.)***

**Калядная песня**

Каляд-калядніца,
Дайце з мёдам паляніцу,
Бо без мёда не така,
Дай ты, цётка, пятака,
А ты, дзядзька, грошы –
Будзеце харошы.

***Запісана ў в. Мачужычы Лагойскага р-на
ад Ступак Лідзіі Міхайлаўны, 1927 г. н.,
студэнткай БДПУ імя М. Танка Красоўскай Л.***

Еслі на Каляды большэ снега, то будзе ўраджайны год. Варылі куццю з пярлоўкі. Нябожчыкаў запрашалі на вячэру.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на
ад Падбярозка Сцяпана Антонавіча, 1933 г. н.,
студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

Мы святкуем Каляды 25 дзекабра. Пост быў 4 нядзелі. Людзі поставалі. Куццю варылі з пярлоўкі. З 24 на 25 – гэта перадкалядкі. На стол ставілі ўсё поснае: поліўку з грыбамі, сялёдку. Яўрэі гаварылі: «Калі Ісус Хрыстос – Бог, то няхай сялёдка на тарэлцы ажыве. І яна, праўды, стала трапыхацца». На стол клалі сена, накрывалі яго белай скацеркай, а калі паядуць, то сена давалі жывёле, каб жывёла ўвесь год была сытая.

**Варажба**

Пяклі ладкі. Ладкі з першай скаварады мы бралі і лажылі на парог. Потым выпускалі сабаку. Чыю ладку сабака з’есць першай, тая дзяўчына першая замуж пойдзе. Потым глядзелі, у які бок сабака пабяжыць, у той дзяўчына і замуж пойдзе.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на
ад Турчыновіч Міхаліны Бенядзіктаўны
(нарадзілася ў в. Каргавішча)
студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

**Варожбы**

На Каляды варажылі. Кусок волава трымалі над вадой, тапілі. Каплі капалі на ваду. Што накапае, тое й будзе ў жыцці. Вянок – замуж выйдзеш, гроб – да смерці, бывае што і дзіця выходзіць, тады дзіцёначка народзіш.

* * *

*Варажылі на Каляды пра замужжа.*

На Каляды бегай пад вокнамі, слухай, хто скажа: «Ідзі ты», – замуж пойдзеш, а калі «Сядзь» – будзеш у дзеўках.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на
ад Турчыновіч Міхаліны Бенядзіктаўны
студэнткай БДПУ імя М. Танка Сяргейчавай В. (2000 г.)***

**Жаніцьба Цярэшкі**

Выбіралі бацьку і маці. Яны гаворуць, з якім хлопцам ісці гуляць. Рабілі круг, гарманіст іграў, сядзелі за сталом і гулялі.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на
ад Акуліч Ніны Сямёнаўны, 1938 г. н.
(нарадзілася ў в. Вострава),
Студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

**Варажба на Калядкі (куццю)**

На куццю напякалі аладак. Мая старэйшая сястра з дзяўчатамі варажыла. Паклалі гэтыя аладкі на парог. А ў дзярэўні сучка галодная бегала. Вось яе пазвалі да парога. Яна ўсе аладкі абнюхала і першай сястрыну аладку з’ела. Дык, ведаеце, і праўда, сястра хутка замуж выйшла.

***Запісана ў в. Нарбутава Лагойскага р-на***
***ад Гусакоўскага Івана Іванавіча, 1922 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бярдычавец Т., Домiным А., Елавой Н. (2008 г.)***

**Варожбы**

Нада перад Калядамі прыйсці дамоў, разуцца. Вады паставіць і шчэпачку палажыць, легці спаць. Хто правядзе па шчэпачцы, той і мужам будзе.

Слухалі пад вокнамі ў чужых хатах. Ад таго, што пачуеш, завіся тое, як хутка замуж пойдзіш.

Абнімалі забор. Чотная колькасць жэрдак – хутка замуж пойдзіш.

***Запісана ў в. Новае Чэрнева Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Ядвігі Аляксандраўны, 1931 г. н.,***
***Акуліч Антона Адамавіча, 1931 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бярдычавец Т., Домiным А., Елавой Н. (2008 г.)***

Вадзілі казу. Калядоўшчыкі хадзілі па хатах і вадзілі казу. Ім адчынялі, і каза тут валілася, а хазяіва гаварылі: «Устань, устань, каза. Дадзім табе падарункаў». Звычайна давалі сала, цукеркі, а можа, што і іншае.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Аўсейкі Валянціны Дзям’янаўны, 1937 г. н.***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Саўчанка Г. П.***

У Каляды зімой «Ката» гулялі. Сабіраецца маладзёж, гуляюць, спяваюць. Выбіралі ката з кошкаю і вот так гулялі.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Бондар Тамары Еўдакімаўны, 1929 г. н.***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Саўчанка Г. П.***

Дзяўчыны гадалі на Каляды на абручальным кальцэ, а таксама аладкі лажылі: сколькі дзевак, столькі аладак, хто першую аладку схопе – тая замуж пойдзе першая. Забор абнімалі. Калі ў пару будуць частаколіны, то ў пары быць, а калі не ў пары – то замуж не выйсці. На чардак залазілі, глядзелі ў зеркала і верылі, што хто пакажацца, той і будзе жаніхом.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Грынь Ганны Пятроўны, 1953 г. н.***
***(раней пражывала ў в. Нарбутава Лагойскага р-на)***
***Новак В. С.***

Тапілі печ, варылі на вадзе постную куццю з пярлоўкі. Куццю ставілі на скамейку астываць. Калі куцця астывала, яе ставілі на стол. Стол усцілалі сенам і наверх лажылі скацерць. Зверху куцця знімалася і назаўтра аддавалася курам, каб добра неслі кокі. На стале ўсё было поснае, елі аладачкі (святое із касцёла). Не пілі водкі, а на багатую – пілі толькі маладыя.

Яшчэ ў гэты дзень у нас гадалі. Матка пекла аладкі, дзяўчаты выбіралі па адной і потым на парог, запаміналі дзе чыя, пускалі сабаку. Яна панюхае ўсе і выбера. У якім парадку з’есць, так яны і пойдуць замуж.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Зялёнка Ніны Апалінараўны, 1938 г. н.***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Саўчанка Г. П.***

**Варожбы**

І яшчэ можна верыць у гаданія. Вот у мяне случай быў. Прыехаў там к адным старычок. І вот мы там сабраліся чатыры дзеўкі ў хаце гуляць. А ён сядзіць, гэты старычок, і гаворыць: «Вот, дзяўчаткі, я вам пагадаю. Толькі, кажа, пастаўце мне гарэлкі глечык. Ну, мы што там сказалі, і ён нам гадаў. І, знаеце, дзвюм як ён сказаў, так і збылося. А дзвюм нам і мне ён сказаў, што выйду замуж за далёкага і будзе ў мяне трое дзяцей, і мне будут людзі завідаваць. А другой сказаў, што будзе ў яе пяцёра дзяцей. І точна, усё так і ёсць. Ён на руку гадаў».

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Мароз Надзеі Фацееўны, 1925 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Гулялі Цярэшку. Збіралася маладзёж і хто што нёс. Разбіваліся на пары, з тых хто каму падабаўся.

Каляды праходзілі ў два дні: суботу і васкрэсенне. У суботу садзіліся за стол, а ў васкрэсенне танцавалі. Гулялі звычайна цэлымі дзярэўнямі. І вот, як наступала субота, мы ўжо ждзём запісачкі с танцамі. Былі такія маленькія запісачкі, і на іх напісана «танцы». На Каляды варылі аўсяны кісель, чарнічны кісель. Сама куцця была з ячменю.

На куццю гадалі на ўраджай. На стол усегда перад Калядамі пад скацерць лажылі сена. І ўтрам ужэ ўсе садзіліся і елі на гэтым сене, а потым выцягвалі і аддавалі каровам. Мылі посуд ужо вечарам.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Медунецкай Веры Ермалаеўны, 1940 г. н.***
***студэнтамі ГДУ Ларковай Н., Нікалаенка В., Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

**Жаніцьба Цярэшкі**

У нас сабіралась маладзёж у хаце: падружкі, дружкі. Тады ж не было, што цяпер дзіскацекі. Што ў каго было, тое сабіралі на стол. Помню, у нас была карова. Мама з малодзіва пякла яешню такую. Вот, і выбіралі пару, з тых ужо, хто каму нравіцца, і астальныя па пары разбіваліся. Калі дружка табе не нравіцца, можна была і адмовіцца. І спявалі песню. Я толькі некалькі слоў памятаю:

Цярэшка, Цярэшанька,
Шырака дарожанька…

Вот такую песню пелі, а патом там пают, як ён да шлюбу вядзе. І гэта пара абыходзіла ўкругу і гульні гулялі, песні пелі. Назаўтра тож такі абрад паўтаралі. Даже некатарыя і жаніліся после гэтага.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Сансевіч Ніны Фёдараўны, 1938 г. н.***
***студэнтамі ГДУ Ларковай Н., Нікалаенка В., Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Калядавала маладзёж, но ў хаты не заходзілі, пелі песні пад вокнамі. Куццю гатавалі сабе і дзядам. Сначала куцця ставілася на стол, а патом её астаўлялі стаяць на покуці. Калядоўшчыкаў угашчалі калбасой, гарэлкай. Яны наражаліся мядзведзямі, казламі.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Карэнскага Станіслава Антонавіча, 1942 г. н.***
***(перасяленца з в. Барсукі г. Маладзечанскага р-на)***
***Новак В. С.***

Звычайна ў нас гадалі дзеўкі. На калядную ноч збіраліся дзеўкі ў хаце. Каждая гадала сама сябе. Браўся сцекляны стакан з вадой з калодзежа, станавіўся на стол. Дзеўка садзілася за стол, брала ў левую руку залатое кальцо, а ў правую – свечку. Воск капаў праз кальцо ў стакан з вадой, пакуль не зцянецца. Пасля глядзела воскавы малюнак з астатнімі. Па малюнку гаварылі яе будучае. Усё рабілі ў цемнаце.

Варылі куццю з пярловай кашы. На стол клалі сена. Запрашалі мароза: «Мароз, мароз, хадзі куццёй частавацця». Калядоўшчыкі вадзілі казу, і яшчэ насілі звязду з сабой. Стукаліся ў дзверы і пелі песні, а якія, я ўжо і не помню. Хазяін іх угашчаў канфетамі, булачкамі, а другі раз і гарэлкай.

Гадалі мы яшчэ і так. Ішла дзяўчына ў сарай і абхватывала рукамі палены. Калі абхваце чотнае чысло полен, то ў гэтым годзе будзе ў пары, а калі нячотнае, то будзе адна.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Паўлавай Мар'і Ігнацьеўны, 1940 г. н.***
***Новак В. С.***

Варажылі на Каляды. Бралі бумажкі, пісалі на бумажках імена хлопцаў і лажылі пад падушку. Раніцай, кагда прасыналіся, цягнулі бумажку з-пад падушкі і глядзелі. Січталась, што так будуць зваць сужанага. Яшчэ варавалі бацькавы штаны і клалі пад падушку, січталась, што сужанага ўвідзіш ва сне.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад перасяленкі з в. Гарадзец***

Каляды – куцця посная. Раньшэ пасціліся. Не весяліліся да Каляд. На гэта свята жанілі Цярэшку: выбіраюць бацьку і матку ў танцах. Яны падводзяць да дзяўчыны хлопца, які ёй нравіцца. Тады бяруць іх за рукі і загадваюць «Лявоніху» танцаваць. Тады садзяцца за стол, ядуць і выпіваюць.

На стол, за якім елі куццю, прыносілі сена і на ім елі. Потым гэтае сена аддавалі есці карове, авечкам, козам.

На куццю запрашалі Мароз:

– Мароз, мароз, хадзі куццю есці.
– Дзякуй. Еў, на кабылку сеў і паехаў.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Альсімовіч Галіны Сцяпанаўны, 1925 г. н.***
***(раней пражывала ў в. Чэркасава Міёрскага р-на Віцебскай вобласці),***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Да Каляд гатуюцца так: гатуюць куццю, бяруць салому ці сена, ложуць на стол, патом засцілаюць скацерць, патом ставяць куццю, патом астальное.

Было тры куцці: першая – посная, другая – багатая, трэцяя – бедная.

На сена ці на салому гадалі. Калі ўсе павячэраюць, выцягваюць салому. Калі яна будзе з зернем, то год будзе ўраджайны.

Выходзілі на вуліцу і глядзелі, калі звёзды на небе ёсць, то будзе многа грыбоў.

На Каляды хадзілі шчадраваць, вадзілі з сабой казу. Я была казой. Мы стукаліся, прасілі дазволу зайсці ў хату, потым пелі песні. Жадалі дабрабыту гаспадарам, здароўя, добрага ўраджаю. У калядную світу ўваходзіў мядзведзь, каза, правадыр і калядоўшчыкі. Нам давалі, што было: каўбасу, сала, грошы.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Петрашко Лідзіі Лявонцьеўны, 1932 г. н.***
***(нарадзілася ў в. Хадакі Лагойскага р-на),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

Сабіраліся ў кучу. Гулялі «Цярэшкі». Выбіраліся малады, маладая, бацька, маці. Скідваліся па рублю, хто гарэлку, хто закуску прыносіў і гулялі свадзьбу ў мініацюре, шутачную. Некаторыя хадзілі і пелі песні ад хаты да хаты, перадзяваліся ў казу, мядзьведзя. Іх угашчалі хто чым.

Маці смачнейшым карміла бацьку, стол накрывалі сенам, скацерцю, ставілі чугун с куццёй, які стаяў ў куце. Бацька еў первы, потым на следуюшчы дзень кармілі куццёй сабаку і таксама ўсю скаціну, яка мелася ў хазяйстве. Дзеўкі гадалі: абнімалі штакет, калі чот – выйдзе ў гэтым гаду замуж. Таксама нешта на бумажках пісалі, камкалі і потым палілі, нешта глядзелі. З сена, якое клалі пад скацерць, выцягвалі адну саломку і па ёй апрыдзялялі: калі яна длінная – лён нада сеяць, калі кароткая – сеяць беспалезна.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Адамовіча Андрэя Пятровіча (раней пражываў у в. Стаецкія),***
***Новак В. С.***

**Жаніцьба Цярэшкі**

Гуляла моладзь на Каляды сёмага вечарам. Вечарынка была ў хаце. Выбіраюць бацьку і маці. Збіраецца ўвесь люд: і старыя, і малыя і глядзяць. Старога завуць Цярэх, а маці як хто прыдумае: Акуліна, Мальвіна. Бацьку выбіраюць пажызненна і завуць Цярэх. Хоць хто з кута крычыць: «Цярэх, Цярэх, схапі Акуліну ды ў мех». А дзед: «Акуліна валочыцца, жаніцца не хочыцца». Бацькі стаяць у кругу сярод хаты. Бацька пытаецца: «Дзеці, хто з кім хоча жаніць Цярэшку? Па свайму жаланню будзеце жаніцца, ці вас нада акручваць?» Хлопцы крычаць (дзеўкі сарамлівыя былі): «Я Галю хачу браць». Дзеўкі адмаўляюцца. Хлопцы: «Ці ўмееш ты бліны пячы, штаны шыць?» Дзеўкі: «Ці ўмееш ты каня запрагчы?» Бывае, пішуць спісак, хто з кім хоча ісці ў Цярэшку, а бацькі робяць наадварот. Выцягваюць дзеўчыну, з кута хлопца, іграе музыка, пару абкруцяць, старыя пяюць песню ці частушку. Пар многа. Бывае непарная частка. Усіх пакруцілі, пажанілі, састаўляюць сталы, дзеўцы на раздумку даюць мінут трыццаць. Адказваць нельзя, таму што хлопцу пазор. За сталом трэба сядзець з тым, каго выбралі. Дзеўкі нясуць калбасу, сала, пірагі ці бліны. Хлопцы нясуць гарэлку. Усе садзяцца па парам і гуляюць. Бацька з маці сядзяць на куце, дзеўкі, якім не хапіла хлопцаў, сядзяць каля бацькоў. За сталом шуткі. Потым сталы ўбіраюць і танцуюць.

*Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на*
*ад Зімніцкай Рэгіны Васільеўны, 1939 г. н.,*
*студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Савіцкай Ю.*

**Варожбы**

Бралі бумагу, спальвалі яе. Далей высвятлялі, якая выява атрымалася з попелу. Напрыклад, калі нешта падобнае да вяночка, то хутка выйдзеш замуж.

Каб дзяўчына не ведала, маці брала стакан з вадою, лажыла на яго дзве палачкі і ставіла пад ложак. А ў сне дзяўчыне павінен быў прысніцца суджаны, які правядзе яе праз мост.

На Каляды маладыя дзеўкі пеклі бліны, клалі іх на парог. Патом выпускалі сабаку. У якой паслядоўнасці сабака з'ядаў бліны, у такой дзяўчаты выйдуць замуж.

*Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на*
*ад Акуліч Ганны Сяргееўны, 1936 г. н.,*
*студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

**Жаніцьба Цярэшкі**

7 января к вечару «жанілі Цярэшку». Все всегда былі парамі. Дзевушка бярэ закуску, калбаса далжна быць абезацельна ў дзевушкі. Пірагі там, здоба якая. Парэнь ужо квас прыносіў. І абезацельна пары выбіралі. Калі хто адзін быў, так пару выбіралі ужо на самім вечары. Ну вот этыя пары былі цэлы вечар разам. Пачыналі гуляць. Парня і дзевушку абкручвалі вакруг. Іх называлі дзедам з бабай і пелі такую песню хорам:

Ах ты, мой дзядулечка,
Я ж твая бабулечка,
Паіла каня ў вядрэ,
Відзела дзядульку на дне.
Дзед бабі кажух шыець,
А ў бабы весь дух ныець.
Ах ты, мой дзядулечка,
Я твая бабулечка.

*Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на*
*ад Дышлевіч Ганны Рыгораўны, 1932 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

На Рождество люди давали ўсё последнее, што ў каго ёсь. Как багаткі, гаварят, так и рады. Варили обязательно кашу, называлась кутья.

*Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на*
*ад Мінкувіч Антона Антонавіча, 1928 г. н.,*
*Новак В. С.*

Калядныя святы доўжаюцца з 25 снежня да 7-га студзеня. Чакаюць іх з асаблівай радасцю. Каляды – свята агульнаславянскае і святкавалася яно ў гонар сонца. Каляды святкуюцца беларусамі з суправаджэннем разнастайных варожбаў і ўвесяленняў. Каляды адзначаліся на працягу двух тыдняў, з 24 снежня па 6 студзеня. У гэтыя дні па сяле хадзілі пераапранутыя хлопцы і дзяўчаты, якія вадзілі з сабою казу. Яны віталі гаспадароў, жадалі ім шчасця.

Напярэдадні свята, пасля з'яўлення зорак на небе, наладжваюць увечары куццю. Куцця ўяўляе сабой разнастайную посную вячэру. Стол для вячэры ставіцца абавязкова на покуці хаты. На яго спачатку кладуць сена і накрываюць белым абрусам. Калі ўся сям'я садзіцца за стол, то гаспадыня падае па парадку абавязковыя для куцці стравы: селядзец, посную верашчаку, аладкі на алеі, крупнік, аўсяны кісель, вароны гарох у сухім выглядзе.

Накануне Рождества, всё покрыто снегом в эти дни, церкви белокаменной сродни. Глядя на кристально чистый снег, сердцем прозревает человек.

На Каляды ў кожнай хаце абавязкова гатавалі куццю (кашу) з ячных ці пшанічных круп. Загаралася святло ў хаце, уся сям'я садзілася за стол, дзеці мыкалі, рохкалі, кракалі, каб у гаспадарцы скаціна і птушкі вяліся. Загарнуўшы першую лыжку стравы, гаспадар клікаў на куццю мароз, каб вясной не губіў пасевы.

Бегла калядка пяшком, пяшком,
Несла бліны мяшком, мяшком.
Едзя Каляда на канёчку
У маляваным вазочку.

І шла каляда, калядуючы,
Каля двору ішла, ды бядуючы,
За ёй хлопчыкі, усе жабруючы!
– Гаспадынечка – перапёлачка,
У цябе сырнікаў поўная полачка,
А ты нас частаваць будзеш!
– Буду!
– А мы цябе віншаваць будзем
І са святам здароўечкам!

***Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на***
***ад Аўласка Анатоля Іванавіча, 1952 г. н.,***
***Новак В. С.***

На Каляды гатавалі куццю. Першая куцця называлася посная. На стале не павінна быць нічога жырнага, бо ў гэту ноч нарадзіўся Ісус Хрыстос. Калі садзіліся за стол, бацька браў ложку куцці, выходзіў і гаварыў: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці. Не марозь маё збожжа, маю скацінку». Потым браў ружжо і некалькі раз страляў. На стол лажылі сена, пакрывалі белай скацеркай. Калі ўжо паядзім, то выцягвалі саломінку. Калі выцягнеш саломінку с каласком, то гэты год будзе ўрадлівым.

***Запісана ў в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Акуловіч Валянціны Адольфаўны, 1933 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарына Пінчуковай Н., Канцавой М.***

**Варажба**

Заходзілі вечарам у баню, бралі свечку, запальвалі яе, ставілі зеркала адно супраць другога, глядзелі ў зеркала і гаварылі: «З кім мне век дажываць, прыйдзі, пакажыся». Я ўбачыла салдата, ды прыгожага. Праз нейкі час пайшла я па ваду. Набіраю ваду, і падыходзіць салдат, просіць папіць. Эта быў той салдат, якога я бачыла. Мы з ім пажаніліся.

***Запісана в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Дрозд Галіны Антонаўны, 1932 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

Усе хрысціяне спраўлялі Каляды. Ну, адзін раз я помню, да нас прыйшлі валачобнікі. Пелі віншавальныя песні, хвалілі нас, жадалі, каб усяго было.

***Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на***
***ад Паўтарачанка Аляксандры Міхайлаўны, 1948 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

**Гульня «Спраўляць ката»**

Я сама ў «Каце» не ўдзельнічала, яшчэ малая была. А так яны ў вёсцы сабіраліся, няслі хто што можа і складваліся. Ну, а тады танцавалі. Тады такая вечарынка была, і жанілі, як Цярэшку. Выбіралі маладога, маладую, вакол іх танцавалі, пелі. Маладых выбіралі з цех, каторыя ўжо встрэчаліся. І тады вакол іх танцавалі. Вот і кот.

А чаму кот – я не ведаю, можа таму, што гэта было пад март, як каты марцавалі, не ведаю. Мяне туды не прынімалі, там старэйшыя былі. Мы, калі прарвёмся ў гэтую хату, пад ложак залезім і глядзім. А як ужо ўвідзяць нас – за шкірку і вон. А яшчэ спецыяльныя песні пелі, але я іх не ведаю.

***Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на***
***ад Данілевіч Ніны Аляксандраўны, 1938 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

**Каляды**

Пелі калядныя песні, гадалі. Але калядныя гаданні не васпрынімаліся ўсур'ёз. Усё васпрынімалася як гульня. Ну, вот выбежам на двор, у ахапак хватаеш дроў, шчытаеш: 5 – значыць замуж не выйдзеш, 6 – чотнае, то ўжо выйдзеш.

Трэба было ў куратнік зайсці, курыцу ўзяць і ў хату прынесці. Еслі белая курыца – то жаніх бландзін будзе, а калі чорная – то брунэт які.

Вады пад койку ставілі. Паставяць вады, а тады ўжо клалі кладачку і ўжо што сасніш. І вот тока мне прыснілася, што нехта мяне праз ручэй перанёс і пусціў. Яшчэ абсыпаліся канаплямі і казалі: «Сею, сею канапельку на Святую Андрэйку. Дай, Божа, знаць, з кім век векаваць». Гэта казалі на ноч, як спаць лажыліся.

***Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на***
***ад Данілевіч Ніны Аляксандраўны, 1938 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

**Гульня «Жаніцьба ката»**

На «Ката» выбіралі хату. Дагаварваліся: хлопцы – гарэлку, а мы – закуску. Ну, якая тады была закуска, што ў каго было сабіралі, ды і ўсё. У хаце сядзелі толькі са сваёй вёскі, а патом на танцы прыходзілі з другіх вёсак.

Чаму называлі катом, я не ведаю. «Кот» спраўляўся раз у год, пасля пасту, а тады ўжо да следуюшчага. Песні пелі, якія ўмелі. Ката жанілі так: выбіралі нейкую пару, садзілі на кут і вродзе гэта былі маладыя. Ігры розныя былі, але ўжо я забылася.

***Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на***
***ад Казаноўскай Любові Андрэеўны, 1928 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Люди устраивали яркое уличное представление. Обходили дома и пели поздравительные песни и устраивали представление с козой (кто-то переодевался в костюм козы). Коза считалась символом плодородия. Коляды в основном праздник мальчиков и девочек, которые ходят по домам, поют песни и щедруют.

Го-го-го каза,
Го-го-го шэра,
Дзе ж ты, козанька,
Дзе ж ты бывала?
Я ў бару ягадкі брала.

Щёдрики – вёдрики,
Дайте вареника,
Грудочку кашки,
Кусочек колбаски,
Решето овса –
И колядка вся!

Коляд, коляд, колядница,
Добрая с мёдам,
А без мёду не такая.
Дайте, дядька, пятака,
А пятак то мала,
Дайте рубчик золотой!

**Рождественские гадания**

Наугад достать три картофелины, разрезать их пополам. Если все три имеют внутри изъян или гниль – это к тяжёлой болезни.

Если из трёх картофелин гнилые только две – это к разладу в семье.

Если же только одна картофелина гнилая, то это к денежным потерям.

Если все три картофелины внутри чистые и без изъяна – это к долгой и хорошей жизни.

Гадать следует натощак и в одиночестве. Подойти к берёзе, загадать желание и сломать веточку. Посчитать на веточке все почки. Если их число чётное – желание сбудется.

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Яскевіч В. М., 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Курыбінай І.***

**Каляды**

На Каляды хадзілі песні спявалі. Усе гуртом збіраліся. Спявалі пад акном. На Каляды хадзілі толькі ўвечары. Куццю варылі. Адразу посную ці галодную, а потым багатую – на Новы год.

***Запісана ў в. Рэпішча Лагойскага р-на***
***ад Сабалеўскай Алены Пятроўны, 1932 г. н.,***
***Новак В. С.***

На бедную куццю (Ражаство) варылі кашу, на кут ставілі, елі таксама клёцкі з макам. Хадзілі калядаваць, цыганамі пераапраналіся. На першую куццю рабілі ўсякія бясчынствы: вароты кралі і заносілі ў якое-небудзь месца.

На Крашчэнне ваду бралі, свяцілі ў царкве, потым выкарыстоўвалі яе ў розных мэтах. Захоўвалі цэлы год. Калі хавалі чалавека, то гэту ваду лілі на магілку, абмывалі гэтай вадой нябожчыка, пілі наташчак. А на Вялікдзень усё пасвячалі гэтай вадой.

На Каляды варажылі. Адзявала дзеўка насок, а другі ляжаў побач, яна казала: «Суджаны, ражаны, з кім век векаваць, прыдзі насок разуваць». Ставілі стакан з вадой, палачку пасярэдзіне ставілі: хто перавядзе – той будзе суджаны. Абхватвалі ўтрам частакол, калі ў пару – замуж выйдзеш, а калі не – то не выйдзеш. А яшчэ башмак кідалі праз забор. У які бок гляне, у той бок і замуж пойдзеш.

***Запісана ў в. Рэпішча Лагойскага р-на***
***ад Зінькевіч Раісы Пятроўны, 1952 г. н.,***
***Новак В. С.***

На Каляды гатовілі куццю са шкваркамі, лажылі пад абрус сена і ставілі куццю. Патом сабіраліся ўсёй сям'ёй за сталом. Калі ўжэ пасядзім, маці сабірае куццю, што засталася, і дае жывёле. Прыходзілі калядоўшчыкі. Яны ў хату не заходзілі, а стаялі пад вокнамі ў двары. Пелі песні, жартавалі. А мы патом ішлі гадаць. Бралі блін, выходзілі на двор, кідалі блін сабаку. Калі сабака возьме блін, то глядзелі, куды ён пабяжыць, туды і замуж пойдзеш.

Было яшчэ адно гаданне. Бралі тарэлку, на тарэлку ставілі свечку, стакан з вадой, бралі нітку, вешалі абручальнае кальцо, раскручвалі яго на нітцы і гаварылі: «У колькі год я замуж выйду, столькі кальцо і пракруціся». Колькі раз пракруціцца і ўдарыцца аб стакан, у столькі замуж выйдзеш.

*Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на*
*ад Зюзянюк Валянціны Аляксееўны, 1945 г. н.,*
*студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.*

Бліны клалі, сабака падбягаў і чый блін першы возьме, тая дзеўка замуж выйдзе першая. Яшчэ забор абнімалі, калі парнае калічэства досак – то будзеш у пары ў гэтым годзе. Яйцо бралі ў сараі, калі на скарлупе кроў, то адразу захаладае.

*Запісана ў в. Скарады Лагойскага р-на*
*ад Умэцкай Ніньа Антонаўны, 1930 г. н.,*
*Пракопчык Жаны Канстанцінаўны, 1968 г. н.,*
*студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

**Варожбы**

Запальвалі свечку, дзержалі над міскай з вадой, капаў са свечкі ў ваду воск і глядзелі, якая фігура атрымаецца. Па гэтаму вызначалі, ці хутка выйдзеш замуж.

Перакідвалі валёнак праз пабудову: у які бок галянішчам ляжа – там жаніх.

*Запісана ў в. Скарады Лагойскага р-на*
*ад Умэцкай Ніньа Антонаўны, 1930 г. н.,*
*Пракопчык Жаны Канстанцінаўны, 1968 г. н.,*
*студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

**Калядная песня**

Слаўны вечар,
Каляда, каляда!
Добры вечар,
Каляда, каляда!
Паночак, гаспадарочак,
Ці ты спіш, ці не чуеш?
Адчыні акенца,
Паглядзі ў гуменца,
Хто там, што там робіць?
Сам Бог, сам Бог там ходзіць,
Дабро тваё ліча
І цябе ён кліча.
Падарак даець:
Поўны ток жыта,
Жоначцы тваёй –
Шубу да хаты.
Сыночкам тваім –
Ды па коніку,
Ды па коніку,
Ды й па вараненькім.
Дачушкам тваім –
Ды па вяночку,
Ды па вяночку,

Ды й па ружовенькім.
Паночак, гаспадарочак,
Просім не трымаць.
Кароткія ў нас світкі –
Сцюдзёна стаяць.
Нам дар невялікі, –
Рэшата аўса.
Рэшата аўса,
Паверх кілбаса.

Гаспадар, гаспадар, добры вечар!
Дары, дары, хоць і нечым.
Лезь, каза, на паліцу,
Лезь па кілбасіцу.
Лезь, каза, на пол –
Пакажы тапор.
Лезь, каза, на печ –
Пакажы чапец.

***Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на***
***ад Матрашылавай Ганны Сцяпанаўны***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Бурдыка І.***

**Калядная песня**

Пайшла я кароў даіць,
А за мной Давід бяжыць.
Пушчу я даёначку
Давыду ў галёначку.
Адкуль цябе кадук браў,
Нашто ты мне хвартух падраў?
Мне татуська купіў,
Каб Пятруська любіў.

***Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на***
***ад Матрашылавай Ганны Сцяпанаўны***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Майтак М.***

**Раство Хрыстова**

Матка Боска Марыя гаворыць, што Бог нарадзіўся:
Уставайце, пастухі,
Бог наш нарадзіўся.
Прыдзіце да стайні
І там увідзіце младзенца –
Вас Ісус увідзе.

***Запісана ў в. Стрый Лагойскага р-на***
***ад Бабруйскай Алены Францаўны, 1932 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Буцер Н. (2005 г.)***

На Каляды залазілі на гару і клалі ў комін провалаку, каб дым ішоў на хату. Яшчэ была гульня «Карча драць». Лажацца бабы на сена, кладуцца адна і другая, і тады ногі зачэпліваюцца. І каторая каторую пабедзіць.

***Запісана ў в. Стрый Лагойскага р-на***
***ад Крэнь Ганны Канстанцінаўны, 1940 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

**Варажба**

Калі кладзешся спаць, то трэба падставіць пад краваць адзін стакан вады і накрыць салам. І тады ўжо прысняць жаніха.

*Запісана ў в. Стрый Лагойскага р-на
ад Руткоўскай Наталлі Аляксандраўны, 1933 г. н.,
студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

**Калядная песня**

– Го-го-го, каза,
Го-го шэрая,
Дзе ж ты, козанька,
Рожкі падзела?
– На соль праела.
Соль дарагая,
Каза маладая.

*Запісана ў в. Сыраеўшчына Лагойскага р-на
ад Коўзан Надзеі Антонаўны, 1930 г. н.,
студэнткай БДПУ імя М. Танка Войцік А.*

**Жаніцьба Цярэшкі**

Сабіраліся ў першы дзень Раждзяства ў доме ў каго-небудзь. Дагаварываліся з узрослымі, выбіралі бацьку і матку. Патом ішлі на танцы, но толькі па прыглашэнню. Ну, прыязжалі прыглашонныя. Утрам мама мая пела на клерасі ў цэркві. После службы прыглашалі хлопцаў. Бацька з маткай выбіраюць пары па свайму ўсматрэнню. Інагда самі сабе выбіралі пару. Ну, дзеўкі былі свае, з дзярэўні, а хлопцы – прыглашонныя. После сводаў накрывалі сталы, гулялі ўсю ноч. Ну, мне гэта мама ўсё расказвала. Ана гаварыла, што патом былі какіе-то ігры, песні. Я іх ужэ не помню. А патом, як усю ноч пагуляюць – расходзіліся.

*Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на
ад Міхайлоўскай Валянціны Іванаўны, 1930 г. н.,
студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А., Шурмель С. (2008 г.)*

**Варожбы**

Гадалі ад Крашчэння да Раждзяства. Ставілі стакан з вадой з перакладзінай пад краваць. Хто ў сне перавядзёт чэраз перакладзіну ету, той і мужам будзе.

Бралі ахапку дроў з аднаго разу. Патом шчыталі. Еслі астанецца дзве бервяніны, то ў пары будзеш, а еслі адна, то не.

З лучынак дзелалі калодзеж, а на яго вешалі маленькі замочак. Кагда лажыліся спаць, прыгаворвалі: «Міленькі мой, суджаненькі, прыдзі ка мне, замочак адкрый. Мяне пацэлуй».

*Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на
ад Міхайлоўскай Валянціны Іванаўны, 1930 г. н.,
студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А., Шурмель С. (2008 г.)*

**Каляды**

Свята ёсць свята. Гармошку бралі з сабой, хадзілі па хатах. Адзяваліся ў казу. Насілі звязду на палцы. Песні пелі. Хто як падмажыцца, падкрасіцца, адзежу надзене. Угашчалі: яйкі, скварку, чарку. Чалавек хадзіў з торбай, сабіраў. Потым збіраліся ў другой хаце і дзялілі.

*Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на
ад Бартко Аляксандра Іванавіча, 1927 г. н.,
Бартко Рэгіны Антонаўны, 1929 г. н.,
студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А.,
Шурмель С., Булахавай М. (2008 г.)*

**Варажба пад Новы год**

Перад Новым годам пяклі аладкі і клалі на парог. А потым прыводзілі ў хату сабаку. Яна абнюхала ўсе аладкі. А потым першую ўзяла аладку адной з дзяўчат і з’ела. Дык праўда. Хутка тая замуж пайшла. І я веру, што сабака – добры варожбіт.

А на куццю дровы насілі. Трэба было, каб у пару, тады замуж пойдзеш. А калі не ў пару, тады ў дзеўках яшчэ год прасядзіш.

Была такая яшчэ варажба. Хадзілі пад вокны. І там слухалі. Калі пачуеш «сядзі», то ў гэтым годзе яшчэ замуж не пойдзеш, а калі «ідзі» ці штось падобнае, то выйдзеш замуж у гэтым годзе.

*Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на*
*ад Вярбіцкага Антона Пятровіча, 1937 г. н.,*
*Вярбіцкай Раісы Міхайлаўны, 1932 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Домiным А. (2008 г.)*

**Сачэльнік**

Вясёлае ўрэмя было. Не як цяпер. Гатавалі стол, смачнасці ўсякія, каўбасы, квас, пірагі. Дом украшалі. А чым весела было? Дык гулялі, пелі, падшучвалі над суседзямі. Забор разбяром ці лаўку, ці дровы з навесу параскідваем па двару.

Гадалі многа. Кідалі чэраз плот валёнак. Куды насок пакажа, у той старане і муж будушчы жыве. А ешчо бралі блін і з гэтым блінам беглі на перакростак. А пакуль беглі, адкусвалі, і называлі мужчынскія імёны. Гаварылі, якое імя будзе на перакростку, так і мужа будуць зваць.

*Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на*
*ад Зіневіч Настассі Яўгенаўны, 1931 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А., Шурмель С. (2008 г.)*

**Каляды**

Заўсёды перад куццёй пост (калядны пост). Першая куцця – абыкнавенная. Перад Новым годам была другая куцця – багатая. Трэцяя куцця – перад Вадохрышчам. Свяцілі ваду. Свяцонай вадой потым палівалі агарод і давалі жывёле. Гэтая вада не мутнела. Гэтай вадой лячылі хворых дзяцей. На стол слалі сена, а потым скацерць. Потым гэта сянцо аддавалі скаціне. На другую куццю першую скавараду аладак выкладвалі на парог і пускалі сабаку. Вось, калі сабака хопіць аладку, то тая дзеўчына выйдзе замуж. Таксама лезлі на чардак. Там паляць дзве свечкі і ставяць зеркала. Заўсёды сядзеў адзін чалавек. Калі ў зеркале быў відзен гроб, то чалавек скора памрэ, а калі чалавек – выйдзе замуж, або ажэніцца.

*Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на*
*ад Гуніч Ніны Іванаўны, 1913 г. н.,*
*Новак В. С.*

**Жаніцьба Цярэшкі**

Збіраліся ў адной хаце. Зносілі ўсё, што ў каго ёсць. Заўсёды збіралася шмат моладзі. З маладых падбіралі пару, садзілі іх побач, нараджалі і жанілі. Спявалі песні і гулялі ў гульні.

*Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на*
*ад Гуніч Ніны Іванаўны, 1913 г. н.,*
*Новак В. С.*

Варылі кашу пярловую. Цёрлі ў кашу каноплі з макам. За сталом усе сядзелі ўместе. Клікалі: «Мароз, мароз, хадзі ў нашу хату куццёй частавацiся». Пачынаў першым кушаць куццю бацька, а патом усе астатнія.

*Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на*
*ад Вашкевіч Ганны Іосіфаўны, 1934 г. н.,*
*Новак В. С.*

**Сачэльнік**

Ой, к сачэльніку, к 6 января, мы ўкрашалі хату. А затым рыхтавалі стол. Там пяклі многа чаго. Самае інтарэснае, што ў гэта свята мы падшучвалі над саседзямі. Закідвалі дзеравяшкамі

ўхадныя дзверы, а другі раз з прыгрэбніку дровы выкідвалі і раскідвалі па ўсём двары. Песні пелі, у ігры гулялі. Прыгаворы нейкія шапталі, толькі я іх ужо не помню. Гадаць добра было ў палунач. Я ўсягда ішла да калодца і слухала, закапает вада, ці не. Кідалі праз вярэю валёнкі, куды насок стане, там і любоў знойдзеш. Хадзіла я не адна, а з падружкамі. Хлопцаў не бралі з сабою. Мамка мая казала, што раньшэ хадзіла на «кресты», ну гэта значыць перакростак. Толькі не ведаю для чаго.

***Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на***
***ад Шаршунь Ніны Канстанцінаўны, 1940г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Булахавай М., Шурмелем С., Атрохавай В. (2008 г.)***

Пасцяць 3 дні. Куццю варылі з кашы пярловай. Збіраліся гуртам і слухалі пад акном – ці знайдзеш ты сабе каханне. Слухалі, ў якім баку сабака брэша, туды і пойдзеш замуж. Гадалі так. Збіраліся ў кучу дзеўкі. Потым аладкі ложым ў адну кучку, потым пусціць сабаку. Якую першую з’есць ладку, тая дзяўчына первей выдзе замуж. Пяклі ката. Збіралася моладзь. Дзяўчаты прыносілі закуску, а хлопцы гарэлку. Пяклі ката, а потым яго вешалі на нітачку.

***Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на***
***ад Бынкошскай Ганны Пятроўны, 1938 г. н.***
***Новак В. С.***

**Варожбы**

Дзеўкі ўсе выбягалі і абдымалі забор з завязаннымі глазамі. Калі ўхопіш пару, то і будзеш хутка ўпары з хлопцам.

Бралі дровы і неслі ў хату. Калі ўпару – то хутка замуж пойдзеш.

Кідалі валёнка за забор. Куды глядзіць нос, туды і паказвае на каханне тваё.

Плавілі манету алавяную, гэта олава капала ў ваду. Я выглядзела вянок – і хутка свадзьбу згулялі.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Алены Ігнатаўны, 1923 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

Плавілі на відэльцы манетку алавяную. Гэта капала ў ваду, дык усе глядзелі, што там паказвае ў вадзе гэта.

Сабакам аладкі давалі. Каторую перш схваця – тая першаю пойдзе замуж.

Мае сыны, калі маладыя былі, дык зносілі вароты да дзевак (так быстрэй яны пасватаюцца да гэтых дзевак).

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Мігунька Ганны Пятроўны, 1937 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

**Калядкі**

Перад Калядкамі мы не хадзілі на танцы шэсць нядзель, пасцілі. Перад Калядкамі нільзя было хадзіць. Тады прыходзюць Каляды. Дзяўчаты калбасу нясут, хто што імея. Нясём закуску. А хлопцы водачку, самагоначкі і тады гулялі ўжо, пяём, гуляім, танцуім, другіх прыглашалі. Вот, калі ў дзевачкі ёсць хлопец, то яна яго прыглашае, а хлопец – дзевачку, калі ёсць. Зваўся ў нас «Кот». Будзем гуляць ката.

І прыдзя і каза, і Каляды тожа. А маладыя ходзяць, скача каза, прымаўкі там. Прыпеўкі пяе, а казе ж нада заплаціць. Яна ж дарам не скача, хто што мее, тое дась. Хто канфет, хто бутылачку аджалея, як ёсь. А хто калбасу дасць, а яны ўсяму рады. Паскачуць і пойдуць.

Толькі казу ў нас вадзілі. Толькі каза скача і на гармошачцы іграюць.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Пустаход Ніны Віктараўны, 1929 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Домінам А. (2008 г.)***

**Варожбы**

Варажылі мы так: перакідвалі бот цераз вароты і глядзелі, куды носам ляжыць, там і суджаны жыве.

Хадзілі пад чужыя вокны і слушалі, што там гаварылі. Еслі гаварылі «ідзе, хадзіў, ехаў і г. д.» – дык скора замуж пойдзеш. А еслі гаварылі «сядзі» – то няскора замуж.

Пяклі бліны і давалі сабаку. Чый блін першым схопіць сабака, тая хутчэй за ўсіх пойдзе замуж.

Гадалі на чардаку. Нада было залезці на чардак у 12 гадзін (ноччу). І доўга глядзець у зеркала. І так я ўбачыла свайго будушчага мужыка.

Хлеб трэба лажыць пад падушку. Тады мілага саснеш.

А на следуюшчы дзень мы разнасілі запіскі-запрашэнні на танцы, яны ў нас называліся вечарыны. Усе сабіраліся ў адной хаце і скакалі пад гармонік.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Булыга Надзеі Пятроўны, 1935 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

**Каляды**

У нас было дзве куцці: бедная і багатая. На бедную куццю клалі на стол сена, не на сам стол, а на кут стала, і ставім посную кашу. А на багатую – накрывалі добры стол.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Булыга Надзеі Пятроўны, 1935 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

**Варажба на Каляды (куццю)**

Яшчэ было гэта на куццю. Маладому хлопцу, калі не баісся, у двінаццаць часоў пайсці ў баню, узяць камень з каленкі. Камень прынесці там, дзе сабіраліся. У нас гэта было, што ты схадзіў, не пабаяўся ў бані чарцей. Чарцей баяліся. Дык вот, хто не баіцца, свабодна пойдзеш, возьмеш і выйдзіш. Гэта, каб праверыць храбрасць. У нас было. Там, у садзе стаяла баня. Яна як абшэственная была. Вот туда хадзілі. А цёмна ж там. І самому прыходзілася раз. Ну і што. Пайшоў, узяў каменьчык і прыйшоў назад. І потым кінуў у снег. Во, табе. Яно ж, відаць, укапцеўшы. А ета ж снег.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Пустахода Аляксандра Сямёнавіча, 1930 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Доміным А. (2008 г.)***

**Варажба на Каляды (куццю)**

На Каляды кідалі цераз браму бацінкі. І куды нос будзе глядзець, туды ты замуж пойдзеш. Брама – вароты высокія з перакладзінаю зверху.

Тады ідзём і дровы носім, ці ў пару. Калі ў пару, замуж выйдзеш, еслі ўлішку, то не пойдзеш замуж.

На волава вылівалі, каму цвяток, значыць гэта замуж пойдзя. А бывае пахожа на крэст, дык тады ўжо плакала ета дзеўка, што памрэ. Гадалі. Ці волава, ці воск грэіш, кінеш, а табе над галавой на ваду пліcь, выльюць і што там выльіцца, плюхніш у ваду.

Вот так гадалі, варажылі.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Пустаход Ніны Віктараўны, 1929 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Доміным А. (2008 г.)***

**Гульня «Цярэшка»**

На другі дзень Каляд Цярэшку жанілі. Выбіралі чужых бацьку з маткай. Наймалі музыку, ішлі дамоў да каго-небудзь. Хлопцы неслі гарэлку, а дзеўкі – закуску. Абязацельна на стале – калбаса, скварка. Гралі «Цярэшку». Казалі: «Цярэшка валочыцца –жаніцца хочацца». Выбіралі пары. Хто з кім не хоча – уцякалі. Патанцуем – ідзем за стол. Гулялі да ўтра.

***Запісана ў в. Чырвоная Зара Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Сафіі Карлаўны, 1940 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Сяргейчавай В. (2000 г.)***

### Варожбы

На куццю перад Ражаством, калі з'ядалі куццю і аставаліся ж крупы, тады гэтыя крупы збіралі і курам давалі, каб куры вяліся і нікуды не ішлі.

У 12 часоў ночы на Каляды ставіла зеркала і свечку так, каб і ў зеркале была тая свечка. І каго ўбачыш, той і суждзёны.

***Запісана ў в. Штанюкі Лагойскага р-на<br>ад Крэнь Марыі Станіславаўны 1938 г. н.,<br>Новак В. С.***

### Каляды

Каляды – гэта бальшы празнік. Хадзілі ў цэркаў. І свенцюць. Куццю варылі перад самымі Калядамі, яна была посная – 24 дзекабра. А на Каляды – 25, ужо елі ўсё. Стол свяцілі. Была ўсяночная і ўсё, што на стале, свяцілі. А на куццю варылі ячную кашу, мак цёрлі, саладзілі і запраўлялі толькі гэтым макам. А пасля Каляд ужо была багатая куцця. На Каляды сенам стол засцілалі, каб скаціна вялася. Яго пасля аддавалі кароўцы. Гадалі ў гэты час. Бралі кружку вадзічкі, ставілі пад кравper, кладачку лажылі. І хто ўжо прысніцца ўначы, праходзіць чэраз гэту кладачку, той і твой суджаны.

***Запісана ў в. Штанюкі Лагойскага р-на<br>ад Крэнь Марыі Станіславаўны 1938 г. н.,<br>Новак В. С.***

### Калядная песня

*Калі ўваходзяць у хату:*<br>
Добры вечар, пане гаспадару.<br>
Ой, там на Йардане цэрква стаяла.<br>
Ой, Божая маці сына ражала.<br>
Ой, нарадзіўшы, яго ў рэчцы купала.<br>
Ой, з усходам сонца прыехалі тры дары.<br>
Ой, першы дар, то Хрыстова Ражжаство.<br>
Ой, другі дар – святое Васіля,<br>
А трэці дар – да святое Хрышчэнне.

***Запісана ў в. Юркавічы Лагойскага р-на<br>ад Дастанка Ніны Сцяпанаўны, 1927 г. н.,<br>студэнткай БДПУ імя М. Танка Дастанка А.***

### Кот

Пасля Каляд «Ката» гулялі. Збіраліся хлопцы, дзеўкі. Заўсёды збіраліся ў адной хаце. Запрашалі музыкантаў, дзяўчаты гатавалі закуску. Выпякалі ката, а потым гулялі ў розныя гульні і танцавалі, пелі.

***Запісана ў в. Дзераўно Лагойскага р-на<br>ад Савіцкай Ганны Мяфодзьеўны, 1933 г. н.,<br>Новак В. С.***

### Кот

Збіраліся гурбой у адной хаце. Дзяўчаты ладзілі закуску, а хлопцы гарэлк. Былі і музыканты. Танцы і спевы былі да ўтра. Раней выпякалі на гэты дзень булкі, а пазней ужо не пяклі. На гэты дзень збіралі ўсё, хто дасць: халоднае, рэпа, каўбаса, хлеб, сала, свініна.

***Запісана ў в. Дзераўно Лагойскага р-на<br>ад Рудкоўскай Алены Мікалаеўны, 1928 г. н.,<br>Новак В. С.***

Ката спраўлялі зімой пасля Каляд. Выпякалі пірог. Збіраліся ў адной хаце ўсе хлопцы і дзяўчаты і гулялі. Пелі песні і танцавалі.

***Запісана ў в. Зарэчча Лагойскага р-на***
***ад Шавель Алены Уладзіміраўны, 1943 г. н.***
***Новак В. С.***

У нас на Каляды была гульня «Жаніцьба Цярэшкі», а таксама гулялі ў «Ката». Хлопец дружа з дзеўкай, сабіраецца маладзёж толькі, поўна хата найдзе. Хто надумаўся жаніцца, то таго ўжо жаніць і будуць.

***Запісана ў в. Рудня Лагойскага р-на***
***ад Грось Алены Казіміраўны, 1940 г. н.,***
***Новак В. С.***

Збіраліся ў любое врэмя, каб пасядзець, пагуляць, зрабіць ката (выпякалі пірог), куклу. Гуляць збіраліся ў адну хату. Зносілі ўсё, што ў каго ёсць, а потым елі. Рабілі вечарыну і гулялі ў розныя гульні.

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на***
***ад Гуніч Ніны Іванаўны, 1913 г. н.***
***Новак В. С.***

**Гульня «Спраўляць ката»**

Быў такі нейкі перыяд, недзе 8 сакавіка. І вот збіраліся хлопцы і дзяўчаты ў адной хаце і гэта называлася «Спраўляць ката».

***Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на***
***ад Паўтарачанка Аляксандры Міхайлаўны, 1948 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

**Хрышчэнне**

Мы на Крышчэне проруб рубілі. Праўда, не купаліся. Збіраліся кампаніяй, брасалі ў калодзец, ну а чашчэ, канешне, у проруб крыжыкі маленькія, здзеланыя з дзерава. Свяцонай вадзічкай крэст-накрэст брызгалі хату, сарай са скацінай, дрывотню, пограб.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Зіневіч Настассі Яўгенаўны, 1931 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А.,***
***Шурмель С., Булахавай М. (2008 г.)***

О, на Крышчэнне проруб рубілі. Купаліcь у ім. Сабіраліся ўсе маладыя і кідалі ў проруб ці калодзеж дзірывянныя крэсцікі. Матка мая пекла крэсты. Самі іх елі і скаціне давалі, каб не хварэла. Свяцонай вадой брызгалі крэст-накрэст усю хату.

***Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на***
***ад Шаршунь Ніны Канстанцінаўны, 1940 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Булахавай М.,***
***Шурмелем С., Атрохавай В. (2008 г.)***

**Масленіца**

Пяклі варэннікі ці бліны. А часцей за ўсё бліны. Гэтыя бліны мазалі мёдам або варэннем і частаваліся імі.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Шуркевіча Рыгора Станіслававіча, 1930 г. н.***

На Масленіцу мая маці пекла бліны і смазвала іх маслам. Яны былі жоўценькія, пахожыя на сонца. Потым сабіраліся з дзяўчатамі, пелі песні, каталіся з горкі. Былі розныя гульні:

хлопцы лазілі на стаўбы, дзе была каробка з падарункамі. Потым рабілі чучала і спальвалі яго, насілі па дзярэўні, тым часам пелі песні. Малыя і моладзь выскаквалі з хаты і хадзілі з намі.

***Запісана ў в. Закалюжжа Лагойскага р-на***
***ад Емяльянавай Надзеі Пятроўны, 1937 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

Пяклі бліны. На другі дзень Масленіцы, на бліны сыпалі арэхі, каб смачней было.

***Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на***
***ад Ліс Марыі Андрэеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

На Масленіцу бліны пяклі. Чучала дзелалі, наражалі па-ўсякаму. Усе сабіраліся. Пелі песні, вадзілі карагоды, танцавалі кадрыль.

Чучала зжыгалі, лічылі, што зжыгалася ўсё плахое; прызыў да новага, лепшага.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на***
***ад Шыла Лідзіі Нікіфараўны, 1937 г. н.,***
***(раней пражывала ў Віцебскай вобл.)***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Палілі кастры, пяклі бліны, вадзілі карагоды, палілі чучала. Гэта значыць, што зіма адыходзіць, а вясна прыходзіць. Каталіся з горкі.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Петрашко Лідзіі Лявонцьеўны, 1932 г. н.***
***(нарадзілася ў в. Хадакі Лагойскага р-на),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

Перад Масленіцай ідзе пост. Во время Масленіцы ядзяць сыр, масло, малоко. Існавала такая прыкмета, што, еслі дзяўчына да 20 гадоў не выйшла замуж, яе павінны былі злавіць і завязаць ей калодкі, а потым яе павінен быў выкупліваць хлопец нежанаты. Каталіся на канях. Грала гармошка. Пелі песні. Яшчэ каталіся на санях. Пяклі бліны.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Аўсейкі Валянціны Дзям'янаўны, 1937 г. н.***
***Новак В. С.***

На гэта свята ўсе пяклі смачныя бліны, хадзілі на кірмаш, каталіся з горак на санках, спявалі песні, вадзілі карагоды, палілі чучала.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Арцем'евай Ліліі Васільеўны, 1939 г. н.***
***(раней пражывала ў в. Слабада Лагойскага р-на),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

На Масленіцу маладзёж разбівалася на пары. І вот хто там ужо каго кахае. Вродзе бы яны і жаніцца далжны былі. Спявалі розныя песні, гулялі. Чучала ў нас не палілі, а палілі толька на Купалле.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Мароз Надзеі Фацееўны, 1925 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

В этот день пекут блины, едят их и других угощают, а так же блины заговаривают, делают через них приворот. Привороты на блинной неделе самые крепкие во все дни. Масленица справляется за 7 недель до Пасхи. На Масленицу катались на качелях, закапывали молодых

в снег, обсыпались снегом, сжигали чучело. Готовили и специальную обрядовую еду – сырницу (творог с маслом, делалось слоями).

Жавароначкі, прыляціце,
Вясну красную прынясіце,
Каб сонейка засвяціла…
Выйдзі, выйдзі і песеньку заспівай нам, веснянку.
Зімувалі, не співалі, вясну дожідалі.

Игра: С каждой стороны по двое – «Конь и Всадник».

Думаю, ещё в школе все в неё играли. Нужно было свалить противника на землю. Очень много от « коня» зависит.

Понедельник – встреча,
А мы Масленицу встречали,
Повстречали, душа, повстречали,
На горушке побывали,
Блином гору выстилали,
Сыром гору набивали,
Маслом гору поливали,
Поливали, душа, поливали.

Масленица – мокрохвостка!
Приезжай домой со двора,
Отошла твоя пора!
У нас с гор потоки,
Заиграй овражки,
Выверни оглобли.
Весна – красна,
Наша ладушка пришла!

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Яскевіч В. М., 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Курыбінай І.***

Перад пастом збіраліся гурбой, гулялі да 12 гадзін вечара. Запрагалі каней і каталіся па ўсёй вескі, спявалі песні, гулялі ў розныя гульні. Палілі касцёр і вадзілі харавод вакол.

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на***
***ад Гуніч Ніны Іванаўны, 1913 г. н.,***
***Новак В. С.***

Перад пастом было загавенне на мяса, а затым малочная нядзеля, толькі малочнае разрашалася – дык вось Масленіцай і называлася. І елі толькі малочнае ўсё – гэта загавіны на пост.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Залуцкай Таццяны Міхайлаўны 1922 г. н.***
***Новак В. С.***

Дужа весела празнавалі. Ішлі ў канец дзярэўні ды каталіся з гары на ледзянках. Але ў нашай дзярэўні нічога не жглі. Мала тут людзей было. А во ў суседняй, там мой брат, добра палілі. А мы, маладыя, збярэмся ды папяём частушкі.

***Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на***
***ад Шаршунь Ніны Канстанцінаўны, 1940г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Булахавай М., Шурмелем С., Атрохавай В. (2008 г.)***

# ВЕСНАВЫЯ АБРАДЫ, ЗВЫЧАІ І ПЕСНІ

## Гуканне вясны

### Веснавыя песні

Ах ты, вясна, ты красна,
Ах, ты к нам прышла?
Чаго к нам прышла?
Што нам прынясла?
Жанюшачкам – па братачцы,
Мужчыначкам – па сошачцы,
Старым бабкам – па кіёчку,
Маладым жанкам – па сыночку.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Макей Марыі Феліксаўны, 1910 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Макей І. (1992 г.)***

Мы вясну гукалі так: маці пякла пцічак і ў адну пцічку лажыла манету. Хто гэту птушку з манеткай знойдзе, той увесь год будзе шчаслівы. Потым маці заходзіла на гару і крычала: «Дзеці, дзеці, хадзіце шукаць вясну!»

Потым на гэтай гарэ палілі featpoзнае смецце, а дзеткі маленькія каталіся на арэлях, а потым узрослыя хоць раз так жа павінны пакатацца на арэлях, штоб здаровыя былі.

***Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на***
***ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

А ў горадзе за клеткаю
Вясна-красна на ўвесь свет.
Стаіць роза і з кветкамі,
Вясна-красна на ўвесь свет.
А да той розы чорна сцежачка,
Вясна-красна на ўвесь свет.
А тудой ішла молада дзевачка,
Вясна-красна на ўвесь свет.
А яна тую розу пашчыпала,
Вясна-красна на ўвесь свет.
К свайму ліцу меркавала,
Вясна-красна на ўвесь свет:
– Каб маё ліцо такое было,
Вясна-красна на ўвесь свет.
Як гэтая роза чырвоная,
Вясна-красна на ўвесь свет,
Чырвоная і буйная,
Вясна-красна на ўвесь свет.
Не пайшла ж бы я ні за кога замуж,
Вясна-красна на ўвесь свет.
Ні за селяніна, ні за двараніна,
Вясна-красна на ўвесь свет,
А пайшла б я за такого пана,
Вясна-красна на ўвесь свет,
Што з коніка не ссядая,
Вясна-красна на ўвесь свет.
Перад панам ня клоніцца,
Вясна-красна на ўвесь свет,

Мне моладзе знадобіцца,
Вясна-красна на ўвесь свет.

***Запісана ў в. Баяры Лагойскага р-на***
***ад Ярчак Надзеі Гаўрылаўны, 1922 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляшчун Н.***

Цягалі ў калодках ваду. Вакол калодкі вадзілі хараводі пелі веснавыя песенкі аб уражаі і добрым надвор'і.

***Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на***
***ад Ермановіч Марыі Сцяпанаўны, 1925 г. н.,***
***Новак В. С.***

А ў полі ў чысценькім,
Вясна-красна на ўвесь свет!
Стаіць шацёр бялюсенькі.
Пад тым шатром сам Бог з Пятром,
Сам Бог з Пятром, усе празнічкі,
Усе празнічкі, усе святачкі.
Сталі ж яны шчытаваціся,
Шчытаваціся, радаваціся.
– Каго нету?
– Святое Міколы.
– Каму ехаць Міколу шукаці?
– Пятру ехаць Міколу шукаці.
Пятро кажа: «Я каня не маю,
Яшчэ к таму, Міколы не знаю».
– Юр'ю ехаць Міколу шукаці.
А Юр'я кажа: «Я каня маю і Міколу знаю».
Толькі Юр'я на коніка –
Аж Мікола ў вароцікі.
– Здароў, здароў, святое Мікола,
Дзе Мікола прыбывала?
– Па саду хадзіла, пчолак вадзіла,
Па полі хадзіла, пшонку радзіла,
Па лесе хадзіла, ножкі расіла.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

Гаспадынька,
Зялёны явар, кудравы!
Маладая,
Уставай рана,
Мыйся бела,
Бяры ключы
Залатыя,
Ідзі да хлява,
Запры дзверы.
У тваім хляве
Праявачка
Явілася:
Сорак кароў
Цялілася.
Гаспадынька

Маладая,
Уставай рана,
Мыйся бела,
Бяры ключы
А залатыя,
Ідзі да хлява,
Запры дзверы.
У тваім хляве
Праявачка
Явілася:
Сорак свінак
Парасілася.
Гаспадынька
Маладая,
Уставай рана,
Мыйся бела,
Бяры ключы
А залатыя,
Ідзі да хлява,
Запры дзверы.
У тваім хляве
Праявачка
Явілася:
Сорак авечак
Акацілася.
Гаспадынька
Маладая,
Уставай рана,
Мыйся бела,
Бяры ключы
А залатыя,
Ідзі да хлява,
Запры дзверы.
У тваім хляве
Праявачка явілася:
Сотня курак
Апладзілася.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

Між клеткамі, між новымі,
Эй, то-то, да між клеткамі,
Ло-ло, між новымі, ло-ло!
Расце рожа чырвоная,
Эй, то-то, да расце ружа,
Ло-ло, чырвоная, ло-ло!
Туды бегла красна панна,
Эй, то-то, да туды бегла,
Ло-ло, красна панна, ло-ло!
Вышчыкнула з ружы кветку,
Эй, то-то, да вышчыкнула,
Ло-ло, з ружы кветку, ло-ло!
Раўнявала к свайму лічку,

Эй, то-то, да раўнявала,
Ло-ло, к свайму лічку, ло-ло!
– Каб такое ліцо было,
Эй, то-то, да каб такое,
Ло-ло, ліцо было, ло-ло!
Як гэтая з ружы кветка,
Эй, то-то, да як гэтая,
Ло-ло, з ружы кветка, ло-ло!
Не пашла б я за селяніна,
Эй, то-то, да не пашла б я,
Ло-ло, за селяніна, ло-ло!
Да пашла б я за двараніна,
Эй, то-то, да пашла б я,
Ло-ло, за двараніна, ло-ло!
Ён коніка асядлае,
Эй, то-то, да ён коніка,
Ло-ло, асядлае, ло-ло!
Па постаці паязджае,
Эй, то-то, да па постаці,
Ло-ло, паязджае, ло-ло!
Каньчука з рук не пускае,
Эй, то-то, да каньчука,
Ло-ло, з рук не пускае, ло-ло!
Сорак работ прыганяе,
Эй, то-то, да сорак работ,
Ло-ло, прыганяе, ло-ло!
У селяніна з постам бацвінне,
Эй, то-то, да ў селяніна,
Ло-ло, з постам бацвінне, ло-ло!
А ў двараніна арэх, саланіна,
Эй, то-то, а ў двараніна,
Ло-ло, арэх, саланіна, ло-ло!
Ён без порцы есць не сядзе,
Эй, то-то, да ён без порцы,
Ло-ло, есць не сядзе, ло-ло!
Без дзеўчыны спаць не ляжа,
Эй, то-то, без дзеўчыны,
Ло-ло, спаць не ляжа, ло-ло!

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

Добры вечар, панна!
Ці здрова, васанна?
Да віно ж, віно зеляно!
Калі спіш, прабудзіся,
Калі не спіш, да нас адзавіся.
Да віно ж, віно зеляно!
Прасі, паненка,
Да нас пад акенка.
Да віно ж, віно зеляно!
Мы панну відзелі,
Сабе ў густ удзелі.
Да віно ж, віно зеляно!
Пакуль да паненкі дапыталі,

Свае боты патаптали.
Да віно ж, віно зеляно!
Даруй, даруй нас, паненка,
Наша даравізна невялічка:
Да віно ж, віно зеляно!
Чырвоны злоты
Нам на боты.
Да віно ж, віно зеляно!
Паўзалатоўкі
Для нас на падкоўкі.
Да віно ж, віно зеляно!
У нядзелю рана
Уставай, панна.
Да віно ж, віно зеляно!
Бела умывайся,
Харашо ўбірайся.
Да віно ж, віно зеляно!
Харашо ўбірайся,
Гасцей спадзявайся.
Да віно ж, віно зеляно!
Прыедуць госці
З чужой валосці.
Да віно ж, віно зеляно!
Адзін на булану,
Другой на каштану.
Да віно ж, віно зеляно!
Трэці на мышастым,
Сам архірасты.
Да віно ж, віно зеляно!

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

У роўным полі авёс расцець,
А ў тым аўсе белы камень.
На камні сакол сядзіць.
Вышаў, вышаў красны панічык,
Красны панічык, што млоды Ясек,
Меціць стрэліць, сакала забіць.
– Не бі, не бі, млоды Ясеньку,
Я то скажу да тры радасці:
Адна радасць – бацькі слухаць,
Друга радасць – цару служыць,
Трэцяя радасць – жаніціся.
Бацькі слухаць – збавен будзеш,
Цару служыць – славен будзеш,
Жаніціся – багат бадзеш.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

Казалі, калі на Саракі капае с крыш, то будзе вясна скора. Саракі – пагоня снег да ракі.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

**Веснавая песня**

Хадзіла курка па сенажаці,
Вадзіла за сабой
Пяцёра дзетак.
Адзін – Ілля, другі – Мікола,
Трэці – Іван, чацвёрты – Адось,
Пяты – Сцяпан.
Першы – крывыя ногі –
Жар выграбаць.
У другога – кудравая галава –
Печ вымятаць.
У трэцяга – рэдкія зубы –
Кісель цадзіць.
У чацвёртага – страшны твар –
Людзей пужаць.
У пятага – сінія вочкі –
Дзевачак выглядаць.

*Запісана ў в. Пушча Лагойскага р-на*
*ад Усянцовай Марыі Майсееўны, 1927 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Бурдыка І.*

**Благавешчанне**

Свята значнае і вялікае. У гэтае свята нельга было працаваць. Птушка ў гэты дзень не ўе гнязда. Адзін чалавек не паслухаўся і запрог каня, а потым паехаў працаваць. Неба ў той дзень было яснае, але потым набеглі тучы і ўдарыў пярун. Пярун забіў каня, а гаспадар застаўся жывы.

*Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на*
*ад Гуніч Ніны Іванаўны, 1913 г. н.,*
*Новак В. С.*

**Вербная нядзеля**

Свячоную вярбу ў хату прыносілі ад пажару. Каб не балелі каровы на ўрокі, бралі вярбу свечаную і выганялі іх у поле.

*Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на*
*ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,*
*Новак В. С.*

Сімвал – ветачка вярбы.
Калі Ісус уяжджаў на асле, яму кідалі пальмавыя веткі, а ў нас – вярба.

*Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на*
*ад Закрэўскага Івана Аляксандравіча, 1931 г. н.,*
*студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)*

Вербачкай свянцонай дзяцей сцёгалі і казалі:

– Верба б’е, не я б’ю
Ад усякіх напасцей,
Ад усякіх няшчасцей,
Ад усякіх языкоў,
Ад усякіх глаз.

*Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на*
*ад Бондар Тамары Еўдакімаўны 1929 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А., Шурмель С. (2008 г.)*

## Пасты

Вялікі пост – перад Паскай 7 нядзель. Перад Раждзяством 6 нядзель.

Петроў пост. Ён завісіт ад Паскі і Троіцы (Сёмухі). Троіца – чэраз 7 нядзель после Паскі. Ну а Петроў пост – чэраз недзелю после Троіцы.

Успенскі пост дзеліцца на дзве нядзелі. Он строгій, как і Велікій. Он начынаецца 14 аўгуста, перад Успеніем Багародзіцы. Ой, калі ж ён? 28 ці 29 аўгуста. Ой, Госпадзі, забыла!

Ва ўсе пасты нельзя было есці жывотную пішчу, жывотныя жыры. У цэркві бярэцца благаслаўленне на пост. Еслі хто-та не можэт выдзержаць строгі пост, он спрашывает разрышэння ў цэркві.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Міхайлоўскай Валянціны Іванаўны, 1930 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А., Шурмель С. (2008 г.)***

## Вялікдзень

Перад Паскай клалі яйцы ў хрышчоную воду, потым гэтай вадой умываліся дзеці. Еслі оні ўмоюцца гэтай вадой – будуць здаровымі. Дзеці хадзілі па яйкі. Гулялі ў біткі. Чыё яйцо застанецца крэпкім, той атрымоўвае канфеты.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Анішкевіч Анжэлы Усеваладаўны, 1964 г. н.***
***Новак В. С.***

Красілі яйкі ў чырвоный колер. Ігралі на ўбіткі. Хто выйграе, таму даюць прызы. Звычайна давалі гарэлку, канфеты. У гэты дзень валачобнікі хадзілі і пелі песні пад акном.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Смаляка Алеся Мікалаевіча, 1937 г. н.***
***Новак В. С.***

А як фарбавалі? Канечне ж, у чырвоны колер. Паску выпякала мая мамка, яна была вельмі смачная. Ігралі з дзецьмі ў біткі, чыё яйцо крапчэйшае, той і выйграў.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Шуркевіча Рыгора Станіслававіча, 1930 г. н.***
***Новак В. С.***

Вялікдзень мы святкавалі наступным чынам. Хадзілі па хатах, пелі валачобныя песні, віншавалі. Кожны з гаспадароў імкнуўся адарыць чым-небудзь. Увогуле, хто што дасць. Хадзілі заўсёды па 2–3 чалавека. Пасля збіраліся ў адну хату і гулялі. Дзеці лёталі гурбой. Яйкі фарбавалі ў чырвоны колер – Хрыстос быў. Марыя Магдалена-грэшніца, калі Хрыстоса прыбілі да крыжа, а потым ён васкрэс, тады Марыя Магдалена прынесла апосталам яйкі. Красны – сімвал крыві, васкрашэнне Хрыстова. Пеклі ў гэты дзень булкі, кулічы. З яйкамі гулялі ў біткі і качалі ў лубкі.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Лісоўскай Алены Міхайлаўны, 1936 г. н.,***
***Драгун Алены Уладзіміраўны, 1940 г. н.***
***Новак В. С.***

## Валачобная песня-віншаванне

На гарэ Галгофе яўрэі стаялі,
На красце спасіцеля распялі.
А пад крастом маці яго стаяла,
Громкім голасам рыдала:
– Сын мой прэкрасны,
Ачэй маіх ясны,
На красце паміраеш,
З кім мяне пакідаеш?
– Не плач, маці мая родная,

Трэці дзень васкрэсну
І ўсім радасць вазвяшчу.
Мы гэту радасць прынімаем
І хазяіна(ку) паздраўляем
З жаной, з дзецьмі
І з харошымі людзьмі.
Хрыстос васкрэс/3р.

На Пасху хадзілі валачобнікі. Сабіраліся на першы дзень Пасхі к вечару. Былі спецыяльныя велікодныя песні. Спачатку пелі песні, а затым нам выносілі хто каўбасу, хто хлеб, хто яйкі. А затым віншавалі хазяіна з хазяйкай.

На Паску печ не тапілі. Ужо наварана было. Яйкі фарбавалі ў красны колер – ён абазначаў кроў. У біткі біліся. Дровы як колеш, дык бывае адшчэпіцца, дык яго ставілі адзін канец вышэй, другі ніжэй. І з іх каталі яйкі. Спачатку адзін спусціць, затым другі. І трэба было, каб гэты другі папаў у першае яйка і пабіў яго. На Вялікдзень не здароваліся, а хрыстосаваліся. Гаварылі – Хрыстос Васкрэс – тры разы.

**Песня на Вялікдзень**

Вялик святый нам день настал,
Со славай с гроба воссиял
Христос Господь, нам вечный свет.
Христос воскрес – 3 р.
Суботня полночь лишь прошла,
Заря недели лишь прошла,
Как ангел дверь во гроб отверз.
Христос воскрес – 3 р.
В ту ночь ко гробу жены шли
И мирро ценное несли,
Но там уж был гроб отверз.
Христос воскрес – 3 р.
Те жены плакать лишь почли,
Что в гробе тело не нашли,
Но смотрят в гроб – там некто есть.
Христос воскрес – 3 р.
То был в блестящих ризах лик,
Посланник Божий там для них,
То светлый ангел был с небес.
Христос воскрес – 3 р.
И женам ангел тот сказал:
«Христос Господь из мертвых встал.
Что ищете его вы здесь?»
Христос воскрес – 3 р.
«Идите, дайте знать о том
И всем его ученикам»,
Продолжил ангел ту им весть.
Христос воскрес – 3 р.
Как сам пред смертью он сказал,
На третий день Он и встал –
Вот радость всем, не нужно слёз.
Христос воскрес – 3 р.
В церквях ликуйте и домах:
Нам жизнь открыта в небесах.
Все веселитесь люди днесь.
Христос воскрес – 3 р.

Как ангелы на небеси,
Все радуйтесь и на земли.
Христос воскрес – 3 р.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Залуцкай Таццяны Міхайлаўны, 1922 г. н.***
***(раней пражывала ў в. Дрыла-1я Лагойскага р-на),***
***Новак В. С.***

Перад Вялікаднем пасцілі цэлы тыдзень, поснае елі. Хадзілі ў касцёл. Перад Вялікаднем у касцёле ўсяночная. На раніцу прыяжджаюць, свенцюць, трэба каб яйкі былі ўсякія: красныя, сінія, зялёныя і цвятныя, пірагі, гатунку, які хто робіць. Затым у біткі біліся, а то нейкі латок, бывае, нам зробя дзед, мы качаем гэтыя яйцы. От, паложыш латок, каб касяком быў і ложыш яйцо, і яно коціцца. Тваё і маё коціцца, усіхныя коцяцца і чыё паб'ецца.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Міхневіч Валянціны Мікалаеўны, 1938 г. н.,***
***Новак В. С.***

На каталіцкую Пасху ўсё ўрэмя сабіраліся ватагай людзі, а праваслаўныя сабе збіраліся. Хадзілі грамадой, чалавек 20–30. Прыходзілі на двор, станавіліся пад вокнамі, пелі песні. Хадзілі ў большасці мужчыны, але былі і жанчыны, песні пелі рэлігіёзныя. Кожны гаспадар валачобнікаў адорваў краснымі яйкамі, каўбасой. Да Вялікадня варылі мяса свіное – сцягно, грошы давалі, гарэлку выносілі, хадзілі дапазна, і хадзіла звычайна некалькі груп валачобнікаў. Потым сабіраліся да таго, у каго гармонік быў. Устраівалі пір. Весяліліся да раніцы.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

Сабіраліся на Пасху і хадзілі пад вокнамі, пелі песні, нам давалі падаркі. Яйкі фарбавалі ў чырвоны колер таму, што Марыя Магдалена грэшніца, Ісуса Хрыста прыбілі да крыста. Па традыцыі спрадаўна яйка краснае таму, што Хрыстос нарадзіўся. Булкі пеклі, называлі кулічы. Гулялі з яйкамі: яйкі ў латок кідаеш і глядзіш: паб'ецца ці не, гулялі ў біткі.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Лісоўскай Алены Міхайлаўны, 1936 г. н.,***
***Драгун Алены Уладзіміраўны, 1940 г. н.,***
***Новак В. С.***

На Вялікдзень нельзя было работаць. Мы з маці пяклі паску, красілі яйцы і гулялі ў біткі. Раней мы красілі яйкі ў чырвоны колер. Паску выпякалі вельмі асцярожна, бо лічылася, калі корка ў пасці патрэскаецца – чакай вялікага гора. На Вялікдзень мы нікагда не хадзілі на могілкі, бо ў царкве гаварылі, што Вялікдзень – гэта дзень Хрыста, а Радуніца – гэта дзень памершых. Валачобнікі ў Вялікдзень не хадзілі. Людзі ў эты дзень хадзілі ў царкву, пасвяцалі яйкі, потым прыносілі іх дадому, лажылі ў міску з вадой. Усе павінны былі памыцца вадой, каб усе былі прыгожыя, румяныя. У Вялікдзень пелі такую песню:

Вялік святой наш дзень настаў,
Хрыстос васкрэс із мертвых, устаў,
Но вы ішчыце яго здесь,
Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс!

Гаворац, што на Паску сонца гуляе. Мне маці заўсёды гаварыла: «Надзея, ідзі паглядзі, як сонца гуляе». Я выходзіла, але не бачыла, як яно гуляе. І цяпер не веру, што гуляе.

***Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на***
***ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

**Велікодная песня**

*Спявалі на Вялікдзень, калі хадзілі валачобнікі, песня велічальная, накіраваная пану-гаспадару:*

А на Вялікдзень ды на першы тыдзень
Хрыстос васкрэс, сын Божы.
Ішлі – чулі валачабнічкі,
Ішлі – чулі валачабнічкі.
Ішлі яны, высцілаючы,
Ішлі яны, высцілаючы,
Высцілаючы і граючы,
Высцілаючы і граючы,
Слаўнага пана пытаючы,
Слаўнага пана пытаючы:
– А ці дома, слаўны пане?
А ці дома, слаўны пане?
А ці дома ды не адгукаецца,
А ці дома ды не адгукаецца.
У светлай ложы высыпаецца,
У светлай ложы высыпаецца.
У галавах яго тры служачкі,
У галавах яго тры служачкі:
Две служачкі абуваці будуць,
Две служачкі абуваці будуць.
Тры служачкі расцілаці будуць,
Тры служачкі расцілаці будуць.
Ай вы, служачкі, маладзейшыя,
Ай вы, служачкі, маладзейшыя,
Вы пойдзіце на стаеньку,
Вы пойдзіце на стаеньку,
Аседлайце каня варанога,
Аседлайце каня варанога,
Вараненькага, што найлепшага,
Вараненькага, што найлепшага.
Я паеду ў роднае поле,
Я паеду ў роднае поле,
У роднае поле жыта аглядаці,
У роднае поле жыта аглядаці.
Жыта аглядаці, зямлю адмакаці,
Жыта аглядаці, зямлю адмакаці.
Ня едзь, ня едзь, слаўны пане,
Ня едзь, ня едзь, слаўны пане.
Ня едзь, ня едзь, ды вярніся,
Ня едзь, ня едзь, ды вярніся:
Тваё жыта агледжана,
Тваё жыта агледжана,
Тваё жыта ядрыстае,
Тваё жыта ядрыстае,
Ядрыстае, каласістае,
Ядрыстае, каласістае.
У дом бура нахіснула,
У дом бура нахіснула,
Госпада Бога паклікнула,
Госпада Бога паклікнула.
Палажы падкладку ды заві ў хатку,
Палажы падкладку ды заві ў хатку.

Тваёй хатцы харашо будзе,
Тваёй хатцы харашо будзе.

***Запісана ў в. Астрошыцы Лагойскага р-на***
***ад Аўтушка Антаніны Паўлаўны,***
***Лагуноўскай Тамары Васільеўны,***
***Дрычавай Тамары Канстанцінаўны,***
***Гудковай Тамары Аляксандраўны,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Табалевіч В. (1997 г.)***

**Валачобная**

*Спявалі на Вялікдзень, калі прыходзілі валачобнікі, спявалі паненцы:*
А ў гародчыку ды за клеткаю
Там стаяла роза кветкаю.
Тудой ішла малада паненка,
Гэту розу сашчыпала,
К свайму тварыку прыкладала.
Каб мой тварык такі быў,
Як чырвона ружа,
Не пайшла я не за каго замуж:
Не за селяніна, не за двараніна,
А пашла б я за такога пана,
Што з коніка не знімае
Ні ён каралю, ні каралі яму.

***Запісана ў в. Астрошыцы Лагойскага р-на***
***ад Лагуноўскай Тамары Васільеўны, 1924 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Табілевіч В.***

**Вялікдзень (васолы)**

А цераз рэчку кладка,
Там хадзіла Божа матка.
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.
Ішла полем і другая,
На трэція ступаючы.
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.
На трэція ступаючы,
Трох анёлаў спаткаючы.
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.
– Вы, анёлы наймілейшы,
Ці відзілі майго сына?
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.
Адзін кажа: «Я не відзіў»,
Другі кажа: «Я не бачыў».
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.
Трэці казаў: «Я сам там быў:

Твайго сына жыды ўзялі».
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.
Твайго сына жыды ўзялі,
На крэст святы распіналі.
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.
На крэст святы распіналі,
Жывой крыві дабывалі.
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.
– Сыночык мой наймілейшы,
Цябе болі найстрашнейшы.
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.

***Запісана ў в. Атрубак Лагойскага р-на***
***ад Пракопчык В. С., 1938 г. н.,***
***Пустаход М. А. 1929 г. н.,***
***Пустаход А. С. 1949 г. н.,***
***Кучынскай Я. С. 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Акуліч Т.***

Вялік святы наш дзень настаў,
Са славаю з раба сіяў.
Хрыстос, Гасподзь – наш вечны свет.
Алілуя,
Алілуя,
Алілуя.
Суботня поўнач ліж прашла,
Зара ў нядзелю ўзышла,
Как ангел гроба дзвер аткрыў.
Алілуя,
Алілуя,
Алілуя.
У ноч ка гробу жоны шлі
І мірацын з сабой няслі,
Но смотрят: горя там свершылась.
Алілуя,
Алілуя,
Алілуя.
Те жоны плакаць началі,
Што цела ў гробе не нашлі,
Но смотрят в гроб, там нехта есць.
Алілуя,
Алілуя,
Алілуя.
Там быў блесцяшчый ангелец,
Пасланнік божый был ані,
Там светлый ангел быў з нябёс.
Алілуя,

Алілуя,
Алілуя.
Ангел же нам радасць сказаў:
«На трэці дзень Ісус престаў».
Вот Радасць всем, не нужно слёз.
Алілуя,
Алілуя,
Алілуя.
Церква знаходзіцца в дамах,
Нам жызнь адкрыта в небесах,
Предложыл ангел ім ту весць.
Алілуя,
Алілуя,
Алілуя.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Шышко Любові Мікалаеўны, 1930 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Грушэўскай Н.*

**Велікодная песня для гаспадара**

А ці дома, дома, пане-гаспадару?
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Хоць і дома, ды ня кажацца,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
У чысовай ложы высыпаецца,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
І з жаноюмаладою,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
І з дзеткамі дробнянькамі.
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Адчыні акно, полядзі ў гумно,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Што ў тваім полі добра дзеіцца,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Добра дзеіцца, жыта сеіцца,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
З мяжы на мяжу пахілілася,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Госпаду Богу пакланілася,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
У полі капамі, а ў гумне скірдамі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
А ў млыне молам, у дзяжы падыходам.
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
А калбаска – акружыць будзе,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
А сыр і з маслам – закусіць будзе.
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
А на моры, ды на сіненькім,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
На Дунаі, ды на ціхенькім,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Там Леначка бель бяліла,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Бель бяліла, залаты персцень ураніла,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!

Тудой ішлі тры рыбалоўцы,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Тры рыбалоўцы, красныя малойцы,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
– Да й закіньце шоўкаў сеці,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
– Да й спаймайце залаты персцень.
А я ж вам ды служыць буду:
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Першаму буду я суседачка,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
А другому буду я нявестачка,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
А трэцяму буду сама маладая,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Да суседа агню пайду пазычу,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
А свёкрачка разуваць буду,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
А з міленькім пад вянец стану,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!

**Валачобная песня**

Цераз поле шырокае,
Цераз мора глыбокае.
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
Там ліжала зыбка кладка,
Тудой ішла Божжа Матка.
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
Ішла ж яна, баялася,
З трыма анельмі спаткалася.
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
– Мае ж вы тры анёлачкі,
Ці ня відзелі вы майго сына?
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
Адзін кажа: «Я й ні відзеў»,
Другі кажа: «Я й ні бачыў».
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
Трэці кажа: «Я й сам там быў,
Твайму сыну я гроб рабіў».
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
Твайго сына ў цябе ўкралі,
На крэсце рукі распялі.
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
Праз бок сэрца даставалі,
Гарачу кроў разлівалі.
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
Жоўтым пяском засыпалі,
Белым камнем навярнулі.
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
Ісус Хрыстос страпянуўся,
Белы камень адвярнуўся.
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
Жоўты пясок рассыпаўся.
На тым месцы прэстол стаяў.
Хрыстос васкрэс! – 3 р.

Ізбаў душу збавенную,
Аднэй душы не выкупляй.
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
Гэта душа вельмі грэшна,
Атца і матку зніважыла.
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
Брата з сястрой у кроў убіла.
Каб я гэта ды ведала,
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
Я ж ба гэта не рабіла,
Атцу і матцэ ножкі мыла.
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
Сама б тую ваду піла,
Каб збаўлена душа была.
Хрыстос васкрэс! – 3 р.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Жылянінай Марыі Мікалаеўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Масцеравай А. (2001 г.)***

**Валачобная**

Цераз поля шырокая,
Цераз мора глыбокая,
Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс!
Там ляжала гібка кладка,
Тудой ішла Божа матка,
Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс!
Яна ішла і баялася,
З трыма ангеламі спаткалася,
Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс!
– Мае ж вы тры ангельчыкі,
Ці не відзелі майго сына?
Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс!
Адзін кажа: «Я не відзеў».
Другі кажа: «Я не бачыў».
Трэці кажа: «Я й сам там быў»,
Хрыстос Васкрэс, Хрыстос Васкрэс!

**Валачобная песня**
**Ой, ляцела сойка, жалудок нясла**

Ой, ляцела сойка, жалудок нясла.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Ураніла на Міколу двор.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
На тым месцы дубок вырас.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Пад тым дубам крэсла стаіць.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
На тым крэсле сядзеў Валодзька.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Прыйшлі да яго тры паненкі.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Адна прыйшла ў золаце.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
А другая ў аксаміце.

Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
А трэцяя з розумам.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Пайду ж, пайду да маткі пытаці.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Ды каторую замуж браці.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
А ці тую, што ў золаце.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
А ці тую, што ў аксаміце.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
А ці тую, што з розумам.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Мы ж золата сваё маем.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Аксаміту наспраўляем.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
А розуму нідзе не дастанем.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Кохан Яўгеніі Мікалаеўны,***
***Новак В. С.***

**Валачобная песня**
**«Тын трышчоны, двор машчоны»**

Тын трышчоны, двор машчоны,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
А вароцічкі ды замчыстыя,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
На вароцічках салавей сядзіць,
Салавей сядзіць, распявая,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Гаспадыньку вызывая,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
– Гаспадынька, журавінька,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Устані раненька, умыйся беленька,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Палі фанарочык, ідзі ў хлявочык,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Што ў тваім хлеве паявілася,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Сем каровак ацялілася,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
А восьмая на часах ходзе,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Тваёй дочцы на пасаг будзе,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!

**Велікодная песня дзяўчыне**

А на моры ды на сіненькім,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы.
Там дзевіца бель бяліла,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы.
Бель бяліла, персцень ураніла,

Хрыстос васкрэс, Сын Божы.
Вы закіньце таўковы невад,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы.
Ды спаймайце залаты персцень,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы.
А я ж вам служыць буду,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы.
А першаму да суседачка,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы.
А другому да нявестачка,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы.
А трэцяму – сама маладая,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы.
Да суседа агня найду,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы.
А свекрачка разуваць буду,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы.
А мілага шанаваць буду.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы.

**Велікодная песня**

Вялік святы наш дзень настаў,
Са славаю з гроба сіяў
Хрыстос, Гасподзь наш, вечны свет.
Хрыстос васкрэс. – 3 р.
Суботня поўнач ліш прашла,
Зарання дзельная ўзышла,
Як ангел у гробе дзвер адтвер.
Хрыстос васкрэс. – 3 р.
Ту ноч да гробу жоны шлі
І мірацэн з сабой няслі,
Но гроб там был уже отвержій.
Хрыстос васкрэс. – 3 р.
І жоны плакаць пачалі,
Што цела ў гробе не нашлі.
Но смотраць в гроб – там нехта есць.
Хрыстос васкрэс. – 3 р.
Там быў бляскучы хрызахлік.
Пасланы Богам быў для ніх
Тот светлы ангел быў с небес.
Хрыстос васкрэс. – 3 р.
І ангел жонам тем сказал:
«Хрыстос Гасподзь із мёртвых встал,
Не ішчыце вы яго здзесь».
Хрыстос васкрэс. – 3 р.
Як сам прэд смерцю ён сказаў:
«На трэці дзень із мёртвых встал».
Радасць всем дал.
Хрыстос васкрэс. – 3 р.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Грынкевіч Галіны Міхайлаўны, 1938 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Рубін Ж.***

**Велікодная песня**

*Пяецца ў дзень смерці Хрыста:*

Месяц заходзя,
Сонца ўсходзя,
Божая Матка свайго сыночка
За ручкі водзя.
Прывяла яго к цэркві,
Ангелы яе спрасілі:
– Пачэму ты, Марыя, такая скучная?
– Но як не быць такой скучнай,
Калі аднаго сыночка мела,
І таго яўрэі ўкралі, мёртвым зрабілі.
Алілуя, алілуя, алілуя.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Шышко Любові Мікалаеўны, 1930 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Грушэўскай Н.*

**Пасхальная**

– Добры вечар, пані гаспадынічка,
А ці дома, дома красна паненка?
– Хоць і дома, дык не акажыцца,
У святліцы вымываецца,
Вымываецца, надзяваецца!
– Проша выйсці на ганачак
І вынесці падарачак –
Кварту гарэлкі,
Сыр на талерке.
Каб паненка намі не гардзіла,
На вяселле прыгласіла!

* * *

**Велікодная песня**

Цераз поле шырокае, Хрыстос васкрэс.
Цераз мора глыбокае, Хрыстос васкрэс.
Там ляжала гібка кладка, Хрыстос васкрэс.
Тудой ішла Божжа Матка, Хрыстос васкрэс.
Гібка кладка зыбнулася, Хрыстос васкрэс.
Божжа Матка зяхнулася, Хрыстос васкрэс.
Тудой ішлі тры анёлачкі, Хрыстос васкрэс.
– А мае вы анёлачкі, ці не відзелі майго сына?
Хрыстос васкрэс!
Адзін кажа: «Я не відзеў», Хрыстос васкрэс.
Другі кажа: «Я не бачыў», Хрыстос васкрэс.
Трэці кажа: «Яго жыды ўзялі, ды на крэст распялі.
Жывую кроў даставалі», Хрыстос васкрэс.

*Запісана ў в. Гарадзішча Лагойскага р-на*
*ад Шолкавіч К. К., 1912 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Шолкавіч Н.*

**Валачобная (васол)**

А на моры гібка кладка,
Там хадзіла Божа Матка.
Аля-люі, аля-люі, аля-люі.
Гібка кладка зыбнулася,
Божа матка злякнулася.
Аля-люі, аля-люі, аля-люі.
Ішла поле, ішла другое, на трэцяе ступае.

Аля-люі, аля-люі, аля-люі.
– Вы, анёлы-прыяцелі,
Ці не відзелі сына майго
Аля-люі, аля-люі, аля-люі.
Адзін кажа: «Я не відзеў»,
Другі кажа: «Я не слыхаў».
Аля-люі, аля-люі, аля-люі.
Трэці кажа: «Сына твайго жыды ўзялі».
Аля-люі, аля-люі, аля-люі.
Твайго сына жыды ўзялі,
На крыж крыжоў распіналі.
Аля-люі, аля-люі, аля-люі.
У ручкі, у ножкі гвоздзі гналі.
Аля-люі, аля-люі, аля-люі.
У ручкі, у ножкі гвоздзі гналі.
На сем сажнеў дол капалі.
Аля-люі, аля-люі, аля-люі.
На сем сажнеў на чатыры
Твайго сына схаранілі.
Аля-люі, аля-люі, аля-люі.

***Запісана ў в. Глебаўшчына Лагойскага р-на***
***ад Усцін Веры Васільеўны, 1939 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Беланоўскай М.***

Перад Паскай быў Вялікі пост. Елі толька посную ежу. Варылі і падсмажвалі мяса, пяклі булкі і красілі яйкі. Хадзілі ў касцёл. Потым святкавалі. Можна было ўжо есці ўсё, што хочаш.

***Запісана ў в. Дрыла 1-я Лагойскага р-на***
***ад Міклашэвіч Анастасіі Уладзіміраўны, 1927 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А. (2008 г.)***

**Валачобная песня**

На сенажаці, на поплаве
Зялёны явар, зялёны.
Там сядзела курапатак стая.
Між тых курапатак шэрая зязюля.
А дзе браўся саколік.
Ён тых курапат паразганяў,
Шэрую зязюлю да сябе ўзяў.
А на ганачку, ды на новенькім,
Там стаяла дзевак куча.
Між тых дзевак малада Ніначка.
А дзе браўся малады Ванечка.
Ён тых дзевак паразганяў,
Маладу Ніначку да сябе ўзяў.
– Дзе гуляць будзеш – значная будзеш,
Значная будзеш – маёй будзеш,
Венчык здзену – чэпчык адзену.
**рэфрэн паўтараецца пасля кожнага слупка*

***Запісана ў в. Заазер'е Лагойскага р-на***
***ад Сінюковіч Марыі Пятроўны, 1931 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кур'ян Н.***

А з-пад лесу, лесу цёмнага,
Да зялён явар, кудравы!
Ох, ідзе, ідзе туча цёмная,

Туча цёмная, валачобная.
Валачобнікі валачыліся,
Валачыліся, памачыліся.
Зайшлі да бабкі, пасушыліся.
А дала бабка ўсім па яечку,
Усім па яечку, ды па красненькім.
Адной сіраце ды не засталася.
Вывела бабка ды каровіцу.
Сірата-дурата са двара не йдзець,
Са двара не йдзець і кароўку не бярэць.
Вывела бабка ды красну дзеўку.
Са двара пайшоў паскакуючы,
Паскакуючы, падзякуючы.

***Запісана ў в. Заполле Лагойскага р-на***
***ад Крэнь Марыі Станіславаўны, 1938 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Саўчанка Г. П.***

Калісь святкавалі. Да яшчэ як жа ж. Устанеш ранкам, яшчэ пакуль сонца ўстане, і чакаеш, яно ж ранкам скача так хораша, то ўверх, то ўніз, наглядзішся! А потым наліваеш ваду і туды яйка кідаеш і ўмываешся, каб красівым быць. А потым, як малыя былі, дык раніцай хадзілі па валачобных. Спявалі спецыяльныя валачобныя песні:

Я малы жачак,
Ні курам бачак,
Не вельмі вуме,
Пшысткі разуме.
У школе не бывала,
Рузгі не відзяла.
Рузга зелёна,
Джова мовёна,
Маленькі зябкі,
Чакай кляпкі.
Пшысткі стаялі
І зустра віталі:
– Ах, Езус, мой дрогі,
Цалуюць ногі.
Бжэнчыга падноша,
Валачобнага проша,
Проша даць, не жалобаць,
Шоб было жачку падзіньковаць.

Я малы жак,
Паўзу як рак,
Скачу як жаба,
Дай яйцо, баба.
Не дасі кока,
Вылезе вока.
Не дасі свінінкі,
Падохнуць твае свінкі.
Не дасі пірага,
Адсохне нага.

***Запісана ў в. Заполле Лагойскага р-на***
***ад Крэнь Марыі Станіславаўны, 1938 г. н.,***
***Новак В. С.***

**Велікодная песня**

Гаспадынька – журавінка,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
У цябе ўчора краўцы былі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Краўцы былі, шубу шылі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Шубы шылі, падаўжылі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Па двару ходзя, двор падмятае,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Сваіх дзетак пабуджае,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
– Устаньце, дзеткі, устаньце, нявесткі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
У нас сягодня прыявачка,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Прыявачка паявілася,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Сорак кароў ацялілася,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Яшчэ столькі назначылася,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!

***Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на***
***ад Кізіны Ніны Макараўны, 1926 г. н.,***
***студэнткамі БДПУ імя М. Танка Гайчук С., Гладковай І. (2005 г.)***

**Валачобная песня**

Чэраз рэчку гібка кладка,
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.
Па ёй ішла Божа Матка,
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.
Гібка кладка згібнулася,
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.
Божа Матка завіхнулася,
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.
Ёй на встрэчу тры сокала,
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.
Тры сокала, тры ангела.
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.
– Вы сокалы, вы ангелы,
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.
Ці відзелі майго сына,
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.
Адзін кажа: «Я не відзеў»,
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.
Другі кажа: «Я не бачыў»,
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.
Трэці кажа: «Я сам там быў»,
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.
Я сам там быў і ўсё відзеў,
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.
Твайго сына жыды ўзялі,
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.

Жыды ўзялі, распіналі,
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.
В рукі, в ногі гвоздзі гналі,
Хрэстос васкрэс, Сын Божы.

***Запісана ў в. Казінец Лагойскага р-на***
***ад Змітрачковай Надзеі Васільеўны, 1939 г. н.,***
***студэнткамі БДПУ імя М. Танка Сцяпанавай К., Слянскай К. (2002 г.)***

Яйцы красілі ў чырвоны цвет. Звычайна гралі ў біткі. Выпікалі пасху, а потым яе свяціў свяшчэнік.

***Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на***
***ад Ліс Марыі Андрэеўны, 1928 г. н.***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Саўчанка Г. П.***

Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Ішлі, гулялі валачобнікі,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Іграючы, выспяваючы,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Слаўнага пана велічаючы,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
А ці дома, слаўны пане?
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
А ці дома, ды не акажацца,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
У святой ложы высыпаецца,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
У нагах яго дзве служачкі,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
У галавах яго тры служачкі.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Дзве служачкі абуваць будуць.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Тры служачкі адзяваць будуць.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Ой, ідзіце ж ды асядлайце.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Асядлайце коні вараныя.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Я паеду ў чыста поле.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
У чыста поле яравое.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Маё поле каласістае.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Каласістае, ядраністае.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!

* * *

Вялік святы наш дзень настаў,
Хрыстос васкрэс, із мёртвых устаў.
Хрыстос васкрэс. – 3 р.
У ту ноч ка гробу жоны шлі
І міру цэнную няслі.
Хрыстос васкрэс. – 3 р.

Вдруг смотрят гроб:
Там кто-то есць.
Хрыстос васкрэс. – 3 р.
Це жёны плакаць усе пайшлі,
Што ў гробе цела не знайшлі.
Хрыстос васкрэс. – 3 р.
То быў свяшчэннік із нябёс,
Ён ім такую весць прынёс.
Хрыстос васкрэс. – 3 р.

**Велікодныя песні**

Гаспадынечка, журавіначка!
Устань раненька, вымайся беленька.
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы.
Што ў тваім хляве нарабілася:
Дзевяць каровак ацялілася.
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы.
А дзесятая па часах ходзіць,
Па часах ходзіць.
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы.
Гэта на пасаг тваёй дачушачцы будзе.
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы.

**Валачобныя песні**

А ці дома, дома пані гаспадару?
А хоць дома ды не акажацца.
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы.
У часовай ложы высыпаецца.
А ўстань, пану, устань рана.
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы.
Адзень боты казловыя,
Ідзі ў поле жыта аглядаці.
А хоць ідзі – хоць вярніся.
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы.
Я тваё жыта сам агледзеў.
Тваё жыта ядраністае, залацістае.
Да адной мяжы нахілілася.
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы.
Госпаду Богу пакланіся
І святому пану.
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы.

***Запісана ў в. Карбачоўка Лагойскага р-на***
***ад Жалабковіча Сяргея Мікалаевіча, 1963 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Саўчанка Г. П.***

А ці дома, дома пані гаспадару?
А хоць дома ды не акажацца.
Хрыстос і васкрэс, Сын Божы!
У часовай ложы высыпаецца,
А ўстань, пану, устань рана.
Хрыстос і васкрэс, Сын Божы!
Адзень боты казловыя,
Ідзі ў поле жыта аглядаці.
Хрыстос і васкрэс, Сын Божы!

А хоць ідзі, хоць вярніся.
Хрыстос і васкрэс, Сын Божы!
Я тваё жыта сам аглядзеў.
Тваё жыта ядраністае, залацістае
Да адной мяжы нахілілася.
Хрыстос і васкрэс, Сын Божы!
Госпаду Богу пакланіся
І святому пану.
Хрыстос і васкрэс, Сын Божы!

***Запісана ў в. Карбачоўка Лагойскага р-на***
***ад Жалабковіч Валянціны Іванаўны, 1965 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Саўчанка Г. П.***

У гэты дзень абавязкова пяклі кулічы. У нас было 2 Пасхі, бо я праваслаўная, а муж – католік. На пасху абменьваліся яйкамі, гэта сімвал сустрэчы. Гулялі з яйкамі ў біткі, а таксама качалі іх у лубках. На Пасху заўсёды хадзілі валачобнікі. Яны спявалі васолы. Пасля таго, як спелі, прасілі жачкі (тое, што давалі).Часам яны прасілі іх такім выслоўем:

Бабка, не дасі яйка – здохне авечка,
Не дасі кока – вылязе вока.

Валачобнікі пачыналі хадзіць вечарам у 10–11 гадзін. На Вялікдзень мы ездзім свяціць булкі. Яйкі мы фарбуем у красны колер. Красны колер – гэта сімвалічна і звязана з крывёй, якую праліў Хрыстос.

***Запісана ў в. Кацялі Лагойскага р-на***
***ад Ярашонак Сафіі Анатольеўны, 1943 г. н.,***
***Ярашонак Міхаіла Іванавіча, 1944 г. н.,***
***Новак В. С.***

Ішлі на кладбішча. Пасля тапілі печ, варылі мяса, пяклі булкі, яешню рабілі, лапшу дамашнюю, бліны з крахмалам.

У васкрэсенье нічога не дзелалі, толькі печ тапілі. Мылі сцены, паталкі да Вялікадня.

***Запісана ў в. Коранъ Лагойскага р-на***
***ад Шыла Лідзіі Нікіфараўны, 1937 г. н.***
***(раней пражывала ў Віцебскай вобл.),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Хадзілі валачобнікі і пад вокнамі спявалі песню:

Не дасі, баба, яечка,
Дык здохне авечка.
А дасі каўбаску,
Дык пачуем вашу ласку.

***Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на***
***ад Навіцкай Галіны Канстанцінаўны, 1961 г. н.,***
***Пятроўскай Канстанціны Іванаўны, 1931 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Калі ў гэтым годзе нехта з сям'і памёр, то яйкі нельга было фарбаваць. Іх пакідалі белымі. Хаця можна было пафарбаваць у другі адценак. Па-іншаму нельга было. Гулялі на Вялікдзень у латкі і біткі.

***Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Таццяны Ігнатаўны, 1932 г. н.,***
***Дубоўскай Таццяны Рыгораўны, 1932 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Пяклі булкі, красілі яйца шалухой. Унукі за жачкай прыходзілі. На ўсюношную перад Паскай ідуць у цэркаў, нясуць сваю булку і там свецяць. Пасвецяць – тады дамой. Моляцца да ўтра. Дома не заўтракаюць, пакуль не вернецца той, хто ў цэркві, з пасвянцонай булкай, соллю, вадой. Абавязкова на стале павінны былі быць свяцоная соль і яйкі. Патом ужо пілі гарэлку і елі. Мужыкі збіраліся і качалі яйкі, гулялі ў біткі.

*Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на*
*ад Івашкевіч Соф'і Антонаўны, 1914 г. н.,*
*Амбражэй Алы Аляксандраўны, 1936 г. н.,*
*студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

Займаліся ўборкай: бялілі, клеілі, мылі посуд. Першы дзень яйкі качалі, латочак ложаць і качаюць. Вечарам на першы дзень, у кожную хату, ідуць пець васолы. Падходзяць да вакна і гавораць: «Хрыстос Васкрэс!»

*Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на*
*ад Лапцэвіч Ганны Антонаўны, 1931 г. н.,*
*студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

Хрыстос васкрэс, Сын Божы.
Ішлі, гулі валачобнікі,
Іграючы, васпяваючы.
А ці дома слаўны пане?
А ці дома ды не акажацца?
Святы латы высыпаецца.
У нагах яго дзве служачкі,
У галавах яго тры служачкі.
Дзве служачкі абуваць будуць,
Тры служачкі аддзяваць будуць.
Ой, ідзіце ж ды асядлайце,
Асядлайце коні вараныя.
Я паеду ў чыста поле,
У чыста поле яравое.
Маё поле каласістае,
Каласістае, ядраністае.
Хрыстос васкрэс! – 3 р.
Палажы кладачку, зазаві ў хатачку.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы.

*Запісана ў в. Манчакі Лагойскага р-на*
*ад Цішэвіч Рымы Аляксандраўны, 1937 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Цішэвіч А. (2004 г.)*

Валачобнікі валачыліся.
Валачыліся – намачыліся.
Зайшлі ў хату – абсушыліся.
Хрыстос уваскрэс, Сын Божы

**Валачобніцкі абрад**

Ішлі з такімі вялікімі кошыкамі. Падходзяць да кожнай хаты, а там мы ўжо сідзелі за акном усе. І яны падходзілі да вокнаў і пелі песні. Мы слухалі, слухалі, сколька яны пелі, полчаса можыць. А тады выносілі ім яйкі, пірагі, гарэлку дажэ, – усі, што было на святочным стале. Жадалі хазяівам здароўя на доўгія гады, штоб у сям'і быў лад, штоб дзеці раслі вялікія, штоб дзяцей было многа. А потым, как усі пазбіраюць, сабіраліся ўсе ў кучку, гэта разварачвалі і дальшэ працягвалі гуляць.

*Запісана ў в. Манчакі Лагойскага р-на*
*ад Бабpоўскай Надзеі Фёдараўны, 1930 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Шэлег І.*

Валачобнікі, валачобнікі
Валачыліся, намачыліся.
Зайшлі ў хатку, абсушыліся
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!

***Запісана ў в. Манчакі Лагойскага р-на***
***ад Баброўскай Надзеі Фёдараўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Бравaслоўскай Н.***

Хадзіла Машанька па садочку,
Ой, па садочку.
Накалола ножачку на вішнёчку,
Накалола ножачку на вішнёчку.
Баліць, баліць да й не больна.
Любіў парэнь дзяўчыначку, ды й не долга.
Любіў парэнь дзяўчыначку, ды й не долга.
Забралі парнішачку, ды й у салдаты.
Ой, забылася дзяўчыначка запытаці.
Ой, забыла дзяўчыначка запытаці.
А ці замуж мне ісці, запытаці.
Ой, ці замуж мне ісці, ці гуляці – 2 р.
Гуляла дзяўчыначка,
Ой, ды гуляла – 2 р.
Тапчы, тапчы чаравічкі,
Як таптала – 2 р.
Не сцялі ты пасцель белу,
Як ты слала – 2 р.
Ой, не кажы ты хлопцам праўды,
Як казала – 2 р.
Яны тваю пасцель белу
Ой, перакінуць – 2 р.
Яны цябе любіць будуць,
Ды й пакінуць – 2 р.

***Запісана ў в. Манчакі Лагойскага р-на***
***ад Цішэвіч Рымы Аляксандраўны***
***студэнткай Раманоўскай Н. К.***

Гаспадынечка, журавіначка,
Устань раненька, вымайся раненька,
Хрыстос і Васкрэс, Сын Божы.
Што ў тваім хляве нарадзілася?
Дзевяць каровак ацялілася,
Хрыстос і Васкрэс, Сын Божы.
А дзесятая па часах ходзіць,
Па часах ходзіць,
Хрыстос і Васкрэс, Сын Божы.
Гэта на пасаг тваёй
Дачушачцы будзе,
Хрыстос і Васкрэс, Сын Божы.

***Запісана ў в. Манчакі Лагойскага р-на***
***ад Цішэвіч Рымы Аляксандраўны***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Цішэвіч Ю.***

Да Пасхі гатаваліся. Ездзілі ў касцёл. Ксёндз свяціў булкі, яйкі. У гэты дзень нядьзя было работаць. Не рабілі чатыры дні. На чацвёрты дзень не работалі, каб засцерагчыся ад гразы. Яйкі

красілі толькі ў чырвоны цвет. Гэта сімвалізіравала кроў Хрыста. Хадзілі валачобнікі. У асноўным, немаладыя. Дзеці бегалі і збіралі яйкі.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Турчыновіч Міхаліны Венядзіктаўны, 1926 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Былі такіе пагаворкі: «На Пасту не дасі яечка – здохне авечка. Не дасі кока – вылязе вока».

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Ніны Сямёнаўны, 1938 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя  Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Работаць у гэты дзень нельзя. Трэба з'есці па кусочку яечка. Еслі на Паску многа снегу на заборах, то будзе шмат грыбоў і ягад.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Падбярозка Сцяпана Антонавіча, 1933 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Паска – вялікае свята. 4 дні не ядзім нічога, красілі яйкі, пяком булкі, варым мяса, каўбасу. Раней святкавалі тры дні. А чацвёрты дзень – градавая серада, каб град не пабіў зернавое. Назіралі, як гуляе сонейка. Углядзішся – а яно і праўда пачынае скакаць туды-сюды.

**Валачобніцтва**

Так, хадзілі. Хлопцы вып'юць і да бабак ідуць. Пяюць песню:

Я малы жачак, на карым бачак,
Я вельмі ўме, вшысткае разуме.
Баба, калі не дасі яечка,
Здохне твая авечка.
Калі не дасі кока,
Вылезе тваё вока!

***Запісана ў в. Новае Чэрнева Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Ядзвігі Аляксандраўны, 1931 г. н.,***
***Акуліч Антона Адамавіча, 1931 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Домінным А., Елавой Н. (2008 г.)***

У нас у гэты дзень пяклі вельмі ўкусную паску, або хлеб. Гралі мы ў біткі. Матка брала велікоднае яйка і праводзіла ім па ліцу нам, нешта прыгаворваючы, наверно малітву. Яйкі красілі ў чырвоны колер.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Зялёнка Ніны Апалінараўны, 1938 г. н.,***
***Новак В. С.***

Хадзілі валачобнікі, пелі цэрковные песні от хаты да хаты, збіралі дань, гулялі да ўтра. Хадзілі з гармошкай, пелі частушкі:

Калі не далі яечка – здохне авечка,
Не дасі кока – выб'ю табе вока…

Потым іх звалі ў хату, угашчалі. Потым, сабраўшы дань, збіраліс у адной хаце, дзялілі і гулялі да ўтра.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Адамовіча Андрэя Пятровіча***
***(раней пражываў у в. Стаецкія Лагойскага р-на),***
***Новак В. С.***

На Пасху прыхадзілі валачобнікі ў хату. Пелі песні гаспадару, гаспадыні. Яны давалі валачобнікам яйкі. На Пасху гулялі ў біткі.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Грынь Ганны Пятроўны, 1953 г. н.***
***(прыехала з в. Нарбутава Лагойскага р-на),***
***Новак В. С.***

Мы хадзілі ў царкву. Свяцілі яйкі, булкі і інш. Калі прыходзілі з царквы і садзіліся снедаць, то яйка пасвяцонае рэзалі на столькі кусочкаў, колькі было чалавек у сям'і. Кажды доўжан быў з'есці кусочак. Бралі скарлупу і выносілі на агарод, каб быў добры ўраджай. Нельзя было работаць два дні. Яйца красілі ў красны цвет – эта цвет крові Хрыста. А шчас – хто ў які. Гулялі ў біткі.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Петрашко Лідзіі Лявонцьеўны, 1932 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Валачобнікі хадзілі на Паску. Первы дзень мы нікуда не хадзілі, бо нельзя было хадзіць. Трэба было дома сядзець. А ўжо на втары дзень хадзілі па гасцях. Ну, вот на первы дзень сабіраюцца жэншчыны где-то на завалінке, скамеечке, мужчыны тожа сабіраюцца, яічкі прыносяць, б'юцца. Песні пяюць.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Мароз Надзеі Фацееўны, 1925 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Хадзілі ў Хрыстос. Збіралася некалькі чалавек з гармошкай. Хадзілі паздраўлялі і пеялі. Адзін быў пачынальнікам. Усю ноч ходзяць у другую дзярэўню і песні спяваюць. Пастукаюцца ў акно і спрашываюць, ці можна з празнікам паздравіць, і пяюць, граюць. Пяклі на Паску абавязкова булкі. Яйкі фарбавалі толькі ў чырвоны колер. Мужыкі качаюць яйкі. На втары дзень хадзілі на могілкі. Пасядзяць, вып'юць і памянуць.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Альсімовіч Галіны Сцяпанаўны, 1925 г. н.,***
***(раней пражывала ў в. Чэркасава Міёрскага р-на Віцебскай вобласці),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Гатовіліся – пасцілісь перад Паскай, гатовілі, варылі яйкі, красілі ў красны цвет, а цяпер ва ўсялякія красяць, а ў нас красілі толькі ў лукавай шалухе. На Вялікдзень мы нікогда не хадзілі на могілкі, тока на Радаўніцу. Але бывае, што ходзяць і на Вялікадзень, а на Радаўніцу не йдуць, як дзе.

***Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на***
***ад Русак Тацяны Фёдараўны, 1930 г. н.,***
***Новак В. С.***

Гатавалі розныя смачныя стравы. Маці гатавала смачна грыбы. Хадзілі ў царкву. Казалі, што, хто першы прыйдзе з царквы, той і закончыць першым жніво. Шкарлупкі з яек давалі курам, каб добра яйко неслі. Неслі ў поле і клалі там, каб быў добры ўраджай.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Арцем'евай Ліліі Васільеўны, 1939 г. н.***
***(раней пражывала ў в. Слабада Лагойскага р-на),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

Пасху хоть нельзя было, но отмечали её утихаря. Красили яйцы у красны цвет (красили шалушками). Вечарам собираемся на вечорки, танцавали, играли на гормошке, на разных

инструментах, абы было б пад што танцаваць, пабалакалі – і всё.

*Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на*
*ад Мінкувіч Антона Антонавіча, 1928 г. н.,*
*Новак В. С.*

**Валачобная**

Добры вечар, пані гаспадару,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Пані гаспадару, вакол дачакаўшы,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
А ў пана жонка хараша і звонка,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
А й дзеткі, як у садзе кветкі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Коні і каровы, поўныя амбоpy,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Запрагу – працуя, выпрагу – танцуя,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Пані гаспадару, не тамі гасцей,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Не тамі гасцей, частуй барздзей,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Падстаўляй дравінку, лезь па саланінку,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Па яечка ў печку, па калбаску ў сетку,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.

*Запісана ў в. Прудзішча Лагойскага р-на*
*ад Гарпей Іны Уладзіміраўны, 1936 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка (2002 г.)*

**Хрыстос уваскрос!**

Усюды радасць,
Усё глядзіць смялей, святлей!
Вялікі мучанік, здаецца,
Абняў усіх ласкаю сваей.
Хрыстос Уваскрос! Неўгамонны
Плыве па нівах, пушчах клік.
Плыве адна святая думка
З канца ў канец, як свет вялік.
Ды пойдзем да першага двору,
Ці запросяць да гаспадарскага столу
Ў гэта вялікае свята Вялікдзень!?
З красным яечкам, з цёплым славечкам.
А мы ідзём, ідзём пад багаты дом,
Пад багаты дом, «дзень добры» даём.
– «Дзень добры» таму, хто ў гэтым даму.
Гаспадарочак, слаўны паночак.
Ці спіш, ці ляжыш, ці адпачываеш?
Ці нас, валачобнікаў, дажыдаеш?
А ці ўслых табе нашы песенькі?
Валачобныя, вялікодныя?
Калі няўслых, дык Бог з табою.
Калі ўслых, гукай са мною.
Адкрывай клямачку, заві ў хатачку.
У гэтай хаце мы госці жаданыя,

Жывуць тут гаспадары паважаныя.
Ці ў доме пані гаспадыня?
Гаспадынька прутка,
Сабірайся хутка,
Піражок пад пашку,
На стол пляшку,
Кілбасы не шкадуй,
Таксама пачастуй.

**Песня на Вялікдзень**

Святы Юрый па лугу ходзіць,
Па лугу ходзіць, коней пасець,
Каб былі добрыя, да пабрыківалі.
Святы Мікола па межах ходзіць,
Па межах ходзіць, жыта родзіць.
Святой Ушэсце поле вымятаець,
Поле вымятаець, колас высыпаець.
Свята Троіца жыта красцець,
Святы Дзевятнік красу здымаець,
Красу здымаець, пятку становець.
Святы Іван дапамагаець.
А святы Ілля зажынаець,
Залатым сярпом, правай ручкай.
А Іллёва жонка, слаўная жнейка:
Дзе разнець, там сноп кладзець,
Дзе гарушачкі, там капушачкі,
Дзе лажочак, там снапочак...

**Песня на Вялікдзень**

На гарэ пахілілася,
У даліне ў трубы павілося.
Чыста, густа на небе зоркі,
Часцей, гусцей на ніве копкі.
Ай, дай Божа ж, на таку ўмалот,
На таку ўмалот, у дзяжы падход,
У жорнях намол, у дзяжы падход,
У дзяжы падход, у печы падрост.

**Песня на Вялікдзень**

Песня спета проці лета.
А будзь жа весел, як вясна красна,
А будзь жа ціхім, як ціха лета,
А будзь жа багаты, як багата восень.
А ты, гаспадынька, усе дагадаліся:
Скавародку – у печ, па яечкі – у клець.
Кусок сала пакрышыць, а калбаскай абгарадзіць.
Кварту гарэлкі і сыру талеркі.
Зялён явар, зялён.

*Запісана ў в. Прудзішча Лагойскага р-на*
*ад Саевіч Марыі Іванаўны, 1924 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Юрцэвіч М.*

Добры вечар, пані гаспадару.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Пані гаспадару, васол дачакаўся.

Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
А ў пана жонка хароша і звонка.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
А дзеткі, як у садзе кветкі.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Калі і каровы поўныя амборы.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Запрагу працуя, выпрагу танцуя.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Пані гаспадару, не тамі гасцей.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!
Не тамі гасцей, кармі бардзей.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!

***Запісана ў в. Прудзішча Лагойскага р-на***
***ад Тарлеўскай Іны Уладзіміраўны, 1936 г. н.,***
***Новак В. С.***

Яйкі красілі ў чырвоны колер. Чырвоны колер – гэта колер жызні. Качалі яйкі ў латках. Бралі яйка, пускалі яго ў латок. Калі адно яйка ўдарыцца аб другое, то тое, якое пабітае, забіраў той чалавек, якога яйцо засталося цэлае. Я, бывала, пайду і многа яец павыйграю. У гэты дзень хадзілі па вёсцы валачобнікі, пелі песні, жартавалі. Кожны павінен быў даць ім яйцо.

***Запісана ў в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Акуловіч Валянціны Адольфаўны,1933 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Вось валачобнікі раней часта хадзілі. Я сама не хадзіла. Валачобнікі хадзілі на Каляды і на Вялікдзень. На Каляды рабілі казу, звёзды і насілі вялікую торбу, хто ўжо што дасць.

***Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на***
***ад Данілевіч Ніны Аляксандраўны, 1938 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

**Валачобная песня**

Гаспадынька – журавінка,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Вынесь, вынесь, гаршок яек,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Ды нябітачак на пажытачак,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Каб твае куры добра вяліся,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Добра вяліся, кажды дзень нясліся,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
У саду пад кусточкам нясліся радочкам,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
У саду пад агрэстам нясліся перакрэстам,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Кутас Ніны Яфімаўны, 1921 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Саявіч С.***

**Вялікдзень**

*Валачобная песня, адрасаваная дзяўчыне:*
На моры, на Дунаі
Там паненка бялізну мыла,

Залаты пярсцёнак упусціла.
Тудой ішлі рыбалоўнічкі,
Рыбалоўнічкі, мае браткі,
– Вы закіньце шоўкаў невад
І дастаньце златы персцень.
А я ж ды вам служыць буду:
Аднаму буду за суседачку,
А другому – за нявестачку,
А трэцяму – за мілу жонку.
Да суседа агня пайду,
А свякруху радаваць буду,
А мілага шанаваць буду.

**Валачобная песня**

А ці дома, пані гаспадару,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый.
Калі дома ды й не акажыцца,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый,
У новай каморы прыбіраецца,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый,
Баброву шубу на сябе кладзе,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый,
Казліны боты ды й на ножанькі,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый,
Лісью шапку на галовачку,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый.
Як прыбраўся, так і прывітаўся,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый.
З добрымі людзьмі валачобнымі,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый.
Валачобнычкі валачыліся,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый,
Аж па пояс яны абмачыліся,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый.
Пані гаспадару кварту гарэлкі,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый,
Кварту гарэлкі, сыр на тарэлкі,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый.
Пані гаспадару, загляні ў акенца,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый,
Паглядзі ў гуменца,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый.
А што ў цябе нарабілася?
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый.
Сорак каровак ацялілася,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый,
Яшчэ столькі назначылась,
Хрыстос Васкрэс, Сыну Божый.

**Віншаванне**

На гарэ Галгофіі яўрэі стаялі,
Спасіцеля міру да крыжа прыгвоздалі.
Прычыстая маці ў крыжа стаяла,
Глядзела на сына, плакала, рыдала:
– Сын мой прыкрасны, голас твой ясны,

Ты на крыжы па́мiраеш, каму ж ты мяне пакiдаеш?
– Не плач, мая мацi, не плач, дарагая,
Я ў трэцi дзень прыйду, усяму свету
Радасць прынясу.
Мы гэтыя скорбi з табою раздзелiм,
Усiх вас са святам павiншуем.
Хрыстос Васкрэс!

**Велiкодная песня**

Цераз поле шырокае,
Цераз мора глыбокае.
Алiлуя, алiлуя, алiлуя.
Там ляжала зыбка кладка,
Тудой iшла Божжа Матка.
Алiлуя, алiлуя, алiлуя.
Зыбка кладка ззыбнулася,
Божжа Матка злякнулася.
Алiлуя, алiлуя, алiлуя.
Тудой iшлi тры анёлы,
Божжу Матку падхвацiлi,
Да касцёла правадзiлi.
Алiлуя, алiлуя, алiлуя.
А ў касцёле прыстол стаiць,
На прыстоле сам Бог сядзiць.
Алiлуя, алiлуя, алiлуя.
Сам Бог сядзiць i чытае,
Петра з Паўлам вызывае.
Алiлуя, алiлуя, алiлуя
– Петра з Паўлам, ка мне iдзiце,
Ключы пякельныя нясiце.

***Запiсана ў в. Родзевiчы Лагойскага р-на***
***ад Кудыбiнай Таiсii Мiхаўлаўны, 1954 г. н.,***
***студэнткай БДПУ iмя М. Танка Кудыбiнай I.***

На Вялiкдзень па хатах хадзiлi жачыкi, спявалi песнi. У бiткi гулялi i яшчэ ў латках каталi яйкi. Прасыналiся рана-рана, каб паглядзець, як сонца будзе танцаваць. А затым у мiску налiвалi ваду, кiдалi туды краснае яйка i ўмывалiся, каб прыгожаму быць. Яйкi красiлi толькi ў красны колер у шалупiннi з цыбулi.

***Запiсана ў в. Рэпiшча Лагойскага р-на***
***ад Сабалеўскай Алены Пятроўны 1932 г. н.***

На Пасху валачобнiкi iшлi з кошыкамi, падыходзiлi да кожнай хаты i пелi песнi, а iм выносiлi яйкi, пiрагi, гарэлку. Валачобнiкi жадалi здароўя i каб у сям'i лад быў. Затым сабiралiся ў кучу, разварачвалi абрус, ставiлi тое, што iм падарылi, i працягвалi гуляць.

***Запiсана ў в. Рэпiшча Лагойскага р-на***
***ад Зiнькевiч Раiсы Пятроўны, 1952 г. н.,***
***Новак В. С.***

Усё гатавалi ў суботу. У васкрэсенье нiчога не гатовiлi. Нельзя было жарыць у гэты дзень яйцы, бо куры несцiся не будуць. Есць не садзiлiся да той пары, пакуль хто-небудзь не прыйдзе з цэрквы i не прынясе пасвяцонае яйцо. Гулялi ў бiткi.

***Запiсана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Зюзянюк Валянцiны Аляксееўны, 1945 г. н.,***
***студэнткамi ГДУ iмя Ф. Скарыны Пiнчуковай Н., Канцавой М. (2008 г.)***

*На Вялікдзень дзеці хадзілі па жачкі. Падыходзілі да вокан і спявалі песню:*
Я малы жачык,
Не курам бачык.
Не вельмі ўмен,
Вшысткі разумен.
Малыя дзеткі,
Шчыпалі кветкі,
У гробе стаялі,
Ісуса відалі:
О, Езус, Езус,
Прымі да сябе,
Пастаў у небе
Недалёка ад сябе.
Прапенку падносе,
Божа него прошэ,
Прошэ даці, поміловаці,
Каб было зацку
Подзеньковаці.
Хрыстос з мёртвых устаў.
Хрыстос з мёртвых устаў.
Хрыстос з мёртвых устаў.

Сабіралісь жанчынкі. Білі калыкі і мы хадзілі па хатах сабіралі, трэба было расказаць сціхатвареніе.

***Запісана ў в. Скарады Лагойскага р-на***
***ад Умэцкай Ніны Антонаўны, 1930 г. н.,***
***Пракопчык Жанны Канстанцінаўны, 1968 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

На Вяліканне таксама пяюць песні. Пасцілісь увесь пост, асабліва апошнія тры дні. Елі ўсё поснае: рыба, грыбы, ніякага сала, мяса. Хадзілі ў касцёл, спавядаліся, быў ксёндз. Памолішся і пайшоў.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Бартко Аляксандра Іванавіча, 1927 г. н.,***
***Бартко Рэгіны Антонаўны, 1929 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Дожіным А.,***
***Шурмель С., Булаховай М. (2008 г.)***

Жылі раней бедна. Такіх застолляў, як цяпер, не было. Але Пасху святкавалі. Яйкі красілі. Булкі пяклі. Некаторыя дык хадзілі. Пелі, а мы не хадзілі. На Пасху пелі васолы:

Вялік Святы нам дзень настаў,
Ісус Хрыстос із мёртвых устаў,
Хрыстос Васкрэс,
Хрыстос Васкрэс,
Хрыстос Васкрэс,

Вось, ну а так, як звычайна, як і ва ўсіх.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Вярбіцкага Антона Пятровіча, 1937 г. н.,***
***Вярбіцкай Раісы Міхайлаўны, 1932 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Доміным А., (2008 г.)***

## Валачобніцтва

На другі дзень после Пасхі сабіраецца кампанія. Ходзіт па хатах, пяе песні тых, каго ў етай кампаніі нада ўгасціць.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Зімнецкага Вікенція Філіпавіча, 1936 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А.,***
***Шурмель С., Булаховай М (2008 г.)***

### Валачобная песня гаспадыні

У нас сягоння госці былі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Гаспадыні шубу шылі.
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Яны шылі ды пакарацілі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Яны златам надтачылі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Златам надтачылі, а срэбрам падбілі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Частуй гасцей, каб бывалі часцей,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Падстаўляй драбінку, лезь па саланінку,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
А скавародку ў печ, па яечкі ў клець,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Частуй гасцей, каб бывалі часцей,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Гэтыя госці недакучныя,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
У год раз бываюць і не дакучаюць,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Пад акном спяваюць, дзвярэй не адчыняюць,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.

Калі ў хаце была маладая дзеўка, спявалі:

А на вуліцы
Хрыстос, сын Божы, Васкрэс!
Табун дзевачак,
Табун красненькіх
Вось адтуль, адколь
Млоды Колечка.
Ён іх разагнаў,
Адну Танечку
Ён к сабе ўзяў.
Яна прасілася,
Яна малілася:
– Ой, пусці, пусці,
Млоды Колечка.
– Хоць жа я пушчу,
Але засначу,
Тваю кожачку,
Усю пакудлачу.

**Валачобная**

*Спявалі ў хаце, дзе была маладая дзяўчына:*

А ў горадзе ў Адэсе,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Муравалі нову цэркву,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Муравалі з трыма акнамі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
У акно адно сонца свеце,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
А ў другое сокал леце,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
А ў трэцяе сам Бог глянуў,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Сам Бог глянуў, слязу раніў,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Па той слязе пайшлі рэкі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Па тых рэках клалі кладкі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Клалі кладкі габляваныя,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Габляваныя, мураваныя,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Па той кладцы ішла паненка,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Красна паненка, млода Аленка,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
І ўраніла злоты персцень,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Тудой ішлі рыбалоўнічкі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Рыбалоўнічкі, мае брацеткі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Вы закіньце шаўковы невад,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Ды дастаньце злотны персцень,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
А я ж вам жа знадаб'юся,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
А як будзіце жаніцеся,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
За першага сама пайду,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
За другога сястру аддаш,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
А за трэцяга суседачку,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Сама пайду пры розамі,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
Сястру аддаш у золаце,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
А суседку ў аксаміце,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.

Пры розамі пажываць будзем,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
У золаце панаваць будзем,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.
У аксаміце жыта жаць будзем,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы.

**Валачобная песня (васолы)**

А на мары́ гібка кладка,
Тудой ішла Бож'я Матка.
Хрыстос васкрэс. – 3р.
Яна ішла, блукаючы,
Свайго сынка шукаючы.
Спаткалася з анёлкамі:
– Анёлачкі, збавіцелі, ці не відзелі майго сына?
Адзін кажа: «Я не відзеў»,
Другі кажа: «Я не бачыў»,
Трэці кажа: « Я сам там быў,
Я сам там быў і ўсё відзеў.
Твайго сына жыды бралі,
Жыды бралі на крыж клалі.
Ручкі, ножкі распявалі і гваздзямі прыбівалі,
І гваздзямі прыбівалі, гарачу кроў разлівалі,
На сем сажань ды ўкапалі,
На сем сажань ды ўкапалі.
Ды Ісуса Хрыста ўкладвалі,
Жоўтым пяском засыпнулі,
Белым камнем навярнулі.
Ясус Хрыстос страпянуўся,
Белы камень адвярнуўся, жоўты пясок асыпнуўся.
На тым месцы касцёл сам стаў,
У тым касцёле прыстол стаяў.
За тым прыстолам сам Бог сядзеў,
Сам Бог сядзеў, ключы дзяржаў.
Дзяржаў ключы збавельныя,
Баўляў душы пякельныя.
Усе душы павыбаўляў, усе душы не выбавіў.
Тая душа была грэшна, атца з маці не слухала,
Брата з сястрой зневажал.
Атцу б з маці ногі мыла,
А сама тую б ваду піла.
Ваша б тую ваду піла,
Брата з сястрой перапрасіла».
Хрыстос васкрэс – 3р. (Пасля кожнага слупка).

***Запісана ў в. Траянец Лагойскага р-на***
***ад Дубаневіч Ніны Капітонаўны, 1934 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Давідовіч Н. (1998 г.)***

**Вітанне гаспадарам!**

Там, на гарэ Галгофе
Жыдове стаялі, Ісуса Хрыста
У церновы вянец каранавалі.
Маць яго ў нагах стаяла,

Горкім голасам рыдала:
– Сын мой прекрасный,
В очах маіх ясных.
На крэсце ўміраеш,
Мяне, Прычысту маці, пакідаеш.
Но Ісус Хрыстос на трэці дзень васкрос.
Нам всем вялікую радасць прынёс,
А мы гэту радасць спаўняем.
Ад нас, пану-гаспадару, валачобных спяваем.

***Запісана ў в. Траянец Лагойскага р-на***
***ад Жаўняровіч Тацціяны Іосіфаўны, 1923 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Давідовіч Н.***

На Вялікдзень раніцай дзеці хадзілі па жачкі. З яйкамі гулялі ў біткі і качалі ў лубкі. Пеклі кулічы і булкі, а таксама свяцілі. На Вялікдзень хадзілі валачобнікі і пелі валачобныя песні. На Вяліканне ў хаце, дзе памёр чалавек, не спявалі. Дарылі хто што мог: сала, яйкі, водку, хлеб, булку.

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на***
***ад Гуніч Ніны Іванаўны, 1913 г. н.,***
***Новак В. С.***

**Велікодныя царкоўнага паходжання**
**Васолы**

Вялік святой нам дзень настаў,
Са славаю ў грабу сіяў,
Хрыстос Васкрэс!
Суботня поўнач ліш прайшла,
Зара нядзелі чуць узышла,
Як ангел дзвер ва гроб адкрыў
Хрыстос Васкрэс!
У ту ноч, як жоны з гробам йшлі
І міра іншае няслі,
Но смотраць – у гробе хто-та есць,
Хрыстос Васкрэс!
Там быў у бліскучых рызах лік,
Пасланнік Бога там для іх,
Там светлы ангел быў з нябёс,
Хрыстос Васкрэс!
Ідзеце, дайце знаць аб том
І ўсім яго ўчэнікам.
Прэдуславіл ангел ту весць,
Як ангел, і на небясі
Усе радуйцеся на зямлі,
Усе весяліцісь людзі здзесь.
Хрыстос Васкрэс!
У цэркавах лікуясь і ў дамах,
Нам жысць адкрыта ў небесах,
Хрыстос Васкрэс!

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на***
***ад Папроцкай Алены Іванаўны, 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Тамашэвіч С.***

У нашай вёскі хадзілі валачобнікі, а таксама дзеці бегалі і прасілі жачкі. На ўсеночную мы шлі ў царкву, а на досвітку свяцілі пасху. Усёй сям'ёй шлі дадому. У гэты дзень быў багаты стол:

сыр, масла, каўбаса, мяса варонае. Красілі яйкі ў чырвоны колер. Красны колер – сімвал крыві пралітай Хрыстосам. Гулялі ў біткі і качалі ў лубкі.

*Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на*
*ад Рыбчак Яўгеніі Нікандраўны, 1941 г. н.,*
*Новак В. С.*

**Велікодная песня (віншаванне)**

На гарэ Галгофе яўрэі стаялі,
Ісуса Хрыста распіналі.
Маці яго пад крыжом стаяла,
Громкім голасам рыдала:
– Сын мой вазлюбленны!
– Паміраю, цябе адну астаўляю.
Не плач, маці мая,
На трэці дзень уваскрэсну!»
Мы гэту радасць прынімаем
І добрых людзей з празднікам паздраўляем.

*Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на*
*ад Папрыцкай Алены Іванаўны, 1927 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Тамашэвіч С.*

Булкі пяклі, яйцы красілі. Яйцы красілі ў красный цвет. Паску пеклі радзіцелі. Гулялі з яйцамі ў біткі. Бітыя яйцы елі. Глядзелі, чыё крапчэйшае яйцо. Хадзілі валачобнікі. Хадзілі з гармонікам і спявалі розныя песні.

*Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на*
*ад. Вашкевіч Ганны Іосіфаўны, 1934 г. н.,*
*Новак В. С.*

На Вялікдзень мы красілі яйкі, пяклі булкі. На яйках воскам хрэсцікі малявалі. Хадзілі вёскай, моладдзю, пелі, а нам давалі сала, яйкі. Усе пелі і ведалі песню «Васолы»:

І на дзень настаў са славай з гробава сея
Хрыстос Гасподзь, наш ясень свет,
Хрыстос Васкрэс!
Хрыстос Васкрэс!
Хрыстос Васкрэс!
Суботня ноч калісь прыйшла,
Зара ў нядзелю чуць зашла,
Каб ангел гроб Хрыстоў атверг,
Хрыстос Васкрэс!
Хрыстос Васкрэс!
Хрыстос Васкрэс!
В ночку жоны к гробу шлі
І міласердзіе неслі,
Но смотрят – в гробе его нет,
Хрыстос Васкрэс!
Хрыстос Васкрэс!
Хрыстос Васкрэс!
Тобі кто есць –
Хрыстос Васкрэс!
Хрыстос Васкрэс!
Хрыстос Васкрэс!
То был бы шчаслів хрэст закрыць,
Он Богам послан был для ніх,

Хрыстос Васкрэс!
Хрыстос Васкрэс!
Хрыстос Васкрэс!
І, дзеці, дайце знаць а том
Усім его ученікам,
Сказал ім ангел із небес:
Хрыстос Васкрэс!
Хрыстос Васкрэс!
Хрыстос Васкрэс!
Гуляйце, пойце ўсе, весяліцесь,
Не нада слёз,
Хрыстос Васкрэс!
Хрыстос Васкрэс!
Хрыстос Васкрэс!

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Алены Ігнатаўны, 1923 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

А ўжо на Пасху хадзілі, пелі. Кума на Пасху хрэснікам жачкі (валачобнае) прынося. А тады гэту куму як напоюць, яна чуць дамоў зайдзя. Булкі пячом, яйкі красілі. Прыходзілі дзеткі. Ужо адрэжаш булкі, яечка дасі, ці канфетак. На першы дзень яны прыходзяць па валачобнае, а тады ідуць. Мы ўжо самі паелі, тады дачка ці сын, як яны аддзельна жывуць, ужо застолле робюць. Ужо ў нас весела: унукі, дочкі, зяці.

З суботы на нядзелю ездзім у цэркву. Асвяшчаем свяцонку. Ну а тады прыходзім і гэта ўсё, што пасвянцілі, утрачкам ядзім. Прышлі вечарам, часоў у дзесяць, і стаім, пакуль бацюшка не пасвенця. Мы прыходзім вот, бывае, у часы тры-чатыры, ну бальшанство да пяці. А тады гэта ж яшчэ цёмна – пяць, тады мы селі во з ім. Парабілі работу, скаціну дагледзім, сядзем перакусіць. Тут ужо ідуць мае, трэба накрываць стол. Ужо рады, што да Пасхі ўсе дажыліся і ўжо ўгашчэнія. Ужо ўнукам. Зяцю ці дачцэ, ці сыну жачкі даеш. Булку даеш ім з сабой. Вот так Пасху гулялі.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Пустаход Ніны Віктараўны, 1929 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Доміным А. (2008 г.)***

Перад гэтым святам мы саблюдалі пост. Нельзя было есці малако і ўсё, як цяпер. Мы елі во што: таўклі семя, бульбу, рабілі саладуху з мукі жытняй.

А на само свята красілі яйкі шалушкамі з лука. Гулялі ў біткі. Вот праснёмся рана, мамка ўжэ накрасіла яйкі, хапаеш па аднаму і давай гуляць. Хто каго абдура. Хлопцы нас возьмуць ды і надураць, зробяць яйка з дрэва і патаўкуць нашы яйкі.

Пасля этага хадзілі на могілкі і насілі эці яйкі і свянцоныя булкі туды. Валачобнікі ў нас не хадзілі.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Булыга Надзеі Пятроўны, 1935 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

На Пасху збіралася маладзёж і хадзілі спявалі па хатах. Калі валачобнікі паспявалі гаспадарам, а тыя нічога не далі, то пачыналі з іх высмейваць:

Каб у тваёй хатцы крапіва расла,
Каб ты, мая жоначка, жабраваць пайшла.

На Вялікдзень рабілі латочкі. Іх касяком ставілі і каталі яйкі. Дык і многа людзей сабяруца. Вось адзін скоціць, а калі наступны пападзе ў гэтае яйка, дык і забярэ яго, ды так многа людзей гулялі.

## Васолы

Вялік святы нам дзень настаў,
Са славай з гроба вассіяў
Хрыстос Гасподзь, наш вечны свет,
Хрыстос Васкрэс – 2 р.
Ту ночку гроб ужо знайшлі
І міра цэннае няслі,
Но смотраць, мо там нехта есць,
Хрыстос Васкрэс – 2 р.
Но там ужэ быў гроб атверс,
Хрыстос Васкрэс – 2 р.
Хрыстос Васкрэс.
Це жоны плакаць сільна сталі,
Што ў гробе цела не знайшлі,
Но смотраць ў гроб – там нехта есць,
Хрыстос Васкрэс – 2 р.
Хрыстос Васкрэс.
То быў у блесцяшчых рызах лік,
Пасланнік Божы быў для ніх,
То светлы ангел быў с небес,
Хрыстос Васкрэс 2 р.
Хрыстос Васкрэс.
І жонам ангел тот казал:
Хрыстос Гасподзь із мёртвых встал,
Што ішчыце вы здзесь?
Хрыстос Васкрэс – 2 р.
Хрыстос Васкрэс
Ідзіце, дайце знаць а том
І ўсем его учэніком
Прэзначыў ім ту весьць,
Хрыстос Васкрэс – 2 р.
Хрыстос Васкрэс
В цэрквях лікуйце і ў дамах,
Нам жызнь адкрыта ў небесах,
Весяліцісь, людзі, здзесь,
Хрыстос Васкрэс – 2 р.
Хрыстос Васкрэс.
Как ангелы на небесі,
Все радуйцесь і на землі,
Прэзначыў ангел ім ту весьць,
Хрыстос Васкрэс – 2 р.
Хрыстос Васкрэс.

***Запісана ў в. Штанюкі Лагойскага р-на***
***ад Крэнь Марыі Станіславаўны 1938 г. н.,***
***Новак В. С.***

## Гаспадарочык, мой сакалочык

Гаспадарочык, мой сакалочык,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Устань раненька, умывайся бяленька,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Адчыні акно, паглядзі ў гумно,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Што ў тваім гумне парабілася,

Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Нова цэркаўка станавілася,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
А ў той цэркаўцы прыстолы стаяць,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
За тымі прыстоламі ўсе святы сядзяць,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Усе святыя сядзяць, кніжачкі ў руках дзяржаць,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Сам Гасподзь ў кніжачку глядзіць,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
У кніжачку глядзіць ён, чытая,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Ён чытая, святкі збірая,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Катораму святку наперад пайсці.
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Свята Ражство наперад пайшло,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Вадохрышча ваду хрысціла,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Ваду хрысціла, на свет пусціла.
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Святы Аляксей ляды разбіваў,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Святы Аўдакей такі вымятаў,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Святы Саракі, сорак вы раяў,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Святы чацвярок булачак напёк,
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!
Свята Радаўніца – абрадуй, Божа!
Хрыстос Васкрэс, сын Божы!

***Запісана ў в. Юзадава Лагойскага р-на***
***ад Дзігілевіч Л. П., 1914 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мазгуновай К.***

Любілі новае штоб было, адзёжа, хадзілі па хатах. Людзі яйцы красілі, нам давалі, мы іх качалі, ямкі дзелалі, яйцы качалі, ігралісь.

***Запісана ў в. Юльянова Лагойскага р-на***
***ад Зубаравай Таццяны Сямёнаўны, 1935 г. н.,***
***Новак В. С.***

Мы ідзем, ідзем
Пад багаты дом.
Зялён явар, зялён явар
Пад багаты дом.
Дзень добры нясём.
Зялён явар, зялён явар.
Дзень добры таму,
Хто ў гэтым даму!
Зялён явар, зялён явар.
Гаспадарачак, міл саколачак.

Зялён явар, зялён явар.
Ці спіш, ці ляціш,
Ці адпачываеш.
Зялён явар, зялён явар.
А калі ты спіш,
Дык Бог з табой.
Зялён явар, зялён явар.
А калі ляжыш,
Гукай са мной.
Зялён явар, зялён явар.
А мы госцікі
Надакучныя.
Зялён явар, зялён явар.
Не часта ходзім.
Дакучаем,
Зялён явар, зялён явар.
Толькі ў гадочак
Адзін разочак.
Зялён явар, зялён явар.

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на***
***ад Гунік Ніны Андрэеўны, 1926 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Ліхачовай С.***

**Юр'е**

На Юр'я выганялі кароў вярбой, якую асвяшчалі ў царкве.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Залуцкай Тацццяны Міхайлаўны 1922 г. н.,***
***Новак В. С.***

На Юр'е выганялі кароў пасвечанай вярбой. Галінкі пасвечанай вярбы падкладвалі пад вугал хаты для засцярогі. Іншы раз свяцілі лапкі сасновыя або хваёвыя, і калі выганялі ў поле кароў, то махалі гэтымі лапкамі, каб яны не балелі. Пасвечаную вярбу ў хаце ставілі і абносілі вярбу вакол хаты, каб не было пажару.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

*На Юр'я выганялі кароў у поле і прыгаворвалі:*
Сам Ісус Хрыстос ішоў з нябёс,
В правай руке крэст дзяржаў.
Ідзі, мая карова (мянушка),
Цеснымі цёмнымі вуліцамі,
Цябе будуць устрачаць чарадзейкі-ліхадзейкі,
Не бойся – у цябе ногі, у цябе рогі,
Рагамі закалі, нагамі затапчы,
Хвастом замяці,
У свой двор са ўсім дабром уйдзі,
Выпусціць каровачку з вербачкай у поле.

***Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на***
***ад Солуб Лідзіі Іванаўны, 1946 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

**Прымаўкі на Юр'е**

Прыйшоў Юрка на свет – старым бабам канец.
Прыйшоў Юр'е, каб кармоў было ў дурня.

*Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на*
*ад Гуніч Ніны Іванаўны, 1913 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Атрашкевіч Н.*

**Велікодная песня**

А ці дома, дома пане-гаспадару?
А ці дома, дома пане-гаспадару?
Віно ж, віно зеляно!
Віно ж, віно зеляно!
А няма дома, паехаў у поле,
А няма дома, паехаў у поле.
Поле аб'язджаці, жыта аглядаці,
Поле аб'язджаці, жыта аглядаці,
Юр'я з Міколай сустракаці,
Юр'я з Міколай сустракаці.
– Святое Юр'я, Якаво жыта?
– Святое Юр'я, Якаво жыта?
– Пане-гаспадару, поля твайго жыта,
– Пане-гаспадару, поля твайго жыта.
Сам Бог ходзя, жыта родзя,
Сам Бог ходзя, жыта родзя.
Пры дарозе жыта ўдалося,
Пры дарозе жыта ўдалося,
А ў даліне ў трубы павілося,
А ў даліне ў трубы павілося,
А на гарэ пахілілася,
А на гарэ пахілілася.
Едзь дадому, пане-гаспадару,
Едзь дадому, пане-гаспадару,
Наймай жнейкі маладзенькія,
Наймай жнейкі маладзенькія,
У іх сярпочкі залаценькія,
У іх сярпочкі залаценькія.
Жменьку нажне – снапок звяжа,
Жменьку нажне – снапок звяжа,
Спапок звяжа, у капу ставя,
Спапок звяжа, у капу ставя,
У капу ставя, на воз бярэ,
У капу ставя, на воз бярэ,
На воз бярэ, у гумно вязе,
На воз бярэ, у гумно вязе.
У гумно вязе, у тарпу кладзе,
У гумно вязе, у тарпу кладзе.
Дай жа божа, пане-гаспадару,
Дай жа божа, пане-гаспадару,
Пане-гаспадару, у тарпе прыкладам,
Пане-гаспадару, у тарпе прыкладам,
У тарне прыкладам, на таку ўмалотам.
У тарне прыкладам, на таку ўмалотам,
На таку ўмалотам, у свірне прысыпна.
На таку ўмалотам, у свірне прысыпна,

У свірне прысыпна, у млыне прымальна.
У свірне прысыпна, у млыне прымальна,
У млыне прымальна, у дзяжы падходна,
У млыне прымальна, у дзяжы падходна.
У дзяжы адходна, у печы румяна,
У дзяжы падходна, у печы румяна.
У печы румяна, на стале прыкройна.
У печы румяна, на стале прыкройна,
На стале прыкройна, у сям'і давольна,
На стале прыкройна, у сям'і давольна.
Дай жа божа, пане-гаспадару,
Дай жа божа, пане-гаспадару,
За год прыждаці,
За год прыждаці.
Гэтай парой панам назваці,
Гэтай парой панам назваці.
Жыці-быці, а нас надарыці,
Жыці-быці, а нас надарыці:
Капу яек нялічальных,
Капу яек нялічальных,
А сыр на тарэлку,
А сыр на тарэлку.
Чырвонцы ў паперку,
Чырвонцы ў паперку.
І два літры нам запіці,
І два літры нам запіці.

***Запісана ў в. Весніно Лагойскага р-на***
***ад Касоўскай Марылі, 1920 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гаварковай Т.***

Юр'я – гэта празднік, на яго першы раз выганялі жывёлу. Бралі свечку і пасвянцоную ваду, запальвалі свечку і абыходзілі карову, пасвянцонай вадой палівалі яе і чыталі загавор. Брала пасвянцонае яйцо і клала пад парог, штоб жывёла была заўсёды сытая, круглая, як яйцо. Пастуху, што выганяў карову, маці давала што-нібудзь смачнае, а бацька ішоў на поле і глядзеў, які там ураджай. Песен ніякіх не спявалі ў гэты дзень.

***Запісана в. Закалюжжа Лагойскага р-на***
***ад Емяльянавай Надзеі Пятроўны, 1937 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

На Юр'я не пытайся ў дурня. Бяры за сявеньку і сей памаленьку.
Адзін галодны, другі халодны. Вось табе, бабушка, і Юр'еў дзень.
У нас кароў у гэты дзень не выганялі.
Гэта завісела ад прыроды. Звычайна выганялі ў маі. А Юр'я 23 апрэля.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на***
***ад Закрэўскага Івана Аляксандравіча, 1931 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Юр'я – два дурня, вясной – галодны, увосень – халодны. Нічога не трэба рабіць, бо скаціна будзе нядобрая.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Ніны Сямёнаўны, 1938 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Агонь палілі, усе сабіраліся, пьянка – гулянка, во на Юр’е.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад бабушкі Агацці***

На Юр’е гаварылі, што самыя сільныя марозы. Ёсць два Юр’і: галоднае і халоднае.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Мароз Надзеі Фацееўны, 1925 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Мы выганялі кароў. Бралі пасвянцоную воду і абязацельна пырскалі трошкі хлеў. Бралі свечку і хлеб і абыходзілі карову. Бралі замок і лажылі пад парог, каб ваўкі не адкрылі пасць на кароў.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Петрашко Лідзіі Лявонцьеўны, 1932 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М. (2008 г.)***

На Юр’е, калі выганялі кароў у поле, то мураўі прынасілі, каля кожнай хаты іх пасыпалі. Еслі жэншчына калдунья, то карова не выйдзе ў поле. Хадзілі нават у вёску Чэрнева, каб адрабіць гэта.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы***
***ад Грынь Ганны Пятроўны, 1953 г. н.***
***(раней пражывала ў в. Нарбутава),***
***Новак В. С.***

Пра Юр’е гаварат на сяле: вот тебе бабушка Юр’ев день. Ещё гаворят: на Юр’е ўвесь хлеб і ў дурня.

***Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на***
***ад Мінкувіч Антона Антонавіча, 1928 г. н.***

Юр’е ёсць веснавое і восеньскае. Веснавое – калі жывёлу ў поле выганялі, а восеньскае – калі кароў заганялі ў хлеў да вясны.

***Запісана ў в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Акуловіч Валянціны Адольфаўны, 1933 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М. (2008 г.)***

На Юр’е першы раз карову выганялі вербачкай у поле. Гэту вербачку чаплялі пад страху, а потым спальвалі і попел лажылі на грады, каб ураджай быў добры.

***Запісана ў в. Рэпішча***
***ад Зінькевіч Раісы Пятроўны, 1952 г. н.,***
***Новак В. С.***

Гэта празнік, калі выганялі жывёлу ў поле. Пастухам давалі тады добры пачастунак. Маці пырскала карову пасвяцонай вадой.

***Запісана ў в. Скарады Лагойскага р-на***
***ад Умэцкай Ніны Анатольеўны, 1930 г. н.,***
***Пракопчык Жанны Канстанцінаўны, 1968 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

На Юр’е каб было і сена ў дурня.

Птушка не ўе гняздо, а дзеўка не пляце касу.

***Запісана ў в. Скарады Лагойскага р-на***
***ад Умэцкай Ніны Антонаўны, 1930 г. н.,***
***Пракопчык Жанны Канстанцінаўны, 1968 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

На Юр’е выганялі кароў вербачкай свянцонай на пашу.

***Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на***
***ад Шавель Галіны Іванаўны, 1932 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бярдычавец Т., Домінам А.,***
***Елавой Н., Булахавай М. (2008 г.)***

Жывёлу стараюцца да Юр’я выгнаць у поле, да Юр’я, каб сена было і ў дурня.

***Запісана ў в. Стрый Лагойскага р-на***
***ад Крэнь Ганны Канстанцінаўны, 1940 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

На Юр’я хадзілі на кладбішча, плялі вянкі і адзявалі адзін аднаму.

***Запісана ў в. Стрый Лагойскага р-на***
***ад Рутакоўскай Наталлі Аляксандраўны, 1933 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

На Юр’е мы абыходзілі поле з іконай.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Алены Ігнатаўны, 1923 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

На Ю’я выганялі кароў свянцонай вярбой на поле. А вярбу гэтую падторквалі пад страху ў хляве.

***Запісана ў в. Штанюкі Лагойскага р-на***
***ад Крэнь Марыі Станіславаўны 1938 г. н.,***
***Новак В. С.***

**Тройца**

Ветачкі бярозы ламалі, прыносілі ў хату і лажылі пад сена ў сарай, каб мышы не вадзіліся. Вадзілі карагоды, спявалі песні аб добрым ураджаі.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Марыі Віктараўны, 1932 г. н.,***
***Новак В. С.***

Хадзілі ў лес, сабіралі траву, прыносілі яе дамоў і расцілалі на пол. Спалі на палу. Не збіралі траву, пакуль не высахне.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Смаляка Алеся Мікалаевіча, 1937 г. н.,***
***Новак В. С.***

Хадзілі ў лес, завівалі бярозкі. Звычайна ў нас не куміліся. Я помню, як строілі дом, пад цэмент лажылі траву, каб дом быў крэпкім. Звычайна вадзілі караводы.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Шуркевіча Рыгора Станіслававіча, 1930 г. н.,***
***Новак В. С.***

На куце ставілі веткі бярозы, пад паталок тыркалі, у варотах ставілі, калі яны высыхалі – насілі ў сарай і клалі пад сена каля сцен, каб мышы не елі сена.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

Перад Тройцай у суботу ставілі бярозкі. От глядзіш па ёй ці будзе сушыцца сена добра, ці не. Як не высахлі добрэ, значыць будзе пагана сохці, а як добра высахлі, дык добра будзе сохці. Сена

ў гэтым годзе не очэнь-та будзе сохці. Іх ложуць у сена каровам у пуню. Пад сена, каб сахранялася яно.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Луцкай Зінаіды Мікалаеўны, 1941 г. н.,***
***Новак В. С.***

У нас на Тройцу бярозкі ставілі, у хаце бярозкі пад балкі наткаем усякіх: і рабіны, і топал. – усяго. І аеру разложым солнышкам на палу. А тады гэту бярозу, як тая высахне, лажылі ў пуню і наверх сена, каб мышы не елі.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Міхневіч Валянціны Мікалаеўны, 1938 г. н.,***
***Новак В. С.***

На Сёмуху вешалі бярозку, каб сена харашо ў пуні ляжала. Вот як ужо кладзеш сена, от гэтыя бярозкі збіраеш і пад сена кладзеш.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Андрушкевіч Зінаіды Канстанцінаўны 1925 г. н.,***
***Новак В. С.***

На Тройцу бярозкі вешалі. А вешалі, кагда сена кладзеш на зіму, дык іх ложыш пад ніз, каб мышы не елі сена.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Шаўчэнка Ганны Іосіфаўны 1934 г. н.,***
***Новак В. С.***

Вешалі бярозавыя галінкі – яны значаць сашэствіе Бога апосталам. Яна азначае, што дрэва расце, дык і памяць і аера таксама будзе расці. Гэтыя галінкі падкладалі пад сена, каб крысы сена не секлі.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Залуцкай Таццяны Міхайлаўны 1922 г. н.,***
***Новак В. С.***

На Тройцу ўпрыгожвалі хаты зеленню, а тая ветка, якая засталася з тога года, яе прыносілі ў сарай. Маці мая заўсёды хадзіла ў цэркву, бо гэта лічылася вылікім празнікам. На Тройцу мы спявалі песні. У нас хату ўпрыгожвалі бярозкамі, а ў іншых мясцовасцях іншымі дрэвамі.

***Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на***
***ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Каб паненка вялікая расла,
На Сёмуху замуж пашла,
Нас на вяселле прыгласіла,
А мы горды не былі,
На вяселле прыбылі.
Хрыстос Уваскрэс,
Хрыстос Уваскрэс,
Хрыстос Уваскрэс!

***Запісана ў в. Астрошыцы Лагойскага р-на***
***ад Лагуноўскай Тамары Васільеўны, 1929 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Табалевіч В.***

На Троіцу ездзілі да крыжа, на кірмаш, ваду бралі каля крыжа, казалі, там цудоўная вада. На Троіцу ставілі веткі – бярозавыя і рабінавыя. Захоўвалі ўсё ў доме. Потым галіны высыхалі, іх называлі май. Май лажылі пад сена, каб мышы не грызлі.

***Запісана ў в. Дзераўно Лагойскага р-на***
***ад Рудкоўскай Алены Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

На Троіцу мы ставілі ў хаце галінкі клёну і бярозы. Пасля таго, калі яны высыхалі, галінкі не выкідвалі. Іх спальвалі, а іншыя клалі пад сена.

***Запісана ў в. Зарэчча Лагойскага р-на***
***ад Суднікоўскай Алы Міхайлаўны, 1933 г. н.,***
***Новак В. С.***

Троіца заўсёды нерабочая. У гэты дзень увечары былі танцы. На Троіцу ў хаце і на падворку вешалі бярозу, радзей клён, на дол рассыпалі аер. Пасля свята гэтыя ветачкі не выкідвалі, а спальвалі. Потым іх рассейвалі па агародзе, каб добры быў ураджай. У хаце бярозу вешалі ад дрэнных людзей.

***Запісана ў в. Зарэчча Лагойскага р-на***
***ад Шавель Алены Уладзіміраўны, 1943 г. н.,***
***Новак В. С.***

Хадзілі ў лес, ламалі бярэзнік, клалі веткі на іконы. Не завівалі бярозкі, не вадзілі карагоды.

***Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на***
***ад Ермановіч Марыі Сцяпанаўны, 1925 г. н.,***
***Новак В. С.***

У гэты дзень праходзяць багаслужэнні, ісходзяць огненныя языкі. Святы Дух в відзе агня. Па легендзе, з гэтага дня людзі пачалі гаварыць на розныя языках. У гэты дзень яешню пякуць у полі. Ставілі зялёныя веткі на вокны – праявленіе новай жызні.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на***
***ад Закрэўскага Івана Аляксандравіча, 1931 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Абсаджвалі бярозамі ўсе двары, рабілі алею. Мялі вуліцы і ў хаце торкалі бярозкі. У бярозавым лісце варылі яйцы – яны зялёненькімі станавіліся. Хадзілі ў госці. Траецкія Дзяды – памінальныя. Увечары рабілі стол з крупяной кашай, варанай капустай, балтухай (яечняй), пяклі пірагі з макам. Можна было і мяса есці.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на***
***ад Шыла Лідзіі Нікіфараўны, 1937 г. н.,***
***(раней пражывала ў Віцебскай вобл.)***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Абавязкова на Сёмуху ўпрыгожвалі бярозкай хату. А можна было выкарыстоўваць рабіну, дуб ці клён. Пасля свята май (бярозку) клалі ў варыўню (пастройка), каб мышы не вадзіліся.

***Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Таццяны Ігнатаўны, 1932 г. н.,***
***Дубоўскай Таццяны Рыгораўны, 1932 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Калі выганялі карову – клалі ветачку свяцонай вярбы і замок. Выпускалі карову і адмукалі замок, а гэтай ветачкай гналі карову ў поле. Яна абярагала ад Пяруна і розных шкод.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Навойчык Валянціны Мікалаеўны, 1943 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Празднавалі 4 дня. Троіца адзначалася праз 7 нядзель пасля Вялікадня. Украшалі хату толькі бярозкамі.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Турчыновіч Міхаліны Венядзіктаўны, 1926 г. н.***
***(нарадзілася ў в. Каргавішча),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Ламают бярозкі і ставяць у сена, штоб мышы не елі.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Падбярозка Сцяпана Антонавіча, 1933 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Ставілі бярозкі на Тройцу, клалі пад сена, каб мышы не елі. Бярозкі ставілі ў варотах, у дзвярах, у хаце на куце.

***Запісана ў в. Новае Чэрнева Лагойскага р-на***
***ад Акуловіч Ядзвігі Аляксандраўны, 1931 г. н.,***
***Акуліч Антона Адамавіча, 1931 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бярдычавец Т., Домінам А., Елавой Н. (2008 г.)***

Тройца – зялёныя свёнткі. Хадзілі ў лес ламаць бярозавыя веткі і большыя дзераўцы бярозы. Веткамі ўкрашалі хату, а большія бярозкі ставілі ў варотах. Калі засыхала быстра бярозка, то год будзе сухі, галодны, а калі доўга – то ўраджайны.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Петрашко Лідзіі Лявонцьеўны, 1932 г. н.***
***(нарадзілася ў в. Хадакі Лагойскага р-на),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М. (2008 г.)***

На Тройцу бярозкі ставілі на двары. А потым, як высыхалі, спальвалі іх, а попел раскідвалі на ўсадзьбе для ўраджайнасці.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Грынь Ганны Пятроўны, 1953 г. н.***
***(раней пражывала ў в. Нарбутава Лагойскага р-на),***
***Новак В. С.***

**Траецкая песня**

Нарадзілі Густу пры зялёным клёну,
Выйдзі, выйдзі, пані, з новага пакоя,
Вынесь густы хоць ползалатога.
А ў нашай густы, ручкі-ножкі невялічкі,
Трэба ёй купіці казловы чаравічкі.
Одні чаравічкі – да цэркві ходзіці,
Другі чаравічкі – водзіцы носіці,
Трэці чаравічкі – абедзец варыці.

* ***густа***– упрыгожаная дзяўчына на Троіцу

***Запісана ў в. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Шульжык Людмілы Савічны, 1926 г. н.***
***(раней пражывала ў в. Радчыцк Столінскага р-на Брэсцкай вобл.),***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Куніцкай Н.***

Троіца тожа празднік такі, як і Паска. Праздновалі і ўсё. Складаліся, выпівалі. Тры дні нічога не рабілі, шчыталася грэхам нешта рабіць на Троіцу.

***Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на***
***ад Русак Таццяны Фёдараўны, 1930 г. н.,***
***Новак В. С.***

Никогда не работали, ходили на лужайку, на маеўку. Гуляли.

***Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на***
***ад Мінкувіч Антона Антонавіча, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

На Тройцу ля варот бярозы ставілі. Тыркалі май усюды ў хаце. На кут ставілі явар, калі засыхала зелень – неслі ў сарай і клалі ў сена засушаныя бярозкі.

***Запісана ў в. Рэпішча***
***ад Зінькевіч Раісы Пятроўны, 1952 г. н.,***
***Новак В. С.***

На Сёмуху хату ўкрашалі яварам, бярозкамі. Перад гэтым мылі палы.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Зюзянюк Валянціны Аляксееўны, 1945 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М. (2008 г.)***

Режэцца бярозка і вешаецца вездзе ў хаце і ў гэты дзень нічога рабіць нельзя. Красілі яйцы ў красны цвет, бо красны цвет – сімвал краві Ісуса Хрыста.

***Запісана ў в. Скарады Лагойскага р-на***
***ад Пракопчык Жанны Канстанцінаўны, 1968 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М. (2008 г.)***

Заўсёды ў лесе высякалі галінкі бярозы і прыносілі іх дамой. Галінкі ставілі ў кут, а таксама торкалі ў паталок. Бярозу торкалі ў асноўным з-за таго, што Ісус Хрыстос колісь прытуляўся да бярозы. Веткі, калі высыхалі, іх клалі пад сена, каб мышы не грызлі, а некаторыя спальвалі і попел рассейвалі па агародзе.

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на***
***ад Гуніч Ніны Іванаўны, 1913 г. н.,***
***Новак В. С.***

На Сёмуху пелі, танцавалі, ігралі. Ну, ета пасля Пасхі. Хадзілі мы ў лес, там завівалі бярозкі. А патом прыходзілі дамой і тыркалі ўсюды зяляніну. Ну, дажэ ў вароты.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Мігунька Ганны Пятроўны, 1937 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

На Сёмуху ламалі ветачкі бярозкі, клёну і затарківалі ў хаці. На вуліцы ўкапвалі бярозкі. Усё гэта маем называлі. Чатыры дні было свята. Затым гэты май зложуць і запаляць.

***Запісана ў в. Штанюкі Лагойскага р-на***
***ад Крэнь Марыі Станіславаўны 1938 г. н.,***
***Новак В. С.***

**Праводзіны русалкі**

Купаліся. Вада была цёплая. Пілі гарэлку. Русалкай выбіралі тую дзеўку, какая первая пападзецца. Надзявалі ў длінную белую сарочку і вялі на рэчку, яна доўжна была зайсці ў ваду, акунуцца і паплыць. Но русалка красівая была, праўда, тожа выпіўшая.

***Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на***
***ад Аўласка Анатоля Іванавіча, 1952 г. н.,***
***Новак В. С.***

## ЛЕТНІЯ ЗВЫЧАІ, АБРАДЫ І ПЕСНІ

### Антоні

Эта празнік толькі нашай вёскі. Эта празнік па парафіям, завісіт от образа в касцёле. Везлі на канях ікону Святога Антонія, але коні астанавіліся ў нашай вёсцы і далей не пайшлі. Таму тут празнуюць.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Соф'і Іосіфаўны, 1935 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Святкавалася гэтае свята 13 іюня. Многа людзей сабіралася, ксяндзы. Ксёндз свеціць магілкі. Сабіраюцца шмат родзічаў. Вялікае свята.

***Запісана ў в. Новае Чэрнева Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Ядзвігі Аляксандраўны, 1931 г. н.,***
***Акуліч Антона Адамавіча, 1931 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Домінымм А., Елавой Н. (2008 г.)***

### Пятро

Прыйшоў Пятрок – адпаў лісток. Абязательна нада навязаць венік да Пятра.

***Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на***
***ад Пятроўскай Канстанціны Іванаўны, 1931 г. н.,***
***Навіцкай Галіны Канстанцінаўны, 1961 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

Ліст сабіралі і складалі, а на следуюшчы год хаты ўцяплялі.

***Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на***
***ад Навіцкай Галіны Канстанцінаўны, 1961 г. н.,***
***Пятроўскай Канстанціны Іванаўны, 1931 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Обычно хадзілі ў царкву. У гэты дзень нічога не рабілі. Цэплялі на дзерева арэлі. Каталіся дзяўчаты, а хлопцы кідаліся чым-небудзь, каб сагнаць дзяўчыну.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Аўсейка Валянціны Дзям'янаўны, 1937 г. н.,***
***Новак В. С.***

### Купалле

Звычайна называлі гэта свята Янам Купалай. Дзяўчыны завівалі вянкі і пускалі іх па вадзе. Палілі касцёр і прыгалі звычайна праз яго, прыгалі праз касцёр у пары.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Шуркевіча Рыгора Станіслававіча, 1930 г. н.,***
***Новак В. С.***

Дзелалі чучело. Палілі касцёр. Прыгалі праз касцёр. Плялі вянкі і пускалі на воду. Калі дзяўчына або хлопец знойдуць папараць-кветку, то знойдуць сваё счастье.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Смаляка Алеся Мікалаевіча, 1937 г. н.,***
***Новак В. С.***

Раскладвалі касцёр. Спяваюць песні. Прыгаюць праз касцёр, водзяць карагоды. Звычайна пускалі вянкі.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Марыі Віктараўны, 1932 г. н.,***
***Новак В. С.***

Купалле празднавалі летам з 6 на 7 чэрвіня. На празднік была традзіцыя: шукаць папараць-кветку. Той, хто яе сарве, будзе ў дастатку. На Купалу заўсёды палілі кастры, плялі вянкі, а потым прыходзілі дзяўчаты на возера і глядзелі: чый вянок паплыве первым, тая первая замуж пойдзе. Хлопцы пелі жартоўныя песні пра дзяўчат, а дзяўчаты – пра хлопцаў. На Купалле хлопец з дзяучынай прыгалі праз вогнішча разам, тады яны ўвесь год будуць разам. Былі купалаўскія песні, напрыклад:

Купалінка, купалінка, цёмная ночка.
Цёмная ночка, а дзе ж твая дочка?
Мая дочка ў садочку,
Ружу, ружу поліць,
Белы ручкі коліць,
Кветачкі рвець,кветачкі рвець,
Вяночкі звівае, вяночкі звівае,
Слёзкі пралівае.
Купалінка, купалінка, цёмная ночка,
Цёмная ночка, а дзе ж твая дочка?

***Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на***
***ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Да Купалля вада ў рацэ закрытая. Бог ваду яшчэ не адкрыў. А вот ужэ калі дзеўкі ў 12 гадзін ночы кінулі ў ваду вянкі, тады ўжо і купацца можна.

***Запісана ў в. Завішына Лагойскага р-на***
***ад Карзюк Яўгеніі Іванаўны, 1936 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Звычайна ў нас называлася гэта свята Янам Купалай. Палілі вялікае вогнішча. Цераз яго мы прыгалі, як я помню, пускалі вянкі па вадзе.

***Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на***
***ад Ліс Марыі Андрэеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

В эта врэмя (6 іюня) сенакос. Жанчыны стараліся прыйсці дамой і стараліся раней за астатніх запець купальскую песню. У якой старане вёскі прагучыць першая песня, у той старане хутка будзе свадзьба.

Калі па сенажаці мядуначка,
Калі кукавала зязюлечка (некалькі разоў).

Вечарам клалі кастры ля жыта. Дзяўчаты кідалі вянкі праз вогнішча, а хлопцы перапрыгвалі агонь. Надзявалі бяросту на палкі і бегалі вакруг жыта, каб быў добры ўраджай. Рвалі купалкі. Торкалі ў сцяну, чыя распусціцца, таму члену сям’і добра будзе.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на***
***ад Шыла Лідзіі Нікіфараўны, 1937 г. н.,***
***(раней пражывала ў Віцебскай вобл.)***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Збіралі купалкі па колькасці чалавек у сям’і: кожная кветка адпавядала пэўнаму чалавеку. Калі якая-небудзь з іх хутка вяла, гэта значыла, што гэты чалавек памрэ. На Яна нельга нічога даваць, бо скаціна не будзе весціся.

На Яна баба за ягады п’яна.

***Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Таццяны Ігнатаўны, 1932 г. н.,***
***Дубоўскай Таццяны Рыгораўны, 1932 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Палілі кастры. Прыгалі чэраз кастры. Пускалі вянкі ў прудзік.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Турчыновіч Міхаліны Венядзіктаўны, 1926 г. н.,***
***(нарадзілася ў в. Каргавішча),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

На Купалле палілі вогнішча, прыгалі праз яго. Сонца на гэта свята не гуляла. У нас быў такі случай, калі хлопец з дзяўчынай прыгалі праз касцёр, то так прыгнулі, што месяц ляжалі ў больніцы.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Падбярозка Сцяпана Антонавіча, 1933 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М. (2008 г.)***

Палілі кастры, крапіву жучковую тыркалі ў дзверы ад ведзьмакоў. Збіралі таксама купалачкі. Потым каждаму торкаеш пад белячку (доскі пад паталком). Песні пелі: «Купалачка, купалачка…»

***Запісана ў в. Новае Чэрнева Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Ядзвігі Аляксандраўны, 1931 г. н.,***
***Акуліч Антона Адамавіча, 1931 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Домінам А., Елавой Н. (2008 г.)***

Дзяўчыны плялі вянкі сабе, еслі хлопец быў, то яму. Вянкі пускалі па сапраманке (выкапаная рэчка). Еслі вянок сыйдзецца з вянком хлопчыным, значыць, пойдзеш замуж за яго. Бывае і так, еслі сыйдуцца дзявочыя вянкі, то ў гэтым годзе замуж не выйдзеш.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Зялёнка Ніны Апалінараўны, 1938 г. н.,***
***Новак В. С.***

Купалісь, пілі гарэлку. Ноч, цёпла, туман. Раздзявалісь, купаліся голымі, беглі. Ад вады ажна ноччу пар шоў, цёпла было. Но это раньше чэраз касцёр прыгалі, распальвалі на берагу, і тожа голымі прыгалі. Усе былі галышом.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Зялёнага Баляслава Пятровіча, 1934 г. н.,***
***Новак В. С.***

Разложвалі касцёр, сабіраліся саседзі, закуска, гарэлка, самагон, іІгралі песні пад гармонь, пелі, плясалі. Маладзёж попелам сыпала дарожкі ад дома мужчыны да жанчыны, да якой гэты мужчына хадзіў, а калі і вароты маглі снесць у яго і ў яе, аднесці ў канец дзярэўні і паставіць умесце, дык была такая сітуацыя, калі рышылі не іці за варотамі, а хто зняў, сказалі, каб прынеслі назад. Ніхто не пашоў, дык мужык, возле якога паставілі, парубіў іх на дрова.

Дзяўчаты варажылі, нешта ставілі зеркала, па бакам яго дзе свечкі, выключалі свет і ўглядаліся, суседка гаварыла, што так дзелала і ўбачыла сваіво будушчага мужыка.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Карэнскага Станіслава Антонавіча, 1942 г. н.***
***(перасяленец з в. Барсукі Маладзечанскага р-на),***
***Новак В. С.***

Начинается праздник с песен, плясок и конкурсов, продолжается концертом. Первый и самый смешной конкурс «Кто быстрей найдёт папараць-кветку», потом конкурс со столбами,

нужно залезть на столб, без лестницы, потом на верхушке столба висят пакеты с запиской, на которой написан приз. Нужно сорвать пакет и спуститься. Призы там разные – обычно это шампанское, но было даже, что выигрывали тазы, поросят, петухов.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Мерыневіч Вольгі, 2000 г. н.,***
***Новак В. С.***

У нас эта свята называюць Купала, Купалле. Кастёр палілі з тых ветак, якія ставілі на Тройцу. Мы ўсягда варажылі. Плялі па два вянкі і пускалі па вадзе. Калі яны сходзіліся ўмесце, то з хлопцам, якога загадала, будзеш у пары. Збіралі лячэбную траву, таму што ім прыдавалася больш лячэбнай сілы. Хлопцы скакалі праз вогнішча. Мы вадзілі карагоды і пелі песні да ўтра. Была весела.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Петрашко Лідзіі Лявонцьеўны, 1932 г. н.,***
***(нарадзілася ў в. Хадакі Лагойскага р-на),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Сабіралася маладзёж із другой дзярэўні. Песні пеялі ўсю ноч, ігралі на гармошке, палілі касцёр. Варажылі: качаліся ў пшаніцы. Зачарпнеш вады і ціхонька прайсці, не разгаварваць, пакуль у каструльку не паложыш. Прыгалі праз вогнішча. Днём жанчыны хадзілі. Сабіралі лекавыя травы-зёлкі.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Альсімовіч Галіны Сцяпанаўны, 1925 г. н.,***
***(раней пражывала ў в. Чэркасава Міёрскага р-на Віцебскай вобласці)***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Купалле па-рознаму гулялі. Варажылі. Шлі ў жыта, умываліся расой, дровы неслі ў хату. Еслі ў пары, то і я буду ў пары. Гулялі так: раздзяляліся на тры рады. Старэйшыя, сярэднія і малодшыя. Младшыя толькі паглядвалі, ну, а мы, сярэднія, пераймалі ад старшых. На Купалле палілі касцёр, пелі. У гэты дзень у вокны, вездзе ставілі бярэзнік. Потым яго збіралі і палілі на кастры. Значыць, усе дзеўкі збіраліся і пелі песні.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Мароз Надзеі Фацееўны, 1925 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Гадалі. Плялі вянок дзяўчыны на адном баку речкі, а хлопцы на другім, апускалі ў воду, калі вянок дзяўчыны і хлопца саедзініліся і паплылі радам, то яны будуць вмесце і пажэняцца, а мой зацапіўся за сук з браўна, я думала, замуж ня выду, но ў этым жа гаду встрецілa мужа, а це вянкі, якія не саедзініліся ілі к берагу заплылі, це дзеўкі замуж не пойдуць, – і з ніх смяяліся.

Ещё мне сестра рассказала (считают, што это была правда), што гадалі на ладкі, дзяўчыны спяклі 6–7 ладак, я точна не помню, што сімвалізавала. Так вот, далі яны ладкі сабаке, та первую не ўзяла, втарую пажвала і выплюнула, а трэццю занесла пад краваць і парвала лапамі. І када началась вайна, немцы хацелі ўбіць гэту дзеўку, а яна схавалась пад ту краваць, пад каторай сабака разадрала ладку. І немцы знашлі і ўбілі. Здарылася на самай справе.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад перасяленкі з в. Гарадзец,***
***Новак В. С.***

Касцёр раскладвалі, вяночкі плялі, у рэчку кідалі на пару: на ўхажора і на сябе. Калі сайдуцца, назаўтра ідём глядзець, то будзем у пары, а калі не, то не будзем. Значыць, за гэтага не пойдзеш.

***Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на***
***ад Русак Таццяны Фёдараўны, 1930 г. н.,***
***Новак В. С.***

Я на Купалле, гэта была мая самая любімая абязаннасць, вечарам ішла ў хлеў да каровы з грамнічнай свечкай на кожны вугал, пачынаючы з усходу і чытала «Отчэ наш» і «Дзеву Марыю». А свякроў мая казала, што на кожнае акно і дзвер трэба. Ад ведзьмы, як закрыю хлеў, дык на парог лажу жычку (крапіву).

Купалкі (кветкі з бутонамі) на Купалле трэба патоўхаць пад столь. А назаўтра паглядзець, чыя распусціцца, той будзе жыць, а чыя не – памрэ. Гэта трэба на кожнага з хаты загадваць.

***Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на***
***ад Паўтарачанка Аляксандры Міхайлаўны, 1948 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

С 24 июня по 7 июля – русалочьи дни. В эти дни гадают. Гадания эти считаются правдивыми. Самый сильный из русалочьих дней – **день Ивана Купала.** Празднуется с 6 на 7 июля. В образе Купалы представлют молодую девушку. В этот день разжигали костры, через которые потом прыгали; водили хороводы вокруг костра, гадали, пели песни, плели венки, которые потом спускали на воду. Гадали на венках с горящими свечами и пускали их на воду. Ещё в этот день самое главное – искали кветку папоротника, считалось, что найти его мог не каждый, а только тот, кто имел доброе сердце и чистую душу. Цветёт этот цветок синим огоньком.

Купалінка,
Купалінка,
Цёмная ночка.
Цёмная ночка,
Дзе ж твая дочка?

В этот день с утра мы собирали травы и цветы, плели венки для всех, кто учавствовал в празднике. Парни срубали берёзу в свой рост. Мы их украшали цветами или цветными ласкутами. Ребята разводили костёр, возле которого всё гулянье и проходило. Все выстраивались вокруг берёзы и водили хоровод и пели песню:

Во поле было во поле,
Стояла берёза.
Она ростом высока,
Водицу носила. Водицу носила
Листом широка…
Девица-красавица
Дождичка просила…
Зашуми моря светлопеные,
Шелести дубы вековечные,
Засверкай мечи разудалые,
Расплодися земля…….
Божия… – свети освящайся,
От земли до неба – свети, освящайся,
От соли да хлеба – свети, освящайся….

В воду кидали венки и цветы, начинали купаться. После этого девушка разжигала костёр. Тут и начиналось гулянье, водили хороводы и пели песни:

Ой, на святого Купалу,
Ой, на святого Купалу,
Там ласточка купалась,
На бережёчке сушилась,
Красная девица журилась.
Было лето, иль не было,

Мати гулять не пускала,
Золотым ключом замыкала.
Я ж на святого Купалу
До милого побежала…
Купало, Купало,
Где ты зимовало?...
… На святого Купалу
Летели гуси ряд по ряду,
На святого Купалу,
На святого Купалу,
Крикнули гуси раз по разу….

Когда костёр догорал, начинался выбор суженых. Девушка хлопает парня по плечу и убегает, а он бежит её догонять. Поймав, ведёт её к костру, через который они прыгают. Если при прыжке руки не разойдутся, то пара составилась. А разойдутся, то каждый ищет себе новую пару. Ночью на реке суженые обмениваются венками, после этого каждый пускает свой венок по воде.

Ой на святого,
Ой на Купалу
Девки гадали,
Венки кидали.
Кидали в воду,
В воду быструю,
Скажи (название реки),
Про жизнь молодую…

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Яскевіч В.М., 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Курыбінай І.***

Гадалі на водзе, са свечкі ў ваду капалі. Там відзелі сужанага.

***Запісана ў в. Скарады Лагойскага р-на***
***ад Пракопчык Жанны Канстанцінаўны, 1968 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Ой, малыя былі, вясёлыя. З радзіцелямі дагаварываліся, штоб разрэшылі ў доме гуляць. Сабіралася ўся маладзёж, песні пелі. У гульні гралі, танцавалі. Магнітафонаў етых не было тады ў нас, пад гармонь плясалі. Весела было.

У «платочак» гулялі. Выбіралі дзеўку, давалі ёй платочак. Яна станавілася ў цэнтр круга і плясала. А ўсе вакруг яе хадзілі. Патом яна выбірала хлопца. Яны танцавалі ўмесце, патом яны цалаваліся, дзяўчына станавілася з усімі разам, а хлопец аставаўся ў кругу, танцаваў. Патом выбіраў сабе дзяўчыну. Так па кругу. Маладыя былі, дурныя.

Песні пелі. Я большэ ўсяго любіла песню «Ветка сірені»:

Ветка акацыі стучыцца в стекло,
Счастье томілось, да міма прошло.
Ветка рябіны не тонет, плывёт,
Міленькі душу на ленточкі рвёт.
Ветка сірені ўпала на грудзь,
Міленькі мой, ты меня не забудзь.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Зіневіч Настассі Яўгенаўны, 1931 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Доміным А.,***
***Шурмель С., Булаховай М. (2008 г.)***

На Купалле палілі кастры, а потым прыгалі праз іх. Плялі вяночкі і пускалі па вадзе. Шукалі папараць-кветку. Пелі песні і гулялі.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Лісоўскай Алены Міхайлаўны, 1936г. н.,***
***Драгун Алены Уладзіміраўны, 1940 г. н.,***
***Новак В. С.***

На Купалле кастры распальваюць, вянкі плятуць, папараць шукаюць. На ваду вяночкі кідаюць і праз сябе кідаюць, хто пападзе у маладога хлопца.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Шаўчэнка Ганны Іосіфаўны 1934 г. н.,***
***Новак В. С.***

Трэба было прыйсці да дарогі, найсці трыпутнік і ротам яго сарваць, прыгаварваючы: «Трыпутнік, трыпутнік, ты расці пры дарозе, пакажы мне дарогу к міламу». Не павінна была разгаварваць да вечара.

***Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на***
***ад Бынкоўскай Ганны Пятроўны, 1938 г. н.***

У нас гэта свята так і называлася – Івана Купала. Мы да яго асоба не гатовіліся. У канцы вёскі хлопцы рабілі касцёр. Перад гэтым нацягвалі туды шмат дроў. Мы, як дзяўчатамі былі, плялі вянкі і пускалі іх у ваду. Чый вянок першым да берага прымкне, тая хутчэй замуж пойдзе. Калі плялі, дык песні пелі:

Купалінка, Купалінка,
Цёмная ночка,
Цёмная ночка,
А дзе ж твая дочка?
Мая дочка ў садочку
Ружу, ружу поліць.

Прыгалі праз касцёр, вадзілі хараводы вакруг. Некаторыя хадзілі ў лес папараць-кветку шукаць. Гаварылі, хто знойдзе – будзе самым шчаслівым.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Булыга Надзеі Пятроўны, 1935 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

**Варажба на Купалле**

На Купалле дзяўчаты ідуць варажыць, гаварат, што нада голенькай дзяўчыне расой пшанічнай абмыцца. Гэта ў часоў дзвінаццаць. Паходзя, памахая на гэтай пшаніцы і сама сябе вродзі бы абмые. Тады ні с кім не гавора. Прысці трэба і легчы спаць, і хто яе жаніх, той прыйдзя яе выціраць. Сасніць сон.

У нас гэтак дзевачка пашла, мы сядзелі, гулялі. Яна ўстала і пайшла ў пшаніцу. Памылася. Ну нада ж не гаварыць. Тады прыйшла дамоў, а сама, не вячэраўшы, спаць пашла. Маці кажа:

– Лёля! Там вячэра стаіць: бульба з кіслым малаком.

А яна маўчыць ціхенечка.

– Лёля, чаму ты не гаворыш?

Маўчыць. А сын спіць з нявесткаю.

– Лёля, што зрабілася? Чаго ты маўчыш?

Яна маўчыць.

– А, каб цябе халера з гэтых качэляў, во, муся, звалілася, адбілася, ён гавора.

– Міця, чаго ты ляжыш, што Лёля не гавора?

А гэта нявестка кажа:

– Мама, сёння ж Купалле. Чаго ты прычапілася?

Ну яна тады адчапілася. Лёля раніцай устала, кажа:
– Дзе там, хто прыйдзе мяне выціраць. Цэлую ноч мне не давалі спакою.
Вот. А ці гэта праўда, ці не праўда. Варажылі.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Пустаход Ніны Віктараўны, 1929 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Доміным А. (2008 г.)***

Вянкі плялі, на галаву адзявалі, сматрэлі, у каго лучшэ, па вадзе пускалі, рэчка далёка, у сажалку кідалі, кастры палілі, чэраз касцёр прыгалі.

***Запісана ў в. Юльянова Лагойскага р-на***
***ад Зубаравай Таццяны Сямёнаўны, 1935 г. н.,***
***Новак В. С.***

Праводзілі мы сонца на другую палову лета. У гэтай палавіне года кветка шчасця будзе ў народа, каб на зямлі калосссе расцілалася, ды шмат хлеба нарадзілася. Каб адзін аднога паважалі, бацьку і маці не забывалі, нашу спадчыну шанавалі, ды купальскую ноч успаміналі.

***Запісана ў в. Юльянова Лагойскага р-на***
***ад Вязовіч Марыі Іванаўны, 1951 г. н.,***
***Новак В. С.***

**Ілля**

На Іллю нельга было сена ў пуню лажыць.

***Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на***
***ад Навіцкай Галіны Канстанцінаўны, 1961 г. н.,***
***Пятроўскай Канстанціны Іванаўны, 1931 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

**Пятроў і Ільін дні**

Мы празнавалі так: бралі іконы свае з дому і абыходзілі ўсю вёску і прыгаворвалі малітвамі, каб благаславіць усіх.

***Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на***
***ад Нікіцінай Тамары Вікенцьеўны, 1930 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Булахавай М., Шурмелем С., Атрохавай В. (2008 г.)***

## ЛЕТНІЯ ПЕСНІ

### А ў полі жыта палавее

У полі жыта палавее,
У багатага душа лелее,
Што ў засеку жыта тлее.
А ў беднага радуецца,
Што новы хлеб гатуецца,
Што з багатым зраўнуецца.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Васілевіч Вольгі Мікалаеўны, 1933 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Макей І. (1992 г.)***

Ой, жаль жа мне на атца свайго,
Ажаніў мяне, малалетняга – 2 р.
Малалетняга, малаўмнага,
Ох, узяў жану ненараўную – 2 р.
Ні слова сказаць, ні снапа звязаць,

Слова скажа – не наравіцца,
А сноп звяжа – сноп развяжацца.
Запрагай, ацец, вараных каней,
Завязу жану ў далёкі края – 2 р.
І паехаў я на быстру раку,
Пасадзіў жану і з дзяцінушкай – 2 р.
А жана сядзіць, як лучынка гарыць,
А дзяцінушка, як малінушка – 2 р.
Ой, вярніся, жана, ты вярнісь сюды,
І з дзяцінушкай, і з малінушкай – 2 р.
Не вярнуся я, хоць і ўтаплюсь,
Як вечарам – дык каханачка,
А белым светам – дык нагаечка.

***Запісана ў в. Аўгустова Лагойскага р-на***
***ад Каборды Соф'і Антонаўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Сялюк А.***

Стаіць дуб у полі
Чаму не зялёны?
Малады малойчык,
Чаму не вясёлы? – 2 р.
А як жа мне жыці,
Вясёламу быці?
Чужыя жоначкі,
Як перапёлачкі,
А мая няўдалая,
На свет не годная,
Як вазьму няўдалу
За белыя ручкі,
Павяду няўдалу
К ціхаму Дунаю,
Кіну я няўдалу
Уніз галавою,
Вось табе, няўдала,
Разлука са мною.
Калінку ламаю,
Ножку яе віжу,
Удоўку кахаю,
Дзетак ненавіжу.
Не журыся, мілы,
Што дзеткі дробныя,
Ты пойдзеш з касою,
Дзеткі з грабількамі.
Касіў мілы, касіў,
Захацеў ён есці,
А яму жа есці
Некаму прынесці.
Бадай, мая каса
У круг сагнулася,
Бадай, мая няўдала
Назад вярнулася.
Бадай, маё сена
Капаю села.

Бадай, мая няўдала
Са мной радам села.

***Запісана ў в. Весніно Лагойскага р-на***
***ад Каган Марыі Данілаўны, 1928 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Табалевіч В.***

Дый паехаў Сымонка
У поле араці,
Загадаў Кацярыне
Ды абед гатаваці.
Ой, арэць жа Сымонка,
Ды на дом паглядае.
Усе жоны абед нясуць,
Кацярына не дбае.
Дааpаўся Сымоначка
Да зялёнага дуба,
Выпраг волы, пусціў волы
Да зялёнага луга.
Ды пасіцеся, волы,
Ды не бойцеся воўка,
А я пойду да доміка,
Ды баліць мая галоўка.
Як прыйшоў жа Сымонка
Да сваёй да хаты,
Сядзяць дзеці на парозе,
А дзе ж ваша родна маці?
А вот наша родна маці
Пайшла ў лес па каліну,
Забажылася, заклялася,
Што навек я вас пакіну.
Падыйшоў жа Сымонка
Да дубовай скрыні –
Няма срэбра, няма злота,
Няма жонкі Кацярыны.
Кацярына не дура –
Боты хромавы абула
І да хлопцаў пацянула.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Кохан Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Рудак Т.***

А дуб к дубу ды галовачку кланя.
Цешча на зяця правым вокам гляня.
Ня міл, зяцю, паходачка твая.
Пакінь, зяцю, ды ў бяседзе сядзець.
Ідзі дамоў, сваю маладую жану глядзець.
Ён прыйшоў дамоў:
– Мілая жана, абругала меня твая мать старая.
Яна кажа:
– Ах, мой мілы, ясная сонца,
Ня моў проціў мамкі ні слоўца.
Там у лузе калінка гарэла,
Каждая маць сваім дзіцем балела.

Там у лузе, а каліначка жарка,
Каждай мамачцы свайго дзіцятка жалка.

*Запісана ў в. Гасцілавічы Лагойскага р-на*
*ад Філіповіч Анны Флораўны, 1912 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Харaравай Т.*

**Песня касца**

На балоце касец косе.
Прылёг ды галосе:
Ці мая каса тупа?
Ці мая жонка скупа?
Людзі нясуць снедаці,
А маёй жонкі не відаці.
Пайду касу накляпаю,
Сваю жонку пабіваю.

*Запісана ў в. Жасцінае Лагойскага р-на*
*ад Жук Юзэфы Іванаўны, 1913 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Кулак Н. (1992 г.)*

**Яблынька**

Не стой, не стой, садова яблынька, на дварэ.
Не вей, не вей, буян-вецер на яе.
Не выкачвай садовых карней пад яе.
Ды яна ж у нас тры летачкі стаяла,
Ды яна ж рада, што даждала.
Не едзь, не едзь, молад Сярожка, да яе,
Ды не расплятай русую касу ў яе,
Ды яна ж яе, што суботку часала,
Ды яна ж рада, што косачку даждала.

**Гула пчолка, гула**

Гула пчолка, гула, па бару лётаючы,
Па бару лётаючы, мядочык збіраючы.
Праз цябе спазнілася, у лесе садзілася,
У лесе на верасе, на дубовым пянёчку,
На ліпавым лісточку. Мой мядок салодзенькі ...
Гула пчолка, гула.

* * *

Казалі, мой дзед нічога,
Пасеяў пшаніцы многа,
Жыта аруды поўны,
Калі з стрэхамі роўны.
Боты на нагах блішчаць,
Кольцы на руках мігцяць.

*Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на*
*ад Кізіны Ніны Макараўны, 1926 г. н.,*
*студэнткамі БДПУ імя М. Танка Гайчук С., Гладковай І.*

**Жніўная песня**
**Пайду я дуброваю**

Пайду я дуброваю,
Пушчу голас далінаю,
Хай голас галасуе,
Хай мая Машка чуе.

Хай чуе, почувае,
Па голасу пазнавае.
– А калі дзіця маё,
То няхай паспявае.
А калі нявестачка,
То няхай пажынае.

***Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на***
***ад Кізіны Ніны Макараўны, 1926 г. н.,***
***студэнткамі БДПУ імя М. Танка Гайчук С., Глатковай І.***

П'ю я гарэлку, віно,
Цяжка пахмелле маё.
Злыя суседзі мае
Судзяць, гавораць пра мяне,
Што я ў карчомку не йду,
Што я сваю жонку не б'ю.
Біўшы, караўшы яе,
Пойдзіць, пакініць мяне.

***Запісана ў в. Сакавічы Лагойскага р-на***
***ад Любань С. А., 1922 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гайчук М.***

*Спявалі на касьбе:*
На балоце касец косіць,
Прылёг да зямлі ды галосіць:
Ці мая каса тупа?
Ці мая жонка скупа?
Прыносіць хлеба скарыначку,
Прыносіць есці ў чарапочку,
А ложачкі забылася.

***Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на***
***ад Матрашылавай Ганны Сцяпанаўны, 1902 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Бурдыка І.***

Пуховая падушачка
Ва сне сніцца,
Ой, задумал Ванюшачка
Ажаніцца.
Жанісь-жанісь, мой сыночак,
Бог і з табою,
Бяры сабе жонку
Хоць удоўку,
Удовушку лёгка ўзяці,
Цяжка жыці,
Удовушка пасцель сцеле,
Уздыхае,
Удовушка пасцель сцеле,
Уздыхае,
Пра прэжнею жызню
Успамінае.
Бог дай, мая падушачка
У вагне згарэла,
Як я, мама, да заўдавела.

***Запісана ў в. Янушкавічы Лагойскага р-на***
***ад Саўрыцкай Ніны Кузьмінічны, 1932 г. н.,***
***студэнткамі БДПУ імя М. Танка Сцяпанавай К., Слонскай В.***

**Сяўба. Жніво**

Сеялі і малолі ўручную. Скошвалі жніво ці ўраджай касаркамі. Потым малолі ў ступе, уручную. Жэрнаў тады яшчэ не было. Сеялі валамі і плугамі. Плугі мы самі рабілі і абрабатывалі зямлю.

Каб былі харошыя агурцы, іх трэба было садзіць мужыку без штаноў.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Анішкевіч Анжэлы Усеваладаўны,1964 г. н.,***
***Новак В. С.***

Вясной і летам хадзілі збіраць ураджай. Самадзельнымі касаркамі скашвалі ўраджай, і малолі ўручную.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Смаляка Алеся Мікалаевіча, 1937 г. н.,***
***Новак В. С.***

Чыё гэта поле,
Чые то пакосы?
Чыё гэта поле,
Чые то пакосы?
Чыя то дзяўчына
Распусціла косы?
Чыя то дзяўчына
Распусціла косы?

***Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на***
***ад Солуб Лідзіі Іванаўны, 1946 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

**Жніўная песня**

Сягодня зажыначкі,
Дасць нам пан гарэлачкі,
Жала б я да вечара,
Баліць мая сярэдзіна,
А дзе ж твая кугакала,
Яно ў капе закапана,
Я ж было яго скалыхнула,
Сярэдзінка мая б аддахнула.

***Запісана ў в. Чудзенічы Лагойскага р-на***
***ад Абмётка Надзеі Раманаўны, 1937 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кір’ян Н. (2003 г.)***

**Жніўная песня**

Ой, не ідзі дожджык, не ідзі,
Дай Божа пагодачку
На нашу работачку.
Нам трэба жыта жаці
Ды ў снапочкі вязаці.

* * *

Ой, каціцца вянок з поля,
Ой, просіцца да пакоя:
Я ўжо ў полі настаяўся,
Ой, добры дожджык накапаўся,
Добры дожджык накапаўся.

**Жніўная песня**

Божа наш, каціўся каштан па сенажаці,
Божа наш, Божа наш.
Хацеў Вовачка Танечку браці,
Божа наш, Божа наш.
Як яе браці, не ўмее жаці,
Божа наш, Божа наш.
Нажала снапок, кінула сярпок,
Божа наш, Божа наш.
Кінула сярпок вышэй сябе,
Божа наш, Божа наш.
Не жала ў мамкі, не буду ў цябе,
Божа наш, Божа наш.
Каб маё жыта доўга стаяла,
Божа наш, Божа наш.
Каб ты не звекавала,
Божа наш, Божа наш.

*Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на*
*ад Кізіны Ніны Макараўны, 1926 г. н.,*
*студэнткамі БДПУ імя М. Танка Гладковай І., Гайчук С. (2005 г.)*

**Жніўная песня**

Як пайду я на горачку,
Як пайду я на горачку.
Як пакачу іголачку,
Як пакачу іголачку.
Ой, каціся, іголачка,
Ой, каціся, іголачка.
А к свякроўцы пад аконца,
К свякроўцы пад аконца.
Ай, паслухай, іголачка,
Ай, паслухай, іголачка,
Што гавора свякровачка,
Што гавора свякровачка.
Ай, пра цябе, залатую,
Ай, пра цябе, залатую.
Ай, пра цябе, маладую,
Ай, пра цябе, маладую.

*Запісана ў в. Міхеды Лагойскага р-на*
*ад Мароз Марыі Сцяпанаўны, 1933 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Нагулевіч Т. (1995 г.)*

**Жніўная песня**

Божа мой, на сенажаці мядоначка, божа мой.
Божа мой, там кукавала зязюлечка, божа мой.
Божа мой, кукавала, праўду казала, божа мой.
Божа мой, ці дзевачкі падарачкі, божа мой.
Божа мой, тонка тчыце, бела бяліце, божа мой.
Божа мой, бела бяліце, сватоў дарыце, божа мой.

*Запісана ў в. Траянец Лагойскага р-на*
*ад Жаўняровіч Тацціяны Іосіфаўны, 1923 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Давідовіч Н. (1998)*

### Жніўная песня

Каліна там за гарою,
Пайшлі дзевачкі рутачкі палоць, каліна.
Каліна, і мне, маладзенькай, не да рутачкі, каліна.
Каліна, узялі мяне цяжкі смутачкі, каліна.
Паехаў мілы на ваяванне.
Пакінуў мяне на гараванне.
Каліна, пакуль мілы мой адваюецца,
А я, малада, нагаруюся.

***Запісана ў в. Гасцілавічы Лагойскага р-на***
***ад Бірскай Леаніды Аляксандраўны, 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Хабаравай Т.***

### Жніўная песня

Я, малада, баром ішла,
Пад паяском сярпок нясла,
А на руках дзіцятачка.
Спаткаў мяне мой татачка.
Чыё гэта дзіцятачка?
Гэта не маё дзіцятачка,
Гавару я, татачка.
Суседняя, мой татачка.
А чаму яно ў тваё ліцо ўдалося?
Пры мне яно роджалося:
У маё ліцо ўдалося.

***Запісана ў в. Гасцілавічы Лагойскага р-на***
***ад Філіповіч Ганны Флораўны, 1912 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Хабаравай Т.***

### Жніўная песня

З-пад лесу, з-пад лесу зялёнага
Сакалы вылітаюць,
Саколку вызываюць.
З намі, саколка, з намі,
З намі, сакаламі.
Рада б я паляцеці,
Рада б я паляцеці,
Жаль ваду пакідаць,
Садочку зялёнага,
Ягадкі салодкія.
З-пад брамы, з-пад новенькай,
З-пад брамы, з-пад новенькай
Іванька выезжаіць,
Анютку вызываіць,
З намі, Анютка, з намі,
З намі, малайцамі.
Рада б я паехаці,
Жаль мамкі пакінуці.
Мамачка старэнькая,
Сястрыца маленькая.

Цераз гай зеляненькі
Бяжыць конь вараненькі.

Цераз гай зеляненькі
Бяжыць конь вараненькі.
А за ім ў пагоню Іванька маладзенькі,
А за ім ў пагоню Іванька маладзенькі.
Марылька, душа мая, перайняй каня майга.
Марылька, душа мая, перайняй каня майга.
Рада б я перайняці, ды стаіць твая маці,
Рада б я перайняці, ды стаіць твая маці.
Марылька, душа мая, ты ж ня бойся нікога,
Марылька, душа мая, ты ж ня бойся нікога.
Бойся мяне вучонага, бізуна пляцёнага,
Бойся мяне вучонага, бізуна пляцёнага.
Ды мяне ваеннага, бізуна раменнага,
Ды мяне ваеннага, бізуна раменнага.

***Запісана ў в. Засоўе Лагойскага р-на***
***ад Кушняровіч Гілены Лявонцьеўны, 1908 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Бардушка Г.***

**Жніўная песня**

А ў полі дымна, дымна,
А ў полі дымна, дымна,
Там сужаны ваюя,
Там сужаны ваюя.
Зваяваў жа жыта поля,
Зваяваў жа жыта поля,
Да й паехаў на другое,
Да й паехаў на другое.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Кохан Я. М., 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мазгуновай К.***

**Жніўная песня**

Вечар, вечар,
А мая мамачка вячэрае,
Кліча мяне вячэраці.
А вячэрай, мая мамачка,
Я ўжо ж вячэрала.
Сухога хлеба ела.
Слёзкамі праганяла,
Сваю долю праклінала.
Да ты, мая доля,
Да ў агне б ты згарэла.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Макольскай Соф'і Рыгораўны, 1912 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мікуліч Н. (1999 г.)***

**Жніўная песня**

Ой, пара дамоў, пара.
Мне дамоў не хочацца,
К свякроўцы варочацца.
Свякроўка – не мамка.
Не скажыць дзіцятка.
Не скажыць, што жала,
А скажыць – ляжала,

Не скажыць – марылася.
А скажыць – лянілася.

*Запісана ў в. Сакавічы Лагойскага р-на*
*ад Лобаль С. А., 1922 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Нагулевіч Т.*

Пара, жнейкі, дамоў пара,
Ужо раса халодна пала,
А ў мяне дома бяда стала.
Зваліласе свякроў з тына.
Ды ўжы чакай ў крапівачку.
Не жаль мне свякровачкі,
А жаль мне крапівачкі.

*Запісана ў в. Астрошыцы Лагойскага р-на*
*ад Аўташка Антаніны Паўлаўны, 1929 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Табалевіч В. (1997 г.)*

**Жніўная песня**

Я ў полі жыта жала,
Прыйшла дамоў – бяда стала.
Зваліласе свякроў з тына
Ды ў жыжкую крапіву.
Не жаль жа мне свякровачку,
А жаль жа мне крапівачку.
Свякровачка гнісці будзе,
Крапівачка цвісці будзе.

*Запісана ў в. Гарадзішча Лагойскага р-на*
*ад Шалковіч К.К., 1912 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Шалковіч Н.*

**Жніўная песня**

Чаго я дамоў пайду?
Чаго я дамоў пайду?
Мяне дома ні мамачка,
Мяне дома ні мамачка,
А дома мяне свякровачка,
А дома мяне свякровачка.
І не скажа, што я жала,
І не скажа, што я жала,
А скажыць, што ляжала,
Скажа, што ляжала.
Не скажыць, што ўмарылася,
Не скажыць, што ўмарылася,
А скажа, што лянілася,
Скажа, што лянілася.
Не скажыць, сядзь пасядзі,
Не скажыць, сядзь пасядзі,
А скажыць, вады бяжы,
Скажыць, вады бяжы.

*Запісана ў в. Ліневічы Лагойскага р-на*
*ад Леановіч Ядзвігі Паўлаўны, 1932 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляшчынскай Ю. (2004)*

### Жніўная песня

А мне дамоў не хочацца –
У мяне дома чужа маці,
А не будзе пераймаці.
Не скажа, што я жала,
А скажа, што ляжала.
Не скажа: умарылася,
А скажа: лянілася.
Не скажа: сядзь, пасядзі,
А скажа: вады схадзі прынясі.

*Запісана ў в. Сялец Лагойскага р-на*
*ад Ганны Сцяпанаўны, 1908 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Карповіч Л.*

### Жніўная песня

Ой, пайду я дарогаю,
Пайду я дарогай.
Пушчу голас дуброваю,
Пушчу голас дубровай.
Хай мая мамка дома чуя,
Хай мая мамка дома чуя.
І вячэрачку гатуя,
І вячэрачку гатуя.
Вячэрачка халодная,
Вячэрачка халодная.
А мамачка ж народная,
А мамачка ж народная.
Ой, каб родная была,
Ой, каб родная была,
Падагрэла б, падала,
Падагрэла б, падала.

*Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на*
*ад Акуліч М. М., 1924 г. н.,*
*Шалупінай Н. П., 1926 г. н.,*
*Ліс С. С., 1933 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Азімовіч Б., Каранчук А.*

### Жніўная песня

У нас сягоння вайна была,
У нас сягоння вайна была,
Мы ўсе палі зваявалі
І ў снапочкі павязалі.
І ў снапочкі павязалі,
Змялі паля мяцёлкамі,
Змялі паля мяцёлкамі,
Звязлі коньмі шасцёркамі.

*Запісана ў в. Баяры Лагойскага р-на*
*ад Ярчак Надзеі Гаўрылаўны, 1922 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляшчук Н. (2002 г.)*

### Жніўныя песні

Ой, я пайду дарогаю,
Ой, да я пайду шырокай.
Пушчу голас дуброўкаю.

Ой, няхай голас галасуе,
Няхай тады мая мамка чуе.
– Калі гэта дзіця маё,
Дык няхай яна пагуляе,
А калі нявестка,
Няхай яна пажынае,
Няхай яна пажынае
Пры ліхім прыганятым.
А ліхі прыганяты прыганяе,
Дамоў рана не пускае.

***Запісана ў в. Бяларучы Лагойскага р-на***
***ад Абрамовіч Леаніды Васільеўны, 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кульба В.***

Чаго я дамоў пайду?
Каго я дома найду?
У мяне дома ні татачка,
Ні скажа «дзіцятачка».
Ні скажа, што я жала,
А скажа, што я ляжала.
Ні скажа, што ўмарылася,
А скажа, што лянілася.

***Запісана ў в. Астрошыцы Лагойскага р-на***
***ад Ферка Марыі Іванаўны, 1907 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Ферка В. (2000 г.)***

Ой, коціцца вянок з поля,
Ой, просіцца да пакоя:
– Я ўжо ў полі настаяўся,
Ой, дробны дожджык накапаўся.
Дробны дожджык накапаўся,
Ой, буйны вецер намахаўся.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Андросавіч Леаніды Васільеўны, 1928 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мікуліч Н. (1999 г.)***

Цераз гай зяляненькі
Бяжыць конь вараненькі,
А за ім ў пагоню Іванька маладзенькі.
– Марылька, душа мая, пераймай каня майга.
– Рада б я пераняці, ды стаіць твая маці.
– Марылька, душа мая, ты ж не бойся нікога.
Бойся мяне вучонага, бізуна пляцёнага,
Ды мяне ваеннага, бізуна раменнага.

***Запісана ў в. Засоўе Лагойскага р-на***
***ад Кушнярэвіч Гілены Лявонцьеўны, 1908 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Бардушка Г.***

Ой, пайду я дарогай,
Пушчу голас дубровай.
Няхай голас галасіцца,
Няхай мама чуе.
У мяне дома не паплачаш,
У мяне дома свякровь.
Не скажа, што я жала,

А скажа, што я ляжала,
Не скажа, што ўмарылася,
А скажа, што лянілася.

***Запісана ў в. Задор'е Лагойскага р-на***
***ад Гуніч Марыі Мінаўны, 1933 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Харэвіч Т. (2006 г.)***

Я, малада, жыта жала,
А ў мяне дома бяда стала.
Звалілася свякроў з тыну
Ды ў вялікую крапіву.
Не жаль жа мне свякровачкі,
А жаль жа мне крапівачкі.
Я крапіўку – на падліўку,
А свякроўку – у магілку.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Падбярозка Марыі Антонаўны, 1920 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Шарыпавай В. (2006 г.)***

Ой, пара дамоў, пара,
А мне дамоў не хочацца
К свякроўцы варочацца.
Свякроўка – не мамачка,
Не скажыць «дзіцятачка»,
Не скажыць, што я жала,
А скажыць, што ў беразёнцы ліжала.

***Запісана ў в. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Жоравай Вольгі Сцяпанаўны, 1931 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мусько К.***

Усе дамоў, усе дамоў,
А дамоў не хочацца.
У мяне дома чужа маці,
Не будзе пераймаці.
Не скажа, што я жала,
А скажа, што ляжала,
Не скажа, што ўмарылася,
А скажа, што лянілася.

* * *

Жала б я да вечара,
Дык баліць мая сярэдзіна.
Не даў Божа кугакала,
Каб у хвасце заплакала.
Я ж бы села, скалыхнула,
Сярэдзінка б аддыхнула.

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Яскевіч В. М.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кудыбінай І.***

Ой, пара дамоў, пара.
Мне дамоў не хочацца.
У мяне не мамачка,

У мяне дома свякровачка.
Не скажа, што я жала,
А скажа, што ляжала.
Не скажа, што змарылася,
А скажа свінням несці.

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Кутас Ніны Яфімаўны, 1921 г. н.,***
***студэнтамі БДПУ імя М. Танка (2001 г.)***

Загудзела пчолачка,
Па бару лятаючы,
Мядок збіраючы.
А мядок мой саладок,
Праз цябе я спазнілася,
У цёмным лесе начавала,
З мядзведзькам вячэрала.
Мядзведзька кару дзярэ,
Дзевачка ваду бярэ.
– Мядзведзька, на што кара?
– Дзевачка, на што вада?
– Карыца хатку крыці.
– Вадзіца лаўку мыці.
– Хатку крыці, каб дажджы не лілі.
– Лаўку мыці – сватоў ждаці.
*(Кожны слупок паўтараецца 2 разы)*

***Запісана ў в. Атрубак Лагойскага р-на***
***ад Пракопчык В. С., Пустаход М. А., Пустаход А. С., Кучынскай Я. С.***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Акуліч Т. (2000 г.)***

Выходзілі ў поле, спявал песні. Ну, вот, напрымер:

Каліна-Каліна жала лянок,
Каліна-Каліна зламала сярпок.
Каліна-Каліна нажала снапок,
Каліне Ягорка пачыніў сярпок
(або: Каліне Ягорка даў новы сярпок).

***Запісана ў в. Бурыя Лагойскага р-на***
***ад Лапцэвіч Ніны Іванаўны, 1924 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бярдычавец Т., Домінім А., Елавой Н. (2008 г.)***

**Жніўная песня**

Я ў полі жыта жала,
Я ў полі жыта жала,
Мяне дома бяда стала.
Свякроў з тыну звалілася,
У крапіву ўвалілася.
Не жаль мне свякровачкі,
А жаль мне крапівачкі.
Я ў полі жыта жала,
Я ў полі жыта жала,
У мяне дома другая бяда ждала:
Мамка з печы звалілася,
У пярыну ўвалілася.

Не жаль мне пярыначку,
А жаль мне мамулечку.

*Запісана ў в. Бяларучы Лагойскага р-на*
*ад Мароз Надзеі Пятроўны, 1933 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Кульба В.*

**Жніўная песня**

Пайду я гарою, пайду я шырокаю,
Ніхай мая мамка чуе.
Мамка чуе ды кажа:
– Калі ж гэта дзіця маё –
Ніхай аддыхае.
Калі ж нявестачка –
Ніхай пажынае.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Жылянінай Марыі Мікалаеўны, 1930 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Масцеравай А. (2001 г.)*

**Ой, сонейка, сонейка**

Ой, сонейка, сонейка,
Закаціся скоранька,
Не сушы нам явару,
Нам явару многа трэба.
І нам явару многа трэба,
Будзем царкву мураваці,
Будзем дзетак вянчаці.

*Запісана ў в. Заазер'е Лагойскага р-на*
*ад Ярчак Надзеі Гаўрылаўны, 1922 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Тамашэўскай Т. (1999 г.)*

Сягоння ў нас зажыначкі,
Выйшла на поле жанчыначка.
Наша пані маладая
На коніку паязджая.
На коніку паязджая,
Сваіх жнеяк пашчытая,
Прынясе нам абедаці:
– Сядзьце, жнейкі, у халадочку,
З'ешце хлеба па кусочку.
З'ешце хлеба па кусочку,
Піце квасу па кружочку.

*Запісана ў в. Калачы Лагойскага р-на*
*ад Бурковіч Т.І., 1930 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Кастэнка А. (2000 г.)*

**Жніўная песня (дажынкі)**

Не жыта жну – ярылу,
Запяю я песеньку – свежыну.
Авясец, матулька, авясец,
У суботу авясец дажала,
А ў нядзелю сватоў даждала.

*Запісана ў в. Краснаволле Лагойскага р-на*
*ад Цішко Клаўдзіі Тарасаўны, 1922 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Тамашэвіч С.*

**Зажынкі**

Самы апошні сноп, які застаўся на полі, абвязвалі стужкамі, упрыгожвалі, неслі ў хату. Вакол яго скакалі, спявалі песні. Потым з гэтага снапа дзяўчаты плялі вянкі.

**Дажынкі**

У той дзень, калі пачыналі першы раз жаць збажыну, усе людзі прыбіраліся па-святочнаму: белыя рубахі, белыя хусткі, белыя пярэднікі. Першы сноп зажынала самая старая, паважаная баба або маладая, прыгожая дзяўчына. Гэты сноп абвівалі яркімі стужкамі, прыносілі ў хату, ставілі ў чырвоны кут. Спявалі каля снапа песні.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на***
***ад Шыла Лідзіі Нікіфараўны***
***(раней пражывала ў Докшыцкім р-не Віцебскай вобл.),***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Ясяновіч Л. (1998 г.)***

Песні пелі, вянкі вілі. Хазяін найме многа баб. Калі пажнуць, вянок з зярна зробяць і прынясуць хазяіну на стол, або надзяюць на шыю. А той доўжэн угашчаць.

Жалі толькі сярпамі. Хазяева прыносілі на поле крупяную кашу і па шкварцы, таксама халадніка ў жбанку.

Абычна серп не ложаць на зямлю, а на сноп кідаюць.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Івашкевіч Соф'і Антонаўны, 1914 г. н.,***
***Амбражэй Алы Аляксандраўны, 1936 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Першым у зямлю кідалі ячмень. На дажынкі былі жарты, танцы. Спявалі песні: «А я ў полі жыта жала». Шукалі спарышы. Спарыш – гэта два каласы на адной сцяблінцы.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Турчыновіч Міхаліны Венядзіктаўны, 1926 г. н.***
***(нарадзілася ў в. Каргавішча),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

**Дажынкавая песня**

Дажыначкі збыліся
І столікі накрыліся.
Столікі ж вы мае засланыя,
Госцікі мае прыбраныя.
Калі ж мы яшчэ збярэмся,
Шмат гарэлачкі нап'емся?

***Запісана ў в. Паграбішча Лагойскага р-на***
***ад Піцюк Ядзвігі Антонаўны 1939 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Крывецкай Н. (1996 г.)***

Быка называлі волам. Калі зярно прарасце, яго даставалі спецыяльнымі доскамі. Касаркамі скашвалі, вязалі снапы, а потым снапы звазілі. Дзелалі з камня вялікія круглыя каткі. Запрагалі валоў. Так і малацілі.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Аўсейкі Валянціны Дзям'янаўны, 1937 г. н.,***
***Новак В. С.***

**Песня жніва**

Пайду я дарогаю,
Пушчу голас дуброваю,
Хай голас галасуе,
Хай чуе, пачувае,

Па голасе пазнавае,
Чыё гэта дзіця пяе,
Чаму яно дамоў не ідзе?
А я і вячэрку зварыла,
Я і пасцельку пасцяліла.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на ад Зялёнай Леаніды Феліксаўны, 1937 г. н., Новак В. С.***

Калі канчаеш жаць, строілі «бараду»: вытачку жыта ці пшаніцы. Убіралі кветкамі. Павесяляцца, пасядзець, пяюць пры гэтым.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на ад Альсімовіч Галіны Сцяпанаўны, 1925 г. н., (раней пражывала ў в. Чэркасава Міёрскага р-на Віцебскай вобласці) студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Зажынкі. Сярпы тачылі, перахрысціліся, зжалі па снапу, звязалі і неслі, аграному ўручалі. Пажылалі, штоб Бог даў пагоду. Частушкі пелі. Вось напрыклад:

Брыгадзіру ўгадзіла,
Старшыну літр дала.
На работу не хадзіла,
А стаханаўкай была.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на ад Медунецкай Веры Ермалаеўны, 1940 г. н.***

На ўраджай: кагда будзешь ухажываць, будзе харошы ўраджай, а што прыгаворваць, так гэта трын-трава. Штоб быў ураджай – нада работаць, а после работы ўжэ гулялі, песні былі, танцы, во з такіх гулянак я доўга баяўся падайці к ей, а ана стаяла і всегда мне улыбалась.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на ад Зялёнага Балеслава Пятровіча, 1934 г. н.***

Праходзіла ў маім веку так: усе хадзілі, ды серпамі жалі, рукамі, песні пелі на жніво. У жыце «заломаў» не рабілі – не прынята ў нас. У ведзьм і нічыстую сілу не верылі.

***Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на ад Русак Таццяны Фёдараўны, 1930 г. н.***

Такой технікі не было, жэншчыны ўсё сярпом убіралі, а цяпер камбайнам. Ну раншэ, как паднялся ўтрам і да вечара, дапазна, вот пелі песні, частушкі:

Ой жніво маё, жніво,
Жыта залацістое …

***Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на ад Мінкувіч Антона Антонавіча, 1928 г. н.***

Штоб град не пабіў пасеянага, то ў градавую сераду нічога не рабілі на агародзе.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н., студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

**Жніўныя песні**

Пара дамоў, пара,
Халодная раса пала,

Халодная раса пала,
Цёмная ночка стала.
– Дзе мы будзем начаваць?
Што мы будзем вячэраць?
– Начаваці пад капою,
Вячэраці: хлеб з вадою.

* * *

*Спявалі на дажынках:*
Сягодня ў нас вайна была –
Усё поле зваявалі,
Усё жыта пажалі.
Гаспадарак, не скупіся,
У каморачку не хавайся
Ды выкаці бочку гарэлкі,
Ды напаі свае жнейкі.

* * *

Я жну, пажынаю,
На дарожку паглядаю:
Ці йдзе мой міленькі,
Ці нясе гасцінчыка,
Яблачка садовага.
Яблачкі і грушачкі,
Да нашай душачкі,
Яблачкі садовыя,
Мы з табой маладыя.

***Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на***
***ад Матрашылавай Ганны Сцяпанаўны***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Бурдыка І.***

**Жніўная песня**

На двары вечарэіць,
Мая мамка вячэраіць.
Яна мяне ўспамінаіць,
Ці вячэрала дзіця маё?
На чужой старонацы
Пры ліхой свякровачцы.
Ці вячэрала мая мамка?
У канцы стала стаяла,
Сухі хлеб кусала,
Слёзкамі праганяла.

***Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на***
***ад Матрашылавай Ганны Сцяпанаўны***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Майтак М.***

**Жніўная песня**

Іграла сонейка, ды за лес заходзіла,
І плакала сіротачка, да пад Дон падходзіла.
Чаго ж я дамой іду, а што ж я дома знайду?
І няродная матачка, і не скажа: «дзіцятачка»,
І не скажа, што я жала,
А скажа, што ляжала.

І не скажа, умарылася,
А скажа, што лянілася.

***Запісана ў в. Траянец Лагойскага р-на***
***ад Жаўняровіч Таццяны Іосіфаўны, 1923 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Давыдовіч Н. (1998 г.)***

Жанчына апраналася прыгожа і ішла ў поле. Зажынала сноп і звязвала, рабіла бараду. Гэты сноп яна несла гаспадару і ў хаце ставілі на пачотнае месца.

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на***
***ад Гуніч Ніны Іванаўны, 1913 г. н.,***
***Новак В. С.***

**Жніўная песня**

Каціўся вянок з поля
Ды да панскага пакоя,
Выходзь, наш пан, выходзь,
Ды бочку піва выкоць,
Ды жнеяк пераймай
І півам угашчай.

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на***
***ад Кізіны Соф'і Аляксандраўны, 1917 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Атрашкевіч Н. (1999 г.)***

**Жніўная песня**

Румяна поле, румяна.
Поўны двор коней нагнала.
Ніхто тых коней не знае,
Адна Волечка пазнала.
Ой, рана, рана пазнала,
Да стаенькі загнала.
Аброку, татка, аброку,
Ой, рана, рана аброку.
Гэтыя коні здалёку.
Ой, рана, рана здалёку
Сягодня ваше волі дай,
Ой, рана, рана волі дай.
Бо ён паедзе ў чужы край,
Ой, рана, рана ў чужы край.
Ды на чужую старонку,
Ой, рана, рана старонку,
Да за ліхою свякроўку
Ой, рана, рана свякроўку.

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага раёна***
***ад Невяровіч Юзэфы Адольфаўны 1917 г. н.,***
***студэнткамі БДПУ імя М. Танка Граванс В., Атрашкевіч Н.***

Раней сярпамі жыта жалі. Жанчыны адзяваліся красіва. Белы платочак, белы шарфічак з каруначкамі ўсякамі, каражагналіся. Хлеб, соль паложа і пачыналі жаць – гэто ўжо былі зажынкі. Першы сноп нажыналі, дык яго ў дом паложаць, ставяць на кут. І стаіць, пакуль не скончыцца ўсё жніво. Песні спявалі ўсякія. Калі сканчалі жаць – дажынкі называліся. Астаўляюць такі холмік жыта, тады зжынаюць гэта і ўюць вянок і брыгадзіру ці прэдседацелю на галаву вешаюць.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Міхневіч Валянціны Мікалаеўны, 1938 г. н.,***
***Новак В. С.***

Штобы быў добры ўраджай, мы гаварылі так: «Радзі, Божа, на ўсіхную долю!» Першым у зямлю кідалі лепшае зерне. Зажынкі і дажынкі мы асоба не празнавалі. Ну, бралі бараду, заплятАлі.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Булыга Надзеі Пятроўны, 1935 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

Калі пачыналі жаць, то нажыналі першы сноп, маленькі такі, і неслі яго ў кут ставілі. Зажынкамі называлі пачатак жніва, а дажынкі – ужо канец жніва.

***Запісана ў в. Штанюкі Лагойскага р-на***
***ад Крэнь Марыі Станіславаўны 1938 г. н.,***
***Новак В. С.***

Жалі сярпамі, пелі песні, частушкі, многа ўсяго зналі, загоны былі длінныя, ў начале загона начыналі і да канца.

Прыказка: калі Бог дасць, тады і ўражай будзе.

***Запісана ў в. Юльянова Лагойскага р-на***
***ад Зубаравай Тацяны Сямёнаўны, 1935 г. н.,***
***Новак В. С.***

Тады цехнікі не было, усё ўручную, ды добрая жнея, якая па 15 сотак выжынала. Пелі, калі шлі з дажынак.

Атмечалі так: сабіраліся компаніяй брыгадзіры і рабочыя ў клубе, бралі гармошку, танцавалі, гулялі.

***Запісана ў в. Юльянова Лагойскага р-на***
***ад Чаховіч Леаніды Анатольеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

## ВОСЕНЬСКІЯ ЗВЫЧАІ І ПЕСНІ

### Дзяды

Багата ў якіх мясцовасцях існуюць старажытныя жалобныя абрады. Іх адзначаюць у пачатку лістапада пад назвай «Дзяды». Многія маюць час успомніць жыццё, ганарыцца бадзёрым здароўем і ўласным набыткам, якія і Бога хваліць, і жыць на свеце навучылі; цяпер яны маюць час адплаціць доўг удзячнасці душам сваіх продкаў. У гонар іх памяці і спраўляюць абрад Дзяды, памінанне продкаў.

***Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на***
***ад Аўласка Анатоля Іванавіча, 1952 г. н.,***
***Новак В. С.***

Дзед бабу тапіць вядзе,
А баба крычыць, няйдзе.
– Мой жа ты, дзядулечка,
Я ж твая бабулечка!

***Запісана ў в. Літвічы Лагойскага р-на***
***ад Леановіч Ядзвігі Паўлаўны, 1932 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Ляшчынскай Ю. А.***

Дзяды прыходзяцца на першую суботу наябра. Паміналі ў царкве. Неслі ў царкву 3 булачкі, сахар, канфеты. Падают памінальную запіску. Вечарам, кагда паўжынают, усё астаўлялі: і яду, і пасуду на стале. Каб памерлыя пад’елі.

***Запісана ў в. Бурыя Лагойскага р-на***
***ад Лапцэвіч Ніны Іванаўны, 1924 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Домінfamым А., Елавой Н. (2008 г.)***

На Дзяды ідзём усе ў цэркаў, ставім свечкі, падаем памінальную запіску. Свяшчэннік ходзіць па могілках і свенціць іх, хто пазаве. Прыходзім з клодава, ставім 12 любых блюд. І завём: «Родныя, дарагія, прыхадзіце к нам на вужын».

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Алены Ігнатаўны, 1923 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

### Восеньская песня

Мядзведзь кару дзярэць,
А дзеўка ваду нясець.
– Мядзведзь, нашто кара?
– Хатку крыці.
– Дзеўка, нашто вада?
– У хатцы мыці.
Хатку крыці, каб цёпла было,
У хатцы мыці –
Сватоў ждаці.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Жалянінай Марыі Мікалаеўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кур’ян Н. (2005 г.)***

### А чаму ты, ялушачка, не зялёная?

– А чаму ты, ялушачка, не зялёная?
– А як жа мне, ялушачцы, зеляніцца?
Пада мною тры купчыкі начавалі,
Яны ж мае руцце-веццe паламалі,

Яны ж мяне, ялушачку, засушылі.
– А чаму ты, дзяўчыначка, невясёлая?
– А як жа мне, дзяўчыначцы, весяліцца?
А са мною бел малойчык начаваў,
Ён жа мяне, маладзеньку, ашукаў,
Ён жа мой руцень-вяночак украў.

***Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на***

**І пахілілася каліна**

І пахілілася каліна,
Пахілілася на Дунай,
І лісцем беражкі пакрыла,
Карэннем ваду змуціла.
І пакорыстая Анютка
Пакарылася татульку,
І слёзкамі ножкі абліла,
Шоўкам касіцу апляла.
– Ах вы, дзевачкі, вы ўсе мае,
Не завідывайце вы мне,
Бо і вы гэтага дажджэце,
Шоўкам касіцу спляцеце.

***Запісана ў в. Такаўшчына Лагойскага р-на***

**Перапёлка, ластаўка**

– Перапёлка, ластаўка,
Дзе лета летавала?
Дзе лета летавала,
Дзе будзеш зімаваці?
– Летавала ў пшаніцы,
Зімаваць буду ў крыніцы,
Зімаваць буду ў крыніцы,
У сцюдзёнай вадзіцы.
– Ты, дзяўчына маладая,
Дзе гады гадавала?
Дзе гады гадавала,
Дзе будзеш векаваці?
– Гадавала ў мамачкі,
Векаваць – у свякроўкі,
Векаваць – у свякроўкі,
У чужой у сямейцы.

***Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на***

**А на ўдоўчынай гарэ**

А на ўдоўчынай гарэ
Мядзведзька карчом арэ,
А заенька барануе,
Лісічка абед гатуе.
Як прыгрэла сонейка,
Пайшлі ўсе работнічкі:
Мядзведзька – у ельнічак,
Лісічка – у бярэзнічак,
Заенька – пад ламочак,
А ўдоўка – у галасок.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***

**«Качан»**

Як удаўся качан –
Вышэй плота тарчаў.
Я качана сеч –
Качан мне ў плеч.
Я качала ў кадушачку,
А ён мне ў падушачку.
Я качана ў ложачку –
Качан мяне за ножачку.
Я качана ў раток –
Качан мяне за пупок.

***Запісана ў в. Сакавічы Лагойскага р-на***
***ад Лобань С. А., 1922 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гайчук М. (1997 г.)***

*Валянціна НОВАК*

# ТРАДЫЦЫІ СЯМЕЙНА-АБРАДАВАЙ ПАЭЗІІ ЛАГОЙШЧЫНЫ

Жывой з'явай на Лагойшчыне з'яўляецца радзінна-хрэсьбінны абрад, арганічнае месца ў структуры якога займаюць звязаныя з ім прыкметы і павер'і. Жыхары розных вёсак прытрымліваліся народных традыцыйных прадпісанняў адносна таго, як засцерагчы цяжарную жанчыну ў адказны перыяд «выношвання ёю дзіцяці». Запісаныя звесткі ўяўляюць сабой своеасаблівы маральна-этычны кодэкс, у якім спакон веку традыцыяй адрэгуляваны важныя моманты, звязаныя з нараджэннем і выхаваннем дзіцяці. Цяжарная жанчына клапацілася найперш аб тым, каб нарадзіць здаровае дзіцятка. Менавіта з апошнім і звязаны шэраг забарон: «Нельга каб бярэменнай жанчыне кошка прабегла праз ногі, пераступаць чэрэз её і насіць паясы, а то ў дзіцяці, лічылі, будзе сплюшчаная пераносіца» (запісана ў в. Акалова ад Анішкевіч Анжэлы Усеваладаўны, 1964 г. н.).

Асцерагалася цяжарная жанчына, зыходзячы з мясцовых вераванняў, пераступаць цераз сякеру, бо інакш, лічылася, што «у дзіцяці будзе заячая губа» (запісана ў г. п. Плешчаніцы ад Арцем'евай Ліліі Васільеўны, 1939 г. н.). Забаранялася цяжарнай жанчыне шмат есці, бо «дзіця будзе ўсягда хацець есць» (запісана ў г. п. Плешчаніцы ад Арцем'евай Ліліі Васільеўны, 1939 г. н.), не дазвалялася ёй хадзіць і «над вяроўкай, штоб пупавіна ў дзіцёнка не закруцілася за горла», а таксама забаранялася «прыгаць чэраз канаву», а то дзіцё будзе балець (запісана ў в. Акцябр ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.). Будучую маці хвалявалі і іншыя акалічнасці, звязаныя з нараджэннем дзіцяці. У сувязі з гэтым, напрыклад, рацыянальнымі падаюцца засцярогі, паводле якіх, нельга было «смяяцца з бальных, некрасівых. Эта вліяе на дзіця. Яно можа нарадзіцца такім жа» (запісана ў г. п. Плешчаніцы ад Арцем'евай Ліліі Васільеўны, 1939 г. н.). Не павінна была цяжарная жанчына біць жывёл: «Нельзя нагой біць жывёлу, бо дзіця будзе злое, плаксівае, хворае» (запісана ў в. Пуцілава ад Акуліч Валянціны Адольфаўны, 1933 г. н.).

Каб не было дзіця зайздросным і было разумным, забаранялася цяжарным жанчынам зайздросціць чужым людзям і падразаць валасы (запісана ў в. Акалова ад Шуркевіча Рыгора Станіслававіча, 1939 г. н.). У в. Скарады бытуе павер'е, згодна з якім «нельзя бярэменным стрычся – будзе кароткі век у дзіцёнка» (запісана ад Пракопчык Жанны Канстанцінаўны, 1968 г. н.). Паводле ўспамінаў жыхароў гэтай вёскі ўстойлівымі ў мясцовай традыцыі былі ўяўленні, замацаваныя за кожным днём тыдня, у кожны з якіх нараджалася дзіця, то ў характары яго былі ўжо загадзя вызначаны рысы характару: «Калі радзіцца ў четверг – чысцюля будзе дзіцёнак, вторнік – рабацяга, васкрэсенье – гультай, а субота – гуляка» (запісана ад Пракопчык Жанны Канстанцінаўны, 1968 г. н.).

Радзінна-хрэсьбінны абрад, зыходзячы з фактычных матэрыялаў, мае наступную структуру: хрышчэнне дзіцяці ў царкве («Рабёнка свяшчэннік апускаў у ваду 3 разы, чытаў малітву, а потым вешаў на шэю крэсцік і абварочваў дзіця белым палаценцам» (в. Акалова)), ад'езд хроснай маці з дзіцём да хаты яго бацькоў, сустрэча дзіцяці бацькамі, бабкай-павітухай, адорванне дзіцяці падарункамі, аб'яўленне хроснай маці імя нованароджанага, хрэсьбіннае застолле, разбіванне гаршка з кашай, адорванне падарункамі бабкі і кумоў, саджэнне бабкі-павітухі і кумоў на тачку («на тачку садзілі кума з кумой і бабку везлі дадому» – запісана ў г. п. Плешчаніцы ад Арцем'евай Ліліі Васільеўны, 1939 г. н.), выкананне радзінна-хрэсьбінных песень, адрасаваных бацькам нованароджанага, бабцы, кумам і інш.

Вяселле на Лагойшчыне, як і ў іншых рэгіёнах Беларусі, захоўваючы традыцыйны падзел на давясельную, уласна вясельную і паслявясельную часткі, вылучаецца адметнымі мясцовымі асаблівасцямі. На вялікі жаль, тыя сціплыя этнаграфічныя звесткі, што занатаваны былі ў час экспедыцыі, не дазваляюць больш грунтоўна ахарактарызаваць структуру менавіта лагойскага вяселля, але ж тым не менш пэўная яго схема святкавання ўсё ж можа быць прадстаўлена.

Пачыналася вяселле са сватання, важным момантам якога быў рытуальны іншасказальны дыялог паміж сватамі і бацькамі нявесты: «У сваты прыходзяць ужо, наперад дагаворацца, ну і прыходзяць вечарам, кажуць: «Вот мы чулі, што ў вас карова прадаецца» (запісана ў в. Юльянова ад Вязовіч Марыі Іванаўны, 1951 г. н.). Сватацца прынята было ехаць позна вечарам, каб па прычыне адмовы з боку нявесты не было ў вёсцы «пагалоскі» аб тым, што жаніху адмовілі. У в. Асінцы сваты заходзілі ў хату і гаварылі: «Мы чулі, што ў вас ёсць цёлачка,

а ў нас ёсць бычок, прадайце цёлачку нам». Як і ў шматлікіх вёсках Гомельшчыны, так і ў в. Асінцы, калі «дзяўчына жаніху адмаўляла, то выносіла хлопцам гарбуз». Сімвалам згоды на шлюб з'яўляліся паднесеныя нявестай на рушніку для сватоў «хлеб і чарка гарэлкі» (запісана ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.).

У сватанні прымалі ўдзел сват як галоўная дзеючая асоба, а таксама бацькі маладога і сам малады. У в. Акцябр, калі прыходзілі ў сваты, то гаварылі: «Мы – заморскія купцы, вязём золата. Мы – вам падаркі, а вы – нам дачку» (запісана ад Багуцкай Кацярыны Міекалаеўны, 1928 г. н.).

У пачатку размовы паміж сватамі маладая, паводле ўспамінаў Соф'і Антонаўны Каборды, 1930 г. н., «стаяла сціпла, калупала пальцам гліну ў сцяне», што абазначала яе згоду на шлюб (прыгадаем семантыку аналагічных дзеянняў нявесты ў некаторых раёнах Гомельшчыны).

Калі адмаўлялі сватам, то ў в. Атрубак, «адносілі гарэлку і палаценца» (запісана ад Кучынскай Ядвігі Станіславаўны, 1930 г. н.). У в. Весніно, калі маладая не давала згоды на шлюб, то яна «адсылае грошы за ўсю закуску і гарэлку, што прыносіў малады» (запісана ад Макейчык Ніны Васільеўны, 1932 г. н.). Паводле сведчанняў Марыі Мікалаеўны Жалянінай, 1930 г. н., з в. Гайна, маладыя людзі знаёміліся звычайна падчас правядзення кірмашоў, і калі хлопцу спадабалася дзяўчына, едзе ён у сваты: «Ну, прыязджаюць, вродзе бы едуць яны куды-то на базар купіць ялавіцу. Агеньчык гарыць, спыняюцца, каб паначаваць у іх, каня паставіць, каб конь пагрэўся. Ну, яны людзі добрыя, пусцілі. Гаварылі-гаварылі, потым ужо сват і кажа:

Калі прыйшла рыбка да гаці,
Я мушу праўду сказаці:
– Мы прыехалі па тую кветку,
Што цвіцець зімой і ўлетку.
А маці і кажа:
– Якая ж гэта кветка зімой цвіцець, мае людцы?
– Ну, якая кветка? Такая, якую палюбіў наш Андрэйка, Ганначка ваша.
– А, божа ж мой, Ганначка, ці праўда пойдзеш замуж?
Маўчыць Ганначка, у печы пальчыкам гэдак калупае.
– Праўда пойдзеш?
– Ну, ж калі маўчу, дык пэўна ж хачу. Пайду.

Калі ўсё паспяхова вырашалася падчас сватання нявесты, то абавязкова свата абвязваюць палаценцам: «Раз яна (нявеста) ужо сагласна і любе яго, тады п'юць гарэлку ды палаценцэм свата абвязваюць» (запісана ў в. Юльянова ад Вязовіч Марыі Іванаўны, 1951 г. н.).

Жыхары в. Аўгустова пацвердзілі, што пасля сватання ў іх мясцовасці ладзілі запоіны, якія называлі яшчэ «змовінамі», што дае падставы меркаваць аб супадзенні ў часе давясельных абрадавых этапаў – запоін і заручын (змовін). На запоіны «прыходзілі бацька з сынам, з сабой прыносілі пляшку гарэлкі, упрыгожаную жытнімі каласамі і перавязаную рушнікам» (запісана ў в. Аўгустова ад Каборды Соф'і Антонаўны, 1930 г. н.). У структуры давясельнага перыяду ў в. Аўгустова меў месца і такі абрадавы этап, ак агледзіны, сутнасць якога заключалася ў тым, што менавіта пасля цырымоніі сватаўства маці маладога пасылала каго-небудзь з родзічаў наведацца да бацькоў маладой і як мага болей «даведацца, выпытаць, разглядзець. Калі звесткі былі адмоўнага характару, то вяселле магло і разладзіцца» (запісана ад Каборды Соф'і Антонаўны, 1930 г. н.).

Як правіла, на заручынах вырашалі канкрэтныя пытанні аб арганізацыі вяселля. Гэты факт пацвердзілі жыхары в. Мятлічыцы: «На заручынах дагаворваліся пра свадзьбу» (запісана ад Турчыновіч Міхаліны Венядзіктаўны, 1926 г. н.). Рыхтавалі абавязкова каравай, прычым «шмат дзе на Міншчыне гэта рабілася ў дзень вяселля. У некаторых жа месцах каравай рашчынялі ў зборную суботу, а выпякалі ў той час, як маладыя ад'едуць да вянца» [1, с. 169]. Амаль ва ўсіх вёсках інфарматары адзначылі, што звычайна выпякалі каравай замужнія жанчыны (в. Казыры), «каравай выпякалі заўсёды замужнія жанчыны, якія былі шчаслівыя ў сваёй жызні» (запісана ў в. Акалова ад Смаляка Алеся Мікалаевіча, 1937 г. н.).

Падчас падрыхтоўкі цеста для каравая пазбягалі «замешваць яго кулакамі, бо, лічылася, што мужык будзе біць жонку» (запісана ў в. Асінцы ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.).

Абавязковым у сістэме вясельнай абраднасці Лагойшчыны быў выкуп маладым сваёй нявесты: «Калі жаніх знайшоў нявесту, ён павінен выплаціць грошы» (запісана ў г. п. Плешчаніцы ад Аўсейка Валянціны Дзям'янаўны, 1937 г. н.).

Царкоўны абрад вянчання – адзін з важнейшых абрадавых этапаў вяселля на Лагойшчыне: «Калі маладыя ехалі ў царкву або з царквы і распрагліся коні, то маладым жыць нядоўга і муж будзе паднімаць на жонку руку» (запісана ў в. Асінцы ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.). Праўда, зыходзячы з катэгарычных сцвярджэнняў асобных інфарматараў, у некаторых вёсках пра вянчанне нават не ведалі: «Толькі тады ніхто не венчаўся» (запісана ў в. Скарады ад Умэцкай Ніны Антонаўны, 1930 г. н.). Калі «маладыя ехалі ў царкву венчацца, то ехалі паасобку, а з царквы пасля вянца ўжо вярталіся на кане маладога» (в. Аўгустова). «Лічылася, што калі падчас выезду ў царкву ішоў дождж, то на дабро, на шчаслівае жыццё. Коні наравяцца, не хочуць ісці – благая прымета» (запісана ў в. Аўгустова ад Каборды Соф'і Антонаўны, 1930 г. н.).

У мясцовых традыцыях вёсак Мятлічыцы і Акцябр «маладых, якія ехалі ўжо ад вянца, прынята было сустракаць той пары, што толькі што пажаніліся» (запісана ад Турчыновіч Міхаліны Венядзіктаўны, 1926 г. н.), «маладых устрачала замужняя пара, якая жыла добра» (запісана ад  Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.).

Пра абрад пасада, які лічыцца даволі распаўсюджаным на тэрыторыі Мінскай вобласці, жыхарка в. Атрубак Ядвіга Станіславаўна Кучынская, 1930 г. н., прыгадала наступныя звесткі: «Дзяўчаты садзілі нявесту на дзяжу… Калі дзеўка нячэсная – вымазвалі дзёгцем вароты»; «Калі дзеўка была чэсная, садзілася на дзяжу, на пасад, еслі нячэсная, то ана кала дзяжы кленчыла на калені» (запісана ў в. Гайна ад Жалянінай Марыі Мікалаеўны, 1930 г. н.). Маці благаслаўляла маладую сесці на пасад. А яе да дзяжы падводзіла хросная маці: «Маладую садзілі на дзяжу, накрытую вывернутым кажухом. Калі маладая не зберагла дзявоцкасці, на дзяжу не мела права садзіцца, баючыся граху і людскога асуджэння» (запісана ў в. Аўгустова ад Каборды Соф'і Антонаўны, 1930 г. н.).

Пасля вянчання маладых сустракаюць бацькі маладога з хлебам-соллю: «Як заходзяць у дом маладога, маладая стараецца пераступіць парог першай, тады, лічылі, будзе камандаваць. Маладыя ідуць «пад ручкі», каб іх ніхто не разлучыў» (запісана ў в. Атрубак ад Кучынскай Ядвігі Станіславаўны, 1930 г. н.).

Абрад дзяльбы каравая – кульмінацыя вяселля, прычым адбываецца як і ў хаце маладой, так і ў хаце маладога. Звычайна права падзелу вясельнага каравая надавалася хросным: «Крёсная мама дзяліла каравай на ўсіх, кожнаму давала па кусочку» (запісана ў г. п. Плешчаніцы ад Аўсейка Валянціны Дзям'янаўны, 1937 г. н.). Тэкстаў каравайных песень амаль ніхто з апытваемых інфарматараў не здолеў прыгадаць, а іншы раз гучала ў адказ на пытанне: «Падчас выпякання каравая мы не спявалі ніякіх песень» (запісана ў в. Казыры ад Ліс Марыі Андрэеўны, 1928 г. н.).

Наадварот жыхарка в. Асінцы Надзея Мікалаеўна Кузьміч, 1925 г. н. адзначыла, што «выконвалі пры пекцы каравая песні, каравай рабілі вялікі». Калі дзялілі каравай, то кіраваліся пэўнымі правіламі, напрыклад, «первый кусок аддавалі нявесце, втарой – жаніху, патом – радзіцелям», у в. Акцябр «вярхушку каравая аддавалі маладым» (в. Асінцы). Маладых, якія атрымлівалі кавалак каравая, адорвалі падарункамі, выказвалі розныя пажаданні, благаслаўлялі ад імя ўсяго роду на заможнае і шчаслівае жыццё. «Падаркі дарылі чэраз платок, штобы маладыя жылі багата» (запісана ў в. Акцябр ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.). Калі пасля дзяльбы каравая застаюцца яго рэшткі, то «дзеўкі хочуць іх украсці, кінуць на крышу, каб дзеўкі ішлі замуж, а хлопцы стаяць, каб не даць каравай, каб яны не ішлі замуж. І тут ужо вайна: «хлопцы – сабе, дзеўкі – сабе» (запісана ў в. Гайна ад Жалянінай Марыі Мікалаеўны, 1930 г. н.).

Адметнасцю вяселля на Лагойшчыне з'яўляецца выкананне і ў першы, і ў другі дзень вяселля «марша» для маладых і гасцей, падчас якога «збіраюць грошы музыкантам» (запісана ў в. Весніно ад Макейчык Ніны Васільеўны, 1932 г. н.).

Завяршалася вяселле на Лагойшчыне «перазовамі», якія «спраўлялі праз пэўны час пасля вяселля, як хто паспяваў падрыхтавацца. У перыяд да перазоваў маладая не мела права наведвацца да сваіх бацькоў» (запісана ў в. Аўгустова ад Каборды Соф'і Антонаўны, 1930 г. н.).

**Літаратура**

1. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / Уклад. В. Д. Ліцвінка; уклад. муз. часткі Г. Р. Кутырова. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 477 с.

## СЯМЕЙНА-АБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ

### Радзінная паэзія

Хрысцілі рабёнка ў цэркве. Рабёнка свяшчэнік апускаў у воду 3 разы, чытаў малітву, а потым вешаў на шэю крэсцік і абварочваў яго белым палаценцам. Рабёнка забірала хросная маці і везла потым дадому. Там ужо рабёнка адорвалі падаркамі, а хросная маці давала імя рабёнку.

Калі бярэменная ціха ходзе – дзіцё будзе ціхім.

Нельга есці сала бярэменнай – бо будзе аперацыя (кесарава сячэнне).

Нельга каб бярэменнай жэншчыне кошка прабегла праз ногі, пераступать через её і насіць паясы, то ў дзіцяці будзе сплюшчаная пераносіца.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Анішкевіч Анжэлы Усеваладаўны, 1964 г. н.,***
***Новак В. С.***

Цяжарным жанчынам забаранялася шмат есці, бо лічылася, што дзіцёнак не будзе сытым. Цяжарным жанчынам забаранялася зайздросціць чужым людзям. Існавала павер'е, што цяжарная жанчына не магла падразаць валасы.

Хрэсьбіны праісхадзілі так. Свяшчэнік чытаў малітву і апускаў дзіцёнка ў свяцоную воду 3 разы, потым свяшчэнік адзяваў на шэю дзіцёнку крэсцік. Хросная маці яго ўкутвала белым матэрыялам. А пасля ўжэ везлі дзіцёнка дадому. Там іх должна была сустракаць бабка-павітуха ў вывернутым кажусе. Дзіцёнка адорвалі падаркамі. Прыносілі ўсё, што ёсць.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Шуркевіча Рыгора Станіслававіча, 1930 г. н.,***
***Новак В. С.***

Хрысцілі дзіцяці да года. Кум, кума нясуць і хрысцяць. Нясуць таксама што-небудзь бацюшку. Куму каталі зімой на санках, летам на калёсах. Кум выкупляў кашу.

Няльзя цяжарнай жанчыне пераступаць цераз браўно ці вяроўку – дзіця пупавінай задушыцца.

***Запісана ў в. Дрыла 1-я Лагойскага р-на***
***ад Міклашэўскай Ганны Паўлаўны, 1927 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А. (2008 г.)***

На другі дзень хрэсьбін, у час застолля, на каталку лажылі салому, туды садзілі бабулю. Яна ўпіралася, не хацела садзіцца, а яны пасадзюць яе і катаюць. Тады бабуля далжна адарыць іх усіх. А патом каталі хросных. Гэта рабілі, каб дзіця было здаровае, вясёлае і багатае.

***Запісана ў в. Завішына Лагойскага р-на***
***ад Карзюк (Бахар) Яўгеніі Іванаўны, 1936 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

### Радзінная песня

Сядзіць бабулька на куце,
Як галубка на кусце.
Сядзіце далоў. – 2 р.
Ці не пойдзе дамоў?
– Я к дамоўкі не хачу,
У дамоўкі не пайду.
Я за гэты куцец
Зарабіла ласкунец. – 2 р.

Сядзіць кумок на куце,
Як галубок на кусце.
Садзіце дамоў,
Ці не пойдзе дамоў. – 2 р.

Я к дамоўкі не хачу,
У дамоўкі не пайду.
Я за гэты куцец
Заплаціў чырванец. – 2 р.
Сядзіць кумка на куце,
Як галубка на кусце.
Садзіце дамоў,
Ці не пойдзе дамоў. – 2 р.
Я ж дамоўкі не хачу,
У дамоўкі не пайду.
Я за гэты куцец
Заплаціла ласкунец. – 2 р.

***Запісана ў в. Засоўе Лагойскага р-на***
***ад Кушнярэвіч Гілены Лявонцьеўны, 1908 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Бардушка Г.***

**Хрэсьбінная жартоўная песня**

*Спявалі, калі нараджалася дзіця:*
Чыя гэта хатка?
На вуліцу акном стаіць.
Чыя гэта жонка  ў полазе ляжыць,
Папытайцеся, чаго яна хоча?
Ці піва, ці мёду?
А ці горкай гарэлкі?
Калі будзе ды сыночка радзіці,
Дык буду мядочкам паіці,
Калі, дачушкі – людскія служкі,
Дык горкай гарэлкай.

* * *

*Спявалі на хрэсьбінах куме і куму. А пачула яе ад свацці:*
Кум куме рад
Ды павёў яе ў сад.
Еш, кума, ягадкі,
Каторыя салодкі,
А каторыя горкія,
Дык кідай далоўкі.

* * *

Запражыце свінню смалёную,
Адвяжыце куму хвалёную.
Запражыце ды 12 сабак,
Адвязіце нашу бабульку ў кабак.

***Запісана ў в. Зыкава Лагойскага р-на***
***ад Табалевіч Веры Сямёнаўны, 1918 г. н.***
***(нарадзілася ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на),***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Табалевіч В. (1997 г.)***

Праслаў, Божа, каваля,
Што скаваў нам дзіця,
А ён малатком [не] стукнуў,
У ручкі свае [не] хукнуў.
А ў мяккіх падушках,
А пад цёплай дзяружкай

Без малатка, без кавадла
Нарадзілі дзіця ладна.

***Запісана ў в. Карбачоўка Лагойскага р-на***
***ад Жалабковіч Валянціны Іванаўны,***
***Новак В. С.***

Пасля нараджэння бабуля купала дзіця. У ваду клалі капейкі. Бабуля пелінала дзіця і абвязвала поясам (пояс тканы). Бабуля павінна даць пояс, бо не будзе ў пары. Маці-парадзіха абавязана адарыць бабулю (даць грошы). Таксама збіраліся на мыла. На стол ставілі талерку і слалі насавы платок. Сюды кідалі грошы. А потым гэтыя грошы аддавалі маці. Перад крашчэннем бабуля таксама купала дзіця. У адведкі бралі пялёнкі і распашонкі.

На хрэсьбіны каталі бабу і дзеда. Каталі на тачкі, санях да магазіна. Коні былі мужыкі. Баба трымала пугу, якой паганяла мужыкоў. Пуга была сплецена з лент. Ставілі яшчэ тазік з вадою і садзілі музыкантаў. Абавязкова везлі ў магазін, каб баба купіла гарэлкі.

***Запісана ў в. Кацялі Лагойскага р-на***
***ад Ярашонак Сафіі Анатольеўны, 1943 г. н.***
***ад Ярашонак Міхаіла Іванавіча, 1944 г. н.,***
***Новак В. С.***

На хрысціны бабу садзяць у жалезнае карыта і вязуць яе ў магазін па гарэлку. Пасля раджэння бабуля далжна са сваёй адзежай прыйсці купаць рабёнка. Кідаюць у балейку медныя капейкі, каб рос багаты, доля была харошая. Бабуля пякла бальшую міску булак усякіх. Потым дзеля і па сталах раскладае.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Івашкевіч Соф'і Антонаўны, 1914 г. н.,***
***Амбражэй Алы Аляксандраўны, 1936 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Бабака-павітуха адразала рабёнку пуп і клала яго на святую кнігу. Калі купалі, то клалі залатое кальцо, каб багаты быў. Бабка-павітуха абавязкова прыносіла хлеб і соль, а гаспадыня ёй ужо давала падарак.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Лапцэвіч Ганны Антонаўны, 1931 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

У ваду клалі кальцо, капейкі, каб багатыя былі. Ваду вылівалі пад вугол, каб па гэтай вадзе ніхто не ступіў. Бабку адорвалі. Бабка прыносіла вялікую міску. Парадзіха клала бабцы ручнік, абрус, а потым складалі ўсе грошы, хто сколькі мог. Усе клалі грошы, каб дзіця было багатае. Парадзіха за стол не садзілася. Гулялі два дні. Каталі бабу з дзедам. Каталі куму з кумам, ставілі сваю гарэлку. Калі дзіця нараджалася, бабка яго бабіла – пупавіну адразала. Пасля гэтага дазвалялі ўвайсці ў памяшканне да рожаніцы і ўсе маглі паглядзець, як адразаюць пупавіну. Ножніцамі адразала і ёдам змазвала. Сталі прыходзіця жанчыны ў адведзены: сёння адна, заўтра – другая, а ў нядзелю ўсе суседзі. А пасля таго, як акрэпне маці, спраўлялі радзіны. На радзінах пелі, скакалі. Бабулька была галоўным госцем. Бабка прыносіла свае пялёнкі. Бабулька купала малое дзіця. А потым было ўжо застолле.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы***
***ад Лапцэвіч Ганны Антонаўны, 1931 г. н.,***
***Новак В. С.***

Бярэменнай нялзя адаўжаць нічога, а то будзе многа мышэй. Мышы адзежу паядзяць. Іх трудна патом вывесці. Бярэменная прышпільвала булаўку. На хрэзьбіны дарылі спачатку

падарак бабулі. Патом кум, кума і бабуля абменьваліся падаркамі. Бабіна каша называлася бабіна міска.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Турчыновіч Міхаліны Венядзіктаўны, 1926 г. н. (нарадзілася ў в. Каргавішча),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Нельзя было адалжываць, бо пасля гэтага хазяйка магла кінуць нож услед і эта атразілась б на дзіцёнку.

Пасля радзін, як нарадзілася дзіцё, прыходзілі бабка і госці, атведваюць. Кашу называлі бабінай.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Ніны Сямёнаўны, 1938 г. н. (нарадзілася ў в. Вострава),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Цяжарнай жанчыне нельга нагой жывёл штурхаць. А то ў дзіцяці валасы на спіне будуць.

Цераз вяроўку, забор нельга было лезці цяжарнай – дзіця пупавінай задушыцца.

Бацькі рабілі крысціны. Былі кум, кума, бабка. Бабку каталі на баране, давалі «бабіну кашу», давалі грошы, выкуплялі кашу (хто выкупе, той і выкупе). Кума таксама каталі, а ён ужо ставіў бутэльку шампанскага.

Прыходзіла бабка і свяціла дзіцятка з вадзічкі, толькі тая, якая ўмее. Потым вязём у касцёл.

А як не спіць дзіця, трэба «выганяць начніцы». Запіралі дзіця ў шкаф, каб дзень з ноччу памяняць (каб ноччу спаў, а не крычаў).

***Запісана ў в. Старое Чэрнева Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Ядзвігі Аляксандраўны, 1931 г. н.,***
***Акуліч Антона Адамавіча, 1931 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Дамінікам А., Елавой Н. (2008 г.)***

Вазілі младзенца ў цэркву. З вялікай цэбры бралі ваду, хрысцілі дзяцей святой вадой. Свяшчэнік маліўся. Дзяцей бралі і голымі іх акуналі ў свяцоную ваду 3 разы. Акунаў свяшчэнік. Крёсная маць абкручвала дзіцёнка белым матеріалом. Свяшчэнік вешаў крестік і чытаў малітву. Младзенцу прыносілі падаркі.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Аўсейкі Валянціны Дзям’янаўны, 1937 г. н.,***
***Новак В. С.***

Няльзя было чэраз сякеру пераступаць, бо ў дзіця будзе заячая губа. Нельзя было смяяцца з бальных, некрасівых. Эта вліяе на дзіця. Яно можа нарадзіцца такім жа. Няльзя было многа есці, бо дзіця будзе ўсегда хацець есць. Няльзя было абразаць косы, бо дзіця будзе неразумным.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Арцем’евай Лілії Васільеўны, 1939 г. н. (пераехала ў 1962 г. з в. Слабада),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

Бярэменная жэншчына павінна насіць булаўкі, штоб яе ніхто не сурочыў. Бярэменнай нельзя нічога пазычаць, таму што ўслед за бярэменнай могут секнуць на парогу – дзіцёнак будзе красць. Бярэменная, калі спугаецца, то нельзя брацца за цела, а то будзе на гэтым месце пятно. Нельзя сядзець на стале, бо роды будуць цяжолыя, нельзя работаць у праздні́кі. Нельзя глядзець на пакойнікаў. Дзіцёнку трэба павесіць булаўку, каб не сурочылі. Кагда жэншчына ражала, то той срок яе скрывалі. Пры родах адкрывалі ўсе дзверы, вокны, каб лягчэй было ражаць. На хрэсьбіны бралі тую жанчыну, якая прынімала роды. У цэркаў нельзя хадзіць пры хрэсьбінах, а толькі ездзіць, бо дзіцёнак будзе доўга вучыцца хадзіць.

Калі білі кашу, то асколак ад гаршка з кашай бралі сабе, каб быць шчастлівым. Бабке дарылі падаркі, называлі харошымі словамі. А калі хрэсьбіны заканчваліся, то на тачку садзілі кума з кумой і бабку і везлі дадому, пры гэтым пелі песні.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Арцем’евай Лілії Васільеўны, 1939 г. н. (пераехала ў 1962г. з в.Слабада),***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

## Хрэсьбінная песня

*Спявалі бабулі на хрэсьбінах:*
Ой, тут радзінкі былі,
Тут мы гарэлачку пілі.
Запала дарожка сняжком –
Не пойдзе бабуля пяшком.
Унучак, каня запражы,
Бабульку дамоў завязі.
А ты, бабулька, не скупі
Ды нам паўлітра купі.

***Запісана ў в. Пушча Лагойскага р-на***
***ад Усянцовай Марыі Маісееўны***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Бурдыка І.***

Бярэменнай жэншчыне няльзя нагой біць жывёлу, бо дзіця будзе тады злое, плаксівае, хворае. Забаранялася пазычаць што-небудзь. Лучшай родныя хай сходзяць, чым яна сама. Ад суроку дзіця выціралі спадніцай. За бабу-павітуху бралі старую суседку.

***Запісана ў в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Акуловіч Валянціны Адольфаўны, 1933 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М. (2008 г.)***

Бярэменнай няльзя было хадзіць над вяроўкай, штоб пупавіна ў дзіцёнка не закруцілася за горла. Няльзя прыгаць чэраз канаву, а то дзіцё будзе балець.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М. (2008 г.)***

Бярэменным нельзя перастунаць чэраз шланг. Будзе дзіцёнак абкручаны пупавінай. Нельзя бярэменным стрычся – будзе кароткі век у дзіцёнка. Калі радзіцца ў четверг – чысцюля будзе дзіцёнак, вторнік – рабацяга, васкрэсенье – гультай, субота – гуляка.

***Запісана ў в. Скарады Лагойскага р-на***
***ад Пракопчык Жанны Канстанцінаўны, 1968 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

Кумоў выбіралі не як цяпер. Абязацельна кумаўёў доўжэн быў выбраць бацька младзенца, ну муж мой, вось. Я хацела падружку ўзяць, дык ён не разрашыў, патаму шта ў яе дзяцей не было. Нельзя такіх зваць у кумаўя. Ну, у дзень хрэсьбінаў усе, акрамя мяне, паехалі ў цэркаў. Ну што там рабілі, ну дзіцёнка аблілі вадой, далі імя, ну і ўсё. Не, імя ні абы з чаго бралі, як сейчас, а глядзелі па царкоўнаму календару. Жэншчына, каторая радзіла, не імела права ўвайсці ў цэркаў да «ўводзінаў» пасля родаў. Хрысцілі тожа не як цяпер: і ў год, і ў пяць, як захочуць, а самае большае да чатырох нядзель. Ну, еслі радзіўся мальчык, вось як у меня, дык яго ўносілі ў алтар, а дзевачак не ўносяць.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Міхайлоўскай Валянціны Іванаўны, 1930 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А. Шурмель С. (2008 г.)***

Пасля нараджэння прыходзілі, адведвалі дзяцей. Потым былі хрэсьбіны. Пакупалі за вешч бабу. Затым бабу каталі на баране ці плугу і за стол. Давалі ёй на кофту, спадніцу. Хрушчы пяклі (сухаркі), аладзі пасыпалі сахарам.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Бартко Аляксандра Іванавіча, 1927 г. н.,***
***Бартко Рэгіны Антонаўны, 1929 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А., Шурмель С., (2008 г.)***

На хрысціны бралі хроснага, хросную і яшчэ бабу. На крысцінах абязацельна каравай дзялілі. Была бабіна каша і кумава міска. Кумаву міску складаў кум ці кума. Міску такую бальшую, канфет туды, пірагоў наложуць і так красіва ўкрашаюць. І дзялілі яе. Лажылі на бабіну кашу і на кумаву міску капейкі ці рублі. Тарэлачку даюць і кажуць: «Паспытай бабінай кашы. Паспытай кумавай міскі.»А яшчэ каталі бабулю з дзядуляй ці кума з кумой. Ці на санкі, ці ў каляску, тады выкуляюць іх спецыяльна. Па вёсцы каталі, тады яны гарэлку ставяць. Прута якога возьмуць ці веніка і паганяюць.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Міхневіч Валянціны Мікалаеўны, 1938 г. н.,***
***Новак В. С.***

Звалі бабу. Яна купала дзіця першы раз. Спаўе, ножкі туга сцісне, каб танцоркай была ці танцор быў. Хрэсьбіны рабілі. Ідуць госці з сваёй бутылкай. На хрэсьбіны баба міску пякла – пірагі, сухары. Іх разразалі і кожнаму на талеркі клалі.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Андрушкевіч Зінаіды Канстанцінаўны, 1925 г. н.,***
***Новак В. С.***

Первай дзіця купала бабуля. Паложыць малога ў дзеравянае карыта, якое прыносіла сама і абязацельна прыносіла тканыя пялёнкі. У карытца ложаць дзеньгі ці золата, каб багаты быў. На радзіны бабуля пякла міску сухароў. Сабіралі гасцей. Бабуля ставіла гэту міску на стол. Накрывала чым-небудзь, платочкам там ці што. Ну затым ужо баба гэту міску дзяліла. Калі бабуля міску дзяліла, дык ужо лажылі грошы «на бабуліну міску». Салфеткай накрывалі міску і лажылі на яе грошы.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Шаўчэнка Ганны Іосіфаўны 1934 г. н.,***
***Новак В. С.***

Устань, мама, не ляжы,
А дарожку пакажы…
…
Не магу ўстаці
Са сваёй краваці.
…
Дубовыя дошкі
Сціснулі ножкі.
…
Аддалі мяне ў вясковую краіну
Жыць не тужыць.

***Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на***
***ад Бынкоўскай Ганны Пятроўны, 1936 г. н.,***
***Новак В. С.***

К бярэменнай тут не так атнасіліся як зараз. Працавалі да паследняга. Во я сёння, напрыклад, капала бульбу, а назаўтра радзіла. Ніхто не глядзеў на эта. Пасядзела з малым дзень ды і пайшла ў поле. Карміць жа сям'ю трэба было. Я ражала, дык прыбегла Анюта і крычыць нема: «Адчыняйце дзверы, каб хутчэй радзіла». А сама валасы распусціла.

***Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на***
***ад Нікіцінай Тамары Вікенцьеўны, 1930 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Булахавай М.,***
***Шурмелем С., Атрохавай В. (2008 г.)***

Выбіралі выбраную бабулю і яна далжна была першая пакупаць і спелянаць дзяця.

***Запісана ў в. Штанюкі Лагойскага р-на***
***ад Крэнь Марыі Станіславаўны, 1938 г. н.,***
***Новак В. С.***

## ВЯСЕЛЛЕ, ВЯСЕЛЕЙКА

### Вясельныя песні

За лесам-лесам вінны калодзец, вінны калодзец,
А там маладая віно тачыла, віно тачыла,
Віно тачыла, дзевак вадзіла, дзевак вадзіла.
– Дзевачкі, не разлівайце, не разлівайце.
Мая мамачка не сына жэня, не сына жэня,
Не нявестку бярэ, не нявестку бярэ.
Мяне, маладую, замуж аддае, замуж аддае.

***Запісана ў в. Жардзяжжа Лагойскага р-на***
***ад Гатоўка Евы Іосіфаўны, 1913 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Баркоўскай Н. (1999 г.)***

*Ад'езд да маладога:*
Ой, паеду, мая сястрыца, ад цябе,
Пакідаю я сваю рутачку ў цябе.
А ўставай, мая сястрычка, раненька
Ды палівай маю рутачку часценька.
Не палівай маю рутачку вадою,
А палівай маю рутачку сытою.
А ад вады мая рутачка вяць будзе,
А й ад сыты мая рутачка зрэць будзе.

***Запісана ў в. Заазер'е Лагойскага р-на***
***ад Сінюковіч Марыі Пятроўны, 1931 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Тамашэўскай Т. (1999 г.)***

А наш сватка – верабей,
Па сметнічку паскакаў,
Па сметнічку паскакаў,
Капеечкіназбіраў.
Ён Зіначку выкупляў.
А наша Зіначка маладзенька,
Ёй цана даражэнька.
Калі хочаце яе ўзяць,
Трэба тысячу нам даць.
Тысячу на стол кладзіце,
Сабе Зіначку бярыце.

***Запісана ў в. Заазер'е Лагойскага р-на***
***ад Сінюковіч Марыі Пятроўны, 1931 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Тамашэўскай Т. (1999 г.)***

Ой, чуць, маці, чуць,
Да дзе гаенцы п'юць.
А вясёлая тая вулачка,
Да куды яны йдуць.
Ой, знай, маці, знай,
Дачку замуж аддай.
Не аддавай яе за п'яніцу,
Бо будзе роду жаль.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Макольскай Соф'і Рыгораўны, 1912 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мікуліч Н. (1999 г.)***

**Вясельныя песні**

Ні тучы, ні грому,
А дожджык ідзе.
Казак да дзяўчыны
Штовечар ідзе.
Казак да дзяўчыны
Штовечар ідзе.
«Добры вечар, – кажа
І шчэ ручку дае.
Дзяўчына не чуе,
Ручкі не дае.
З другімі жартуе,
На мяне злуе.
На другую весну
Каліна цвіла.
Асталася дзяўчына
Ужо не адна.
Асталась у дзяўчыны
Дзіцятка мала.
Міленькі мой, мілы,
Як мы будзем зваць,
Купі мне гітару
Дзіця забаўляць.
Гітара іграе,
А я весялюсь.
Міленькі пакідае,
А я не журусь.

* * *

Ці не быстрая рэчка,
Што ваду замуціла,
Чаго плачыш ты, дзяўчыначка,
Ці не мамка пабіла?
«Мяне мамка не біла,
Я сама зажурыла,
Што не даў мне Бог,
Не судзіў мне Бог,
Каго верна любіла.
Ой, пайду ж я гарою,
А міл далінаю,
Людзі кажуць, я сама знаю,
Што не жыць мне з табою.
Няхай людзі кажуць
Усякае ліха,
А мы з табой, мілюсенькі,
Ды любіліся ціха.
Каб я гэта знала,
Што замужам ліха,
Рашчасала б касу русу,
Ды сядзела б ціха.
Ой, пайду ж, пайду тудою,
Кудай дзеўкай хадзіла,
Ці не ўбачу, ці не ўвіжу я,
Каго верна палюбіла.

*Запісана ў в. Гайна*
*ад Кохан Галіны Міхайлаўны, 1930 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Рудак Т.*

*Пяецца пасля вянчання:*
А дзе ж быў саколік,
Дзе ж была саколка? – 2 р.
Зляцеліся ж яны
Дый ў адзін садочак. – 2 р.
Селі ж яны
Ды ж на адзін кусточак. – 2 р.
Пілі ж яны вадзіцу
Ды ж аднэй крыніцы. – 2 р.
А дзе ж быў Іванка?
Дзе ж была Ганначка? – 2 р.
З'ехаліся ж яны
Ды на адно падвор'е. – 2 р.
Селі ж яны
Ды за адно застолье. – 2 р.
Пілі ж яны гарэлку
З аднаго кілішка. – 2 р.
Елі ж яны патраўку
Ды з адной жа міскі. – 2 р.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Кохан Яўгеніі Мікалаеўны, 1918 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Грушэўскай Н.***

*Пяюць, калі едуць па нявесту:*
А полюм-полюм, як морюм,
А дарогаю, як шнуром,
Ехала казакоў сем палкоў.
А наперадзе Сашанька
Шаўковым платком махаець,
Усех буярёў здзяржаець.
– Стойце, буярі, слухайце,
Як зязюлечкі кукаюць,
Як саловушкі шчыбечаць,
Як мая Леначка песні пяёт,
У новай каморе седзючы,
Тонку рубаху шыючы.

***Запісана ў в. Убалацце Лагойскага р-на***
***ад Аўхачовай Ганны Ігнатаўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Сямёнавай Л. (1994 г.)***

*Пяюць, калі хлопец едзе да дзяўчыны:*
Сабіраецца наш Колечка ў дарожку,
Панасыпаем поўны кішэні гарошку.
А там будуць сватнія дзеўкі піяці,
А мы ім будзем па гарошыне даваці.
*(Кожны слупок паўтараецца 2 разы)*

***Запісана ў в. Бяларучы Лагойскага р-на***
***ад Мароз Надзеі Пятроўны, 1933 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кульба В.***

*Пяюць, калі ідуць на каравай:*
На каравай ішла,
У каробцы яйцы несла.
Наперадзе былі яйцы ў каробцы.

Зрабілі мне бяду,
З чым я на каравай пайду?

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Янкавай А. І.***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кудыбінай І.***

*Жаніху:*
Ці табе, Іванька, кот вочы выдраў?
Па якіх ты ездзіў, а якую выбраў?
– А я ездзіў ночы, ня відзелі вочы.
А як стала відна, самому стала стыдна.
А яна ні з паходкі, а яна ні з работкі,
А яна ні з стану, а яна ні з твару.

***Запісана ў Лагойскім р-не***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мазгуновай К.***

*Пяюць сваты, калі прыехалі да маладога:*
Ой, знаці-знаці,
Чы то чужая маці
Вывернула кажуха
І прыйшла лякаці.

*Пяюць госці маладой, калі прыходзяць да маладога:*
Пусці свата ў хату
На печ пагрэціся,
На маладу падзівіціся.

*Пяюць, калі сваты заходзяць да маладога:*
Уздрыгнуліся лаўкі,
Як селі прыданкі.
Яшчэ больш уздрыгнуцца,
Як горелкі нап'юцца.

*Пяюць сваты, калі маладая не плача:*
Чорна хмара дожджу не мае,
Маладая Манечка плакаці не знае.
Дайце ёй цыбулі ў вочы,
Да й яна заплача ад маманькі ідучы.

*Пяюць сваты, калі забіраюць маладую:*
Прапіла маці дочку
На салодкам мядочку.
Напіўшыся, скачэ,
Праснуўшыся, плачэ
Ад куточка да куточка:
«Дзе дзелася мая дочка?»

***Запісана ў в. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Шульжык Людмілы Савічны, 1926 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Куніцкай Н.***

*Спявалі ў зборную суботу:*
Добра зязюльцы ў садзе жыці,
Лёгка мамачцы дачушку збыці.
Збыла дачушку за адзін дзянёчак,

За адзін дзянёчак, за вечарочак.
– Выйду на вулку – дзевачкі пяюць,
А маёй дачушкі ды нідзе не чуць.
Гляну на лаўку – лаўка пустая,
Прыйду ў хатку – хатка глухая.

***Запісана ў в. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Жоравай Вольгі Сцяпанаўны, 1931 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мусько К.***

*Пяюць маладой пры ад'ездзе да маладога:*
Думай сабе, Нэлачка, думай сабе.
Ці не жаль табе, Нэлачка?
З кім ты кідаеш сваю мамачку старую? – 2 р.
Яна ж пойдзе, старэнькая, па ваду,
Паваліцца з вядзёркам на ляду,
Памарозя белыя ручкі на снягу. – 2 р.
Прыйдзя ў хату з вялікімі трудамі,
Заліецца гарачымі слязамі.
Будзе цябе, маладзенькую, успамінаць.
Не будзе каму яе, старую, шанаваць.

***Запісана ў в. Жардзяжжа Лагойскага р-на***
***ад Гатоўка Евы Іосіфаўны, 1913 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Баркоўскай Н. (1999 г.)***

*Пяюць маладой, калі ад'язджае да маладога:*
– Пойдзе, (імя), у чужыя людзі,
Як ні жаль табе будзе.
Там сцежачкі невядомыя,
Ты па іх блудзіць будзеш,
Там суседачкі незнаёмыя,
Аб табе следжыя.
– А я сцежачкі разведаю,
Блудзіць не буду,
З суседкамі распазнаюся,
Судзіць не будуць.

***Запісана ў в. Буда Лагойскага р-на***
***ад Жук Ніны Мікалаеўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Шавель Т. (2000 г.)***

*Пяе маладая, як ад'язджае да маладога:*
Аставайся, мая мамачка, здарова,
Як мне выпала на Украіначку дарога.
А ці будзеш па мне, мамачка, тужыці,
Як я буду на Украіначцы служыці?
А ці будзеш па мне бедаваці,
Як я буду на Украіначцы гараваці?
Мамка запяець, а я заплачу слязою.
Ці не сыйдуцца нашы галаскі з табою?
Мамка будзет у полі жыта жаць,
А я буду ў сінім моры ваду браць.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Грынкевіч Аляксандры Міхайлаўны, 1936 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Рубін Ж.***

*Пяе маладая, як ад'язджае да маладога:*
– Ой, жаль жа мне, мая мамачка, на табе,
Што не пабыла яшчэ гадочак у цябе.
Я ж бы ў цябе первавы вяночак насіла,
Я ж бы тваё падворэйка красіла.
– З Богам, з Богам, маё дзіцятка, ад мяне,
Ёсць у мяне яшчэ меншая за цябе.
Тая будзе первавы вяночак насіці,
Яна будзе падворэйка красіці.
*(Кожны слупок паўтараецца 2 разы)*

***Запісана ў в. Жасцінае Лагойскага р-на***
***ад Гатоўка Юзэфы Вікенцьеўны, 1936 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Курак Н. (1992 г.)***

*Співаюць, калі дзеляць каравай:*
Да спары, Божа,
Да нашаму караваю.
Да злучы ж, Божа,
Да нашу парачку –
Янука і Ганначку.

***Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на***
***ад Матрашылавай Ганны Сцяпанаўны, 1902 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Бурдыка І.***

*Пяюць маладой у доме маладога:*
Як ляцела пава па бару,
Ляцела пава па бару,
Пусціла пер'я па маху,
Пусціла пер'я па маху.
– Сучыся, пер'е, сучыся,
Сучыся, пер'е, сучыся,
Вучыся, маладая, вучыся,
Вучыся, маладая, вучыся.
Як па новай хатцы пахадзіць,
Як па новай хатцы пахадзіць,
Як чужой мамачцы ўгадзіць,
Як чужой мамачцы ўгадзіць.
– Я й па новай хатцы пахажу,
Я й па новай хатцы пахажу,
Чужой мамачцы ўгажу,
Чужой мамачцы ўгажу.
Я яе мамкай назаву,
Я яе мамкай назаву.

***Запісана ў в. Жардзяжжа Лагойскага р-на***
***ад Гатоўка Евы Іосіфаўны, 1913 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Баркоўскай Н. (1999 г.)***

*Співаюць, калі дзяўчыну пакідаюць у мужа:*
– Сабірайцеся, мае сястрыцы, да сталу,
Будзім гаварыць, што будзім рабіць з сястрою.
Тут пакінуці – будзе трудненька ёй адной,
Дамоў забраць – будзе стыдненька ад людзей.
*(Кожны слупок паўтараецца 2 разы)*

***Запісана ў в. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Грынкевіч Валенціны Станіславаўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Саўчанка Г. П.***

*Пяюць, калі дараць падарункі:*
А на моры-моры,
Дзе вадзіцы многа,
Дзе вадзіцы многа,
Як сталі дарыці,
Дык няма нікога,
Дык няма нікога.
– А дзе та радзінка
Падзявалася, падзявалася?
Ці па надворку
Пахавалася, пахавалася?

***Запісана ў в. Чудзенічы Лагойскага р-на***
***ад Абмётка Надзеі Раманаўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мікуліч Н. (2005 г.)***

Дарылі-дарылі ды нямнога здарылі,
Ды нямнога здарылі.
Усяго паўасьміны.
Усяго паўасьміны і каня варанога.
І каня варанога, і цялушку-брыкушку.
І цялушку-брыкушку, і авечку-бялюку.

***Запісана ў в. Заазер'е Лагойскага р-на***
***ад Ваяводскай Леаніды Уладзіміраўны, 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Тамашэўскай Т. (1999 г.)***

Ой, дарылі-дарылі
Ды нямножка здарылі,
Толькі семсот чатыры.
Дары ты, мамка, маеш,
Ты маёй долі не знаеш.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Жалянінай Марыі Мікалаеўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кур'ян Н.***

Дзякуй, дзякуй, мой братка,
За твае дары невялікія.
Не я ж цябе дарую,
Госпада Бога вяльмую.
Судзі ж, Божа, даждаці,
Гэтыя дары аддаці.
Вясёліца на лета.
Дзякуй табе за гэта.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Кулік Марыі Іванаўны***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Савасцей В. (2000 г.)***

*Пяюць, калі падарылі падарункі:*
Каруся, каруся,
Старому, малому кланюся.
Старога, малога не мінай,
У Госпада Бога долечкі ўпрашай.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Кулік Марыі Іванаўны***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Савасцей В. (2000 г.)***

*Да маладой:*
Маладзенькая (імя), ты сядзіш вячэраеш,
Нічога не ведаеш, які твой замуж будзе.
Твой (імя) – п'яніца, цябе любіць не будзе,
Ён цябе біці будзе.

*Маладая:*
А я яго любіць буду.
Вадзіцы ў кубачак –
Напіся, мой любачак.
Ой, дары, мама, чым маеш,
Ты маёй долі не знаеш.

*Да маладых:*
Запалі, маці, свечку,
Выйдзі насустрэчу.
Сустракай пару дзетак,
Пару дзетак-адналетак.
У адно лета раджаліся,
А ў другое пазналіся,
А ў трэцяе звянчаліся.

*Да маладой:*
Запалі, мама, жыжу –
Прывезлі табе грыжу.

*Да маладога:*
Каб табе, Іванка,
Кот вочы выдраў.
Якую ты сабе
Нехарошу жонку выбраў.
А ні яна з твару,
А ні яна з стану,
А ні яна з паходкі,
А ні яна з работкі.

***Запісана ў в. Весніна Лагойскага р-на***
***ад Макейчык Ніны Васільеўны***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гаварковай Т.***

*Спяваюць маладой у хаце маладога:*
– А ў гародзе ячмень ці ўродзе?
Маладая Волечка свайму свёкру ці ўгодзе?
– Угаджу, дзевачкі, угаджу,
Я ля яго з чарачкай пахаджу.
– А ў гародзе ячмень ці ўродзе?
Маладая Волечка сваім залоўкам ці ўродзе?
– Угаджу, дзевачкі, угаджу,
Я ля іх з цвяточкамі пахаджу.
– А ў гародзе ячмень ці ўродзе?
Маладая Волечка сваёй свёкроўцы ці ўгодзе?
– Угаджу, дзевачкі, угаджу,
Я яе мамачкай назаву.

***Запісана ў в. Жасцінае Лагойскага р-на***
***ад Жук Юзэфы Іванаўны, 1913 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Курак Н. (1992 г.)***

*Застольная:*
А на нашай маладой,
А на нашай маладой,
На ёй венчык ззяя.
Я на ёй венчык ззяя,
А на ёй венчык ззяя.
А не сам жа ён ззяя –
Золата павышая,
Золата павышая,
Срэбра паніжая.

***Запісана ў в. Заазер'е Лагойскага р-на***
***ад Ваяводскай Леаніды Уладзіміраўны, 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Тамашэўскай Т. (1999 г.)***

Ой, стаяла, буяла,
Ой, стаяла, буяла канапелька ў гародзе.
А не даў ёй ветрык,
А не даў ёй ветрык зялёнай пастаяць.
Зялёнай пастаяці,
Зялёнай пастаяці, вецейкам памахаць.
Абабіў ёй лісточык,
Абабіў ёй лісточык на жоўценькі пясочык.
Ой, гуляла, гуляла,
Ой, гуляла, гуляла Галечка ў мамачкі,
А не даў ёй Вовачка, маладой, пагуляць.
Маладой пагуляці,
Маладой пагуляці, коскаю памахаць.
А расплёў ёй косачкі,
Расплёў ёй косачкі,
А разліў ёй слёзачкі.

***Запісана ў в. Мяхеды Лагойскага р-на***
***ад Мароз Марыі Сцяпанаўны, 1933 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Нагулевіч Т. (1995 г.)***

**Сіроцкая песня** *(спявалі дружкі нявесце)*

Сягоння ў нас сіроцкае вяселле.
Сіротачка па могілках хадзіла,
Яна сваю родну мамачку будзіла:
– Устань, устань, мая мамачка, не ляжы,
Хоць ты мне адзін дзянёчак паслужы.
– Не ўстану, не ўстану, дачушка, не магу,
Жоўты пясочак зажаў мне грудцы і насочык,
А грабавыя доскі сціснулі мае ножкі.

Ды хто ж гэта ў цёмным лесе гукае?
Гэта ж Волечка родну маму шукае.
Усе горы, даліны перайшла
Ды яна сваю родну мамачку не нашла.
Ды яна хадзіла ад цёмнай ночкі да сонца,
Ды яна не чула ад сваёй мамкі ні слоўца.
Вярніся, Волечка, вярніся,
Чужой мамачцы пакланіся.
Роднаму татку – найніжэй,
Ён благаславітны і шчырэй.

***Запісана ў в. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Жоравай Вольгі Сцяпанаўны, 1931 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мусько К. (1995 г.)***

**Сіроцкая песня**

Па магілачцы сіротачка хадзіла,
Яна свайго роднага татку будзіла:
– Устань, устань, мой татачка, не ляжы,
Хоць адзін дзень ты мне, татачка, паслужы.
– Не ўстану, дачушка, не ўстану,
Грабовы дошкі сціснулі ножкі, не ўстану,
Жоўты пясочык заціснуў носік, не дыхну.
– Ды павейце, буйныя ветры, з даліны,
Ды парвіце грабовыя дошкі на крошкі,
Ды пастаўце майго татачку на ножкі.

*Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на*
*ад Кізінай Ніны Макараўны, 1926 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Гладковай І. (2005 г.)*

**Сіроцкая песня**

Сёння ў нас нядзелька – васкрасенне.
Пачынаецца сіроцкае вяселле.
Сіротачка па магілкам хадзіла,
Яна сваю родную мамку будзіла:
– Устань, устань, мая мамачка, не ляжы,
Хоць ты мне адзін дзянёчак памажы.
– Ой, не ўстану, маё дзіцятка, не магу,
Зялёны дзярночык на грудзях ляжыць – не крану,
Грабовыя дошкі сціснулі ножкі – не ўстану,
Жоўты пясочак залёг у насочык – не дыхну.
Узнімяцца буйны ветры з даліны
Ды пазмятаюцца жоўтыя пяскі з магілы,
Ды паб’юцца грабовыя дошкі на крошкі,
Ды паставіцца мая мамачка на ножкі.

*Запісана ў в. Горна Лагойскага р-на*
*ад Козел Надзеі Арсенцьеўны, 1931 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Харэвіч Т. (2006 г.)*

**Сіроцкая песня**

Хто сягоння цёмнай начачкай не даспаў,
Праз магілачку чорну сцежачку вытаптаў?
Не даспаў наш Колечка ходзячы,
Свайго татачку просячы:
– Устань, устань, мой татачка, не ляжы,
Хоць жа ты мне адну ранічку памажы.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Кохан Я. М., 1930 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Маргуновай К.*

**Сіроцкая песня**

У нас сягоння дзень васкрэсны – нядзеля.
Пачынаецца сіроцкае вяселле.
Сіротачка на магілачку хадзіла,
Сваю мамачку на вяселейка прасіла:
– Прыбудзь, прыбудзь, мая мамачка, ты да мяне,
Бо не будзе парадачку без цябе.
– Дзіцятачка маё, мілое маё, не магу.

Сасновы доскі сціснулі ножкі – не ўстану,
Жоўты пясочак залёг у насочак – не ўздыхну.

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Яскевіч В. М.***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кудыбінай І.***

**Сіроцкая песня**

А паехала малада Ганнулька па двару,
Паглядала малада Ганнулька пад зару.
– А ці не йдзець мая мамачка з уборку,
А ці нясець мне ў хустачцы ўборку.
А нідзе маёй мамачкі не відаць,
А мне яе ўборыкаў не відаць.
*(Кожны слупок паўтараецца 2 разы)*

***Запісана ў в. Засоўе Лагойскага р-на***
***ад Кушнярэвіч Г. Л., 1908 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Бардушка Г.***

**Сіроцкая песня**

Ды зляцеліся шэрыя гусі ў аўсе,
Ды сабраліся к Светачцы госці, ды не ўсе.
– Ці ты, Светачка, позна-позненька ды заспала,
Што на свадзебку роднага татку не звала?
Пішы паслочкі ці ішлі лісточкі да яго,
Ды няхай жа ён хоць зязюлечкай прыляціць,
Ды няхай жа ён тваю свадзебку паглядзіць.

***Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на***
***ад Кізінай Ніны Макараўны, 1926 г. н.,***
***студэнткамі БДПУ імя М. Танка Гайчук С. і Глатковай І. (2005 г.)***

Неяк нядзельнай ранічкай выправіліся суседзі ў мястэчка на базар. Хацелі сёе-тое прадаць і набыць абноўкі дзецям і сабе. Ледзь не цэлы дзень яны прахадзілі ў пошуках патрэбных тавараў і вярталіся дадому не з пустымі рукамі. Весела паскрыпваў воз, на якім сядзелі гаспадар і гаспадарыня, іх блізкая сваячніца з мужам і старэйшым сынам. Такой кампаніяй ім зусім не было страшна пераадольваць ліхое месца. Гаспадар мурлыкаў пад нос песню, як раптам здалёк данёсся перазвон калакольчыкаў, заўзятыя пералівы гармоніка. Ехала вяселле. Сваты запрасілі і Гапона з сям'ёй прыняць у ім удзел. Той ахвотна згадзіўся, бо даўно ўжо не даводзілася яму гуляць на вяселлі. Сваты паднеслі гарэлку, далі й прыкусіць, а потым усё завіхурыла, зашумела. Гапон з жонкай кінуўся ў скокі. За ім сваячніца з мужам. Яны доўга скакалі, весяліліся. Потым сваты павялі іх спаць, пры гэтым дапамаглі й распрануцца, разуцца. Ачнулася Гапонава сямейства на світанку. Расплюшчылі вочы і жахнуліся: вакол іх непралазнае балота, багна, а іх адзежа, лапці і анучы паразвешаны па кустах. Ледзь выбраліся тады яны адтуль і больш ніколі не адважваліся ні хадзіць, ні ездзіць праз балота. Ледзь не пагубіла іх вяселейка.

***Запісана ў г. Лагойск***
***ад Кранцэвіч Любові Браніславаўны, 1936 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Рудак Т.***

Шлі ў сваты звычайна бацька, маці маладога, і яшчэ бяруць аднаго родственніка. П'юць гарэлку. Маладая адорвае падаркамі сватоў. Выкуп праісходзіць так. Маладую хавалі ў суседняй хаце. А жаніх іскал яе, калі ён не зможа яе знайсці, то бацькі і самі яе ўжо і аддаюць. Калі ад'язджаюць да маладога, то маладых абсыпаюць зярном.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Марыі Віктараўны, 1932 г. н.,***
***Новак В. С.***

У сваты хадзілі абычно бацька жаніха і бралі кума. Сватам абычно наліваюць гарэлкі, а потым іх адорваюць. Каравай выпякалі заўсёды замужнія жанчыны, якія былі шчаслівыя ў сваёй жізні. Каравай потым упрыгожвалі маладыя дзяўчаты. Каравай выпякалі очень бальшым. Частуюць потым усіх караваем, кожнаму па кусочку. Пелі каравайныя песні.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Смаляка Алега Мікалаевіча, 1937 г. н.,***
***Новак В. С.***

**Сямейна-бытавая (хрэсьбінная)**

Пайшла б дамоў, дык баюся,
Упілася я, аж валюся!
Я ліхога мужа маю,
Будзе біці – добра знаю.
Я пастукаю ў ваконца:
– Адчыніся, маё сонца!
Ідзі, жана, утапіся.
Цяпер ты мне не трэба.

***Запісана ў в. Жардзяжжа Лагойскага р-на***
***ад Рублеўскай Алены Мікалаеўны, 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Казловай Н. (2000 г.)***

**Вясельная песня**

*Пяецца пасля цэрквы:*
– Ой, дзе ж была, куды ездзіла, Танечка?
– А я была, я ездзіла на таржок.
– А што збывала,
А што набывала на таргу?
– А я збывала – дзявоцкую красу,
А набывала – жаночую пішчатку.
– А я збывала дзявоцкая гулянне,
А набывала жаноцкае страданне.

***Запісана ў в. Жасцінае Лагойскага р-на***
***ад Гатоўкай Юзэфы Вікенцьеўны, 1937 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Рудак Т.***

**Вясельная песня**

*Калі садзіліся за стол:*
Пасадзілі Волечку на куце,
Няхай мая калінка расцвіце.
Белы яе ручанькі, беленькі,
Каму ж яны будуць міленькі?
Устала раненька-раненька,
Узяла мяцёлку па хаце.
Што разок махне,
Цяжка ўздыхне
Ды яшчэ й паўтарае.

***Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на***
***ад Акуліч М. М., 1924 г. н.,***
***Шалупінай Н. П., 1926 г. н.,***
***студэнткамі БДПУ імя М. Танка Каранчук А., Азановіч В.***

### Вясельная жартоўная песня маладой

Кукавала зязюлечка, аж бор вяў.
Расплакалася наша дзеванька, што муж мал:
– А што ж я буду з такім маленечкім рабіці?
Палажыці ў пялёначку, дык парвецца,
Палажыці ў калысачку, дык не гнецца.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Давідовіч Соф'і Канстанцінаўны, 1912 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Конанавай Т. (1999 г.)***

### Вясельная песня

*Спявалі на вяселлі маладым:*
– Дзе быў, саколік?
Дзе была, саколка?
Пазляталіся ў адзін садочак,
Елі яны ягадкі з аднае ветачкі,
Пілі вадзіцу з аднае крыніцы.
– А дзе быў Янка?
Дзе была Ганначка?
Паз'язджаліся на адно падвор'е,
Пасаджаліся ды за адно застолле.
Пілі яны мёд, віно з аднае чарачкі,
Елі яны патраўку з аднае місачкі.

***Запісана ў в. Зыкава Лагойскага р-на***
***ад Табалевіч Веры Сямёнаўны, 1918 г. н.,***
***студэнткай Табалевіч В. (1997 г.)***

### Вясельная песня (пасад)

Ішла Зіначка із поля,
Несла кросачкі ў прыполе,
Несла кросачкі ў прыполе.
Віла вяночак пры столе,
Віла яна віла, плакала,
Ляцела зязюля і пытала:
– На каго, Зіначка, жаль мае?
І на таіку, зязюля, на мамку,
Што не дала моладзі вырасці,
Што не дала моладзі вырасці,
Русай косачкі выплесці.
Па двары хадзіла чэшучы,
На парозе стаяла вяжучы,
На парозе стаяла вяжучы,
У хату ўвайшла плачучы.
На пасадзе села, як зорка зазрэла,
А з пасады ўстала, ды як руда стала.

***Запісана ў в. Заазер'е Лагойскага р-на***
***ад Сінюковіч Марыі Пятроўны, 1931 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Тамашэўскай Т. (1999 г.)***

### Вясельная застольная песня

– Дзе ж быў, саколік?
Дзе ж была, саколка?

Заляцеліся ж яны ды ў адзін садочак,
Ды ў адзін садочак.
Селі ж яны ды на адзін кусточак,
Ды на адзін кусточак.
Пілі ж яны вадзіцу ды з адной крыніцы,
Ды з адной крыніцы.
– А дзе ж быў Іванка?
Дзе ж была Настачка?
Дзе ж была Настачка?
З'ехаліся ж яны ды на адно падвор'е,
Ды на адно падвор'е.
Селі ж яны ды за адно застолле,
Ды за адно застолле.
Елі ж яны патраўку ды з адной жа міскі,
Ды з адной жа міскі.
Пілі ж яны гарэлку з аднаго кілішка.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Кохан Аляксандры Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мікуліч Н. (1999 г.)***

**Вясельныя песні**

*Спяваецца перад вяселлем:*
За лесам-лесам вінны калодзеж. – 2 р.
Там маладая Волечка дзевак паіла. – 2 р.
– Піце, дзевачкі, не разлівайце. – 2 р.
Майму татачку не перашкаджайце. – 2 р.
Мой татачка не сына жэне. – 2 р.
Не сына жэне, ні нявестку бярэ. – 2 р.
Мяне, маладу, замуж аддае. – 2 р.

* * *

*Спяваецца перад вяселлем:*
А за лесам-лесам вяліка поле, вяліка поле.
Мала Манечка пшанічку поле, пшаніцу ў полі,
Пшанічку ў полі перабірае, перабірае.
Вугаль-мятліцу вон выкідае, выкідае.
Вугаль-мятліца добрае зелле, добрае зелле,
Была пшанічка мне на вяселле, мне на вяселле.

***Запісана ў в. Жасцінае Лагойскага р-на***
***ад Жук Юзэфы Іванаўны, 1913 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Курак І. (1992 г.)***

**Вясельны жарт**

Назаўтра пасля шлюбнай ночы маладым прыносілі качан капусты і казалі, што ў ім нешта схавана, калі гэта нешта дастанецца маладой, то нарадзіцца дачушка, калі маладому, то сынок. Маладыя разрывалі гэты качан і нічога не знаходзілі. А чалавек, які прынёс яго, казаў: «Такія вялікія, а ўсё вераць у казачку, што дзяцей знаходзяць у капусце».

***Запісана ў в. Аўгустова Лагойскага р-на***
***ад Станкевіч Алены Сямёнаўны, 1954 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Пацеевай І. (1992 г.)***

**Вяселле (перад каморай)**

Хадзіла Манечка па рынку,
Насіла ў ручках калінку,

З ёй хлопчыкі хадзілі
У яе калінку прасілі.
– Не дам калінку нікому,
Панясу калінку дадому,
Пасаджу калінку на куце,
Няхай наша калінка расцвіце.

*Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на*
*ад Кутас Ніны Яфімаўны*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Кудыбінай І.*

**Вясельная застольная песня**
**Сядзіць Леначка за сталом**

Сядзіць Леначка за сталом,
Льюцца слёзы ручаём.
Кліча татачку да сябе:
– Куды аддаеш ты мяне?
Ці ў цябе хатка замала,
Ці ў цябе хлеба не стала?
Хатка замала – прырубі,
Хлеба не стала – прыкупі!
Мяне, маладой, не губі!

*Запісана ў в. Траянец Лагойскага р-на*
*ад Жаўняровіч Таццяны Іосіфаўны, 1923 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Давідовіч Н. (1998 г.)*

Хваця вам, братцы, піці-гуляці,
Пара вам, братцы, да хаты ступаці.
– А ў нашым доме няма нікога,
Только сівы конь на стайні стаіць.
Ды пушчу я каня ў роўнае поле,
Няхай сівы конь нагарцуецца,
Няхай шэльма-жонка намуштруецца.
Пушчу сівога каня ў роўнае поле,
Няхай сівы конь наскочацца,
Няхай шэльма-жонка наплачацца.
Пушчу сівога каня ў роўнае поле,
Прывяжу жану каню к хвасту,
Няхай шэльма-жонка навалочыцца.

* * *

**Вясельная песня**

*Звычайна спяваецца пасля пярэзаваў:*
Цераз рэчаньку, цераз быструю
Гібкая кладачка ляжыць.
Па гэтай кладачцы, па гібкай
Малод Валодзечка ідзець,
Сваю Анечку, маладзеньку,
Ён за ручку вядзець.
– А ты, кладачка, а ты, гібкая,
Не гніся пада мной.
А ты, Анечка, маладзенькая,
Не хадзі ка ты за мной.
Выпі чарачку, выпі дзве –

Не будзь п’яненька,
Радзі сына і дачушку,
Не будзь старэнька.

* * *

Ой, зацвіла рута, зацвіла,
Ой, зацвіла рута, зацвіла,
Мела я мужа, мужа я мела,
Ой, мела я мужа п’яніцу.
Нічога не робя, толькі п’е,
Нічога не робя, толькі п’е,
А прыйдзе дадому, дадому прыйдзе,
А прыйдзе дадому, жонку б’е.
Не бі мяне, мужа, не карай,
Не бі мяне, мужа, не карай,
Бо я цябе кіну і дзяцей пакіну,
А сама паеду за Дунай.
Калі жонка ў лодку сядала,
Калі жонка ў лодку сядала,
Правай ручанькай, белай хустачкай,
Правай ручанькай махала.
Ой, вярніся, жонка, дадому,
Ой, вярніся, жонка, дадому,
Бо дзеці плачуць, есцікі хочуць,
А сам я не знаю, што рабіць.
Вярнулася жонка дадому,
Вярнулася жонка дадому,
Лыжкі нямыты, чашкі пабіты,
А дзеці плачуць на печы.

***Запісана ў в. Тукалаўка Лагойскага р-на***
***ад Глушанавай Ганны Іванаўны, 1907 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Карповіч Л.***

**Вясельная песня (перазовы)**

Позна-позна з вечара я прала,
Часта-часта ў акно паглядала.
Ой, ці ўзойдзе месячык звысоку,
Ці прыедзе брацейка здалёку.
Ой, узыйшоў месячык высока,
Ой, прыехаў брацейка здалёка.
Пытаецца брацейка ў сястрыцы:
– Ці ўгадзіла, сястрыца, сямейцы,
– Не ўгадзіла, брацейка, нікому.
Ні сямейцы, ні мужу, нікому.

***Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на***
***ад Кізіны Ніны Макараўны, 1926 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гайчук І. (2005 г.)***

**Вясельная**

*Спявалі, калі дзяўчыну садзілі на пасад:*
Ганулька, Ганулька, сядзь ты на куце,
Хто ж табе, Ганулька, косачку запляце,
А мамка родная запляце маю косачку.

Сядзь ты на дзежачцы, сядзь, ты сядзь.
Табе косачку рашчэсвала мамка родная.
Ганулька, Ганулька, пакланіся ты ўсім:
І малому і старому,
І ў ручкі і ў ножкі.
Гануся, Гануся, пакланіся ты мне.

***Запісана ў в. Харошае Лагойскага р-на***
***ад Аўсейкі Ксеніі Іванаўны, 1916 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Конанавай Т. (1999 г.)***

**Вясельная (сваццям)**

Ах, свашкі, свашкі – чурашкі,
Нямытыя ў вас рубашкі,
Нямытыя ў вас рубашкі.
Пазычце вы ў нас вадзіцы,
Пазычце вы ў нас вадзіцы.
Памыйце свае спадніцы,
Памыйце свае спадніцы.

***Запісана ў в. Алекшыцы Лагойскага р-на***
***ад Бурак Ірыны Васільеўны, 1928 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Вендзінай П. (2005 г.)***

**Вясельная**

*На застоллі ў маладога:*
На вяселейка пазвалі,
Чарачку гарэлкі не далі.
А каб знала – не пайшла б,
Ці я дома работкі не знайшла б?
Напрала б пачынак з пацьвінак,
Аснавала б красёнцы на кручок
І выткала б спаднічку і хвартушок.

***Запісана ў в. Гарадзішча Лагойскага р-на***
***ад Шолкавіч К. К., 1912 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Шолкавіч Н.***

Калі прыязджалі сватацца, то бацькі прывозілі сваю гарэлку. Калі заходзілі ў хату, то гаварылі: «Мы чулі, што ў вас ёсць цёлачка, а ў нас ёсць бычок, прадайце цёлачку нам». Бацькі жаніха баяліся, што нявеста адмовіць, бо гэта было пазорам. Калі дзяўчына адмаўляла, то яны выносілі хлопцам гарбуз. А калі нявеста згаджалася, то яна падносіла хлеб на ручніку свату і чарку гарэлкі. Пасля яны дамаўляліся аб вяселлі, а падружкі нявесты спявалі песні. На свадьбе нявесту ўпрыгожвалі падружкі і пры этым спявалі, песні. Калі маладыя ехалі ў царкву або з царквы і распрагліся коні, то маладым жыць нядоўга і муж будзе паднімаць на жонку руку. Калі маладыя прыязджалі дадому, то іх абсыпалі зярном – каб была багатая сям’я. На свадзьбе лажылі кажух там, дзе сядзяць маладыя, для таго, каб сям’я жыла ў дабрабыце, багацці.

А да вяселля яшчэ пяклі каравай. Пекла яго тая жанчына, якая ўдала вышла замуж. Каравай не трэба замешваць кулакамі, бо мужык будзе біць жонку. Выконвалі пры пекцы каравая песні, каравай рабілі вялікі. Песні, якія выконваліся на вяселле, у асноўным былі для жаніха і нявесты. Каравай выносілі, голымі рукамі нельзя браць яго. Вярхушку каравая аддавалі маладым. На свадзьбу прыходзілі цыгані, пелі песні, жартавалі.

***Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на***
***ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

**Вясельная песня**

Падумай сабе,
Ці не жаль табе (імя)?
Пры кім, пры кім
Старую мамку кідаеш,
А хто яе старыя ручкі падменіць?
А хто ж ёй мягка пасцельку пасцеліць?
А хто ж ёй бела кашульку памыець?
Есць у яе яшчэ меншая за мяне,
Яна пасцеліць лепей пасцельку за мяне,
Яна памыець лепей кашульку за мяне.

*Запісана ў в. Астрошыцы Лагойскага р-на*
*ад Фярко Марыі Іванаўны, 1907 г. н.*
*(нарадзілася ў в. Мацееўка Докшыцкага р-на Віцебскай вобл.),*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Фярко В. (2000 г.)*

Ішлі ў сваты бацька, маці, сват. Дагаварваюцца аб жаніцьбе. Нявеста звала суседзяў. Потым дагаварваюцца, калі свадзьба. Нада, каб свата перавязалі палаценцам. Калі нявеста адмаўляла – адносілі гарэлку і палаценца. Дзяўчаты садзілі нявесту на дзяжу. У першую ноч маладых пасылалі бацькі ў баню. Калі дзеўка нячэсная – вымазвалі дзёгцем вароты. Бацькі ўстрачалі маладых з хлебам-соллю. Як заходзяць у дом маладога, маладая стараецца пераступіць парог першай, тады будзе камандаваць. Маладыя ідуць «пад ручкі», каб іх ніхто не разлучыў. Маладая вешае ў хату ікону, палаценца на яе і ложыць падарак, а таксама калі ідзе першы раз да калодзежа, астаўляе там падарак таксама. Маладая дае ўсёй радні падаркі. Як вылазюць з-за стала, шаферка здзяе з маладой вянок і вешае на ікону. Свякроў выганяе маладых з-за стала дубчыкам, і маладая павінна даць падарак. Тады свякроў павязвае платок маладой. Потым маладая накрывае стол свякрові і свёкру і абслугоўвае іх.

*Запісана ў в. Атрубак Лагойскага р-на*
*ад Кучынскай Ядзвігі Станіславаўны, 1930 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Акуліч Т. (2000 г.)*

**Вясельны абрад**

Маладыя, будучыя муж і жонка, часцей за ўсё знаёміліся на кірмашах, ля царквы. Выгадным лічыўся жаніх з працавітага роду, калі ў яго прыстойныя бацькі. Нядбайны, гультаваты хлопец не мог разлічваць на тое, што за яго выдадуць выхаваную, дарэчную дзяўчыну. Пра такога жаніха казалі: «Вырас пад неба, а дурань як трэба».

Абавязковым быў куфар, у які складвалі па традыцыі трубкі палатна, абрусы, ручнікі, адзенне, посцілкі тканыя. Давалі ў пасаг цялушку, жарабя, каня, калі выдавалі за беднага. У крайнім выпадку, калі не пазваляў дастатак, то авечак ці нават курэй. У пасаг сыну, калі ён аддзяліўся ад бацькоў, выдзялялі надзел зямлі або прыкуплялі. Сыну меншаму пры жаніцьбе выдзялялі больш, бо яму выпадала даглядаць да старасці бацькоў. Малодшаму завяшчалася і бацькоўская гаспадарка.

Вяселле, як правіла, спраўлялі ў мясаед – перыяд ад Вадохрышча да велікоднага поста. Не спраўлялі вяселляў у месяцы маі, бо лічылі, што ўсё жыццё будуць маяцца. Калі дзеўка па выхаду замуж зацяжарвала, што было рэдкасцю, то абыходзіліся без вяселля, яна прыходзіла ў новую сям'ю «цішком». Лічылася, што калі на галаву цяжарнай ускласці вянок, пашкодзіцца плод дзіцяці.

Вяселле доўжылася адзін дзень. Багатым лічылася вяселле, калі застолле праходзіла тры вочарадзі, тры разыналівалі. Чарка хадзіла па кругу, «ад крука да крука» (крук забівалі ў вушак – для віцця вяровак). На багатым вяселлі ў дружыне было па 8 шафераў і столькі ж шаферак, іх яшчэ называлі «асустэнцыі» або «асустэнткі», з боку маладой другая назва – бальшаначкі. Паміж шаферкамі размяркоўваліся абавязкі: каму рабіць вянок, каму рабіць ці купляць кветкі, каму прыглядваць за гасцямі.

Яшчэ да сватання збіраліся бацькі на змаўленне (запоіны), абгаворвалі пытанні, звязаныя з прадстаячым вяселлем. Высвятлялі і такія пытанні: «А ці знаеце вы, што ваш сын надумаўся жаніцца? А ці згодны ўзяць нашу дачку ў сваю зямлю?»

Сватаўству папярэднічалі запоіны (змовіны), на якія прыходзілі бацька з сынам, з сабой прыносілі пляшку гарэлкі, упрыгожаную жытнімі каласамі і перавязаную рушнікам.

У сваты выпраўляліся якраз у пятніцу або суботу (адсюль прымаўка: «Гатова дзеўка, хоць у пятніцу замуж»), і абавязкова на маладзікову «поўню». Гэтую місію бралі на сябе сват і свацця. Нявестка, ведаючы аб маючым адбыцца сватаўстве, запрашала сваіх блізкіх сябровак. З гэтага выпадку яна апранала ружовую спаднічку і белую кофтачку. У пачатку размовы яна стаяла сціпла, калупала пальцам гліну ў сцяне. Калі прыходзілі да згоды, дамаўляліся аб часе правядзення вяселля, колькі будзе гасцей з абодвух бакоў, якім будзе склад дружыны. Калі дасягалася згода, маладую падводзілі да жаніха, ставілі побач.

Калі па прыездзе ў сваты заставалі ў хаце другіх сватоў, то вырашала сама дзяўчына: з кім садзілася побач, таго і лічылі за жаніха. У тым выпадку, калі пры сватанні не прыходзілі да згоды, то расставаліся па-добраму. Бацькі маладой праяўлялі тактоўнасць: маўляў, яшчэ маладая, няхай падрасце, а там будзе відаць. Бацькі дзяўчыны павінны былі сплаціць за выпітую гарэлку.

**Агледзіны.** Пасля сватаўства маці маладога пасылала каго-небудзь са сваякоў (ці суседку), якая быццам незнарок завітвала ў хату да бацькоў маладой, дзе старалася неўпрыкмет як мага болей даведацца, выпытаць, разглядзець. Калі звесткі гэтыя былі адмоўнага характару, то вяселле магло і разладзіцца.

На споведзь перад вяселлем хадзілі паасобку. Дзяўчына прызнавалася ў сваёй чэснасці, а хлопец даваў абяцанне – клятву, што будзе добрым мужам, не пакрыўдзіць будучую жонку. У лазню да вяселля маладыя ўдваіх не хадзілі.

Адзенне маладой: белы каптанок і белая спадніца, шытая ў 5 кліноў, ззаду раскляшоная, з шлейфам, які павінны былі несці, прыўзняўшы, дзве шаферкі («аўсістэнкі»). Прыбіралі маладую да шлюбу ў суседняй хаце.

Бывала, што маладому жартам падстаўлялі прыбраную пад нявесту старую бабу. Праходзіў розыгрыш: «Я ж не гэтую выбіраў». «А ты добра не разгледзіў вечарам, бо цёмна было». Жаніх плаціў грашыма тым, хто рабіў вянок, хто прыбіраў нявесту.

Каравай выпякала свацця, адна, у сваёй хаце.

Малады ехаў да маладой на возе з сватам і сваццяй, першым шаферам і першай шаферкай. На другім возе – астатнія шаферы з музыкантам. Коні былі чыста вымытыя, прыбраныя. Музыкант іграў усю дарогу. Каб коні беглі шпарчэй і весялей, ім пры паенні падлівалі гарэлкі.

На пасад маладую вяла хросная маці. Родная маці благаслаўляла з іконай. Маладую садзілі на дзяжу, накрытую вывернутым кажухом. Калі маладая не зберагла дзявоцкасці, на дзяжу не мела права садзіцца, баючыся граху і людскога асуджэння.

Поезд маладой пад'язджаў да хаты маладой шумна, з музыкай, жартамі. Сустракалі бацька і маці. Калі ж бацькі ў маладой не было, яго замяняў хросны бацька. Заходзілі ў хату, бацька станавіўся справа, маці злева, у руках трымалі талерку з хлебам і чаркамі для маладых.

За стол рассаджваў сват, найперш – маладых – на покуці на разасланым рушніку. Насупраць іх – хросныя бацькі і сват са сваццяй. Дружына маладога – з яго боку, маладой – насупраць.

У царкву ехалі асобна, з царквы – на кане маладога. Едучы вянчацца, бралі з сабой дабро. Раней толькі вядро вады.

Лічылася, што калі падчас выезду ў царкву ішоў дождж, то на дабро, на шчаслівае жыццё. Коні наравяцца, не хочуць ісці – благая прымета.

На вяселлі ў маладога абрусам закрывалі стравы на стале. Калі ўсе рассаджваліся, маці ключом ад свірана знімала абрус, клала сабе на пляччо. У гэты момант маладая падносіла, уручала свае падарункі – бацькам маладога, усім сямейнікам. Пакідаючы застолле, свякроў знімала з галавы нявесты вянок і завязвала хусцінку. Вянок з вэлюмам вешалі за ікону.

Перазовы спраўлялі праз пэўны час пасля вяселля, як хто паспяваў падрыхтавацца. У перыяд да перазоваў маладая не мела права наведвацца да сваіх бацькоў. На перазовы запрашаюць сват і свацця.

*Запісана ў в. Аўгустова Лагойскага р-на*
*ад Каборда Соф'і Антонаўны, 1930 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Сялюк А.*

## Вясельны абрад «Завіванне»

На куце сядзяць маладыя, а на лаўках становяцца жанчыны яшчэ маладога ўзросту, каб былі вёрткія. Гэтыя жанчыны знімаюць з маладой вэлюм, бяруць за рогі хустку, якую трымаюць над галовамі, і спяваюць:

Мы ж цябе ... завіваем,
Шчасцем, доляю нагараждаем.
Будзь багата, як зямля,
Будзь здарова, як вада,
Будзь прыгожа, як ружа.

Пасля гэтых слоў песні стараюцца стукнуць галовамі маладых, маладыя прыціскаюцца, але іх аддзіраюць, каб стукнуць зноў. Пасля гэтага завязваюць хустку маладой.

***Запісана ў в. Аўгустова Лагойскага р-на***
***ад Мельнік Паліны Іванаўны, 1920 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Хадаровіч Т. (1997 г.)***

## Вясельная песня

*Старыя пяюць маладой, калі да яе прыязджае малады:*
Сядзіць голуб на пераплёце, боб клюе,
Але яго галубачка пшаніцу.
– Лепей табе, мой Голубе, чымся мне,
Тваё зярнятка буйнейшае, маё – не.
Сядзіць Леначка за столікам, слёзкі л’е,
Але яе Дзімачка мядок п’е.
– Лепей табе, мой Дзімачка, чымся мне,
У цябе мамачка родненькая, у мяне – не.
Яна цябе ранюсенька пабудзіць,
Мяне выйдзе на вулачку, абсудзіць.

***Запісана ў в. Буда Лагойскага р-на***
***ад Жук Ніны Мікалаеўны, 1934 г. н.,***
***студэнтам БДПУ імя М. Танка Булат А. (2004 г.)***

## Вясельная песня маладой

Бальшаначкі, падманачкі вы мае,
Бальшаначкі, падманачкі вы мае.
Падманулі, маладзенькую, вы мяне,
Падманулі, маладзенькую, вы мяне.
Сказалі, пойдзеш у зялёны садок вянкі віць,
Сказалі, пойдзеш у зялёны садок вянкі віць.
А мне звілі ды з калючага ялінцу,
А мне звілі ды з калючага ялінцу.
Як вазьму ў ручкі, ён мне ў ручкі клоніцца,
Як вазьму ў ручкі, ён мне ў ручкі клоніцца.
Як на галоўку, мая галоўка коліцца,
Як на галоўку, мая галоўка коліцца.
Пакланіся роднай маццы і татку,
Пакланіся роднай маццы і татку.

* * *

*Калі хлопец прыязджае да дзяўчыны:*
Добры вечар, добрыя людзі чужыя,
Не пугайцесь, што вялікая дружына.
Мы прыехалі не піць, не есці,
Мы прыехалі сваю нявесту паглядзець.

* * *

Стукнулі, грукнулі на двары.
– Глянь, мая мамачка, ці не мяне?
– Па цябе, дачушачка, па цябе.
– Знай, мая мамачка, што сказаць,
Знай, мая мамачка, што сказаць.
– Пайшло маё дзіцятка ў сад гуляць,
Пайшла мая дачушка ў сад гуляць,
Садовыя вішанькі пашчапаць,
Свайго мілага частаваць.

***Запісана ў в. Бяларучы Лагойскага р-на***
***ад Мароз Надзеі Пятроўны, 1933 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кулыба В.***

Бацькі маладога бяруць мужчыну і жанчыну, якія будуць сватамі, і едуць да дзеўкі з закускай і гарэлкай. Калі маладая дае згоду, то бацькі яе накрываюць на стол. Запіваюць маладую. Дагаворваюцца, калі будзе вяселле, колькі прыданага, колькі гасцей. Калі маладая не дае згоду, то яна адсылае грошы за ўсю закуску і гарэлку, што прыносіў малады.

Прыязджае малады са сватамі, дружынай, шаферамі – купляюць маладую. Таргуюцца, потым малады выкупае нявесту і вядзе ў дом маладой, садзяцца за стол. На куце – дружына ад жаніха, ад маладой – сяброўкі. Сваты сядзяць насупраць, далей – усе астатнія госці. Частуюцца. Потым ідуць на танцы. Спачатку толькі для маладых іграе вальс, а потым танцуюць усе. Затым садзяцца за стол. Некаторыя госці пачынаюць крычаць: «Горка!». Затым усе ідуць адпачываць. Раніцай збіраюцца ўсе, хто быў учора, выпіваюць па чарцы. Потым іграюць марш, збіраюць грошы музыкантам. Частуюцца. Потым ідуць танцаваць. За гэты час прыбіраюць са стала, ставяць свежае. Іграе музыка. Чатыры хлопцы бяруць каравай, падымаюць уверх і танцуюць з ім. Потым ставяць яго на стол. Сваты дзеляць каравай. Падыходзяць бацькі маладой, пачынаюць дарыць. Маладая і яе бацькі плачуць, а жанчыны побач пяюць песні. Потым дорыць радня, а потым астатнія. Павячэралі. Малады забірае нявесту і вязе к сабе дамоў з усімі гасцямі, акрамя бацькоў маладой. Бацькі маладога сустракаюць іх з хлебам, соллю, чаркамі з гарэлкай, усё гэта стаіць на крышке, якая накрыта салфеткай. Пад ногі сцелюць кажух. Маладыя ўсё гэта спрабуюць. Потым садзяцца за стол. Маладая дае падарункі бацькам маладога і родным, а сваццям павязвае хустачкі на галовы. П’юць. Жанчыны пяюць жартоўныя песні да маладой, а потым да маладога. Маладая крыўдзіцца і плача, а малады яе ўгаворвае. Свякроў трохі яе жалее. Потым частуюцца.

Раніцай іграе марш. Апяць складваюць грошы музыкантам. Рытуал з караваем такі ж самы, як і ў доме маладой. Падарылі маладога. Заходзе маці маладога, здымае вянок з нявесткі, вешае яго на ікону і завязвае хустку. Частуюцца. Потым усе госці разыходзяцца. Праз тыдзень пасля вяселля маладыя наведваюць бацькоў нявесты.

**Вясельная песня**

*Да нявесты:*
Маладзенькая (імя), ты сядзіш вячэраеш,
Нічога не ведаеш, які твой муж будзе.
Твой (імя) – п’яніца, цябе любіць не будзе.

*Маладая:*
А я яго любіць буду.
Вадзіцы ў кубачак –
Напіся, мой любачак.

***Запісана ў в. Весніно Лагойскага р-на***
***ад Макейчык Ніны Васільеўны, 1932 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гаварковай Т. (2005 г.)***

**Вясельная песня**

Рута-мята зялёна несаджоная,
Маладая дзяўчыначка заручоная.
Умылася, вчасалася, на базар пайшла,
Як спаткалі дзяўчыначку
Ды тры малайца.
Адзін бярэ за ручаньку,
Другі за рукаў,
Трэці глядзіць – сэрца баліць:
Любіў да й не ўзяў.
Як павялі дзяўчыначку
На татачкаў двор.
У майго татку двор вялікі,
Новы чыстакол.
Як вылецеў ды й паляцеў
Да мамкі ў пакой.
Устань – устань, мая мамка,
Доса табе спаць,
Прыехалі чужаземцы,
Хочуць дочку ўзяць.
Як прывезлі хлеба – солі,
Да яшчэ й віна,
Прашчай, прашчай, мая мамка,
Я ўжо не твая.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Жалянінай Марыі Мікалаеўны, 1930 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Кур'ян Н. (2005 г.)*

**Вясельная песня**

*Пяецца на дзявішніку:*
Суборная субота настае.
Зялёная ружа на стале.
Дзевачка дружыну збірае,
Кругом століка саджае.
Адкрывай варота, ацец, апяць,
Бо едуць малойцы двадцаць пяць,
Бо едуць малойцы і патопчуць кветкі, вінаград.
Не шкадуй, дачушка, кветак, вінаград,
А шкадуй, дачушка, сваіх лет,
Бо вінаград і кветкі зрастуцца,
Бо маладыя гады мінуцца.

* * *

Хто сягоння цёмнай ночкай не даспаў,
Праз магілачку чорну сцежачку вытаптаў?
Не даспаў наш Колечка ходзячы,
Свайго татачку просячы.
– Устань, устань, мой татачка, не ляжы,
Хоць жа ты мне адну ранічку памажы.

* * *

А дзе ж быў, саколік?
Дзе ж была, саколка?

Зляцеліся ж яны
Ды ў адзін садочак – 2 р.
Селі ж яны
Ды на адзін кусточак. – 2 р.
Пілі ж яны вадзіцу
Ды з адной крыніцы. – 2 р.
А дзе ж быў, Іванька?
Дзе ж была, Настачка? – 2 р.
З'ехаліся ж яны
Ды на адно падвор'е. – 2 р.
Селі ж яны
Ды на адно застолле. – 2 р.
Елі ж яны патраўку
Ды з адной жа міскі. – 2 р.
Пілі ж яны гарэлку
З адной кружачкі. – 2 р.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Кохан Яўгеніі Міхайлаўны*
*студэнткай Маргуновай К.*

**Вясельная песня**
**(Песня як засватаюць)**

Пайду ж я замуж,
Даведаюся, даведаюсь,
Колі ж добра будзе,
Замужам буду, буду,
Калі ж нядобра –
Дамоў вярнуся, вярнуся.
Я ж сваёй мамачцы
Служыць наймуся, наймуся,
Я ж свайго татачку
З карчмы прывяду, прывяду,
Я ж сваёй сястрычцы
Коскі запляту, запляту,
Я ж свайму браточку
Коня папаю, папаю,
Я ж сваёй братоўцы
Ваду панашу, панашу.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Грынкевіч Аляксандры Міхайлаўны, 1936 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Рудак Т.*

**Песня дзеверу**

А мой жа ты, дзевярусенька,
Вядзі мяне памалюсеньку.
Не вядзі мяне на кошанцы,
Вядзі мяне па дароженцы.
Па кошанцы мае ножкі не ідуць,
Па дарожцы яны самі бягуць.
Па кошанцы ўпіраюцца,
Па дарожцы разлігаюцца.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Жылянінай Марыі Мікалаеўны, 1920 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Грушэўскай Н.*

**Як ад’язджае дачка**

Аставайся, мая мамачка, здарова,
Як мне выпала на Украіначчку дарога.
А ці будзеш па мне, мамачка, тужыці,
Як я буду на Украіначчы служыці?
А ці будзеш па мне бедаваці,
Як я буду на Украіначчы гараваці?
Мамка запяець, а я заплачу слязою,
Ці не сыйдуцца нашы галаскі з табою?
Мамка будзе ў полі жыта жаць,
А я буду ў сінім моры ваду браць.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Грынкевіч Аляксандры Міхайлаўны, 1936 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Рубін Ж.*

Даўней быў кірмаш, і на кірмашы падабаў ужо хлопец дзеўку. І паедзе ў сваты, бярэ свата і прыязджаюць у сваты. Маці не знае, што палюбіў яе Ганначку. Ну, прыязджаюць, вродзе бы едуць яны куды-то на базар купіць ялавіцу. Агеньчык гарыць, спыняюцца, каб паначаваць у іх, каня паставіць, каб конь пагрэўся. Ну, яны людзі добрыя, пусцілі. Гаварылі-гаварылі, потым ужо сват і кажа:

Калі прыйшла рыбка да гаці,
Я мушу праўду сказаці:
Мы прыехалі па тую кветку,
Што цвіцець зімой і ўлетку.

А маці і кажа:
– Якая ж гэта кветка зімой цвіцець, мае вы людцы?
– Ну, якая кветка? Такая, якую палюбіў наш Андрэйка – Ганначка ваша.
– А, Божа ж мой, Ганначка, ці праўда пойдзеш замуж?

Маўчыць Ганначка, у печы пальчыкам гэдак калупае, маўчыць.
– Праўда пойдзеш?
– Ну ж калі маўчу, дык пэўна ж хачу. Пайду!

Ну і прывезлі хлеб, солі, і прывезлі бутылку такую бальшую віна. А віно гэта такой мятай абложана. І да гэтага пяецца песня. Пазвалі маці, бацьку кроснага. Пяюць песню «Рута мята зялёная насаджоная».

Раньшы када-то, када мая мама ішла замуж, былі заручаны – заручаюць дзеўку, прыехалі і заручаюць. Гэта робяць пасля сватоў. Пяюць такую песню: «Хадзіла Ганначка па рынку».

Яны патом дагавараваюцца. Бацька кажа: «Я сваёй Ганнацэ даю пасаг: каня, карову і шэсць авечак». А маці кажа: «Што ж, і пасаг дасі, а што мы с табой рабіць удваёх будзем? Мы ж старыя ўжо». А сваты ды бацька маладога і кажа: «А ў нас шэсць сыноў, і я, мы ўсе ўсей грамадой прыедзім і вам усё ўбяром і паможам».

Ну і дагавараваюцца: сколька людзей сядзіць, сколька будзе асустэнак (Асустэньцыі – цяпер шаферкі), сколька з якога боку будзе чаго. Па шэсць пар, ці па тры пары. Як бедныя – па дзве пары, каб мені людзей было, а як багатыя – і па шэсць пар бяруць.

Калі дзеўка была чэсная – садзілася на дзяжу, на пасад звалі, еслі нячэсная – ана кала дзяжы кленчыла на калені. Да гэтага пяецца песня: «Пайду ж я замуж – даведаюся».

Пяклі каравай і дарылі караваем. Ну вот пякуць каравай, маці пячэ каравай маладой, а калі ёй не пад сілу – каго-небудзь прося, каб спяклі бальшы каравай. Ну, і гэты каравай ужо дзелюць на падарунак. Як доруць – даюць каравай. Астаецца астача. Дзеўкі хочуць яе ўкрасці, кінуць на крышу, каб ішлі дзеўкі замуж, а хлопцы стаяць, каб не даць каравай, каб яны не ішлі замуж. І тут ужо вайна: хлопцы сабе – дзеўкі сабе. От тады ўжо, як дзеўкі каравай украдуць, тады ўсё ў ладонькі б’юць. Весела надта ўжо, што пойдуць замуж.

Як маладая ад’язджае ад хаты, да калёс ці да саней прывязвалі шпулечкі нітак. Калёсы едуць – шпулечка коціцца. Як усе ніткі раскоцюцца, тады ўсе дзеўкі замуж выйдуць.

Дугі на конях прыбіралі лентамі, і па каню, і па аглоблях, шархуны вешалі на шыю.

На каравай так робяць печ, каб не нагрэлася і не перагрэлася. Калі перагрэецца печ, тады ён шыбка расце і шчапаецца. Маленькі саўсім, ціпунькі гэты душок, каб ён паціхоньку рос, каб нідзе не трэснуў. Еслі ўжо начынае падгараць, такую трапачку льняную мочуць і кладуць наверх.

Як бедны чалавек, былі вечарам у маладой, а да маладога нанач. А як багатае вяселле, робіцца так: сягодня ў пятнічку начынаюць, а ў суботку ўжо вечарам адпраўляюць толька да маладога. Прыданыя да маладога садзілі. Еслі з шафера, садзілі з прыданкі. Як прыехалі да маладога, пелі:

Адчыняй, мамачка, новы двор,
Прынімай нявестачку на выбор.
Каб я гэта ведала – не пайшла,
Цяпер сабе работачкі не знайшла.

Як дарылі, пелі: «Ой, дарылі, дарылі». Назаўтра, як канчаецца вяселле, адтуль ад’язджаюць тыя прыданкі, пяюць песню: «Ай, сваціцы дай галубіцы».

Маладыя, будучыя муж і жонка, часцей за ўсё знаёміліся на кірмашах, ля царквы.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Жалянінай Марыі Мікалаеўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кур’ян Н. (2005 г.)***

**Вясельная песня (прыданкі)**

*Спяваюць, як раз’язджаюцца:*
Ой, сваціцы, дай галубіцы,
Просім вас, каб не было
Нашай Леначцы ганьбы ў вас,
Каб не стаяла цёмнай
Ночкай пад акном,
Каб не ўцірала дробны слёзачкі рукаўцом,
Каб не была ды паветачка за хатку,
Каб не была ды й суседачка за матку.
Паветачка, ды й не цёплая хатачка,
А суседачка, ды й не родна мамачка.
Ой, будзе, будзе, ды й паветачка за хатку,
Ой, будзе будзе ды й суседачка за матку.
Паедзем, прыданні, дадому,
Паелі конікі салому,
Аржаную мякіну,
Каля плота крапіву.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Грынкевіч Галіны Міхайлаўны, 1938 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Рудак Т.***

**Вясельная песня**

*Як прыедуць да маладога:*
Мамачка, адчыні новы двор,
Вядзём табе нявестку на выбар.
Адчыні аконца, вядзём нявестку, як сонца.

*Адказвае маці:*
– Адчыніць не ўспею,

Па двары хаджу, мак сею.
А з гэтай макаўкі залатой,
А з гэтай макаўкі залатой
Для сваёй нявесткі дарагой
Няхай так будзе,
А мая нявестачка пагуляе.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Грынкевіч Галіны Міхайлаўны, 1938 г. н.,***
***Новак В. С.***

Ой, знаці, знаці,
Чы то чужая маці
Вывернула кажуха
І прыйшла сюда?

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Шульжык Людмілы Савічны, 1926 г. н.,***
***студэнткай Куніцкай Н.***

Хадзіла Ганначка па рынку,
Насіла ў хустачцы касынку.
А за ёй малойцы хадзілі,
У яе калінку прасілі.
Не дам калінку нікому,
Панясу калінку дадому,
Пастаўлю калінку на куце,
Няхай мая калінка расцвіце.
Расцвіла калінка цвятамі,
Прыехаў Іванка з сватамі.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Яцкевіч Веры Васільеўны, 1912 г. н.,***
***студэнткай Шапута Н.***

**Вясельная песня**

*Гэтую песню спявалі, калі дзеўка ад'яжджала да жаніха:*
І драча, вутачка, драча,
Драча, вутачка, драча.
З возера не злітае,
Возера не кідае.
І плача Манечка плача,
Плача Манечка плача.
Са двара не з'іжджае,
Мамачку не кідае.
І падай, мамачка, ручку,
Падай, мамачка, ручку,
Пераначую ночку.
І падай, мамка, другую,
Падай, мамка, другую,
Я ў цябе перадню́ю.
І не буду падаваці,
Не буду падаваці,
Не будзеш начаваці.

***Запісана ў в. Глубачаны Лагойскага р-на***
***ад Якубоўскай Марыі Якаўлеўны, 1933 г. н.,***
***Новак В. С.***

Вяселле пачыналася з таго, што адразу ішлі ў сваты. Ішлі бацька, матка, сват і малады. Бралі з сабой хлеб і бутыль гарэлкі. Заходзіў першы сват у хату і кажа:

– Нам гаварылі, то ў вас дзеўка вельмі ладная ёсць, можа дазволіце хоць паглядзець на яе?

– Ну паглядзіце, калі так ужо хочаце.

І пачыналася размова, што вось спадабаліся яны адін аднаму. Можа б іх ажаніць. Калі ўжо дагаворваліся, дык і паядуць усё, і гарэлкі цэлы бутыль вып'юць. І ў гэты бутыль насыпалі жыта, каб не несці яго назад пустым.

Потым вяселле пачыналі. Гулялі тры дні. Суботу і раніцай у нядзелю ў маладой, а затым ужо нядзелю і панядзелак у маладога. Сват на вяселле должан быў спякці каравай ці сватаву міску, як кажуць. Яшчэ маладых абсыпалі жытам, каб яны многа зараблялі. Абсыпалі, калі ад'яжджала маладая да маладога, і калі яны прыяжджалі да маладога. На трэці дзень ужо як падоруць дак і ў цыганоў перадзяваліся, і ва ўсякіх там, хто што прыдумае. Яшчэ гулялі пярэзаўкі. Гэта от чэраз нядзелю маладая, малады, бацькі маладога ехалі гасцяваць да бацькоў маладой, да гэтага нельга маладой было ісці дадому, хоць нават у адным сяле жылі. А затым праз нядзелю ужо тыя ехалі да бацькоў маладога на пярэзаўкі.

***Запісана ў в. Глубачаны Лагойскага р-на***
***ад Ляхновіч Леаніды Мікалаеўны, 1942 г. н.,***
***Новак В. С.***

Тады вяселле гулялі па 7 дней, раней гуляла ўся вёска. Збіраліся ўсе і гулялі, танцавалі. Калі бацька пайшоў сватацца да маёй маці, то ў яе ўжо быў кавалер. Дык папа каню яе кавалера гужы парэзаў, хамут парэзалі і хвост адрэзалі.

***Запісана ў в. Дзераўно Лагойскага р-на***
***ад Рудкоўскай Алены Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

Вяселле гулялі два дні. Маладыя дарылі падаркі. Пасля таго, як адгуляюць, нявеста ішла жыць к мужу. Уваходзіць маладая ў дом, нясе абразік. Потым вешае гэты абразік у хаце жаніха.

***Запісана ў в. Дрыла 1-я Лагойскага р-на***
***ад Міклашэўскай Ганны Паўлаўны, 1937 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А. (2008 г.)***

Швагер і маці хадзілі ў сваты. Сваталіся. Яго радні давалі падаркі. У сватах дамаўляліся пра дзень вяселля. На веселле каравай павінна была пекці кросная маці. Гулялі, пелі, танцавалі. Звычайна гулялі тры дні. Маладая ішла жыць у дом маладога.

***Запісана ў в. Дрыла 1-я Лагойскага р-на***
***ад Міклашэвіч Анастасіі Уладзіміраўны, 1927 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Доміным А. (2008 г.)***

Вот я знаю, што перад самім вяселлем маладой ставілі ваду пад кравацьь. Калі сасніцца ёй яе малады, то яны будуць жыць доўга і шчасліва.

*Адараванне маладых:*
Дару табе палена,
Каб малады пацалаваў
Маладую ў калена.
Дару табе зялёны чай,
Дзе малады захоча –
Там і лягай.
Дару табе звязку цыбулі,
Каб адзін аднаму не варсалі дулі.

*Віншаванне маладых:*
Паздраўляю маладых
І жадаю шчасця

Пусць мінут вас усякія нянасця.
І шчасліваю ракою
Ваша жызнь струіцца,
І як месяц малады,
Сын у вас радзіцца.

*Цёшчы наказ:*
Запомні, цёшча, запаведзь прастую,
І не забудзь яе вавек:
Жыві з любоўю ў сэрцы к зяцю,
Бо зяць – ён тожа чалавек.

***Запісана ў в. Дрыла 1-я Лагойскага р-на***
***ад Макей Надзеі Іванаўны, 1924 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны, Домінам А. (2008 г.)***

Я ішла замуж у 57 годзе. Прыехалі ў сваты дваццаць дзевятага іюня і адгулялі. Патом гулялі свадзьбу тры дні: суботу, нядзелю, панядзелак. Маладых на вяселлі было многа. Пяць дзяўчат і пяць хлопцаў – гэта была дружына. Нявесту адзявалі дзяўчаты, сёстры дваюрадные. Не сматрэліся ў зеркала. Шафер выкупліваў мяне, грошы даваў, канфеты, гарэлку. Гулялі вяселле з гармошкаю, бубнам. Песні пелі такія, каб маладая плакала. Жаласлівыя. Прыходзілі жанчыны глядзець на галашэнне маладой. Па дарозе ад маладой да маладога перанімалі. Пераняў брат. Стаяла дзве чаркі і ляжалі два кусочкі хлеба і два кусочкі сахару. Выкуплялі, выпівалі і закусвалі. Потым нявеста ішла жыць да маладога. На парозе сцялілі. Перад тым, як жаніх забярэ нявесту, маладых абсыпалі жытам.

***Запісана ў в. Дрыла 1-я Лагойскага р-на***
***ад Сімко Кацярыны Іосіфаўны, 1932 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Домінам А. (2008 г.)***

Сегодня ў нас суботачка настала, сегодня.
У нас суботачка настала, сегодня.
Наша Леначка ўсіх дзевачак сабрала,
Наша Леначка ўсіх дзевачак сабрала.
Сядзьце-пасядзьце, мае дзевачкі, у радочык,
Сядзьце-пасядзьце, мае дзевачкі, у радочык,
Завіце мне, маладзенькай, вяночак,
Завіце мне, маладзенькай, вяночак.
Завіце мне ды вяночак маленькі,
Завіце мне ды вяночак маленькі.
Каб жа ён быў майму Алежку міленькі,
Каб жа ён быў майму Алежку міленькі.

***Запісана ў в. Жардзяжжа Лагойскага р-на***
***ад Гатоўка Евы Іосіфаўны, 1913 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Баркоўскай Н.***

**Вясельная песня**

*Спявалі, калі маладая сядзе на пасад:*
Ой зелен, зелен садочак – 2 р.
Сплялі Волечцы вяночак – 2 р.
Ды пакацілі па скам'і – 2 р.
Надалі жалі ўсёй сям'і – 2 р.
Роднай мамачцы найгоры – 2 р.
Што гадавала найболі – 2 р.

**Вясельная песня**

За лесам, лесам вінны каладзеж, – 2 р.
Там маладая Волечка дзевак паіла. – 2 р.
Піце дзевачкі, не разлівайце, – 2 р.
Майму татачку, не нараўляйце. – 2 р.
Мой татачка не сына жэне, – 2 р.
Не сына жэне, не нявестку бярэ, – 2 р.
Мяне маладу замуж аддае. – 2 р.

***Запісана ў в. Жасцінае Лагойскага р-на***
***ад Жук Юзэфы Наканаўны, 1913 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Курак Н. (1992 г.)***

**Як маладая едзе да маладога**

Ужо не раненька, яшчэ не позьненька,
Сонейка на захадзе.
Ужо не раненька, яшчэ не позьненька,
Сонейка на захадзе.
Наша Леначка маладзенькая
Ад мамкі адыходзе.
Наша Леначка маладзенькая
Ад мамкі адыходзе.
Дзякуй, мамачка, дзякуй, родная,
За тваё гадаванне.
Дзякуй, мамачка, дзякуй, родная,
За тваё гадаванне.
Я гадавала, як знала, толькі
Долечку не ўгадала.
Я гадавала, як знала, толькі
Долечку не ўгадала.

***Запісана ў в. Жасцінае Лагойскага р-на***
***ад Гатоўка Юзэфы Вікенцьеўны 1936 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Курак Н. (1992 г.)***

**Вясельная застольная песня**

А па ўзгор'ю сінія краскі цвіцелі,
Сінія краскі цвіцелі,
А па застоллю мілыя госці панеслі,
Мілыя госці панеслі.
Сінія краскі цвітуць, растуць, ападуць,
Сінія краскі цвітуць, растуць, ападуць.
Мілыя госці пап'юць, паядуць, паедуць,
Мілыя госці пап'юць, паядуць, паедуць.

***Запісана ў в. Жардзяжжа Лагойскага р-на***
***ад Гатоўка Евы Іосіфаўны, 1913 г. н.,***
***студэнткай Баркоўскай Н.***

**Вясельная**

*Калі маладая едзе да маладога:*
Дождж ідзе, дождж ідзе і раса расіць,
Леначка братачку стала прасіць:
– Брацейка, родненькі, не кідай мяне,
Кожную суботу прыязджай ка мне.

– Леначка, сястрыца, не кіну цябе,
Кожную суботу прыеду к табе.

***Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на***
***ад Кізіны Ніны Макараўны, 1926 г. н.,***
***студэнткамі БДПУ імя М. Танка Гайчук С., Гладковай І. (2005 г.)***

**Вясельная песня ў канцы вяселля**

Прашу цябе, мая сваціца, з павагі,
Каб не было маёй дачушцы знявагі,
Каб не стаяла цёмнай ночкай пад акном,
Каб не ўцірала дробных слёзачак рукаўцом,
Каб не ўхінала белых ножак падалком,
Каб не была паветачка за хатку,
Каб не была суседачка за матку.
Паветачка не цёпла, хатка не грэе,
Суседачка не родна, мамка не жалее.
Прашу цябе, мая сваціца, павагі,
Каб не было маёй дачушцы знявагі.

***Запісана ў в. Калачы Лагойскага р-на***
***ад Бурковіч Т. І., 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кастэнка А.***

**Вясельная песня**

*Прыданыя ад'язджаюць:*
Едзьце, прыданкі, к чорту дамоў,
Вы нам ужо надаелі.
Коні салому паелі 2 р.
І ячменную мякіну, 2 р.
І каля плота крапіву.
Ой, сваціцы мае родныя,
Просім мы вас,
Каб не было горка нашай нявесце ганьбы ў вас.
Ой, будзе, будзе ды паветачка за хатку
Ды суседачка за мамку.

***Запісана ў в. Карбачоўка Лагойскага р-на***
***ад Унукавай Ларысы Фёдараўны***
***студэнтам БДПУ імя М. Танка Муравіцкім А.***

**Вясельная**

*Магла выконвацца ў канцы вяселля:*
Ой, сваціцы-галубіцы, прашу вас:
Каб не была наша Верачка бедна ў вас,
Каб не была паветачка за хатку,
Каб не была саседачка за мамку,
Каб не стаяла цёмнай ночачкай пад акном,
Каб не выцірала дробны слёзачкі рукаўцом.
Ой, сваціцы-галубіцы, маўчыце,
А вы сваю Верачку паціхоньку вучыце,
Каб яна хату, сені падмяла,
Каб яна на вуліцу смецце не нясла.

***Запісана ў в. Красная Зара Лагойскага р-на***
***ад Сівец Марыі Паўлаўны, 1940 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Аўрашчук Н. (2005 г.)***

**Вясельная песня**

*Перад збіраннем (выпраўкай) дачкі да жаніха:*

Мая мамачка родная,
Чаму мяне замуж аддаеш,
А долечкі не даеш?
Што ў куфры маю, то даю,
А аб долі не ўгадаю.
Мае хустачкі, як бель бяленькі,
Яны ж мне не міленькі.
Шыла шубачку аж да долачку,
Ды я ж яе не знасіла.
Русая каса аж да пояса,
Ды я ж яе не ўкрасіла.
Насіла і красавалася,
Пакуль не звянчалася.

***Запісана ў в. Тукалаўка Лагойскага р-на***
***ад Глушанавай Ганны Іванаўны, 1907 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Карповіч М.***

За лесам, ляском бярозка з лістком
Усю восень гаварыла:
– Бярозка мая, белая мая,
Як жа мы растанемся?
Вятрок павее, лісток ападзе,
Я голая стаяць буду.
Ганначка з мамачкай усю ночку гаварыла:
– Мамачка мая, родная мая,
Як жа мы растанемся?
– Сваты прыедуць, цябе забяруць,
А я старая астануся.

*Спяваюць, калі нявеста адʼязджае да маладога.*

Выйду я на ганачак,
Выйду я на ганачак,
Гляну ў садочак.
Як красачкі ззяюць,
Як красачкі ззяюць,
Аж мае ручкі вянуць.
Ззяйце, красачкі, ззяйце,
Ззяйце, красачкі, ззяйце,
А мне вас не шчыпаць.
Мне вас не шчыпаць,
Мне вас не шчыпаці,
Вяночка не звіваці.
Адзін была, звіла,
Адзін была, звіла,
І таго не знасіла.
У куфар улажыла,
У куфар улажыла,
Для меншай сястрыцы.
Для меншай сястрыцы,
Для меншай сястрыцы,
Для русай касіцы.

*Спяваюць пасля вяселля:*
Сяду, сяду, наабедаюся,
Як зайду замуж, даведаюся.
Калі добра будзе, я там буду,
Калі нядобра – дамоў вярнуся,
Я свайму папку служыць згаджуся.
Служыць згаджуся з кусочка хлеба,
Служыць згаджуся з кусочка хлеба.
А татка скажа: ты мне не трэба,
А татка скажа: ты мне не трэба.
Я табе, татка, вады прынясу,
Я табе, татка, вады прынясу.
А татка кажа: цябе не прашу,
А татка кажа: цябе не прашу.

*Як маладая ад'язджае да маладога:*
Пойдзеш, Волечка, у чужыя людзі:
Як табе не жаль будзе?
Там вулачкі невядомыя,
Ты па ім блудзіці будзеш.
Там суседачкі незнакомыя,
Аб табе судзіць будуць.
Я вулачкі разведаю,
Я па іх блудзіць не буду.
Я з суседкамі распазнаюся,
Судзіці не будуць.

*Як маладая ад'язджае да маладога:*
Пойдзе (імя) у чужыя людзі,
Як не жаль табе будзе?
Там сцежачкі невядомыя,
Ты па ім блудзіці будзеш.
Там суседачкі незнакомыя
Аб табе судзіць будуць.
А я сцежачкі разведаю,
Я па іх блудзіць не буду.
І з суседкамі распазнаюся,
Судзіці не будуць.

*Спяваюць, калі едуць да маладога:*
Паедзім дамоў зараз,
Паедзім дамоў зараз.
Павязём з сабой радасць,
Павязём з сабой радасць.
Радасць радавую, радасць радавую,
Братаўку маладую,
Братаўку маладую.
Братаўка-гартоўка,
Братаўка-гартоўка,
Учора гардзіла намі,
Учора гардзіла намі,
А сёння едзе з намі,
А сёння едзе з намі.

**Спяваюць маладой у хаце маладога**

А ў горадзе ячмень ці ўродзе,
Маладая Волечка свайму свёкру ці ўгодзе?
– Угаджу, дзевачкі, угаджу,
Я ля яго з чарачкай пахаджу.
А ў горадзе ячмень ці ўродзе,
Маладая Волечка свайму свёкру ці ўгодзе?
– Угаджу, дзевачкі, угаджу,
Я ля іх з цвяточкамі пахаджу.
А ў горадзе ячмень ці ўродзе,
Маладая Волечка свякроўцы ці ўгодзе?
– Угаджу, дзевачкі, угаджу,
Я яе мамачкай назаву.

*Запісана ў в. Жасцінае Лагойскага р-на*
*ад Жук Юзэфы Іванаўны, 1913 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Курак Н. (1992 г.)*

**Вясельныя песні**

З-за парога сваты ідуць,
З-за парога сваты ідуць,
Да ў печ паглядаюць,
Да ў печ паглядаюць,
Ці вялікі гаршкі кашы,
Ці вялікі гаршкі кашы,
Ці пад'ядуць свацці нашы?
Первы кажа – маўчы,
Первы кажа – маўчы,
Другі кажа – маўчы,
Другі кажа – маўчы,
Бо заставяць нас таўчы.

* * *

Ішла Зіначка із поля,
Несла красачкі ў прыполе,
Несла красачкі ў прыполе,
Віла вяночак пры столе.
Віла яна, віла, плакала.
Ляцела зязюля й пылая,
На каго, Зіначка, жаль мае.
І на мамку, зязюля, на мамку,
Што не дала моладзе вырасці,
Што не дала моладзе вырасці,
Русай косачкі вплесці.
Па дварэ хадзіла чэшучы,
На парозе стаяла вяжучы,
На парозе стаяла вяжучы,
У хату ўвайшла плачучы,
У хату ўвайшла плачучы.
На пасадзе села, як зорка зазрэла,
І на пасадзе села, як зорка зазрэла,
А з пасада ўстала, да як рута звяла.

*Запісана ў в. Заазер'е Лагойскага р-на*
*ад Сінюковіч Марыі Пятроўны, 1931 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Тамашэўскай Т. (1999 г.)*

**Вясельная застольная**

– А хто ў нас за столікам харошы?
– Молад Колечка за столікам харошы.
А ў яго на ручачках пярчаткі,
Каб любілі заазерскія дзяўчаткі.
А ў яго на ножках галошы,
Молад Колечка за столікам харошым.

*Запісана ў в. Заазер'е Лагойскага р-на*
*ад Ваяводскай Леаніды Уладзіміраўны, 1927 г. н.*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Тамашэўскай Т. (1999 г.)*

**Выслоўі на вяселле**

*Як выкупліваюць маладую, у сваты ідуць дружына – усе хлопцы і дзеўкі па вяселлі:*
Дзевачкі сідзяць і прашу наш букет прыняць.
Наш вянок із ружы і мяты, а ваш – з салаты.
Каб цыбуля і смятанне было заўтра дружкам сняданне.

Мы думалі – сваты едуць,
А яны пяшком ідуць,
Маладога ў мяшку нясуць.
А з мяшка ногі тырчаць,
На яго каты вурчаць.

Казалі – дружка багаты,
А на ім рызы ды латы.
Заставіў дзеўку пільнаваць,
Каб ніхто рызаў не ўрэзаў,
Каб ніхто латаў не кратаў.
А дзе там дружка падзеўся,
Можа, у саломку ўвярцеўся.
Нужна саломку папаліць –
Да стала дружка прыбяжыць.

*Закоснік – хлопец у дзеўкі, бальшанка – дзеўка ў нявесты, зязюлька – дзеўка ў маладога, дружок – хлопец у маладога.*

**Вясельная песня**

*Калі на вяселле прыязджае жаніх п'яны:*
Куды твае, Ганначка, вочкі глядзелі, – 2 р.
Што за гэткага, за п'янчынку, хацелі. – 2 р.
А ён жа дзе едзець, дык карчомачкі не мінець, – 2 р.
А ўсе чарачкі ды шынкарачкі* разаб'ець. – 2 р.
Па-дарагому ён усё гэта адплаціць, – 2 р.
Ты ж, маладзенькая, усё гэта адплачыш. – 2 р.
Ён зробіць тваю русую касу на мятлу, – 2 р.
Ён счарніць цябе, маладзенькую, на зямлю. – 2 р.
* *шынкарачкі – пасуда з сцякла*

**Сіроцкая вясельная**

*Спяваецца хлопцам на магіле бацькі:*
А хто ў пясочку ды ціхусенька гукаець,
А там Алічак ды свайго таткі шукаець,
А ўсе горачкі і даліначкі абышоў,
А на кладбішчы ён магілачку ды найшоў.

А стаў жа ён ды свайго татачку будзіць:
– Ды ўстань, устань, мой татачка, да мяне,
А няма ў мяне парадачку без цябе.
– Ды адстань, адстань, маё дзіцятка, не магу,
Жоўты пясочак, залёг пясочак, не дыхну,
Шэра каменне ў мяне на грудцы, не магу,
Грабовы дошкі сціснулі ножкі, не крану.
– А я, татачка, буйнога ветра папрашу,
Нашто ты сыскаў з сямі сялоў бандароў*,
Нашто ж ты зрабіў мне хатачку без вуглоў?
Павей, павей, буйны вятрок, з даліны,
А садзьмі, садзьмі жоўты пясочак з магілы,
А раскаці шэра каменне на поле,
А пашчапай грабовы дошкі на крошкі,
А пастаў жа майго татачку на ножкі.
** бандары – людзі, якія займаюцца вырабам бочак і г. д.*

***Запісана ў в. Засоўе Лагойскага р-на***
***ад Кушнярэвіч Гілены Лявонцьеўны, 1908 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Бардушка Г.***

У сваты ішлі ў суботу. Дагаворуцца. Нажануць гарэлкі, каб хапіла і ўжо ладзяць свадзьбу. Два дні гуляюць. Калі едуць па маладу, то перагароджвалі дарогу хлопцы з вёскі, не давалі праехаць. А патом ім за гэта пірага ці канфеты давалі, каб ужо прапусцілі. Малады прыяжджаў пад хату да маладой. А яе там не было, яе хавалі ў суседкі. Але галоўнае, не трэба, каб хата суседкі знаходзілася па другі бок вуліцы, трэба каб усе было ў лінію. Ну тады малады шукае яе, выкуплівае і ўжо забірае да сябе. У сябе таксама гуляюць цэлы дзень. От адгулялі, а малада, пакуль не адгуляюць пярэзавыя, ні нагой у сваю хату… нельга, бо разыйдзецца. А ўжо праз нядзелю едзе маладая з сваёй новай раднею да сваіх бацькоў гасцяваць, а тыя ўжо на другую да іх.

***Запісана ў в. Заполле Лагойскага р-на***
***ад Крэнь Марыі Станіславаўны, 1938 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ***

Маладых з вянчання заўсёды сустракалі парай, калі не было бацькі, то сустракала маці і брат, каб маладыя жылі парай. Вяселле гулялі чатыры дні. Два дня ў мужа і два дня ў хаце маладой. Падарункі дарылі на другі дзень. Пад канец свадзьбы свякруха здымала фату і адзявала платок. Маладыя, калі прыехалі з вянчання і ідуць за стол, то маладая павінна наступіць на нагу маладому, каб верх быў твой у хаце. Пасля свадзьбы былі пеpазовы. Маладуха не магла вяртацца да маці на працягу тыдня.

***Запісана ў в. Зарэчча Лагойскага р-на***
***ад Суднікоўскай Алы Міхайлаўны, 1933 г. н.,***
***Новак В. С.***

Вяселле гулялі ў суботу. Нявесту апраналі ў сваёй хаце, а потым жаніх з сваёй дружынай прыязджаў па нявесту. У першы дзень гулялі ўсе, а на другі дзень дарылі падарункі і дзялілі каравай. На другі дзень таксама перапраналіся. Рабіліся іншыя маладымі. Пасля вяселля былі перазовы. Нявеста дамоў не магла прыйсці (да маці) тыдзень. Першыя перазовы ў жаніха, а потым у нявесты. За стол не садзіліся разам. Вяселле асобна ў жаніха гулялі і асобна ў нявесты. Разам гулялі пасля вянчання.

**Вясельная песня**

Зялёная вішня з-пад кораня вышла,
Аддала мяне маці, дзе я непрывычна.
Варыла маці вячэру ды на маю долю,
Варыла, варыла ды ўсё гаварыла:

«Няма табе ні міскі, ні лыжкі.
Успомні мяне, мама, хоць раз у панядзелак,
А я ж цябе, маці, глядзеўшы на дзевак.
Успомні мяне, маці, хоць раз у аўторак,
А я ж цябе, мама, на дзень разоў сорак.
Успомні мяне хоць у сярэду,
А я ж цябе, мама, ідучы на бяседу.
А ў пятніцу ідучы па суніцы,
У суботу ідучы на работу,
У нядзелю сцяліўшы пасцелю».
Зялёная вішня з-пад кораня вышла,
Аддала мяне маці, дзе я непрывычна.

***Запісана ў в. Зарэчча Лагойскага р-на***
***ад Шавель Алены Уладзіміраўны, 1943 г. н.,***
***Новак В. С.***

**Заручыны**

Я за свайго сыночка пабыла ў сваточка.
Сыночка палюбілі, нас мядочкам (гарэлкай) напаілі.
Далі нам піць і есці,
Далі нам месца сесці.
Мы ж ужо пілі і елі,
На лавачцы пасядзелі,
Дайце ж нам пагуляці,
Ножачкі папрастаці.

***Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на***
***ад Кізіны Ніны Макараўны, 1926 г. н.,***
***студэнткамі БДПУ імя М. Танка Гайчук С., Гладковай І.***

Не плач, не плач, мая мамачка, ты па мне,
Ды я буду жыць непадалёку ад цябе.
Пойдзеш, мамачка, у сіне мора хусты праць,
А я пайду ў чыста поле жыта жаць.
Станем, гукнем вясенняю парою,
Можа сойдуцца нашы галаскі з табою.
Як цяжка мне было маленькую гадаваць,
Цяпер найцяжэй чужой мамачцы аддаваць.

* * *

Ой, жаль, жаль мне, мая мамачка, на табе,
Што не пабыла яшчэ гадочак у цябе.
Ой, жаль, жаль мне, мая мамачка, на табе,
Што не пабыла яшчэ гадочак у цябе.
Я ж бы ў цябе первавы вяночак насіла,
Я ж бы тваё падвор’ейка красіла.
Я ж бы ў цябе первавы вяночак насіла,
Я ж бы тваё падвор’ейка красіла.
З Богам, з Богам, маё дзіцятка, ад мяне,
Ёсць у мяне яшчэ меншая за цябе.
З Богам, з Богам, маё дзіцятка, ад мяне,
Ёсць у мяне яшчэ меншая за цябе.

**Вясельная песня**
**Трава-балота**

*Калі маладая ў маладога:*
Трава-балота – красіва,
Леначка Сярожку прасіла:
Адвядзі, Сярожка, дзе браў,
Каб мой вяночак тут не звяў.
Нябось, Леначка, не звянець,
У мяне ёсць сястрыцы – паправяць.

***Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на***
***ад Кізіны Ніны Макараўны, 1926 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гайчук С. (2005 г.)***

Выпякала каравай замужняя жэншчына. Падчас выпякання мы не спявалі ніякіх песень. У сваты хадзілі звычайна бацька, маці і нейкі сусед жаніха. Нявеста іх адорвала падаркамі.

***Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на***
***ад Ліс Марыі Андрэеўны, 1928 г. н.,***
***Новак В. С.***

*Вясельная песня, калі ў маладой няма бацькоў у час дзялення каравая:*
Кажуць, у моры вадзіцы многа,
Кажуць, у моры вадзіцы многа,
Кажуць, у Светы радзінкі многа,
Кажуць, у Светы радзінкі многа,
Сталі дарыці – няма нікога,
Сталі дарыці – няма нікога.
Дзе ж тая радзінка падзявалася,
Дзе ж тая радзінка падзявалася?
Кажуць – радзінка пахавалася,
Кажуць – радзінка пахавалася.
Раздрабіце вы грабовы дошачкі на крошкі,
Раздрабіце вы грабовы дошачкі на крошкі,
Падыміце вы маю мамачку на ножкі.
Сабярыцеся вы, буйные ветры, у даліну,
Падыміце вы майго татачку з магілы.

***Запісана ў в. Крайск Лагойскага р-на***
***ад Баракоўскай В. А., 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Курыбінай І. (2005 г.)***

**Вясельная песня**

*Калі пачынала дзяліць каравай радня маладой, у канцы вяселля, калі госці раз’язджаюцца:*
Мы праехалі горы, даліны раўнаваць,
Прывязлі мы вам сваю Святлану гараваць.
Гаруй, гаруй, наша Светачка, не кайся,
Як прыедзеш да мамкі ў госцікі, не жалься.
Каб не была паветачка за хатку,
Каб не была суседачка за мамку,
Каб не стаяла цёмнай ночачкай пад акном,
Каб не ўціралa дробны слёзачкі рукавом.

***Запісана ў в. Крайск Лагойскага р-на***
***ад Бараноўскай В.А., 1930 г. н.,***
***студэнтам БДПУ імя М. Танка Ліхачовым С.***

**Вясельная**

*Магла выконвацца з моманту заручын:*

Чаго сядзіш, што думаеш, Ганулька,
Хто за табой за коснічкам паедзя?
Хто за табой за коснічкам паедзя?
Твой брацетка, твой родненькі, ня хоча,
Твой брацетка, твой родненькі, ня хоча.
Ой, выйшаў ён да дзевачак, хахоча,
Ой, выйшаў ён да дзевачак, хахоча.

***Запісана ў в. Красная Зара Лагойскага р-на ад Філіповіч Ефрасінні Пятроўны, 1916 г. н., студэнткай БДПУ імя М. Танка Аўрамчук Н.***

У сваты абавязкова бралі торбу з гарэлкай і падарункамі і торт. Гулялі свадьбу тры дні. У сваты хадзілі бацька і маці, маці хросная і бацька хросны. Галоўнай прыметай заканчэння свадзьбы былі бетоны на заборы.

***Запісана ў в. Кацялі Лагойскага р-на ад Ярашонак Сафіі Анатольеўны, 1943 г. н., Ярашонак Міхаіла Іванавіча, 1944 г. н.***

**Вясельная песня**

*Калі маладую вядуць на пасад:*

Брат сястру на пасад вядзе,
Брат сястру на пасад вядзе.
Яна яму да ног пала:
– Ой, братка мой родненькі,
Ой, братка мой родненькі,
Чым я табе надаела?
– Сястрыца мая родная,
Сястра мая родная,
Нічым ты ні надаела.
Ні сваёю красатою,
Ні сваёю красатою,
Ні ціхімі ўходамі,
Ні ціхімі паходамі,
Ні ціхімі паходамі.

***Запісана ў в. Лагі Лагойскага р-на ад Цімафеевай Ніны Аляксандраўны, 1932 г. н., студэнткай БДПУ імя М. Танка Нагулевіч Т. (1995 г.)***

**Вясельная песня**

Ой, зелен, зелен садочык,
Ой, зелен, зелен садочык,
Звілі дзевачцы вяночык,
Звілі дзевачцы вяночык.
І пакацілі па скам’е,
І пакацілі па скам’е.
Надалі жалю ўсёй сям’е.
Надалі жалю ўсёй сям’е.
А роднай мамцы найболій,
А роднай мамцы найгорый.
Што гадавала найболій,
Што гадавала найболій.

Кажа мамульцы родная дачка.
Кажа мамульцы родная дачка.
Што не пабыла адзін гадочак у цябе,
Што не пабыла адзін гадочак у цябе.
Я ж ба ў цябе і па задвор'ейку хадзіла,
Я ж ба ў цябе і па задвор'ейку хадзіла.
Я ж ба ў цябе русаю касу насіла,
Я ж ба цябе русаю касу насіла.
З Богам, з Богам, дачушка, ад мяне,
З Богам, з Богам, дачушка, ад мяне.
Есць у мяне меншая дачка за цябе,
Есць у мяне меншая дачка за цябе.
Яна ж будзе і па задвор'ейку хадзіць,
Яна ж будзе і па задвор'ейку хадзіць.
Яна ж будзе і русаю касу насіць,
Яна ж будзе і русаю касу насіць.

***Запісана ў в. Лонва Лагойскага р-на***
***ад Кажура Ганны Гіляраўны, 1938 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Акуліч М. (1999 г.)***

**Вясельная**

*На вяселлі пела свацця свату:*
А сват сваццi
Паплёў лапці,
[з тоўстых лык]
А свацця ходзіць надуўшыся,
Як індык.

***Запісана ў в. Луськае Лагойскага р-на***
***ад Петух Алены Паўлаўны, 1928 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Падбярэзскай Т. (2005 г.)***

Калі было ў мяне вяселле, праязджалі праз агонь, калі ўжо з царквы ехалі. І коні спужаліся, адзін як бы ў бок хацеў адскочыць, ды й аглобіну пераламіў. Жонкі казалі, што не будомо жыць. Так і палучылась: пагіб мужык мой, як сено перавозілі, на рэчцы ўтапіўся. І засталася я з трымя дзецьмі адна.

***Запісана ў в. Любань Лагойскага р-на***
***ад Буневіч Веры Міхайлаўны, 1931 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кандратовіч Н. (2005 г.)***

Па точнаму едуць. Як зналі. Калі едуць сваты, гатавалі ўсё. Калі сваты прыязджаюць, гаварылі: «Чулі, што ў вас цялушка прадаецца». Адказвалі, што прадаецца. Тады шуцілі. Таргаваліся, пілі гарэлку. Калі пашуцяць пра цёлку, пачыналі дагаворвацца па-сер'ёзнаму.

Раней вянчаліся. І ад вянца едуць да маладой. Гуляюць дзень, б'юць у цымбалы і ў качалку, што бяльё качаць. Сват са сваццёй каравай пякуць. Дарылі маладых. Сваты даюць маладым румку і каравай. Упаследку ходзяць па сталу і сабіраюць дзеньгі на марш. Віншуюць, каб дабро вялося і доўга жылося.

Раньшэ на свадзьбу і палаценца, і простынь дарылі. Калі канчаецца свадзьба, ставяць на стол куфар, які доўжэн быць поўны адзення. Тады сват аглашае, што гэта ён дорыць нявесце. Пад канец свадзьбы свякроў знімала хвату і завязвала хустачку пад бараду. Абычна едуць жыць да маладога.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Івашкевіч Соф'і Антонаўны, 1914 г. н.,***
***Амбражэй Алы Аляксандраўны, 1936 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Калі едуць вянчацца, сват адзяе кажух навыварат. Маладых пасыпалі зярном, каб вялося (карова, авечкі). Калі маладая плачэ – добра. Як замуж ідзе і не плача, то будзе плакаць, калі штаны праць будзе на рэчцы.

*Спявалі песні:*
Табе, сястра, адна спадніца,
А мне дзве,
Бо я паеду ў чужыя людзі,
А ты не.
Як я буду жыць багата,
Тады будуць знаць, дзе й хата,
Я як буду гараваць,
Тады браты і сестры
Будуць мяне абнімаць.

Ой, пайду ж я ў садочак
І сарву з розы кветку.
І пушчу ж я гэту кветку
Па сіняму мору.
Плыві, плыві, кветка,
Нідзе ні станавіся,
Толькі для маёй роднай матачкі
Стань, астанавіся.
А ў нядзельку ранюсенька
Мамка воду брала.
Яна ж гэту кветачку
І з вадой паймала.
Ох, чаму ж ты з розы кветачка
Пад дožджыкам звяла?
Ці не там мая дачушка
Пад кветачкай ляжала.
Ой, не ляжы, мая мамачка,
Ні ў дзень, ні ў нядзельку.
Сушыў мяне малады, мамачка,
І ў дзень і ў ночку…

Радня віншавала маладых: дару табе медзі, каб дзеці былі як мядзведзі. Дару табе ніткі, каб не заглядваў на чужыя лыткі.

*Спявалі песні жартоўнага характару:*
Ці я табе не казала,
Ці не гаварыла,
Не лажыся на мяне,
Бо будзе Гаўрыла…
А ты мяне не паслухаў,
Каля мяне клаўся,
А цяпер ты сам не знаеш,
Дзе Гаўрыла гэты браўся.
Цяпер жа не ляжы –
Бяжы за кумамі,
Бо Гаўрыла на пячы
Дрыгае нагамі.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Мялешка Ганны Васільеўны, 1927 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Святочная субота настала,
Святочная субота настала.
Наша Анечка сваіх падружак сабрала.
Усіх дзевачак за святочны стол саджала:
– Сядзьце, пасядзьце, мае дзевачкі, ў радочак,
І пашыйце мне, маладзіцы, вяночак.
Каб мая галовачка ў вяночку не легла,
Ды каб мая матачка жалела.
Жалей, жалей, меня, мамачка, ў дамочку.
Меня ж павязуць, мая мамачка, у вяночку.

*Вясельная песня, адрасаваная брату:*
Не абіжайся, мая браточка, на мяне,
Што я села так блізенька ля цябе.
Што я села за столікам за сваім,
Я прыехала за брацікам за сваім.
Я прыехала не піць, не есці – пасядзець,
Я прыехала на браточку паглядзець.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Лапцэвіч Ганны Антонаўны, 1931 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

**Вясельныя песні**

Хвалілася каліначка за ракой,
Звалілася каліначка за ракой,
Што ніхто яе ні дастане за вадой – 2 р.
Біз чаўна, біз залатога вяселца. – 2 р.
Адкуль браўся люты мароз на яе? – 2 р.
– А я ж цябе, мая каліначка, дастану – 2 р.
А біз чаўна, біз залатога вяселца – 2 р.
Хвалілася малада дзевачка за сталом, – 2 р.
Што ніхто яе ні дастаня за раднёй, – 2 р.
А біз віна, біз залатога кубачка. – 2 р.
Адкуль браўся малод малойчык да яе? – 2 р.
– А я ж цябе, мая дзевачка, дастану, – 2 р.
А біз віна, біз залатога кубачка.

* * *

Ой, стаяла, буяла,
Ой, стаяла, буяла канапелька ў гародзе.
А не даў ёй ветрык,
А не даў ёй ветрык зялёнай пастаяць,
Зялёнай пастаяці,
Зялёнай пастаяці, вецейкам памахаць.
Абабіў ёй лісточык,
Абабіў ёй лісточык на жоўценькі пясочык.
Ой, гуляла, гуляла,
Ой, гуляла, гуляла Галечка ў мамачкі,
А не даў ёй Вовачка, маладой, пагуляць.
Маладой пагуляці,
Маладой пагуляці, коскаю памахаць.
А расплёў ёй косачкі,

Расплёў ёй косачкі,
А разліў ёй слёзачкі.

***Запісана ў в. Міхеды Лагойскага р-на***
***ад Мароз Марыі Сцяпанаўны, 1933 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Нагулевіч Т. (1995 г.)***

Першы дзень вяселля. Маладая знімала вянок і кідала яго. Дзяўчыны павінны яго злавіць. Гэта азначала, што яна ў наступным годзе пойдзе замуж. Маладых сустракалі з хлебам-соллю. Пад гэты хлеб-соль уваходзілі маладыя ў хату. Нельга ўносіць маладую на руках, бо малады будзе насіць яе на кулаках.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы***
***ад Лапцэвіч Ганны Антонаўны, 1931 г. н.,***
***Новак В. С.***

**Сірочая песня**

Стаяць садочкі ў тры радочкі,
Стаяць садочкі ў тры радочкі.
У первым садочку зязюля кукуе,
У первым садочку зязюля кукуе.
У другім садочку салавей шчабеча,
У другім садочку салавей шчабеча.
У трэцім садочку дзевачка плача,
У трэцім садочку дзевачка плача.
Зязюля кукуе – другую чуе,
Зязюля кукуе – другую чуе.
Салавей шчабеча – дзетак сзывае,
Салавей шчабеча – дзетак сзывае.
Дзевачка плача – мамкі ні мае,
Дзевачка плача – мамкі не мае.
Яе мамачка вельмі далёка,
Вельмі далёка, у зямле глыбока.
У зямлі глыбока, за трыма замкамі,
У зямлі глыбока, за трыма замкамі.
Первы замочык – зялён цярночык,
Первы замочык – зялён цярночык.
Другі замочык – жоўты пясочык,
Другі замочык – жоўты пясочык.
Трэці замочык – грабавыя дошкі,
Трэці замочык – грабавыя дошкі.
Жоўты пясочык залёг у насочык,
Жоўты пясочык залёг у насочык.
Сырая зямля на грудцы лягла,
Сырая зямля на грудцы лягла.
Нельзя мне ўстаці к свайму дзіцяці,
К свайму дзіцяці параду даці.

***Запісана ў в. Міхеды Лагойскага р-на***
***ад Мароз Марыі Сцяпанаўны, 1933 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Нагулевіч Т. (1995 г.)***

**Вясельная песня**

*Спяваецца перад сіроцкім вяселлем:*
Сягоння ў нас нядзелечка ўскрасення,
Пачынаецца сіроцкая вяселле.
Сіротачка па магілачцы хадзіла,

Яна сваю родну мамачку прасіла:
«Устань, устань, родная мамачка, ка мне,
Няма каму ў канцы стала пастаяць,
Няма каму любых гасцей прыглашаць».

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на
ад Падбярозка Марыі Антонаўны, 1920 г. н.,
студэнткай БДПУ імя М. Танка Шарыпавай В. (2006 г.)***

**Вяселле**

У сваты прыходзілі сват, радзіцелі маладога і малады. Гарэлку прыносілі сваю. На заручынах дагаварваліся пра свадзьбу. Зборнай суботы не было. Вянок маладой – марля з цвяточкамі – вэлюм. Каравай быў бальшой і красівы.

Малады забірае маладую і яны едуць к вянцу. Маладых устрачала пара, што толькі што пажаніліся. Сустракалі хлебам, соллю, 2 чаркамі віна. Сват дзяліў каравай. Першы кусок – радзіцелям маладой. Платочкам трэба было браць падаркі, каб былі багатыя.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на
ад Турчыновіч Міхаліны Венядзіктаўны, 1926 г. н., (нарадзілася ў в. Каргавішча)
студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

Вянок быў з бінту, марлі з цвяточкамі. Цвяточкі былі розныя. Каравай выпякалі замужнія жанчыны.

Хлопец бярэ свата, старэйшага за сябе і ідзе да нявесты. Каравай яшчэ дзялілі, як доруць падаркі, і дзяліў хросны.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на
ад Акуліч Ніны Сямёнаўны, 1938 г. н., (нарадзілася ў в. Востраў),
студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

На заручыны прыязджалі на кані ноччу. На вяселлі за сталом сядзелі па парам. Тры дні гулялі вяселле: суботу, нядзелю – у маладой, а панядзелак – у маладога.

Пана Езуса замучылі ў пятніцу – таму нельга было жаніцца ў пятніцу. Гэта траурны дзень.

***Запісана ў в. Новае Чэрнева Лагойскага р-на
ад Акуліч Ядзвігі Аляксандраўны, 1931 г. н.,
Акуліч Антона Адамавіча, 1931 г. н.,
студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бярдычавец Т., Домінымі А., Елавой Н. (2008 г.)***

**Вясельная песня**

*Спявалі маладой на вяселлі, пачула на адным з вяселляў*

Сіня мора калыхалася,
Сонейка купалася.
Ганначка ваду брала,
Сама ў ваду ўвалілася,
У мамачкі прасілася:
– Мамачка мая родная,
А ратуй мяне з мора
І з вялікага гора.
– Дзіцятка маё роднае,
Ні я цябе ўтапіла,
Ні я буду ратаваці.
Няхай цябе Бог ратуе,
Шчасце, долю гатуе.

***Запісана ў в. Парыжская Камуна Лагойскага р-на
ад Сарока Ніны Мікалаеўны, 1932 г. н.,
студэнткай БДПУ імя М. Танка Табалевіч В. (1997 г.)***

Маладых сустракалі з іконай і абсыпалі іх зярном. Крёсная мама дзяліла каравай на ўсіх, кожнаму давала па кусочку. Кралі нявесту і хавалі дзе-небудзь, напрыклад, у хаце. Калі жаніх знайшоў нявесту, ён павінен выплаціць грошы. У канцы свадзьбы жаніха і нявесту перадзівалі ў цыган, садзілі іх у самадзельную тачку і каталі па ўсёй вёсцы.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Аўсейка Валянціны Дзям'янаўны, 1937 г. н.***

Нявесту раней дарылі. Пасадзяць на лаву, шаферкі каля яе. Малады прыязджае і ў яго два шаферы. Гаворацъ, пака дагаворацца. Шаферкі хочуць большы выкуп. Бяруць маладую. А малады ў другой хаце, каб не відзець маладую. Калі ўжо выкупілі, садзяцца за стол. Раньшэ ездзілі ў цэркву вянчацца. Бацюшка моліцца, бярэ за рукі маладых і абводзіць вакол алтара тры разы. Патом забіраюць маладуху і едуць да яе. Другі дзень гуляюць у маладога. Устрэчаюць там іх бацькі маладога з хлебам і соллю. Хлеб должэн ляжаць на мацерыяле. Два ілі тры разы сядаюць за стол. Песні пеялі. Прыхажане паздраўляюць. Гармонікі іграюць марш. Прыхажане пяюць:

– Чаго сядзіш, што думаеш, (імя)?
– Я сяджу і думаю, як тут жыць,
Што не будзе роднай матулькі пабудзіць,
Чужая маці раней пабудзіць,
А выйшаўшы на вуліцу, асудзіць.

Пяклі бальшушчыя круглыя пірагі, мяса, у каго што было. Шчэ пака жаніх прыедзець на пасаг і благаслаўляюць хлебам-соллю. Каравай выпякалі любыя жанчыны. Гулялі доўга. Спачатку кожны ў сябе, а тады разам. Як прыязджалі ягоныя госці к нявесце, пеялі:

Ой, сватку ж, наш сватку,
Пусці нас у хатку.
Змерзлі ж мы, змерзлі,
На лютым марозі.
На лютым марозі,
У бальшой дарозі.

*Пелі сіроцкія песні:*
Сірацінушка па магілачцы хадзіла,
І родную мамульку будзіла:
– Устань, устань, родная мамулька, да мяне,
Няма ў мяне парадачку без цябе.
– Роднае дзіцяці, рада ўстаці,
Табе парадачку даці.
Дубовыя дошкі сціснулі ножкі,
Не магу праступіць.
Жоўты пясочак упаў на грудцы,
Не магу прадыхнуць,
Зялёная траўка зарасла вочкі,
Не магу прагляяуць.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Альсімовіч Галіны Сцяпанаўны, 1925 г. н.***
***(раней пражывала ў в. Чэркасава Міёрскага р-на Віцебскай вобласці)***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

**Вясельная песня**

*Брат спяваў сястры:*
Валодзька-швагрочык, ды бывай здароў.
Волечка-сястрыца, паедзем дамоў.

Дома ў нас хатачка не мяцёная,
Дома ў нас мамачка засмучоная,
Дома ў нас ложачка не памытая.
Воліны слоўцы не забытыя.

### Вясельная песня

*Спявалася нявесце ў зборную суботу дружкамі:*
Плач, плач, Волечка, ды не ўцірайся,
Мамчыну роскаш ды забывайся.
У мамкі была – гора не знала,
Гора не знала – курэй не чула.
У Валодзькі станеш – усё пазнаеш,
Курэй пачуеш, ваду беручы,
Зару ўвідзіш, на ток ідучы.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на ад Жоравай Вольгі Сцяпанаўны, 1931 г. н., студэнткай БДПУ імя М. Танка Мусько К.***

### Вясельная песня

*Пяюць сваты з боку маладой у маладога:*
Зрадавалася хата,
Што невеста богата:
Ручнікі на колачку,
Надзежнікі да на дзежачкі.
Пойце, сваткі-сыроежачкі.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на ад Шульжык Людмілы Савічны, 1926 г. н. (пераехала са Столінскага р-на, в. Радчыцк) студэнткай БДПУ імя М. Танка Кунецкай Н.***

Радзіцелі выбралі хлопцу дзеўку. Гэты хлопец должэн гуляць, і хоць міла – няміла, трэба ўжо з гэтай дзевачкай гуляць. У сваты прыходзяць ужо, наперад дагаворацца, ну і прыходзяць вечарам, прыходзяць і кажуць: «Вот мы чулі, што ў вас карова прадаецца» – смяюцца, шуцяць. Ну, а тады ўжо даюць паследняе, угашчаюцца, раз яна ўжо сагласна і любе яго, тады п’юць гарэлку, ды палаценцэм сват абвязваець, як ужо высваталі, палаценцэм абвязваюць. Як станеш думаць, так уродзі бы гэта сон быў.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на ад Зялёнай Леаніды Феліксаўны, 1937 г. н., Новак В. С.***

Свадзьбу два дня гулялі. На первы дзень роспіс, а потым садзілісь за стол, пілі водку, паздравлялі невесту ў сватах. Прыходзілі сваякі, бацька, маці.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на ад Зялёнага Баляслава Пятровіча, 1934 г. н., Новак В. С.***

### Вясельная песня

*Спявае нявеста сяброўкам:*
Сёння ў нас суботачка настала, – 2 р.
Млада Манечка ўсіх дзевачак сабрала, – 2 р.
Садзіцеся, маі дзевачкі, у радочык, – 2 р.
Надзеньце, мне, маладзенечкай, вяночык, – 2 р.
Няхай мая галовачка лялее, – 2 р.
Няхай мяне мая мамачка жалее, – 2 р.

Няхай мая галовачка буяя, – 2 р.
Няхай мая радзіначка гуляя. – 2 р.

***Запісана г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Трынкевіч Вялянціны Станіславаўны, 1930 г. н.,***
***(нарадзілася ў в. Становішча),***
***Новак В. С.***

**Вяселле**

Тры дні свадзьбы гуляліся. Суботай пачыналі, а ў панядзелак канчалі. У суботу ехалі мы за хросным, паехалі да дзеўкі ў суботу, выкуплялі дзеўку, там гарэлку пілі і шампанскае. Выкуплівалі гарэлкай. Падругі спрашвалі жаніха: «Люблю! Люблю! Пусціце мяне туды!» Рваўся праз галовы. На вторы дзень толькі водку пілі і плясалі ўсе. А на трэцці хто што: хто раз’ехаўся, хто далей гуляў. Пасля свадзьбы жаніх з нявестай вмесце ехалі, удваём. У панядзелак мы былі там і ўсе паехалі туды к яму, і яе забіралі, прывезлі да маткі, мы ўсе прыехалі на трэцці дзень.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад бабушкі Агацці***

**Вясельная песня**

*Спявалася ў зборную суботу дружкамі маладой:*
А сёння суборная суботачка настала,
Млода Ганачка ўсіх дзевачак сабрала,
Да сабраўшы па-за столікам саджала.
Ды й пасядзьце, мае дзевачкі, усе ў рад,
Ды й савіце мне вяночак з розных квят,
Ды й каб мае галовачка лялела,
Ды й каб мяне мая радзімка жалела.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Жоравай Вольгі Сцяпанаўны, 1931 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мусько К.***

**Вясельная песня**

А сваціца-галубіца, спавагі,
Не давайце нашай Машаньке знявагі,
Каб не стаяла цёмнай ночачкай пад акном,
Каб не ўцірала дробны слёзачкі рукаўком.
Каб не была ды паветачка за хатку,
Каб не была ды суседачка за матку.
А сваціца-галубіца, спавагі,
Не давайце нашай Машаньке знявагі,
Каб не стаяла цёмнай ночачкай пад акном,
Каб не ўцірала дробны слёзачкі рукаўком.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Дышлевіч Ганны Рыгораўны, 1932 г. н.,***
***Новак В. С.***

**Вясельная песня**

Ляцеў сакалок праз тры бары,
А ў чацвёртым бару сеў на дубу:
«Што ж табе, сакалок, спадабалася,
А ці бор, ці явар, ці каліначка?»
І не бор, не явар, не каліначка.
Спадабалася мне шэра вутачка.

Ехаў малады хлопец праз тры сяла,
А ў чацвёртым стаў у цесця на дварэ.
«Што ж табе, хлопец, спадабалася:
А ці мёд, ці піва, ці гарэлка?»
І не мёд, не піва, не гарэлка.
Спадабалася мне ваша дзевачка.

*Калі малады разам са сваёй світай ішоў на заручыны*

**Вясельная песня**

Злавілі старога лося ў гаросе,
Злавілі старога лося ў гаросе.
Як зачула яго ласіца ў бары,
Як кінула рогі пад ногі,
Няхай мої крутыя рогі прападуць,
Куды ж майго лося павядуць?
Ішлі сваты па двары.
Як зачула Таніна маці ў хаце,
Як кінула залатыя ключыкі пад ногі.
Няхай мая ключыкі прападуць,
Куды ж мая дзіцятка павядуць?

*Спявалі ў час заручын*

**Вясельная песня**

*Спявалі ў той час, калі малады ехаў да маладой (заручыны):*
На заручыны
А з гары, з даліны,
А з гары з даліны.
Беглі конікі чатыры.
А на коніках малады хлопец.
Прывязаў конікаў да дубу,
Сцёбнуў конікаў пад ножкі,
Бяжыце, мої конікі, шырока,
Яшчэ мая дзевачка далёка.
Бяжыце, маі конікі, вузенька,
Што ж, мая дзевачка, блізенька.
Бяжыце, мої конікі, ступою,
Что мая дзевачка са мною.
А ўжо конікі пад акном,
Вось моя дзевачка за сталом.

**Пайшла Танечка ў гарод**

Пайшла Танечка ў гарод,
Там расце межачка ля варот.
А выйдзі, татачка, з касою,
Ды спасі рутачку разам з касою.
А выйдзі, мамачка, з сярпочкам,
Ды спасі рутачку разом з цвяточкам.
А я буду думаці:
Мне ўжо ў деўках не быці,
Вяночкаў разам з імі не віці.

### Стаіць каліна над ракою

Стаіць каліна над ракою,
А пад той калінай дзяўчына стаяла
І русую косу там часала,
Белая лічанька мыла.
Прыйшоў да яе стары дзед: – 2 разы:
– Аб чым думаеш, красна дзеўчына,
Аб кім думаеш, красна дзеўчына.
– Не аб табе, стары дзед. – 2 разы
Стаіць каліна над ракою,
А пад той калінай дзеўчына стаяла
І русу косаньку часала,
Белая лічанька мыла.
Прыйшоў да яе малады хлопец:
– Аб чым думаеш, дзеўчына,
Аб кім думаеш, дзеўчына.
– Аб табе, міленькі,
Аб табе, родненькі.

*Спявалі тады, калі дзеўчыну садзілі на пасад.*

### Вясельная песня

Ой, стаяла, ой буяла
Канапелька ў гародзе.
А дожджык буйненькі
Ды адбіў ёй лісточак
Ды на жоўты пясочак.
Ой, гуляла, ой, гуляла,
Наша Танечка ў мамачкі,
Заплятала Танечка свае косы.
Гуляла, гуляла,
Сваімі косамі шатоша.
Ды прыехаў Віцечка
І расплятаў её косачкі,
І разліў слёзачкі.

### Вясельная песня

У нядзелю раніцай – 2 р.
Сіня мора калыхалася, – 2 р.
Там Ганначка воду брала. – 2 р.
Прыляцелі галубкі, – 2 р.
Селі пані над вадою. – 2 р.
Сталі з мора ваду піці, – 2 р.
Сталі з Ганнай гаварыці: – 2 р.
Ганначка-сястрычка, – 2 р.
А твой жаніх п'яніца – 2 р.
І вялікі нядбайніца. – 2 р.

***Запісана ў в. Прудзішча Лагойскага р-на***
***ад Астроўскай Маніды Ігнацьеўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Баўтрымовіч М. (1997 г.)***

### Вясельная песня

Ой, у нашай радзянцы вяселле зачынаецца,
Вяселле зачынаецца, Валечка заручаецца.

Ад мамачкі адлучаецца,
Ад мамачкі адлучаецца,
К Сярожачку прылучаецца.

*Спяваецца звычайна перад тым, як заходзіць за застолле ў маладой.*

**Вясельная песня**

*Перад падрыхтоўкай нявесты да шлюбу (зборная субота):*
Крамяная печачка,
Крамяная печачка
Вечар гарыць да не выгарыць,
Свойго краменейка ды не распайць.
Малада Анечка,
Маладая Анечка
Вечар сядзіць ды не заплача,
Вечар сядзіць ды не заплача,
Сваёй мамкі ды не разжаліць,
Сваё лічанька церацць.
Маё лічанька як яблынька, а сама я як вішанька.
Як яблычка саладзесенька,
Як вішанька чырванесенька.

***Запісана ў в. Прудзішча Лагойскага р-на***
***ад Вашкевіч Соф'і Іванаўны, 1909 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Карповіч Л.***

Гулялі два дні. У 1-ы дзень после роспісі за стол садзіліся, і ўсё, як зараз. Каравай быў красівы, дзяліць, дык ён харошы такі, красівы. Выпякалі каравай самі, пяклі яго толькі замужнія жанчыны. Многа песен на свадзьбе пелі.

***Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на***
***ад Русак Таццяны Фёдараўны, 1930 г. н.,***
***Новак В. С.***

Сваты захадзілі, бралі водку, стукаліся і гаварылі: «Мы вашу дочку, мы, сваты, к сабе бяром. Первы стаяў бацька жаніха, а за ім усе астальныя».

***Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на***
***ад Аўласка Анатоля Іванавіча, 1952 г. н.,***
***Новак В. С.***

Калі святкавалі вяселле, дзяўчына была вельмі прыгожай. У асноўным яна не спявала, але я памятаю такі случай: была ў нашай вёсцы прыгожая дзяўчына. Яна была са старавераў. Яна заспявала частушку:

Начынаю я плясаць первую начальную,
Хачу развесяліць галовушку пячальную.

Жыццё яе было вельмі нешчаслівае. З мужыком гэтым яна разышлася. Каравай дзяліла хросная маці. Падаркі і каравай перадавалі чэраз платок, каб маладыя жылі багата.

***Запмсана ў в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Акуловіч Валянціны Адольфаўны, 1933 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

Вот на вяселле, каб выкупіць маладую, трэба было выкупіць падушкі, пасцель, каторую маладой давалі з сабой, адзеяла, падушкі. Гэта ўсё ў вандэлак звязвалася і садзілі якую-небудзь

дзевачку (малую). Вот ёй далжны былі даць выкуп за тое, каб забраць маладую разам з пасцеллю. І яшчэ на маёй памяці, у маладой была свая дружына, у маладога – свая. І самым пачотным было быць первай шаферкай, втарой – гэта тожа пачотна, трэцяй – пачотна, але гэта ўжо крайняя ступень пачотнасці ззаду. А там ужо, после чацвёртай, лічылася неганаровым. І сейчас старшый свідзецель от маладой і от маладога.

***Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на***
***ад Паўтарачанка Аляксандры Міхайлаўны, 1948 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Маладая сядзела за цветам. Не такі як зараз букецік. А ён спецыяльны быў, утыкаўся ў булку. Цветы былі нежывыя. Маладая сядзела ў вянку і ў фаце. Фата была даўжынёй з сукенку. Цвяток быў у маладой і ў маладога. Шаферкі былі тожа ў цвятах. Сначала садзілі толькі адну маладзёж, як толькі прыехаў малады да маладой. Ад яго маладзёж і ад яе маладзёж. Пагулялі, пасядзелі, выпілі і пайшлі танцы. А тады і госці прыходзяць. На другі дзень ужо маладую ўвозяць. У маладой быў куфар.

***Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на***
***ад Лубнеўскай Ніны Пятроўны, 1932 г. н.***
***(раней пражывала ў в. Аўшчынінкі Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл.)***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

А ў полі вярба пахілёная,
Маладая дзяўчыначка заручоная.
А ў полі вярба пахілёная,
Маладая дзяўчыначка заручоная.
Тады яе запівалі,
Як сад зацвітаў.
Тады яе запівалі,
Як сад зацвітаў.
Як сад зацвітаў,
Як зара ўзышла.
Як сад зацвітаў,
Як зара ўзышла.
Маладая дзяўчыначка
Па саду ішла.
Маладая дзяўчыначка
Па саду ішла.
Кася ад вады, Яся да вады,
Пастой, пастой, мая Кася, дай каню вады.
Кася ад вады, Яся да вады,
Пастой, пастой, мая Кася, дай каню вады.
Як буду твая, папаю каня
З цёмнай крыніцы, з поўнага вядра.
Як буду твая, папаю каня
З цёмнай крыніцы, з поўнага вядра.
А ў полі вярба пахілёная,
Маладая дзяўчыначка заручоная.
А ў полі вярба пахілёная,
Маладая дзяўчыначка заручоная.

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Кудыбінай Т. М., 1954 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кудыбінай І.***

Ой, ляцелі жураўлі,
Селі на памосце.
Ой, як вып'юць хазяі,
Так і вып'юць госці.

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на ад Янковай А. І., 1952 г. н., студэнткай БДПУ імя М. Танка Кудыбінай І.***

Встречают молодых родители хлебом-солью, в доме которых играется свадьба. На длинное красивое полотенце кладут круглую буханку чёрного хлеба с укреплённой в середине солонкой. Речь говорит тёща или свекровь: «Поздравляем вас с законным браком, желаем счастья, здоровья, долгой супружеской жизни. Милости просим в наш дом – в ваш дом. Хлеб-соль отведайте, а мы посмотрим, кто в доме хозяином будет».

Молодые отщипывают или откусывают хлеб, макают его в соль и едят. Считается, кто больше откусил – тот и хозяин.

Обряд обсыпания новобрачных:
Кидают вслед новобрачным пшено, зерно, конфеты, монеты, как символ зажиточной жизни.

Маці аддавала,
Шчэ й навучала,
Як на свеце жыці,
У госці не хадзіці,
І гарэлкі не піці,
Мужа шанаваці.

Шанавала год,
Шанавала два,
Трэці не сцярпела.
Абярнулась я шэрай зязюлькай,
У госці паляцела.

Прыляцела ў сад,
Села на сучок,
Стала кукаваці
Пра сваё гора,
Пра сваю бяду,
Пра ўсё расказаці.

Сядзіць мамачка ў садзе,
Рушнік вышывае,
А старэйшы сын
У парозе стаў,
Ружьё заражае.

Дазволь, мамачка,
Дазволь, родная,
Ту зязюльку ўбіці,
Бо яна кукуе, жалю задае,
Не магу я жыці.

Не пазволю сын,
Не пазволю я
Ту зязюльку ўбіці,

Бо той зязюльцэ,
Як маёй дачцэ
У чужых людзях жыці.

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на ад Яскевіч В. М., 1927 г. н., студэнткай БДПУ імя М. Танка Кудыбінай І.***

**Вяселле**

*Спявалася ў зборную суботу:*
Звіняць, звіняць
Званочкі блізенька,
Сядай, сядай,
Дзеванька, нізенька.

А хто твае косанькі рашчэша,
А хто тваю душаньку пацеша.

Ой, рашчэшуць дзеванькі,
Ой, пацеша душаньку міленькі,
Мамуля голованьку прыбярэ,
Бо да асыпаецца вішнёвы сад,
Час табе, Ганусечка, на пасад.

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на ад Кудыбінай Т. М. студэнткай БДПУ імя М. Танка Кудыбінай Г.***

Прыходзілі спачатку ў сваты. Прыносілі бутлю самагонкі і хлеба бохан. Ну вось прыходзілі і гаворуць:

– Можа пераначаваць пусціце?

А бацька гавора:

– Не знаю, што вы за люді, ці пускаць вас пераначаваць ці не?

Вось такая была зачэпка.

Тады сядалі за стол і дагаворваліся. Рушніком бутыль абвязвала, бо не трэба пустую аддаваць і ў бутэль жыта насыпала.

Затым ужо дагаворуцца і пачынаюць вяселле. Ні за што свадзьбы не гулялі ў пост і пры сходзе луны таксама блага.

Гулялі тры дні спачатку ў маладой. Затым прыязджаў малады, перакупваў яе. Калі яны ад'язджалі ад маладой, то іх жытам абсыпалі, і калі прыязджалі да маладога, таксама абсыпалі жытам, каб шчаслівыя і багатыя былі. Калі маладыя прыязджалі ў хату да маладога, то нельга было заходзіць у дом па голай зямлі, а бязацельна што-небудзь пасцілалі пад ногі: ці рушнік, ці палавічку якую. У хату хлопца з маладой ішла матка хрышчоная і несла ікону і рушніка.Таксама прасцілалі кажух шэрсцю ўверх, калі маладыя заходзілі ў хату. Таксама на свадзьбі пяклі каравай. Каравай дзялілі як ужо доруць. Дзялілі яго сват і свацця. Свацця рэзала, а сват румкі наліваў. Маршы ігралі. Госці грошы на марш клалі. На свадзьбі гулялі ката. Спачатку яго пяклі. Вось як настаяшчага зробюць. Паставяць яго на стол, а тады ўжо гуляюць, ці ўкрадуць таго ката ды схаваюць і выкуп просяць, а хто знайдзе, дык падарунак атрымоўвае. Потым ужо і ў цыганоў перадзяваліся на втары дзень. А потым ужо, пакуль не зробяць пярэзаўкі, маладая не ішла дамоў. А раней нельга было ісці дадому.

***Запісана ў в. Рэпішча Лагойскага р-на ад Сабалеўскай Алены Пятроўны 1932 г. н.***

**Вяселле**

У сваты прыходзілі сваты. Яны гаварылі: «Мы – заморскія купцы, вязём золата. Мы вам падаркі, а вы нам дачку». Усе смяяліся, дамаўляліся аб вяселлі. Свадзьбу гулялі першы дзень у

маладой, а на другі дзень, увечары, ехалі да маладога. Нявеста забірала прыданае і заставалася ў маладога. Маладых устрачала замужняя пара, якія жылі добра. Каравай пяклі бальшой, красівый, замужнія жанчыны, штоб маладыя жылі багата. Первый дзень маладая была ў белым плацці і белым венке. На другі дзень нявеста была ў платке, как абычна.

Дарогу гарадзілі маладым, кагда ані ехалі дамой, штобы ані жылі харашо, шчасліва. Каравай дзялілі сваты ілі маць хросная. Первый кусок аддавалі нявесце, втарой – жаніху, патом радзіцелям. Падаркі дарылі чэраз платок, штобы маладыя жылі багата.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Зюзянюк Валянціны Аляксееўны, 1945 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М. (2008 г.)***

9 мая сваталіся, снег засыпаў усё. Яны па снягу ідуць. Мама не хацела мая, каб я замуж ішла. Цераз тыдзень свадзьба. Толькі тады ніхто не венчаўся. У прыданае даюць падушкі і адзеяла. На іх садзяць дзіця. І ў жаніха прасілі выкуп. Дзецям давалі канфеты і забіралі прыданае.

***Запісана ў в. Скарады Лагойскага р-на***
***ад Умэцкай Ніны Антонаўны, 1930 г. н.,***
***Пракопчык Жанны Канстанцінаўны, 1968 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

## Вясельныя песні

*Спявалі на заручынах:*
У маёй Ганулькі на плячах коскі,
На плячах коскі, пад вачамі слёзкі.
На плячах коскі ды парасціталіся,
Пад вачамі слёзкі ды паразліваліся.
На плячах коскі, як лён бяленькі,
Пад вачамі слёзкі, як мак драбненькі.

* * *

*Спявалі, калі малады прывозіў маладую:*
Прывёз павук паву,
Пасадзіў на лаву.
Пійце, пійце, госцікі,
Толькі кубачкі не пабійце.
А табе, павачка,
Вось вечная лавачка.

* * *

*Спявалі, калі маладую саджалі на пасад:*
Стаяла калінка каля варот,
Папрасілася ў чарот.
Стаяла дзеўка каля саду,
Папрасілася на пасаду.

***Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на***
***ад Матрышылавай Ганны Сцяпанаўны 1902 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Бурдыка І.***

## Вясельная песня
## Не рана на дварэ, не рана

Не рана на дварэ, не рана.
Повен двор коней нагнана.
Ніхто ж тых коней не знае.
Выйшла дзевачка, пазнала.
А выйшла дзевачка, пазнала.

Яна іх на стаёнку загнала.
Хай гэтыя конікі пад’ядуць,
Яны ж мяне, маладую, павязуць
Пад тую горачку крутую,
У тую цэркаўку святую.
Адчыняць цэркаўку – я вайду,
Пасцелюць каберац – я стану.
Пасцелюць каберац – яна стане,
Звяжуць ёй ручанькі – яна звяне.

***Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на***
***ад Макольскай С. Р.***

У сваты хадзілі так: бралі свата, заходзілі ў хату да маладой і гаварылі, што хочуць купіць нешта. Кагда прыйшоў сват, нада, каб маладая пол вымыла. Да мяне так прыходзілі, так я вымыла пол, а прыножачкі забыла памыць у стале. То сват кажа: «Паненка ладна ды ногі чорны». Я не магла зразумець, то яны і пайшлі ад нас. А мой Іван працаваў хлебапячэннем. У яго бацькі быў конь і памочніца на гэтым хлебапячэнні. Вось яны і прыехалі ў сваты да мяне. Іван прывёз 5 шапак і застаўся жыць у мяне. Свадзьбу мы не рабілі, бо не было грошай.

Другі раз сваты могуць сказаць так: «У вас дзевіца-красавіца. А ў нас хлапец-удалец. Мы прыйшлі за таварам».

***Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на***
***ад Шавель Галіны Іванаўны, 1932 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бярдычавец Т.,***
***Домінам А., Булахавай М. (2008 г.)***

Не ведала зязюля,
Як у садзе жыці,
Як у садзе жыці.
Не ведала мамачка,
Як дачушку збыці,
Як дачушку збыці.
Збудзеш, збудзеш, мамачка,
За адзін дзянёчак,
За адзін дзянёчак.
Не забудзеш, мамачка,
За ўвесь гадочак,
За ўвесь гадочак.
Прыйдзеш ты ў хатку –
Хатка глухая,
Хатка глухая.
Прыйдзеш ты на рэчку –
Кладка сухая,
Кладка сухая.
Будзе мая ложачка
Па стале валяцца,
Па стале валяцца.
Будзе табе, мамачка,
Цяжка ўздыхацца,
Цяжка ўздыхацца.

***Запісана ў в. Стайкі Лагойскага р-на***
***ад Куніцкай В. У., 1931 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кастэнка А. (2000 г.)***

**Вяселле**

*Сватанне*

У сваты прыходзіў ацец, брат, ну і сам жаніх. Ацец сказаў: «У вас ёсць цёлачка, прададзіця яе нам?» Я сначала абідзелася. А мама мая сказала: «Дурненькая, так нада». Патом бацька жаніха спрасіў, які мае радзіцелі дадуць пасаг (прыданае). Мой бацька сказаў. А яны патрэбавалі большы. Ну, выпілі. Пагаварылі і ўехалі, не пасватаўшыся. Ну, я очэнь растроілася, бо з жаніхом мы очэнь нравіліся друг другу. На другі дзень я была ў цэркві на клерасі. А после службы апяць прыйшоў жаніх з шурынам «швагра», но ўжэ без бацькі. Яны сагласіліся на той пасаг, што даваў мой бацька. Сасваталі, выпілі, пагулялі. Нявеста, ну, я, значыт, палучыла пасаг. У царкву падалі на запаведзі. Патом праз 4 нядзелі нас вянчалі. После вянца паехалі к нявесце, ну, ка мне, а на следуюшчы дзень ужо гулялі ў жаніха, у Васечкі майго, царства яму нябеснае.

Ну «пасаг» – ета абычна… ну, як мой бацька даваў: карова, кабыла, свіння, гусі, вуткі, золата, але ж нямнога.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Шушаевай Галіны Фёдараўны, 1926 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А., Шурмель С. (2008 г.)***

**Вясельная песня**

*Звычайна спявалася на дзявочым вечары:*

Стаяла каліна між варот,
Ехаў служанька наўпярод.
Здалёку коніка трымае,
А збоку сабельку вымае.
Меціцца каліну сеч-рубіць,
А каліна яму змолвіла:
– Не для цябе каліна саджана,
А гэту каліну сад садзіў,
А гэту каліну сад садзіў,
А гэту каліну сад садзіў,
А гэту каліну дождж паліваў,
А гэту каліну дождж паліваў,
Для цябе, татка, дзіцё гадаваў.

***Запісана ў в. Тукалаўка Лагойскага р-на***
***ад Глушанавай Ганны Іванаўны, 1907 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Карповіч Л.***

**Вясельная песня**

*Калі едуць па нявесту:*

Ой, коня, мой конь вараной,
Ці спадзяешся на бягню,
Ці ўзвязеш свашак на гару.
На тую гару крутую,
Пад тую цэркаўку святую,
Пад тыя званы звонкія,
Пад тыя свечы жаркія,
Пад тыя папы пеўчыя.

***Запісана ў в. Убалацце Лагойскага р-на***
***ад Аўхачовай Ганны Ігнатаўны, 1930 г. н.***
***(раней пражывала ў в. Селішча Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл.),***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Сямёнавай Л. (1994 г.)***

**Вяселле**

У сваты ішлі з торбай, бралі гарэлку, пірог. Дамаўляліся аб жаніцьбе. Калі давалі згоду, то сватоў абвязвалі ручнікамі. Дзяўчына, калі не хацела выходзіць замуж, то яна збягала з дому на той

час, калі ў хаце сваты. У сваты хадзілі бацька, жаніх, маці, брат, дзядзька. Вяселле гулялі тры дні. У суботу вяселле пачыналася ў хаце маладой. Маладую апраналі, а потым прыязджаў малады. Ехалі вянчацца. На другі дзень адорвалі падарункамі і пераапраналіся. Дзяўчына мяняла вянок на платок. Пасля свадзьбы былі перазовы. Дзяўчына не магла прыйсці ў бацькоўскі дом на працягу тыдня.

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на***
***ад Рыбчак Яўгеніі Нікanораўны, 1941 г. н.***

**Вясельная**

Ганулька, Ганулька, сядзь ты на куце,
Хто ж табе, Ганулька, косачку запляце.
А, мамка родная, запляці маю косачку.
Сядзь на сцежачцы, сядзь, ты, сядзь,
Табе косачку расчэша мамачка родная.
Ганулька, Ганулька, пакланіся ты ўсім,
І малому і старому
І ў ручкі, і ў ножкі.
Ганулька, Ганулька, пакланіся ты мне.

***Запісана ў в. Харошае Лагойскага р-на***
***ад Аўсейкі Ксеніі Іванаўны, 1916 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Канавалавай Т. П. (1999 г.)***

**Вясельная песня**

Дзевачка, ты сядзіш, вячэраеш,
Ты сядзіш, вячэраеш,
Нічога не ведаеш,
Ці твой суджонак п’яніца,
Дзе карчомку пачуе,
Там жа ночку начуе,
Дзе другую пачуе,
Там дзве заначуе.
Дзевачкі, мае сястрыцы,
Я яму гадзіць буду,
Я яму гадзіць буду.
Рушнічок на комінку,
Рушнічок на комінку.
Утрыся, саколіку.

***Запісана ў в. Чудзенічы Лагойскага р-на***
***ад Абмётка Надзеі Раманаўны, 1937 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Абмётка Г. (2003 г.)***

Вяселле гуляюць як паста няма. Дружуць спачатку. Потым дагаворуцца ды ідуць у сваты. Сват ідзе і маладога вядзе. Ідуць у сваты мама-хросная і бацькі, і брат родны. З сабой бяруць самагонку. Ну, літры тры, каўбасу. Прыходзяць і кажуць: «Ці можна ў хату зайсці?» А мая мама кажа: «А што вы за гэткія людзі, адкуль вы браліся?» А яны кажуць: «Можа пераначаваць у вас можна?» Тады мама ўжо кажа: «Пераначуйце.» Ну і тут ужо на стол ставяць. Патом угашчаюцца. Мама абязацельна свату павязвала рушнікі і сваці адразу, як дагаварыліся.

Вяселле гулялі тры дні. Малады прыязджае. Як ехалі, дык бацькі везлі з сабой хлеб. Пераймаюць маладую. І тут выкупліваюць маладую. І ідуць за стол гарэлку піць. На втары дзень пераадзяваліся – гэта калі ў маладой свякроў вянок здыме і надзене хустку, платок такі, знімала свякруха вянок. Зразу павесіць первай шаферкі, а тады ўжо павесюць на абраз. Тады ўжо садзяцца другія, надзяюцца і садзяцца за маладых. І тады ім доруць ужо. Вот такое было.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Луцкай Зінаіды Мікалаеўны, 1941 г. н.,***
***Новак В. С.***

У сваты ідуць жаніх і маці, і бацька, і сват. Бяруць гарэлку і ідуць дагаварваюцца. Але ж ідуць не ў пост. Жаніх браў толькі гарэлку, што найболей. Уся жаніхова гарэлка была на сватах. Нявеста не ставіла гарэлку, усю нёс жаніх.

Прышлі ў хату і вот гаворуць, што «заблудзіліся, вот убачылі агеньчык і на агеньчык прыйшлі». А не, то: «Шукаем кветачку. Якая ў вас кветачка красівая. Мы яе ў вас хочам купіць ці зламаць». А бывала, засваталася з жаніхом, а тады не захацела ісці, дык тады за гэту гарэлку занесці грошы трэба, што выпілі гарэлку яго.

Вяселле пачыналі ў суботу. У суботу і нядзелю гулялі ў маладой. Адоруць, бо ў первы дзень не дарылі, і тады ўжо збіраюцца да жаніха.

Як пераймалі, калі жаніх з нявестаю прыязджалі і яны сыходзілі з каня, то падыходзілі да бацькоў і кленчылі, то ім кажух пасцілалі, каб яны багатыя былі.

У жаніха нядзелю гуляюць вечар і панядзелак дзень. Як дарылі, дык быў каравай. Добрыя хазяйкі пяклі. Пяклі з мукі, дражджэй, малака, смятаны, масла, сахара. Каравай дзялілі ўжо як дарылі. Кожны прыходзіць, дарыць, паздраўляе і яму даюць кусочак каравая. Маці хросная дзеліць каравай, а сват гарэлку налівае. А як дораць, прыгаворваюць:

Дару цыбулю,
Каб мяне ўзяў за бабулю.
Дару ніткі,
Каб не глядзеў на чужыя лыткі.
Дару медзі,
Каб дзеці былі дужыя як мядзведзі.
Дару ветку бярозы,
Каб хадзіў заўсёды цвярозы,
І сколькі на ёй почак,
Каб столькі было дочак,
А сколькі лісткоў,
Каб столькі сынкоў.

Як сыграюць марш, так і пераадзяваліся: мужчына – у жанчыну, а жанчына – у мужчыну. Якую каструлю возьмуць ці доску, што бяльё сціраюць, чарпаком месюць і розныя прымаўкі спяваюць.

Тады яшчэ пярэзавыя гулялі. Тады ўжо дзе там першыя ў жаніха ці ў нявесты радзіцелі ўжо едуць гасцяць, а наследушчую нядзелю ўжо да гэтага едуць. Нявесце нельзя было цэлую нядзелю ісці дадому, хоць ты цераз вуліцу жывеш.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Міхневіч Валянціны Мікалаеўны, 1938 г. н.,***
***Новак В. С.***

У сваты прыходзілі: малады, сват з жонкай і бацькі. Водку з сабой бралі, бывае, возьмуць літраў пяць. Сватаюцца. Прыйдуць да маладой і кажуць: «Вось мы ішлі ды заблудзіліся. Вот зайшлі ішчэ да вас у хату, можа ў вас дзеўка ёсць якая? Пакажыце нам дзеўку, можа яна нам панаравіцца». Гаворуць, гаворуць і засватаюць тады ўжо. Абвяжуць свата палаценцам, а свацці давалі падарак. Дагаворуцца сваты ўжо калі тая свадзьба будзе.

Два дні гулялі свадзьбу. У маладога гулялі, затым едуць да маладой на конях, шаргуны такія зачэпюць, ой, як едзе свадзьба, дык красіва так з шаргунамі. Маладую садзілі на дзежку і благаслаўлялі бацькі. Ездзілі на конях вянчацца. А коні, што шалёныя ляцелі. Аднойчы, калі вянчаліся, а перад гэтым хлопец гуляў з другой дзеўкай і паабяшчаў яе замуж узяць, дык і не ўзяў. А калі ён ужо пайшоў вянчацца з гэтай, дык тая дзеўка выйшла і кажа: «Ён мне абяшчаў жаніцца і не жаніўся». І не павенчаў іх поп. Як маладыя жэнюцца, дык, як прыяжджаюць па нявесту, дык выкупліваюць. Столькі гарэлкі ставюць. А тыя крычаць: мала. Яшчэ болей, болей паставюць гэтае гарэлкі. Дый ставюць, колькі патрэбна. Заплоцюць яму, гэтаму свату, каторы балбоча. Сват ужо і камандаваў усёй свадзьбай.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Андрушкевіч Зінаіды Канстанцінаўны 1925 г. н.,***
***Новак В. С.***

Прыязджалі сват, бацькі і малады. Бралі з сабой хлеб і соль. Заходзілі ў хату і гаварылі: «Ці сюда мы папалі? Ці не заблудзіліся?» «Сюды папалі. Не заблудзіліся» – адказвалі ім. «Можа ў вас што прадаецца? Ну, вот купец прыехаў, вот мы купляем». І вот гэтак вот было.

Вяселле пачыналі ў суботу і гулялі тры дні. У суботу малады едзе за нявестаю, адпраўляюць яго з іконкаю. Едзе сват, малады і шаферы. Калі прыязджалі, то шаферкі вешалі ім цвяткі. Маладому і тым, хто быў жанаты – з правай стараны, а нежанатым – з левай. Маладому цвяток чапляла першая шаферка.

Адгуляюць у суботу, а ў васкрасенне адпраўляюцца да жаніха. Там ужо іх устрачаюць тожа. Становяцца на калені як адпраўляюцца. Бацькі благаслаўляюць іконкай, перахрысцяць. Пацалаваць даюць аднаго і другога, і адпраўляюць. Ну, там тожэ сустракаюць. Калі яны прыедуць, дык трэба, каб яны сышлі на шубу, каб багатыя былі. Устрачаюць з іконаю, а яшчэ з румачкамі налітымі. Нявеста заўсёды ехала з іконкаю і ручніком, і павінна была павесіць у хаце, ну, дзе ўжо месца, дзе іконы вешалі. На вяселлі выпякалі Сватаву міску. Сват на свадзьбу вязе міску ўжо. Ён накрываў яе, а нявеста ўжо сабірала на гэтую міску. Гэтую міску дзялілі і ў жаніха, і ў нявесты. Калі дзялілі Сватаву міску, то дарылі падаркі іігралі маршы, а яшчэ спявалі песні:

А ў Толі радзіцы многа, радзіцы многа,
Як прышлося дарыці, няма нікога, няма нікога.
А дзе ж тая радзіца падзевалася, падзевалася?
Па якім куточкам пахавалася, пахавалася.

Нельзя было невесце гасціць нядзелю дома. Нельзя было невесце дадому ехаць, таму што жызнь у іх не складвалася, разыйціся маглі. Калі прашла нядзеля, ехалі прасіць ад нявесты, яны ўжо прыязджалі на пярэзавыя. Гасцілі.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Шаўчэнка Ганны Іосіфаўны, 1934 г. н.,***
***Новак В. С.***

Сваты дагаварваліось. Ідзе сват, свацця, нясуць каравай. Бацькі нявесты іх угашчаюць гарэлкай. Маладая дае пшаніцу і дае булку хлеба і мёда, або варэння. Маладых замест рушніка абвязвалі матэрыялам. Не пяклі каравай.

***Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на***
***ад Бынкоўскай Ганны Пятроўны, 1936 г. н.***

Свадзьба ў нас вясёлая была. Там і песні, і танцы. Сначала ў сваты да мяне прыйшлі жаніх са сватам, ды і кажуць: «У вас тавар, у нас купец». Мы ўгасцілі самагонкай сватоў. Ну і спрашываем, ці сагласна я за яго пайсці. Ну, я з ім ужо даўно дагаварылася, а гэта так для бацькоў было. Дагаварыліось сразу, калі будзе свадзьба. А потым прапоі, эта следуюшчы дзень пасля сватання. Накрывалі стол і выпівалі многа, каб будушчая жызнь маладых была добрай.

Перад свадзьбай, вечарам, мяне павялі ў баню. Павялі мяне мае сёстры, сяброўкі і матка. Пелі песню мне:

Мойся, мойся, галубка міленька,
Ды ляці да галубка хуценька.

А калі з банькі я ўжо выходзіла, яны ўтыкалі веткі з веніка ў зямлю перада мною, а навошта – не ведаю. Дзявішнік. Падружкі сабіралі на стол. Сабіраліся ўсе ў хаце. Я кожнай падарыла па платку вышыванаму. Яны таксама прынеслі мне фартух, каб добрай гаспадыняй была. Мы і плясалі тут, і пелі. Падружкі засталіся са мной начаваці. І тут я пачала плакацца падружкам:

Ой, мае вы даражэнькі,
Заўтра еду да свякроўкі.
Будзе зліцца, будзе біць,
А я буду яе любіць.

Буду маткай называць,
По сваёй матульцы гараваць.
Ой, лёлі, лёлі, лёлі, ой.

Сама свадзьба была добрай. Нагатавалі ўсё, што было. Пелі, елі, затым нам падарылі падаркі. Снялі фату, адзелі платок.

*Песня маладой да свякрухі:*
Вось я і прыехала, вось я і прыйшла,
І да другой матачцы я сваёй дайшла.
Кланяюся табе, маці,
Будзем жыць з табой у хаце.
Ой, я не буду, не буду…

На другі дзень быў «красны» стол. Тут мяне пачалі іспытываць: білі пасуду, застаўлялі месці пол і глядзелі, як я мяла. А патом сажалі свякруху ў санкі і ўсе глядзелі, куды я яе пацяну: к печы ці к дзвярам. Еслі к печы – добрай буду, мірна жыць будам, а калі ўжо да дзвярэй – знацца з ёй не хочу.

**Вясельная песня**

Ой, не адпусці-то маладую,
Ой, прасціце, падружачкі,
Ой, паслухай, бацюшка.
Ой, паслухайце, падружачкі,
Ой, да я нямнога млада,
Ой, вы прыехалі сюда,
Паслушай, родная цётушка.

***Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на***
***ад Жаўняровіч Аксаны Юр'еўны, 1939 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Булахавай М.,***
***Шурмелем С., Атрохавай В. (2008 г.)***

Дарожку ад каня да дому высцілалі каўром саматканым. А на сам парог клалі кажух шэрсцю пераварочвалі наверх. Жаніху і нявесце давалі такое благаславенне: «Браце, сёстры, суседзі, прыляцелі на благаславенне». А сват кажа: «Пусць Бог благаславіць».

**Вясельная песня** *(спявала маладая або яе матка)*

Сядзіць галуб, а ля яго галубка.
Сядзіць Юдзечка за столікам.
Галубок паляціць у сваё гняздзечка.
Сядзіць Юдзечка за столікам,
Віно п'е, а ля яго
Яго Ніначка гарэлку п'е.
Лепей жа табе, мой Юдзечка,
А як мне ды ж спяеш
Сваю хатачку, а я ж не.
Цябе сустрэне твая матачка ж,
А мяне не.
Цябе сустрэне твая матачка ж,
А мяне – не.
Цябе назаве сваім дзіцяткам,
А мяне ж – не.
Цябе назаве сваім дзіцяткам,
А мяне ж не.

*Песня да маладой:*
Ты з павагі сваціцы, галубка,
З павагі,
Каб не было нашай нявесце
Знявагі,
Каб не стаяла цёмнай ночачкай
Пад акном,
І не аблівала свае слёзкі рукаўцом.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Алены Ігнатаўны, 1923 г. н.,***
***студэнткай ГДУ Атрохавай В. (2008 г.)***

**Вяселле**

Малады прыязджае да маладой. Маладая хваліцца. А шаферкі (свацці) трэбоваюць выкуп за маладую, трэбоваюць сладзенькага чаго. Цвяточкі дзяўчаткі прышываюць маладым. Малады тожа хоча падфарсіць. Ці дзікалону там, ці чаго. Ну падфарсіць хоча перад дзяўчатамі. Садзюць па пары: дзевачкі з мальчыкамі, ня гэтак, як цяпер, што там сем мальцоў п'юць, а тут селі дзяўчаты. Ніхто не курыў. Хлопчыкі не напіваліся. Ухажывалі за дзяўчатамі за сталом. Гэта ж пра дружыну я расказваю. Крычаць «горка» маладым, і тады лічылі сколькі раз, ці доўга яны цалуюцца. А заручыны прыходзя перш ну, дагаварваюцца паміж сабой маладыя, тады прыходзя матка і з бацькам і малады сват да маладой, да дзевачкі. Вот дагаваруюцца, сколькі пар дружыны будзя ад яго, сколькі ад яе будзе пар. Заручыны былі як у каго выходзя, у каго за месяц, а ў каго за дзве нядзелі да вяселля. Як бацькі справюцца. А бывае, і паўгода цягнецца, ета ж як у каго выходзя з грашыма. А тады ў нас грошай не было. Нада было самагонкі нагнаць, кабанчыка закалоць. На стол ставілі. Вот прыязджае тады. Нада свату бутылку пакруціць, ён, сват, ужо палаценцам, і аддаюць свату. Калі ад'язджае дадому, а бацьку з маткай падаркі далжна была маладая даць. Вот. А бацьку дае на рубашку, матцы на кофту ці на плацце. Як хто можа. Як нявеста багатая ці бедная. А цяпер адправюць туды, закладаюць жэрдкі, маладзёж трэбуе, каб выкуп большы даў. Прыходзіць маладая да маці, нада павесіць абразік, на абразік – палаценца, і мацеры ўскінуць палаценца на абразік і на свой, а тады запівае, п'юць. Абразік на кут.

Каб нявесту выкрадалі.. у нашай дзярэўні не было гэтага. Вобуві не кралі таксама.

Сват каравай заказуя, сватава жонка пячэ. Каравай ставюць, а на каравай доруць тады маладым. А дзевачку дорыць хросная матка. Купляя торт, ці, як даўней, напяком праснакоў ды і ўсё.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Пустаход Ніны Віктараўны, 1929 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Домінам А. (2008 г.)***

Прыйшлі да мяне ў сваты, і мы пайшлі да яго і прыгласілі цётку, каб бацькоў шанавалі. Затым мы вянчаліся. Ну, а патом пасадзілі сваіх гасцей за стол. Пелі і танцавалі пад гармонік. Усе пелі, а нявесце няможна было пець. Маладая магла пець, як усе ішлі танцаваць. Гэтаксама мая сяброўка адна пела, так нядобра жыве. Свій букет сахраняла нявеста, не кідала. Фату знімала мама і вешала першай шаферцы. У канцы гуляння фартук павязвала свякроў. Жылі ў яго хаце. Нявеста сама рыхтавала адзежу і засцілала пасцель. У новую хату на прыпечак клалі грошы і палаценца.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Мігунька Ганны Пятроўны, 1937 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

Прыйшоў у хату з гаршчочкам. Яны суп купілі і прынеслі ў ім. Прасіліся пераначаваць. Маці пасекла ўсю маю адзежу. Не хацела, каб я ішла за яго. Нашы бацькі нам самі выбіралі суджаных. А вот калі маладыя ад'язжаюць на кані, іх трэба зярном абсыпаць, каб добра жылі. Маладая брала клубок з ніткамі і пускала ад самай вёскі, каб усе дзяўчаты хутчэй следам замуж пайшлі.

А вот патом устраівалі празнік. Ужо тут сабірают усю радню, усіх суседзяў і танцуюць, і пяюць. Ой, аж усё гудзіць. Так весела!

Дарылі маладым із яды ў асноўным. Хто цыбулі дасць, хто і грошы. Ну тады багатых не было, дык хто што нёс.

Брачную ноч мы правялі ў яго хаце. Я прасіла разрышэння ў свякрухі. Сама разула жаніха.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Булыга Надзеі Пятроўны, 1935 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

**Вясельная песня (пасад)**

Дождж ідзе, раса падзе, *
Брат сястру на пасад вядзе.
Сястра ў брата да ног падзе:
– Братачка ты мой родне…, родненькі,
Чым я табе надаку…, надакучыла?
Ці русаю касой,
А ці сваёй красой?
– Сястрычка мая родная,
Нічым ты мне не надакучыла –
Ні русаю касою,
А ні сваей красой.
Дакучылі твае госційкі,
Што ў суботу прыяжджаючы,
А ў нядзельку ад'яджаюць.
Твой двор капытом збіты.
* Кожны радок паўтараецца два разы

***Запісана ў в. Чудзенічы Лагойскага р-на***
***ад Абмётка Надзеі Раманаўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мікуліч Н. (2005г.)***

**Вясельная песня**

Дзевачкі-паненачкі,
Дзевачкі-паненачкі,
Дарыце капеечкі.
Хлопчыкі-малодчыкі,
Хлопчыкі-малодчыкі,
Дарыце чырвончыкі.

***Запісана ў в. Чудзенічы Лагойскага р-на***
***ад Абмётка Надзеі Раманаўны 1937 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Абмётка Г. (2003 г.)***

**Вясельная песня (зборная субота)**

*Калі дзеўка замуж выходзіць:*
Жаню, мая мамка, на цябе.
Засталася мая ружачка ў цябе.
Уставай, мая мамачка, раненька,
Ты палівай маю ружаньку часценька.
Не палівай мае ружанькі вадою,
А палівай мае ружанькі слязою.
Ад вадзіцы мая ружка павяне,
Ад слёзачак мая ружка буяне.
Нехай за мной родны брацік гуляе,
А не за мной, да за русаю касою,
А не за касой, да за роднай сястрыцай.

***Запісана ў в. Чырвоная Зара Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Марыі Якаўлеўны, 1906 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Сяргейчавай В.М. (2000 г.)***

На вяселлі маладых садзілі на падушку ці на кажух для таго, каб шчаслівыя былі.

***Запісана ў в. Чырвоная Зара Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Соф'і Карлаўны, 1940 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Сяргейчавай В. (2000 г.)***

**Вяселле**

4–5 дней гулялі, балаган нацягнуць, гармошка, ва дварэ гулялі, у хаце не змяшчаліся, балаган на дварэ нацягнем і гуляем.

Добры вечар, папа, мама!
Приглашала вечера.
А я падрасла и вам принесла!

***Запісана ў в. Юльянова Лагойскага р-на***
***ад Чаховіч Леаніды Антонаўны, 1928 г. н.***

**Пахавальныя галашэнні**

Мылі і апраналі нябожчыка зусім чужыя людзі. Труну выносілі таксама чужыя людзі. Перад тым, як вынесці труну, перш за ўсё выносілі іконы, калі яны імеліся ў хаце. У труну нябожчыку клалі то, чым ён карыстаўся пры жыцці. Калі неслі гроб, заўсёды адбываліся галашэнні. Галасіць прыглашалі старых баб. На могілках бабкі не галасілі. Свяшчэнік чытаў малітву на могілках.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Шуркевіча Рыгора Станіслававіча, 1930 г. н.,***
***Новак В. С.***

Калі паміраў чалавек, то закрывалі ўсе зеркалы, а калі памірала ведзьма, то дзелалі дырку на паталку, каб яна хутчэй выйшла. Хадзілі ў цэркву і адкрывалі вароты. Нельга, каб гэтага чалавека мылі родныя, адзежду гэтага чалавека спальвалі. Калі выносілі нябожчыка, то скамейка, на якой стаяла труна, пераварочвалі дагары нагамі, каб нябожчык не вярнуўся ў хату. Калі везлі нябожчыка, то нельзя, штоб у гэтай дзярэўне нехта спаў. Нельзя глядзець з акна на нябожчыка, нельзя ісці наперад або пераходзіць дарогу, бо сам хутка памрэ. А калі закапваюць нябожчыка, кідалі манеты і грошы, каб на тым свеце ў яго вадзіліся грошы. Нада паставіць у цэркве свечку за нябожчыка і памаліцца за яго.

***Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на***
***ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І. (2008 г.)***

Стол накрывалі, як на Дзяды. На 40 дней вечарам рабілі посныя стравы, на следуюшчы дзень – абыкнавенныя. Прыкладзіны (толькі пасля 40 дзён). Осенню, абкладвалі магілы дзёрнам, у чацвер, перад Дзмітрыеўскімі дзядамі.

Дзмітрыеўскія дзяды – у чэсць Дзмітрыя Данскога. Абавязкова была кураціна: калі ў той год умер мужчына – пятух, калі жанчына – курыца.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на***
***ад Шыла Лідзіі Нікіфараўны, 1937 г. н.***
***(раней пражывала ў Віцебскай вобл.)***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В., Трубкінай Т. (2008 г.)***

Родным няльзя труну выносіць. Паміналі 30 дней, а патом год.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Турчыновіч Міхаліны Венедзіктаўны, 1926 г. н.***
***(нарадзілася ў в. Каргавішча)***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

Знахаркі зналі спецыяльныя малітвы. Мылі чужыя людзі (саседзі). Сабіралі доскі і дзелалі гроб. Прыглашалі людзей, каб пелі галашэнні. У гроб памершаму лажылі то, чым он пользавался пры жызні. Вперёд выносілі гроб, а потым іконы, або на адварот. Ікону ілі кресцік лажылі в гроб, 40 дней прахадзіла, пяклі бліны, мазалі мёдам ілі варэннем і насілі па хатам.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Аўсейкі Валянціны Дзям'янаўны, 1937 г. н.,***
***Новак В. С.***

Галасіць начыналі, калі чалавек памёр. Жонка выходзіла на вуліцу і начынала галасіць. Нябожчыка нельзя мыць родным. Прасілі суседзей і другіх людзей. Людзі не павінны былі адказвацца. На 40 дней этым людзям давалі кусок ткані. Памінальныя дні: трэці, дзевяты, чацвёрты пасля пахавання.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Петрашко Лідзіі Лявонцьеўны, 1932 г. н.***
***(нарадзілася ў в. Хадакі Лагойскага р-на),***
***студэнткаміГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

Па-другому называлася абрадам атпевання. Жалка родственніка. Калі мамка памерла, я крычала, галасіла:

Ой, на каго ж ты мяне пакінула?...
На каго ж ты нас аставіла?...

Мы ж малыя асталіся, дык я нядзелю хадзіла плакала, мне крычалі, што не плач, але шкада ж.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***

Як хто ўміраў, звалі бабак, якія ўмелі галасіць. Галасілі і ў вясельных песнях.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Зялёнай Леаніды Феліксаўны, 1937 г. н.,***
***Новак В. С.***

**Пахаванне**

У час, калі нябожчыка выносілі з хаты, то ў карыдоры блізкія сваякі станавіліся на калені і кланяліся.

Людзей, якія галасілі, называлі пеўчымі. Кагда паміраў чалавек, то закрываліся зеркала, штобы он не ўвідзеў сябе в зеркала і не астаўся дома.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Зюзянюк Валянціны Аляксееўны, 1945 г. н.,***
***студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

Ой, з Васечкам маім мы 16 год душа ў душу пражылі (плача). Ён жа ж не піў у мяне, хазяін добры быў, і хату сам пастроіў, і баню (плача). Васечка мой нічым не балеў. Ён у мяне лёгка памёр, як кажуць, у сне. А мне накануне сон прысніўся: я на кладбішчэ прыйшла да магілкі мамы і бацькі, гляджу – радышкам магіла выкапаная, пустая. Вось і панятна потым стала (плача).

Ну, абмылі цела вадзічкай. Я пазавешвала зеркалы ўсе, часы астанавіла – так нада. Ну, адзела ва ўсё чысценькае, новае, свечачку ў рукі дала. Яшчо ў гроб паклала шапку. Паложэна. А за пазуху грошы паклала. Каб там заплаціць змог за месца. Не, гроб мы на парогу не ставілі, проста выносілі на вуліцу, патом клалі на калёсы і везлі на кладбішча. Магілу родзічам капаць нельзя. Толькі чужыя далжны капаць. А послі пахарон ужо пераварачвалі калёсы, на якіх везлі гроб, каб мёртвы не вярнуўся. Кагда все прыходзяць з кладбішча, абязацельна нада ўсім памыць рукі. А за сталом ужо пілі, елі, паміналі памёрлага. Нікагда за сталом нельзя гаварыць плоха пра ўмёршага, маўчаць ужо лучшэ.

Песні, ну, галашэнні пелі, канешне. Я ўжо і не помню. Ну, еслі кусочак толька:

А мой галубочак, а мой сізенькі,
Паследній раз с табой іду,

У паследній пуць цябе веду,
Паследній раз с табой іду,
У паследній пуць цябе веду.
Ой, асталася я адна, ой.
Ой, без тваего крыла, ой.
Ой, асталася я адна, ой.
Ой, без тваего крыла, ой.

Паміналі, канешна. На трэці, дзевяты і саракавы дні. Як паміналі. Службу ў цэркві заказвалі, ну і, канешна, на магілку хадзілі, паміналі.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Шушаевай Галіны Фёдараўны, 1926 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарына Елавой Н., Доміным А., Шурмель С. (2008 г.)***

Пелі песні. Ну, а потым яму выкапалі і паставілі. Сабіраліся жанчын пяць, пяюць і на кладбішчы пяюць. Потым дамой і за стол гарэлку піць.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Бартко Аляксандра Іванавіча, 1927 г. н.,***
***Бартко Рэгіны Антонаўны, 1929 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарына Елавой Н., Доміным А., Шурмель С., (2008 г.)***

*На пахаранах патрэбен чытацца толькі Псалцір, а яшчэ спявалі:*

Сын мой, я скора растануся с табою,
Скора я ў вечнасць пайду,
Адно я прашу, умаляю:
Ісполніце просьбу маю.
Завешчанне табе астаўляю,
Пазабоцься а маме сваей,
Я жэ цебе не разараю,
Пастарайся ўсё ісполніць тачней.
Мне памінак шыкарных не нужна,
Паметнік, разные венкі,
Ведь абрад этот, только наружный,
Нічэво не дает для душы.
Крэст закажы первым долгам,
Штоб яму маліцца ўсе маглі,
І гроб дастань папрошчэ,
Па-хрысціянску мяне схарані.
Адзень мяне проста і скорбна,
Чцецоў ка мне прыгласі.
Ісполні свой долг, не сцесняйся,
Для паграбення ў храм прынясі.
Кагда ты мяне пахароніш,
То не ўздумай віном памінаць,
Ты душу маю апечаліш
І пацераеш сваю благадаць.
Дзенег не траць на памінкі,
Лучшэ ў цэркві святой памяні,
Свечы пастаў прад іконай,
Абедні, паніхіды ты мне паслужы.
Еслі гроб мой захочаш украсіць,
То цвятоў і вянкоў не кладзі.
На магілу крэст нада паставіць,

Да й бярозку яшчэ пасадзі.
Годы прайдуць за гадамі,
І памяць у забвенне прыдзёт,
А бярозка сваімі ветвямі
Азарных пцічэк к сабе пазавёт.
І тагда на маю уж магілу
Ніхто нікагда не прыдзёт,
А бярозка склоніца нізка
І мне пцічка песню спаёт.

*Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на*
*ад Залуцкай Таццяны Міхайлаўны 1922 г. н.*

Памінай мяне, брацья,
Памінай усякі раз.
І толькі ваша памінанье
Аблегчает усех нас.
Памінайце ўсе радные, усе з любовію меня,
І прасціце, у чэм віновен,
Можэт, быў прэд вамі я.
Памінайце хлебам-соллю,
Дажэ чыстаю вадой,
Памінайце добрым словам,
Будзе ўсё пэрэда мной.
Ешчэ чашчэ памінайце,
Мяне, мілая сям'я,
Я служыл вам безадказна,
Не забудзьце пра меня.
В цэркавь чашчэ прыхадзіце,
Где все душы ждут вас там.
І атцам духоўным вместе
Вымаляйце міласць нам.
Мне не страшна, што са света
Я навекі аташол,
Толькі страшна, што з грэхамі
Я да Госпада прыйшоў.
І цепер, маі радные,
Прэдстаю я перэд ім,
Памінайце і маліцесь,
Штобы вечно быў я с нім.
Не скарбіце, усе радные,
І не плач, сям'я мая:
Всех я встрэчу, вы паверце,
Все вы смертны, как і я.

Пакойніка выносілі нагамі ўперад. Калі выносяць, то спяваюць «Святы Божа».

*Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на*
*ад Залуцкай Таццяны Міхайлаўны 1922 г. н.,*
*Новак В. С.*

Выносілі труну чужыя людзі. На пачатку галасілі дома, калі яшчэ не выносілі гроб. А подчас хадзьбы да кладбішча галасілі. Ксёндз запрашаў памінаць 9 і 40 дней.

*Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на*
*ад Бынкоўскай Ганны Пятроўны, 1938 г. н.,*
*Новак В. С.*

Мы асталіся адны, без маткі і бацькі (памерлі). Пахавалі сваіх мужыкоў (плачуць). Ну, як хароняць? Мужык памёр рана, бо хварэў. Дзетак у нас не было, я падышла да яго, закрыла вочы яму. Дала яму свечку ў рукі. Пазавешвала ўсе зеркалы. А то шчэ ажыве. Астанавіла гадзіннік. Папрычытала ды і пабегла апавяшчаць усіх. Тут бабкі пачалі мыць яго, бо сваім нельзя было, адзелі ў чысценькае, паклалі ў гроб. Ды шчэ туды паклалі яму шапку яго і трубку з махоркай, бо курыць любіў ён. Гроб везлі на кані праз усю вёску. Я і мая во сястра сядзелі каля яго і прычыталі, а ўсе астатнія (пачці ўся вёска) ішлі за намі. Надо было правесці паследні разок (плача). Магілу капалі мужыкі, бо сваім тожа нельзя. Пасля таго, як вярнуліся, мы мылі рукі і пераапраналіся. Так нада было. А патом ужо памінали на 3-ці, 9-ты, 20-ты, 40-вы дні. Бралі з сабой на клодава выпіць і закусіць, памінали, плакалі.

З пахарон да 40-га дня ў стакан лілі ваду і ставілі на падаконнік, а я кожнае утра вылівала яе ў «глухі» вугал (нежылы), каб душа мылася.

**Галашэнне**

А мой мілы галубочак,
На каго ж ты нас паінуў?
Сірацінкаю аставіў,
А не паглядзіш ты на поле чыстае,
Дзе з табою сустракаліся,
Мілаваліся, цалаваліся.
Больш не пойдзеш
У хату, дзе жаніліся.

А ў мяне ж мужык ды павесіўся. Не было чым сям'ю карміць, не выдзержыў (плача). Дык яго і ў цэркаўкі не адпявалі і пахаранілі, не як усіх, а за агароджай клодава. Сніўся ён мне кажды дзянёк (плача), з сабой зваў, а я не ішла. А каб пайшла, то ужо б памерла. Так старыя кажуць.

*Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на*
*ад Барцэвіч Марыі Аляксандраўны, 1929г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Булахавай М., Шурмелем С., Атрохавай В. (2008 г.)*

Гроб ставяць на табурэткі, засланыя белай простыняй. Нябожчыка свянцонымі зёлкамі абкурвалі. Свянцонай вадой свяцілі. Калі толькі памёр, давалі ў руку свечку запаленую. Мылі нябожчыка толькі чужыя. Галасілі, як хто мог. Везлі на клодава. Затым накрывалі на стол і абедалі. Гарэлку нельга было піць. Патом ужэ на 9, 40 дней збіралася радня памянуць.

*Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на*
*ад Багуцкай Алены Ігнатаўны, 1923 г. н.,*
*студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)*

Як нябожчыка пахаваюць, садзяцца за стол, а тады ўжо каша гэта паследняя. Ужо, кажуць, пасля кашы няма пашы.

Першым долгам ставюць на стол, гарэлку не ставюць, а ставюць закуску і ставюць канон. І ты должэн узяць тры разы гэта вот. У нас абаранкі мачалі ў ваду з мёдам, крышуць і мачаюць. А як даўней, пяклі, наразаіш, як клёцачкі, наразаіш дробненька, выпечыш, трэш мак, салодзіш гэту ваду і тады кідаеш гэтыя булачкі, яны дробненькія. І вот дастаніш, укусіш тры разы, а тады ўжо ставюць гарэлку на стол і там, што ёсць у цябе, тое ставяць на стол. Ну, там ужо співаюць. Звалі на кладбішча. Вот пахаранілі і тады кажуць: «Людцы, хадзіця памянём». І тады ўжо ўсе едуць з кладбішча, мыюць рукі і садзяцца за стол. Канон паядуць, закуску паядуць, а тады ўжо кашу, после кашы няма пашы.

На трэці дзень радня едзе будзіць ужо нябожчыка. Едуць на кладбішча там свае, хатнія, бацькі ці дзеці. Едуць на кладбішча, там прыгаварваюць: «Устань, папа (мама), мы прыехалі да цябе за саветам. Устань нам раскажы, што рабіць».

*Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на*
*ад Пустаход Ніны Віктараўны, 1929 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Доміным А. (2008 г.)*

*Аляксандра СТАНКЕВІЧ*

# ВЯСЕЛЬНЫЯ ПЕСНІ ЛАГОЙШЧЫНЫ: МОЎНЫЯ СРОДКІ СТВАРЭННЯ ВЫЯЎЛЕНЧАЙ ВЫРАЗНАСЦІ

Песенная народная творчасць з'яўляецца вышэйшым узроўнем развіцця вуснага слоўнага мастацтва. Як слушна адзначыў Н. С. Гілевіч, для народнай песні характэрна «незвычайна высокае паэтычнае майстэрства народных песнятворцаў, іх зайздроснае ўменне карыстацца сэнсавымі, вобразна-выяўленчымі і інтанацыйна-эўфанічнымі магчымасцямі роднай мовы» [1, с. 3].

Адметнай асаблівасцю вясельнай песні з'яўляецца яе прыўзнята-лірычны настрой, глыбокая эмацыянальнасць і яскравая выяўленчая выразнасць. Знешне нескладаная, простая, звычайная мова вясельнай песні дакладна перадае задушэўныя перажыванні галоўных герояў, іх шчымлівае пачуццё, сардэчнасць і непасрэднасць. Простыя і шчырыя словы песні ідуць ад сэрца і моцна кранаюць за душу. Аб'ектам нашага аналізу з'явіліся тэксты вясельных песень, запісаных у Лагойскім раёне, крыніцай фактычнага матэрыялу – фальклорны архіў БДПУ імя М. Танка.

Істотным адрозненнем вясельных песняў ад іншых песенных жанраў вуснай народна-паэтычнай творчасці з'яўляецца яркая эмацыянальна-экспрэсіўная афарбоўка. Паколькі экспрэсіўнасць прадстаўлена на ўсіх узроўнях мовы, тэксту і маўлення, яна ствараецца мноствам сродкаў і спосабаў. Функцыянальны падыход да экспрэсіўнасці як камунікатыўнай з'явы абумоўлівае ў сваю чаргу разуменне яе сістэмнасці. Як і іншыя камунікатыўныя якасці, выразнасць мастацкага, у тым ліку і народна-паэтычнага тэксту ствараецца адзінкамі ўсіх узроўняў моўнай сістэмы – гукавога, лексічнага, лексіка-семантычнага, словаўтваральнага, сінтаксічнага і іх узаемадзеяннем. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што ўсе ўзроўні моўнай сістэмы, якія ў немастацкім маўленні адыгрываюць службовую ролю (выкарыстоўваюцца аўтаматычна), у паэтычным маўленні набываюць больш або менш важную самастойную значнасць, паколькі асноўная функцыя паэтычнай мовы – у максімальнай актуалізацыі моўнага выказвання [2, с. 273].

Выразная экспрэсіўна-эмацыянальная афарбоўка вясельнай песні ствараецца рознымі моўнымі сродкамі. Самым паказальным словаўтваральным сродкам стварэння эмацыянальнасці і экспрэсіўнасці з'яўляюцца формы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі, якія могуць выражаць станоўчую і адмоўную ацэнку з рознымі адценнямі. Значэнне памяншальнасці і/або ласкальнасці перадаецца суфіксамі -к-, -ок-, -ік-, -ец-, -ц-, -ейк-, -аньк-, -еньк-, -эньк-, -ул-, -ечк- і інш.

У аналізуемых песенных тэкстах ужываюцца пераважна формы з памяншальна-ласкальным адценнем. Значэнне ласкальнасці перадаюць суфіксы суб'ектыўнай ацэнкі, якія выражаюць адценні пяшчоты, ласкі, замілавання безадносна да абазначэння памеру або аб'ёму прадмета: *А мой жа ты дзевярусенька, Вядзі мяне памалюсеньку, Не вядзі мяне па кошанцы, Вядзі мяне па дарожанцы.*

Субстантыўныя формы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі найчасцей выражаюць ласкальныя адносіны да асобы: *Адчыняй, мамачка, новы двор, Прынімай нявестачку на выбор; / Я за свайго сыночка пабыла ў сваточка. Сыночка палюбілі, нас мядочкам напаілі; / Сірацінушка па магілачцы хадзіла І родную мамульку будзіла; / Стаяла каліна між варот, Ехаў служанька наўпярод*; прыродных з'яў: *Сіня мора калыхалася, Сонейка купалася*; рэалій жывёльнага свету: *Драча вутачка драча, З возера не злітае; / Мойся, мойся, галубка міленька, Ды ляці да галубка хуценька;* расліннага свету: *Ой стаяла, ой буяла Канапелька ў гародзе; / Гляну ў садочак, Як красачкі ззяюць, Аж мае ручкі вянуць; / Ой, чаму ж ты з розы кватачка Пад дожджыкам звяла?* ; */ Маё лічанька, як яблынька, а сама я, як вішанька;* прадметаў: *А хто ж ёй мягка пасцельку пасцеліць? А хто ж ёй бела кашульку памыець? / Дома ў нас хатачка не мяцёная, Дома ў нас ложачка не памытая*; дзеянняў: *На вяселейка пазвалі, Чарачку гарэлкі не далі; / Каб я гэта ведала – не пайшла, Цяпер сабе работачкі не знайшла;* адцягненых з'яў: *Аставайся, мая мамачка, здарова, Як мне выпала на Украіначку дарога*; */ Мая мамачка родная, Чаму мяне замуж аддаеш, А долечкі не даеш?*; ласкава называюць прамежкі часу, дні тыдня, адрэзкі сутак: *Каб не стаяла цёмнай ночачкай пад акном, Каб не ўцірала дробны слёзачкі рукаўком*; */ А сёння суборная суботачка настала, Млода Ганачка ўсіх дзевачак сабрала*; */ Ой, не ляжы, мая мамачка, Ні ў дзень, ні ў нядзельку; / А ў нядзельку ранюсенька Мамка воду брала; / Кажа мамульцы*

*родная дачка, Што не пабыла адзін гадочак у цябе*; / *Збудзеш, збудзеш, мамачка, За адзін дзянёчак, Не забудзеш, мамачка, За ўвесь гадочак.*

Ад’ектыўныя формы адлюстроўваюць пачуцці пяшчоты і замілавання да асоб або прадметаў: *Наша Леначка маладзенькая Ад мамкі адыходзе*; / *Як павялі дзяўчыначку На татачкаў двор. У майго татку двор вялікі Новы чыстакол; / Як заручалі, як засмучалі, Ты думала жартачкі. Гэтыя жарты выйшлі На праўды, божа мой, любусенькі; / Мае хустачкі, як бель беленькі, Яны ж мне не міленькі.* Адвербіяльныя – называюць эмацыянальнае стаўленне да пэўных з’яў: *Ужо не раненька, яшчэ ня позьненька, Сонейка на захадзе.*

Шчымліва-лірычная інтанацыя вясельнай песні найчасцей стварае мінорны настрой, які суправаджае сумнае расставанне маладой з родным домам, бацькамі, дзявочай вольніцай. У гэтых радках чуваць страх перад новым жыццём, боязь будучага, змены жыццёвага ўкладу. Акрамя выразнай эмацыянальнай афарбоўкі, формы з суфіксамі суб’ектыўнай ацэнкі надаюць мове песень асаблівую мілагучнасць, меладычнасць і напеўнасць – выконваюць гукапісную ролю.

Даволі актыўна ў працэсе экспрэсівізацыі народна-песеннага тэксту ўдзельнічаюць адзінкі лексічнага ўзроўню і ў першую чаргу – **тропы**.

Тропы выконваюць функцыю мастацкай канкрэтызацыі маўлення, індывідуалізацыі аб’екта, яго вобразнай характарыстыкі. «Менавіта вобразнасць, мастацкая канкрэтнасць і разам з тым цэльнасць успрыняцця і выражэння свету з’яўляюцца спецыфічнымі адзнакамі мастацкага твора і важнейшымі сродкамі ўздзеяння на чытача» [3, с. 80]. Вобразнасць мовы, заснаваная на выкарыстанні слоў у пераносным значэнні, – галоўны стылеўтваральны фактар паэтыкі.

Самы пашыраны троп у аналізуемых песнях – **эпітэт.** Эпітэт – вобразнае азначэнне прадмета або з’явы, якое адрозніваецца ад звычайнага азначэння пераносным сэнсам і экспрэсіўнай функцыяй. Эпітэт дапамагае дакладна і ўсебакова ахарактарызаваць пэўны прадмет, з’яву ці чалавека, вылучыць і апісаць іх найбольш істотныя індывідуальныя рысы, узбагачае выяўленча-выразныя магчымасці апісання, надае мове адметнасць і эмацыянальную насычанасць. У тэкстах песень выкарыстоўваюцца, як правіла, традыцыйныя, устойлівыя або народна-паэтычныя эпітэты, выражаныя прыметнікамі, якія часцей за ўсё называюць істотныя ўласцівасці асоб, пэўных з’яў прыроды або жывых істот: *Сплялі Волечцы вяночак, Ды пакацілі па скам’і, Надалі жалі ўсёй сям’і, Роднай мамачцы найгоры, Што гадавала найболі; / Павязём з сабой радасць. Радасць радавую, радасць радавую, Братаўку маладую; / Сіня мора калыхалася, Сонейка купалася; Пойдзеш, мамачка, у сіне мора хусты праць, А я пайду ў чыста поле жыты жаць.*

Эпітэт у песнях найчасцей выражаецца поўным прыметнікам: *Змерзлі ж мы, змерзлі На лютым марозі. На лютым марозі, У бальшой дарозі*, зрэдку – кароткай формай прыметніка: *Рута мята зялёна несаджаная, Маладая дзяўчыначка заручоная; / Ой зелен, зелен садочак, Звілі дзевачцы вяночык*; / *Ой, мае вы даражэнькі, Заўтра еду да свякроўкі; А сёння суборная суботачка настала. Млода Ганачка ўсіх дзевочак сабрала*; сустракаюцца таксама эпітэты, выражаныя прыдаткамі: *Дзевачкі-паненачкі, Дарыце капеечкі. Хлопчыкі-малодчыкі, Дарыце чырвончыкі.*

Эпітэт выконвае адначасова дзве арганічна узаемазвязаныя функцыі – функцыю вобразнай характарыстыкі прадмета і функцыю экспрэсівізацыі маўлення. Эпітэт найчасцей вобразна, маляўніча і наглядна характарызуе прыродныя з’явы, яскрава і рознабакова апісвае дзеянні, паводзіны, характар людзей, дазваляе аўтару дакладна і выразна перадаць іх пачуцці, эмоцыі, душэўныя перажыванні, псіхічны стан, адносіны да іншых людзей. У некаторых выпадках у адным канктэксце сумяшчаюцца эпітэты, якія маляўніча апісваюць прыродны свет і вобразна характарызуюць унутраны стан лірычнага героя, што садзейнічае больш поўнаму раскрыццю ідэйнага зместу твора і характару вобразаў.

У групу тропаў, заснаваных на падабенстве прадметаў, уключаюцца таксама параўнанні. **Параўнанне** – прыпадабненне аднаго прадмета да другога на аснове іх агульнай прыметы з мэтай узмацнення выразнасці яго характарыстыкі. Параўнанні з’яўляюцца адным з самых пашыраных сродкаў мастацка-вобразнай канкрэтызацыі, якія выдзяляюць, падкрэсліваюць як пастаянныя, устойлівыя, істотныя прыкметы прадметаў, так і іх часовыя, неістотныя адзнакі. Параўнанні надзвычай разнастайныя як па семантыцы, так і па структуры. Асаблівую ролю параўнанні выконваюць у песнях, дзе яны з’яўляюцца важным сродкам вобразнай характарыстыкі прадмета, стварэння экспрэсіўна-эмацыянальнай афарбоўкі мастацкага слова.

Паводле ўспрыняцця адрасатам параўнанні падзяляюцца на агульнамоўныя, суб'ект і аб'ект якіх добра вядомы, і індывідуальна-аўтарскія, пабудаваныя на нечаканых супастаўленнях прадметаў і іх уласцівасцей. Агульнамоўныя параўнанні ствараюцца з «гатовых» агульнамоўных блокаў, якія фіксуюць найбольш бачныя, агульнавядомыя прыметы прадметаў і з'яў: напрыклад, у пажаданнях маладой на вяселлі: *Будзь багата, як зямля, Будзь здарова, як вада, Будзь прыгожа, як ружа; / Мае хустачкі, як бель бяленькі, Яны ж мне не міленькі.*

Параўнанні ўзмацняюць пэўныя якасці асоб: *А сваццця ходзіць надуўшыся, як індык* або прадметаў: *На плячах коскі, як лён бяленькі, Пад вачмі слёзкі, як мак драбненькі*, тлумачаць, падкрэсліваюць асаблівасці дзеяння, унутранага стану, душэўнага перажывання галоўнай гераіні: *На пасадзе села, як зорка зазрэла, А з пасада ўстала, да як рута звяла.* Па сродках сувязі гэта найчасцей злучнікавыя параўнанні са злучнікам як.

Вельмі пашыраны ў вясельных песнях разгорнутыя мастацкія параўнанні, якія ў фалькларыстыцы кваліфікуюцца як вобразны паралелізм [1, с. 40]. Вобразны паралелізм заснаваны на супастаўленні пэўнага дзеяння, стану або ўласцівасцей чалавека са з'явамі прыроды, рэаліямі жывёльнага або раслiннага свету. Вобразны паралелізм называюць псіхалагічным, паколькі ён дапамагае больш поўна і дакладна перадаць унутраны стан галоўных герояў, характар іх перажыванняў, пачуццяў і эмоцый.

У вясельных песнях Лагойшчыны знешняя прыгажосць, маладосць нявесты, яе вясёлае, бесклапотнае жыццё ў родным доме супастаўляюцца з раслінным светам: *Рута мята зялёна несаджаная, Маладая дзяўчына заручоная; / Стаіць каліна над ракою, А пад той калінай дзяўчына стаяла І русую косу там часала, Белая лічанька мыла; / Ой стаяла, ой буяла Канапелька ў гародзе.., Ой гуляла, ой гуляла Наша Танечка ў мамачкі.*

Паводзіны нявесты або яе родных параўноўваюцца з дзеяннямі птушак або станам раслін, прыроднымі з'явамі, што ўзмацняе ступень праяўлення дзеянняў персанажаў песні, надае ім сімвалічны характар: *І драча вутачка, драча, З возера не злітае, Возера не кідае. І плача Манечка, плача, Плача Манечка, плача. Са двара не з'іжджае, Мамачку не кідае; / Не ведала зязюля, Як у садзе жыці, Не ведала мамачка, Як дачушку збыці; / Стаяла калінка каля варот, Папрасілася ў чарот. Стаяла дзеўка каля саду, Папрасілася на пасаду; / А ў горадзе ячмень ці ўродзе, Маладая Волечка свайму свёкру ці ўгодзе? / Дожджык ідзе, раса падзе, Брат сястру на пасад вядзе.*

Перажыванні маладой гераіні перад вяселлем дапамагае падкрэсліць адмоўнае супастаўленне: *Не шкадуй, дачушка, кветак, вінаград, А шкадуй, дачушка, сваіх лет; / Крамяная печачка, Крамяная печачка, Вечар гарыць да не выгарыць, Свайго краменейка ды не распаліць. Малада Анечка, Малада Анечка Вечар сядзіць ды не заплача, Сваёй мамкі ды не разжаліць.*

Супастаўленне з рэаліямі прыроднага свету (асабліва ў спалучэнні з эпітэтам *зялёны,* які падкрэслівае вечнае абнаўленне прыроды, яе сілу і хараство) паказвае ўрачыстасць, значнасць чакаемай падзеі, яе пераломную важнасць у будучым жыцці галоўнай гераіні: *Суборная субота настае. Зялёная ружа на стале; / Ой зелен, зелен садочак Сплялі Волечцы вяночак; / Зялёная вішня з-пад кораня вышла, Аддала мяне маці, дзе я непрывычна*

Вобразны паралелізм можа насіць гіпербалічны характар, калі яўна перабольшваюцца колькасныя або якасныя ўласцівасці з'явы: *Кажуць, у моры вадзіцы многа, Кажуць, у Светы радзінкі многа.*

Даволі часта ў вясельных песнях сустракаецца **антытэза** – супастаўленне процілеглых прадметаў з мэтай стварэння кантрасту і экспрэсіі.

Кантраст, заснаваны на выкарыстанні супрацьлеглых па сэнсе лексічных адзінках, забяспечвае структурна-сэнсавае адзінства паэтычнага тэксту. Найчасцей паэтычная антытэза заснавана на дамінантных семантычных апазіцыях, якія ўключаюць часавае, прасторавае супрацьпастаўленне, кантрасны паказ герояў твораў, іх учынкаў, пачуццяў, перажыванняў, процілеглы характар сацыяльных або прыродных з'яў і г.д. Напрыклад, у вясельных песнях сустракаецца прасторавая апазіцыя: *Кася ад вады, Яся да вады, Пастой, пастой, мая Кася, дай каню вады*; часавая апазіцыя: *Ужо не раненька, яшчэ ня позьненька, Сонейка на захадзе; / Учора гардзіла намі, А сёння едзе з намі;* колькасная апазіцыя: *А ў Толі радзіцы многа, радзіцы многа, Як прыйшлося дарыці, няма нікога, няма нікога*; паказваецца кантрасны эмацыянальна-псіхічны стан чалавека: *Калі ж добра будзе, Замужам буду, буду. Калі ж нядобра – Дамоў вярнуся,*

*вярнуся;* процілеглае становішча ў сям'і: *У мамкі была – гора не знала, .. У Валодзькі станеш – усё пазнаеш;* змена сямейнага становішча: *Вяселле зачынаецца. Валечка заручаецца. Ад мамачкі адлучаецца,.. К Сярожачку прылучаецца;* кантрасныя дзеянні асобы: *Не вядзі мяне па кошанцы, Вядзі мяне па дарожанцы; / Мамка запяець, а я заплачу слязою, Ці не сыйдуцца нашы галаскі з табою?*

Паводле структуры антытэза можа быць простай, заснаванай на супрацьпастаўленні адной антанімічнай пары: *Мы прыехалі па тую кветку, Што цвіцець зімой і ўлетку;*

або разгорнутай, у якую ўключаецца некалькі пар слоў з процілеглым значэннем: *Табе, сястра, адна спадніца, А мне дзве, Бо я паеду ў чужыя людзі, А ты не. Як я буду жыць багата, Тады будуць знаць, дзе й хата, А як буду гараваць, Тады браты і сёстры Будуць мяне абмінаць; / Па кошанцы мае ножкі не ідуць, Па дарожцы яны самі бягуць. Па кошанцы ўпіраюцца, па дарожцы размінаюцца.*

Асаблівую ролю ў стварэнні мастацкага вобраза адыгрывае **метафара** – троп, заснаваны на выкарыстанні слоў і выразаў у пераносным сэнсе на аснове падабенства або аналогіі называемых імі прадметаў і з'яў. Метафара з'яўляецца актыўнай формай вобразнага адлюстравання аб'ектыўнай рэчаіснасці, важнейшым сродкам мастацкага пазнання свету. Неабходна, аднак, адзначыць, што ў вясельных песнях метафара сустракаецца параўнальна рэдка і носіць ў асноўным характар персаніфікацыі.

**Персаніфікацыя** (увасабленне) – наданне неадушаўлёным прадметам і з'явам дзеянняў і ўласцівасцей чалавека:

*За лесам, ляском бярозка з лістком Усю восень гаварыла: «Бярозка мая, белая мая, Як жа мы растанемся? Вятрок павее, лісток ападзе, Я голая стаяць буду».*

Паводле характару аб'ектаў, на аснове якіх адбываецца перанос, у аснове персаніфікацыі ляжыць тып метафары «нежывому – жывое» – перанос уласцівасцей чалавека на прадметы і з'явы прыроды:

*А каліна яму змолвіла: «Не для цябе каліна саджана, А гэту каліну сад садзіў,..А гэту каліну дождж паліваў, Для цябе, татка, дзіцё гадаваў»; / Сіне мора калыхалася, Сонейка купалася.*

Пры персаніфікацыі выкарыстоўваецца таксама тып пераносу «жывому – жывое», калі жывым істотам прыпісваюцца ўласцівасці і дзеянні чалавека:

*Ляцела зязюля й пытае: На каго, Зіначка, жаль мае.*

У вясельных песнях найчасцей персаніфікуюцца рэаліі расліннага свету:

*Хвалілася каліначка за ракой, Звалілася каліначка за ракой, Што ніхто яе ні дастане за вадой Біз чаўна, біз залатога вяселца.*

Персаніфікацыя заснавана на метафарычным выкарыстанні дзеясловаў, калі з'явам прыроды або прадметам прыпісваецца разумовая або псіхічная дзейнасць чалавека:

*Злавілі старога лося ў гаросе, Як зачула яго ласіца ў бары, Як кінула рогі пад ногі: Няхай маі крутыя рогі прападуць, Куды ж майго лося павядуць?*

Да тропаў метафарычнага тыпу, якія выкарыстоўваюцца ў песнях, адносяцца таксама сімвал і алегорыя.

**Сімвал** – адзін з відаў іншасказання, умоўнае абазначэнне сутнасці якой-небудзь з'явы, паняцця пэўным прадметам ці словавобразным знакам:

*Мы ж цябе завіваем, Шчасцем, доляю награждаем; / Падманулі маладзенькую вы мяне, .. Сказалі, пойдзеш у зялёны садок вянкі віць, .. А мне звілі ды з калючага ялінцу; / Сядзьце, пасядзьце, мае дзевачкі, у радочык. Завіце мне, маладзенькай, вяночак, .. Завіце мне ды вяночак маленькі, Каб жа ён быў майму Алежку міленькі* (віццё вяночка = сімвал змены дзявочага жыцця на замужняе).

Ролю сімвалаў звычайна выконваюць канкрэтныя назоўнікі, якія абазначаюць рэаліі жывёльнага або расліннага свету. У вясельных песнях часта сустракаюцца вобразы каліны: *Стаяла калінка каля варот, Папрасілася ў чарот*, вярбы: *А ў полі вярба пахілёная, Маладая дзіўчыначка заручоная*, вішні: *Зялёная вішня з-пад кораня вышла* , руты-мяты: *Рута-мята зялёная несаджаная, Маладая дзяўчына заручоная,* ружы*: Ой, пайду ж я ў садочак І сарву з розы кветку*, канапелькі: *Ой стаяла, ой буяла Канапелька ў гародзе*, зязюлі: *Стаяць садочкі ў тры радочкі. У первым садочку зязюля кукуе, ...Зязюля кукуе, другую чуе, .. Дзевачка плача – мамкі не мае*, вутачкі: *Драча вутачка, драча, З возера не злітае*, якія сімвалізуюць нявесту, вобраз

саколіка – сімвал жаніха: *Ляцеў сакалок праз тры бары*, галубкі – сімвал маладых: *Мойся, мойся, галубка міленька, Ды ляці да галубка хуценька; Сядзіць галуб, а ля яго галубка.*

**Алегорыя** – перадача адцягненага паняцця або ідэі праз канкрэтны прадмет, мастацкі вобраз, малюнак. У алегарычным сэнсе выкарыстоўваюцца як субстантыўныя намінацыі з канкрэтна-прадметным значэннем, так і дзеяслоўныя назвы, якія абазначаюць фізічнае дзеянне:

*Калі прыйшла рыбка да гаці, Я мушу праўду сказаці: Мы прыехалі па тую кветку, Што цвіцець зімой і ўлетку* (рыбка да гаці = госці ў хату; кветка = дзяўчына, цвіцець зімой і ўлетку = вызначаецца сваёй прыгажосцю, прыехаць па кветку = прыехаць у сваты).

У вясельных песнях алегарычна апісваецца пэўны стан жыцця маладой: *Ой, рашчэшуць дзеванькі, Ой, пацеша душаньку міленькі, мамуля голованьку прыбярэ, Бо да асыпаецца вішнёвы сад, Час табе, Ганусечка, на пасад* (асыпаецца сад = прыходзіць пара сталасці, пара выходзіць замуж). Іншасказальна ў песнях перадаецца месца будучага пражывання нявесты: *Мамка будзе ў полі жыта жаць, А я буду ў сінім моры ваду браць* (браць ваду ў сінім моры = жыць далёка); / *Адчыняй, мая мамачка, новы двор, Прынімай нявестачку на выбор* (новы двор = хата жаніха).

У сіроцкіх вясельных песнях прысутнічае іншасказальны, алегарычны вобраз смерці маці: *Дзевачка плача – мамкі не мае. Яе мамачка вельмі далёка, Вельмі далёка ў зямле глыбока. У зямлі глыбока, за трыма замкамі .. Первы замочык – зялён цярночык.. Другі замочык – жоўты пясочык, .. Трэці замочык – грабавыя дошкі.*

Даволі часта сумяшчаюцца алегарычнае і прамое выказванні, асабліва пры вобразным паралелізме, што ўзмацняе выяўленча-выразныя магчымасці алегорыі: *Ляцеў сакалок праз тры бары, А ў чацвёртым бару сеў на дубу: «Што ж табе, сакалок, спадабалася, А ці бор, ці явар, ці каліначка?». І не бор, ні явар, ні каліначка. Спадабалася мне шэра вутачка. Ехаў малады хлопец праз тры сяла, А ў чацвёртым стаў у цесця на дварэ. «Што ж табе, хлопец, спадабалася: А ці мёд, ці піва, ці гарэлка? І не мёд, ні піва, ні гарэлка. Спадабалася мне ваша дзевачка»* (вобразны паралелізм выяўляе ланцужок алегорый: сакалок = хлопец, вутачка = дзевачка, бор = мёд, явар = піва, каліначка = гарэлка, ляцеў = ехаў).

На аснове падабенства адбываецца таксама перанос такіх тропаў, як гіпербала і літота. **Гіпербала** – наўмыснае перабольшванне пэўных уласцівасцей чалавека, прадмета ці з'явы з мэтай узмацнення выразнасці выказвання: *Мы думалі – сваты едуць, А яны пяшком ідуць, Маладога ў мяшку нясуць. А з мяшка ногі тырчаць, На яго каты вурчаць.*

Гіпербала ў вясельных песнях ужываецца ў асноўным з мэтай стварэння камічнага або іранічнага эфекту, надае выказванню гумарыстычнае гучанне: *Ах, сваткі, сваткі-чурашкі, Нямытыя ў вас рубашкі,.. Пазычце вы ў нас вадзіцы, ...Памыйце свае спадніцы.* Пры гэтым персанажам прыпісваюцца адмоўныя, заганныя рысы, якія жартаўліва перабольшваюцца: *Казалі – дружка багаты, А на ім рызы ды латы. Заставіў дзеўку пільнаваць, Каб ніхто рызаў не ўрэзаў, Каб ніхто латаў не кратаў.*

**Літота** – наўмыснае змяншэнне ступені або ўласцівасці чаго-небудзь, ужываецца таксама з мэтай узмацнення экспрэсіі выказвання. Пры выкарыстанні літоты наўмысна змяншаецца колькасць або памер прадметаў: *На вяселлейка пазвалі, Чарачку гарэлкі не далі; / Варыла маці вячэру ды на маю долю. Варыла, варыла ды ўсё гаварыла: «Няма табе ні міскі, ні лыжкі».* У некаторых выпадках гіпербала спалучаецца з літотай, што надае мове асаблівую выразнасць: *Успомні мяне, маці, хоць раз у аўторак, А я ж цябе, мама, на дзень разоў сорак.*

У складзе сінтаксічных сродкаў па сваёй выяўленчай выразнасці і высокай ступені экспрэсіўнасці народна-песеннага тэксту вылучаюцца разнастайныя **паўторы**, якія садзейнічаюць лагічнаму выдзяленню, падкрэсліванню значэння паўтораных слоў, семантычнаму разгортванню канцэптуальнага зместу тэксту, сувязі яго асобных фрагментаў.

**Лексічны паўтор** надзвычай пашыраны ў вясельных песнях, ён з'яўляеццца поліфункцыянальным. Паўтор адных і тых жа слоў выдзяляе іх, узмацняе іх сэнс: *А ў Толі радзіцы многа, радзіцы многа, Як прыйшлося дарыці, Няма нікога, няма нікога.* Вельмі часта лексічны паўтор перадае інтэнсіўнасць дзеяння: *Не плач, не плач, мая мамачка, ты па мне. Ды я буду жыць непадалёку ад цябе*, / *Ой гуляла, ой гуляла, Наша Танечка ў мамачкі;* падкрэслівае яго значнасць і важнасць: *Пайду ж я замуж, даведаюся, даведаюсь, Калі ж добра будзе, Замужам буду, буду. Калі ж нядобра – Дамоў вярнуся, вярнуся;* паказвае яго паўтаральнасць: *Дарылі, дарылі, ды нямнога здарылі,* працягласць: *Варыла маці вячэру ды на маю долю. Варыла, варыла*

*ды ўсё гаварыла; / Звіняць, звіняць Званочкі блізенька, Сядай, сядай, Дзеванька, нізенька;* плаўнасць*: Плыві, плыві, кветка, Нідзе не станавіся.*

Лексічныя паўторы могуць быць поўнымі, калі паўтараецца адна і тая ж лексічная адзінка – тоесны лексічны паўтор. Кантактны тоесны паўтор стварае фігуру падваення: *За лесам, лесам вінны каладзеж; / Ой зелен, зелен садочак.*

Дыстантны тоесны паўтор не толькі звязвае асобныя фрагменты тэксту, але і лагічна выдзяляе, падкрэслівае значэнне паўторанай лексемы, пераводзіць яе ў разрад ключавых слоў*: Ганулька, Ганулька, сядзь ты на куце, Хто ж табе, Ганулька, косачку запляце.. Сядзь на сцежачцы, сядзь ты, сядзь, Табе косачку расчэша мамка родная*.

Арыгінальным з’яўляецца **частковы лексічны (дэрывацыйны) паўтор**, які стварае сутыкненне ў тэксце аднакаранёвых слоў: *Плыві, плыві, квятка, Нідзе ні станавіся, Толькі для маёй роднай матачкі Стань, астанавіся.* Найчасцей паўтараюцца словы адной часцінамоўнай прыналежнасці, гэта могуць быць дзеясловы: *Сядзьце, пасядзьце, мае дзевачкі, ў радочак, І пашыйце мне, маладзіцы, вяночак;* назоўнікі: *А сват сваццi Паплёў лапці;* прыслоўі: *Як цяжка мне было маленькую гадаваць, Цяпер найцяжэй чужой мамачцы аддаваць.* У вясельных песнях сустракаецца паўтор слоў, якія належаць да розных часцін мовы: назоўніка і прыметніка: *Пачынаецца сіроцкая вяселле. Сіротачка па магілачцы хадзіла, Яна сваю родну мамачку прасіла; / Мае хустачкі, як бель бяленькі, Яны ж мне не міленькі;* дзеяслова і назоўніка: *Звіняць, звіняць Званочкі блізенька, Сядай, сядай, Дзеванька, нізенька.* Рэдкім з’яўляецца афіксальны паўтор, калі паўтараюцца словы, утвораныя пры дапамозе аднаго словаўтваральнага сродку: *На плячах коскі да парасцілаліся, Пад вачмі слёзкі ды паразліваліся.*

Частковы паўтор узмацняе гучанне паўтараемых слоў, спрыяе іх больш поўнаму сэнсаваму напаўненню.

Надзвычай пашыраным у песенных тэкстах з’яўляецца **анафарычны паўтор** – паўтор слова ці групы слоў у пачатку некалькіх сумежных сказаў. Анафара – важны сродак інтэнсіфікацыі маўлення, яна павышае ступень экспрэсіўнасці моўных адзінак і прыводзіць звычайна да паралелізму сказаў. Анафара можа быць гукавой:

*У первым садочку зязюля кукуе,*
*У другім садочку салавей шчабеча,*
*У трэцім садочку дзевачка плача*;
лексічнай:
*Будзь багата, як зямля,*
*Будзь здарова, як вада,*
*Будзь прыгожа, як ружа;*
і страфічнай:
*Надзеньце мне, маладзенечкай, вяночык,*
*Няхай мая галовачка лялее,*
*Няхай мяне мая мамачка жалее,*
*Няхай мая галовачка буяя,*
*Няхай мая радзіначка гуляя.*

Найчасцей у вясельных песнях выкарыстоўваецца лексічная і страфічная анафара. Анафара ў вясельнай песці, якая прыводзіць да паралелізму сказаў, даволі часта спалучаецца з **траічнасцю паўтору,** тыповага для народна-песеннай лірыкі:

*Первы замочак – зялён цярночык,*
*Другі замочык – жоўты пясочык,*
*Трэці замочык – грабавыя дошкі;*

*Маці аддавала,*
*Шчэ й навучала,*
*Як на свеце жыці:*
*У госці не хадзіці*

*І гарэлкі не піці,*
*Мужа шанаваці.*
*А хто ж яе старыя ручкі падменіць?*
*А хто ж ёй мягка пасцельку пасцеліць?*
*А хто ж ёй бела кашульку памыець?*

Значна радзей сустракаецца ў вясельных песнях **эпіфара** (адзінаканчатак) – паўтор слова ці групы слоў у канцы сумежных сказаў, яе называюць адваротнай анафарай. Як і анафара, эпіфара з'яўляецца лакалізаваным паўторам. Гэта ўпарадкаваны дыстантны паўтор. Эпіфара спрыяе структурнай арганізацыі тэксту, садзейнічае актуалізацыі семантыкі паўтараемых элементаў выказвання:

*Ёсць у яе яшчэ меншая за мяне,*
*Яна пасцеліць лепей пасцельку за мяне,*
*Яна памыець лепей кашульку за мяне.*

Слоўныя фігуры, заснаваныя на паўтаральнасці моўных адзінак, валодаюць вялікім экспрэсіўным патэнцыялам. Дзякуючы падабенству або тоеснасці супастаўляемых сумежных або дыстантна размешчаных моўных адзінак, сінтаксічная структура сказа становіцца больш сбалансаванай, выразнай і эмацыянальна насычанай. Выкарыстанне гэтых фігур дапамагае лагічна выдзеліць суб'ект або аб'ект пэўнага дзеяння, дазваляе паказаць устойлівасць пэўных якасцей, нарастанне, паслядоўнасць, мэтанакіраванасць дзеяння, працяглыя аднатыпныя адрэзкі часу, дае магчымасць выразіць узмацненне эмацыянальнага і псіхалагічнага стану.

Вясельныя песні ў пераважнай большасці маюць размоўную інтанацыю, напоўненую роздумам, разважаннем, суперажываннем, нярэдка носяць характар дыялогу. У сувязі з гэтым у вясельных песнях часта выкарыстоўваюцца моўныя сродкі экспрэсівізацыі вуснага маўлення: пытальна-адказныя формулы, рытарычныя фігуры, клічная інтанацыя.

Вельмі часта ў гэтых песнях ужываецца **рытарычны зварот** – заклік, словы, з якімі гаворачы звяртаецца да асоб ці прадметаў як прысутных, так і адсутных, і якія не патрабуюць непасрэднага водгуку. Рытарычны зварот узмацняе эмацыянальнасць выказвання: *Мая мамачка родная, Чаму мяне замуж аддаеш, А долечкі не даеш? / Не абіжайся, мая братачка, на мяне, Што я села так блізенька ля цябе.*

Найчасцей рытарычны зварот адрасаваны пэўнай асобе*: А сваціца-галубіца с павагі, Не давайце нашай Машаньке знявагі; / Ой, братка мой родненькі, Чым я табе надаела?/ Ой, сватку ж, наш сватку, Пусці нас у хатку, / Валодзька швагрочык, ды бывай здароў, Валечка, сястрыца, паедзем дамоў,* хатя можа быць звернуты да жывёл: *Бяжыце, маі конікі, шырока, Яшчэ мая дзевачка далёка,* або птушак: *Мойся, мойся, галубка міленька, Ды ляці да галубка хуценька,* ці прыродных з'яў: *Сабярыцеся вы, буйныя ветры, у даліну, Падыміце вы майго татачку з магілы.*

Выразную экспрэсіўна-эмацыянальную афарбоўку тэксту вясельнай песні надае **рытарычнае пытанне** – пытальны сказ са сцвярджальным зместам, які не патрабуе адказу: *А каб знала – не пайшла б, Ці я дома работкі не знайшла б? / Мамачка мая, родная мая, Як жа мы растанемся? / А ці будзеш па мне бедаваці, Як я буду на Украіначцы гараваці? / Пойдзеш, Волечка, у чужыя людзі, Як табе не жаль будзе?*

Рытарычнае пытанне з'яўляецца актыўным сродкам стварэння эмацыянальнасці і выразнасці паэтычнага тэксту.

Ажыўляе паэтычнае маўленне вясельнай песні, частае выкарыстанне пытанняў і адказаў на іх:

*Чаму салаўі не спявалі, Як сады зацвіталі? – Як сады зацвіталі, Мы малы былі;*

*Мая мамачка родная, Чаму мяне замуж аддаеш, А долечкі не даеш? – Што ў куфры маю, то даю, А аб долі не ўгадаю;*

*А ў горадзе ячмень ці ўродзе, Маладая Волечка свякроўцы ці ўгодзе? – Угаджу, дзевачкі, угаджу, Я яе мамачкай назаву.*

Размоўны характар песеннаму тэксту надаюць шматлікія дыялогі, якія перадаюць характар адносін паміж персанажамі песні:

*Дзякуй, мамачка, дзякуй, родна За тваё гадаванне. – Я гадавала, як знала, Толькі долечку не ўгадала;*

*Я табе, татка, вады прынясу. А татка кажа: «Цябе не прашу»;*

*Леначка Сярожку прасіла: «Адвядзі, Сярожка, дзе браў, Каб мой вяночак тут не звяў». – «Нябось, Леначка, не звянець, У мяне ёсць сястрыцы – папраўяць».*

Такім чынам, народна-паэтычны тэкст вясельнай песні Лагойшчыны вызначаецца разнастайнымі моўнымі сродкамі стварэння эмацыянальнасці і экспрэсіўнасці, якія ахопліваюць усе ўзроўні. На лексіка-семантычным узроўні найбольш актыўнымі, адметнымі для народна-паэтычнай мовы сродкамі стварэння выразнасці тэксту з'яўляюцца эпітэт, параўнанне, метафара, сімвал, алегорыя і антытэза, на словаўтваральным – формы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі, на сінтаксічным – разнастайныя паўторы.

**Літаратура**

1. Гілевіч, Н. С. Паэтыка беларускай народнай лірыкі: Слова і вобраз. Паэтычны сінтаксіс. Гукапіс і рыфма / Н. С. Гілевіч. – Мінск,: Вышэйш. школа, 1975. – 288 с.

2. Вахек, Й. Лингвистический словарь Пражской школы. – М., 1964.

3. Кожина, М. Н. О специфике художественной и научной речи в аспекте функциональной стилистики / М. Н. Кожина / Отв. ред. М. А. Генкель. – Пермь, 1966. – 213 с.

4. Клюев, Е. В. Риторика (Инвенция. Диспозиция. Элокуция): учебное пособие для вузов / Е. В. Клюев. – М.: Издательство «ПРИОР», 1999. – 272 с.

*Святлана ВЯРГЕЕНКА*

## «У НЯДЗЕЛЬКУ РАНА СОЛНЫШКА ЎСХОДЗЕ…» (ЗАМОЎНАЯ ТРАДЫЦЫЯ ЛАГОЙШЧЫНЫ)

Усебаковае развіццё нацыянальных культур немагчыма без беражлівага стаўлення народа да сваёй культурнай спадчыны, а гэта магчыма толькі пры ўмове яе дасканалага вывучэння. Таму зусім зразумела павышаная зацікаўленасць апошнім часам (пачынаючы з 80-х – 90-х гг. XX ст.) творамі вуснай народнай творчасці, у тым ліку замовамі. Жанр замовы развіваўся ў дагістарычныя часы і захаваў тагачасныя ўяўленні аб прыродзе і чалавеку, рэлігійныя ўяўленні са сваім бачаннем светабудовы, спецыфічныя ўяўленні аб эстэтычных і этычных ідэалах. Дзякуючы сваёй жанравай спецыфіцы замовы за працяглы час існавання сур'ёзных змен не пацярпелі, адбываліся толькі напластаванні розных гістарычных эпох у сюжэтна-зместавай і паэтычнай структуры. Нягледзячы на ўстойлівы традыцыяналізм замовы як фальклорнага жанра, мы заўважаем у ёй і рэгіянальныя адметнасці. Найбольш істотнымі асаблівасцямі замоў Лагойшчыны з'яўляецца інтэрферэнцыя (налажэнне), зліццё язычніцтва і хрысціянства, натуральны білінгвізм, полілінгвізм, калі беларускі тэкст «расквечваецца» паланізмамі і русізмамі. Такі ўзор культурнай інтэрферэнцыі мы назіраем, напрыклад, у замове «Ад рожы», запісанай у в. Заазер'е ад Сінюковіч Марыі Пятроўны, 1923 г. н.: «Ішоў пан Езус з Ерусаліма, нёс у пачцы 12 роз: сем зялёных, тры мінёных, адна чорна, другая бяла, каб тая роза нігды не паўстала. Здровесь, Марыя…».

Замова як правіла можа разглядацца як акт камунікацыі паміж адрасантам-суб'ектам і адрасатам-аб'ектам, прычым адрасант імкнецца ўздзейнічаць на адрасата (праз просьбу або загад) для дасягнення жадаемага або непасрэдна («… Гасподзь Бог, Ісус Хрыстос, Насвенча Матка, уся святочкі гадавыя, царкоўныя, касцёльныя, прыступіце, ад (імя) цяжкую хваробу адганіце» – «Ад пуду», запісана ад Жоравай В. С., 1931 г. н., г. п. Плешчаніцы), або пры дапамозе пасрэдніка. Можна вылучыць пасрэднікаў двух тыпаў: тыя, з якімі не можа быць непасрэднага кантакту (месяц, маладзік, зара і да т. п.) і тыя, з якімі можна ўстанавіць непасрэдны кантакт. У некаторых выпадках такім пасрэднікам можа выступаць і прадметны атрыбут (прадмет-артэфакт), з якім выконваюцца магічныя дзеянні: «Ячменем у тарэлачкі ўсё сціраць, хай паплюе той, каму сціраюць, і выкіне курам ячмень. Гэта трэба зрабіць тры раза» («Ад барадавак» – запісана ад Умэцкай Н. А., 1930 г. н., Пракопчык Ж. К., 1968 г. н., в. Скарады). Тройчы паўтор акцыянальнай часткі прыведзенай вышэй замовы – тыповая з'ява для магічных працэдур, матывацыя якіх – імкненне выканаўцы хутчэй дабіцца жадаемага выніку. У гэтым пераконваюць і тройчыя загады «Стань, залатнік, на месца», якім заканчваецца замова «Ад парушэння» (запісана ад Кулынай М. І., 1927 г. н., в. Жардзяжжа), і пажаданне «Амінь, амінь, амінь» (да будзе так) у замове «Ад праклёнаў» (запісана ад Кішко М. М., 1972 г. н., в. Загор'е), ці тройчая здравіца Марыі «Здровасць, Марыя!» («Ад грыжы», запісана ад Кульша М. І., 1927 г. н., в. Жардзяжжа), ці тройчае «Отча наш» («Ад рожы» – запісана ад Андрасовіч Л. В., 1927 г. н., в. Бяларучы). Даволі часта ў аналізуемай калекцыі рэкамендацыя «тры разы» сустракаецца ў паяснялньа-рытуальнай частцы. Напрыклад, Марыя Мекта, 1907 г. н., паведаміла, што замову «Ад спуду» трэба не толькі прачытаць тры разы, а і ў завяршэнні, пасля слоў «Бог з помаччу, я з духам» неабходна «тры разы падуць у святы крыж», Рыма Аляксандраўна Цішэвіч, 1965 г. н., з в. Манчанкі, падказала, што замову «Ад ліха», трэба прагаварыць тры разы на маладзіку за хатай. Больш складаная акцыянальная частка ў замове «Ад гадзюкі». Алена Іосіфаўна Апімаховіч, 1932 г. н., з в. Ляўданшчына, паведаміла, што замову «трэба казаць і духу не мяняць. А як загаворыш так тры разы, то трэба пахукаць, ну дунуць». Найчасцей жа інфарматары проста канстатуюць, што паўтараць трэба «тры разы».

Як відаць з прыведзеных прыкладаў, лічба «тры» ўжываецца найчасцей. Толькі аднойчы нам сустрэлася рэкамендацыя Рымы Аляксандраўны Цішэвіч, 1965 г. н., з в. Манчакі, замову «паўтараць дванаццаць разоў, стоячы за хлявом». Але ж і тут трэба агаварыцца, што лічба 12 таксама ўтрымлівае ў сабе магію тройкі. Як зазначае У. Тапароў, усе прадметы, аб'екты, якія пазначаны лічбай тры (ці то сакральныя, ці то прафанныя) маркіруюцца станоўчымі, бо набываюць сілу, якая пераходзіць на іх ад тройкі… такую ж сакральную сілу маюць і лічбы

кратныя тром – 6 (3х2), 9 (3х3), 12 (3х4, дзе 4 – таксама лічба магічная, бо асацыіруецца з чатырма напрамкамі свету, а калі іх злучыць прамымі, то атрымліваецца сакральна-магічны абярэг – крыж, які нашы продкі ведалі задоўга да хрысціянства [1]. Адносна выкарыстання ў магічных тэкстах лічбы тры, У. Тапароў сцвярджаў, што «… роля лічбы тры ў замовах аказваецца не проста галоўная сярод іншых лічбаў, але і выключнай» [1, с. 215]. Узнікае пытанне, чаму ў міфалагічнай свядомасці нашых продкаў гэтая лічба надзяляецца магічнай сілай нават сярод іншых (4, 7, 9). Паводле меркаванняў даследчыкаў-фалькларыстаў, у прыватнасці У. Тапарова, «лічба 3 з'яўляецца найбольш частотнай, бо менавіта гэтая лічба мадэліравала ў архаічных уяўленнях найбольш важныя паняцці. Напрыклад, трохмерная структура свету (падземны, сярэдні, верхні); тры стадыі любога дзеяння (пачатак, сярэдзіна, завяршэнне)» [1, с. 203].

Паэтычны свет замовы – гэта свет духаў прыроды, фантастычных персанажаў іншасвету, дэманічных істот, прадметаў і дзеючых асоб культурнай прасторы. У замовах, як ні ў адным іншым жанры вуснай народнай творчасці, назіраецца ўстойлівае кола вобразаў. Іх адбор і пастаянная «прапіска» ў замове падпарадкавана прынцыпам арганізацыі замоўнага тэксту. Усе даследчыкі фальклору пагаджаюцца, што адной з характарыстычных адзнак міфалагічнага мыслення з'яўляецца бінарнасць. Увесь акаляючы свет уяўляўся нашаму старажытнаму продку з аднаго боку як свет добрых сіл (гэты свет «узначальваў» Белабог), а з другога – свет злых сіл (на чале з Чарнабогам). Бінарнасць якраз і спарадзіла апазіцыю вобразнай прасторы замоўнага тэксту: свой/чужы, добры/нядобры, здароўе/хвароба, дзе свой свет – свет дабра, культурны свет, свет гарманічны і знаёмы, абжыты чалавекам, а свет чужы – свет невядомы, неўпарадкаваны, населены варожымі істотамі. З гэтага вынікае, што ўсе персанажы і вобразы замоўнага кантынуума падзелены на тыя, якія дапамагаюць чалавеку, і тыя, што яму шкодзяць, ствараюць хаос, парушаюць гармонію. Асноўная ж мэта замовы – імкненне гарманізаваць свет, уздзейнічаць на варожыя сілы, а гэтага можна было дасягнуць рознымі спосабамі. Найпершым, самым простым спосабам з'яўляецца зварот да звышнатуральных сіл, і ў залежнасці ад «палярнасці» гэтай сілы вызначаецца характар звароту: просьба, загад, патрабаванне, пагроза і г.д. Звароты адрасуюцца як да язычніцкіх, так і да хрысціянскіх персанажаў. З апошніх найчасцей просяць аб дапамозе Прачыстую Маці, Госпада Бога: «Прашу Бож'ю Маць (імя) апраўдаць…» (запісана ад Макейчык Ніны Васільеўны, 1966 г. н., в. Весніно), «Госпадзі, пашлі мне маю палавінку…» (запісана ад Зялёнкі Ніны Апалінараўны, 1938 г. н., г. п. Плешчаніцы), «Папросім Госпада Бога, каб ён дапамог» (запісана ад Сінюковіч Марыі Пятроўны, 1920 г. н., в. Гасцілавічы), «Гасподзь Бог, Ісус Хрыстос, Насвенча Матка, усе святочкі гадавыя, царкоўныя, касцельныя, прыступіце, ад (імя) цяжкую хваробу адганіце…» (запісана ад Жоравай Вольгі Сцяпанаўны, 1931 г. н., г. п. Плешчаніцы) і да т.п. У калекцыі замоў Лагойшчыны сустрэўся тэкст, у якім замаўляючы звяртаецца адначасова як да язычніцкіх, так і да хрысціянскіх персанажаў. Увогуле гэтая з'ява даволі пашыраная ў замоўным жанры і сведчыць пра тое, як рэагавалі нашы продкі на тыя змены, што адбываліся з прыняццем хрысціянства. Паказальнай у гэтым плане з'яўляецца замова «Ад рожы», запісаная ў в. Такаўшчына ад М. Мекта, дзе замаўляючы, загаворваючы рожу, «Бога на помач запрашае і Святую Багародзіцу» і тут жа звяртаецца: «Ранняя зарыца, вячэрняя зарыца, будзь (імя) памачніца. Вадзіца-цароўна, усяму свету роўна, будзь памачніца… А ты, рожа, цела не сушы, касці не ламі, крыві не пі», або замова «Ад спужання», запісаная ў в. Загор'е ад Кішко М. М., дзе літаральна ў адным сказе ўпамінаюцца і «Гасподзь Бог, Ісус Хрыстос, Насвенша Матка, святая субота, вада ад пужання (імя)». Прычым персанажы ў апошнім тэксце толькі ўпамінаюцца, напэўна, замаўляючы лічыць гэта дастатковым, «каб (імя) пужанне прайшло».

І ўсё ж найбольш распаўсюджанымі ў аналізуемай калекцыі замоў з'яўляюцца тэксты, у якіх гучыць субматыў «Зварот замаўляючага да язычніцкіх персанажаў». У пераважнай большасці лекар звяртаецца да хваробы: «Звіху ты мой, звіху, ня будзь так ліху, жыл не сушы, жывата не тамі», «Звіх-звіх, не будзь ліх, не хадзі па касцях, не ламай касцей, а сустаў на месца пастаў», «Рожа-рожа, рожа паня, не хадзі па касцям, не гнаі мяса…», «Грызь-грызь, я цябе грызу, за сіняе мора шлю каляду есці, асіну грызці…», «Ідзі, балезь, на сухія лясы, на дзікія балоты» і г. д. У апошніх прыкладах субматыў звароту да хваробы працягваецца субматывам адсылання хваробы, у якім міфалагемы мора, лясы (сухія), балоты (дзікія) асацыіруюцца з антылокусамі, месцамі, непрыгоднымі для жыцця чалавека, мяжой, пераходнай з «гэтага свету» ў іншасвет,

«дзе сонца не ўсходзе, дзе людзі не ходзюць». Мора – гэта той міфалагічны цэнтр, за якім пачынаецца іншасвет, свет мёртвых (локус, які з'яўляецца мяжой паміж светам жывых і светам мёртвых). «У народных павер'ях і фальклорных тэкстах той свет апісваецца як аддаленая прастора, якая знаходзіцца… за марамі…» [2, с. 372].

Цікавы тэкст замовы «На захаванне цяжарнасці» запісаны ў г. п. Плешчаніцы ад Коўшык Г. П., 1906 г. н.: «На сінім моры сіні камень, на тым камні святая цэркаўка, а ў той цэркаўцы прыстол, на тым прыстоле Ісус Хрыстос…». Дадзены фрагмент тэксту пабудаваны па прынцыпе прыступчатага звужэння. У якасці другаснага локуса, які знаходзіцца на моры, часта выступаюць камяні, прадметы, якія «ў народна-міфалагічным асэнсаванні надзяляліся магчымасцю ўздзеяння на чалавека» [3, с. 80]; «у народнай традыцыі аб'ект шанавання» [4, с. 274]; «камень для старажытнага чалавека ўяўляў сабою велічнасць і сілу» [5, с. 137]. Таму «культ камянёў быў шырока распаўсюджаны на Беларусі» [5, с. 139]. У адрозненне ад замоў Гомельшчыны, дзе ў асноўным сустракаецца белы камень, у прыведзеным тэксце колер каменя сіні, адпаведны колеру мора. У дадзеным выпадку можна выказаць меркаванне аб станоўчасці локуса з сінім колерам, у адрозненне, напрыклад, ад «чорнага мора», за які адсылаецца хвароба. Станоўчасць або адмоўнасць локуса таксама падкрэсліваецца і іншымі прадметамі і персанажамі, якія там знаходзяцца. Напрыклад, у замове «Ад грыжы», сіні колер мора зусім не звязваецца са станоўчым локусам. У дадзеным выпадку ён выступае мяжой паміж гэтым светам і іншасветам: за сіняе мора адсылаецца хвароба з патрабаваннем «каляду есці, асіну грызці». І калі ў тэксце замовы «На захаванне цяжарнасці» станоўчасць локуса падкрэсліваецца наяўнасцю на ім святой цэркаўкі, прыстола, Ісуса Хрыста, то ў апошнім тэксце адмоўнасць сіняга мора падкрэсліваецца наяўнасцю асіны.

У замовах часта падаецца шлях дзеючых асоб у міфалагічны цэнтр. Прывядзем для прыкладу замову «Ад залатніка», запісаную ад Любові Іосіфаўны Курылёнак, 1931 г. н., з в. Убалацце: «У нядзельку рана солнышка ўсходзе. Найсвеншая Матка Ісуса Хрыста за ручку водзе. Правяла на утраню, з утрані – на Божу службу, з Божай службы – на вячэрню, з вячэрні – у сіня мора. А ў сінім моры ляжыць белы камень, на тым камені сядзяць тры дзявіцы – родныя сястрыцы, белы кужаль пралі, залатнік у (імя) выбіралі. Залатнік, выбірайся, на места вастанаўляйся». У дадзеным тэксце здзіўляе таксама і дакладная практорава-часавая арганізацыя падзей. Па-першае, дэталёва прапісана цырымонія нядзельных хрысціянскіх дзействаў. Адбываецца цэлы цырыманіял ачышчэння, перш чым трапіць у сакральны цэнтр. Па-другое, міфалагічным цэнтрам, на якім адбываецца асноўнае дзеянне, з'яўляецца белы камень, які ляжыць на сінім моры. «Бел-гаруч каменем» у фальклоры называецца «камень Алатыр», і ён надзяляецца сакральнымі і лекавымі ўласцівасцямі [4]. Як адзначае В. Ільінская, «несумненную цікавасць уяўляе … вылучэнне ў тэкстах замоў двух пластоў – язычніцкага і хрысціянскага, а гэта можна зрабіць, аналізуючы змену персанажаў на тым самым Латыры-камні ад краснай дзевіцы да Багародзіцы, ад жалезнага мужа да Хрыста…» [6, с. 38]. У прыведзеным прыкладзе якраз і адбылася змена персанажаў: ад Прачыстай Маці і Ісуса Хрыста на «сінім моры» да трох дзявіц на «белым камені», прычым асноўнае дзеянне адбываецца менавіта на камені. Працэс вырабу белага кужалю суадносіцца з працэсам прадзення «жыццёвай ніткі чалавека», і ад плёну работы пралляў будзе залежыць здароўе чалавека і нават яго жыццё. Па-трэцяе, прыведзены тэкст замовы дакладна арганізаваны і інтанацыйна. Даволі пашырана ў вуснай народнай творчасці выкарыстанне эліпсіса – наўмыснага пропуску слоў у сказе. Дзякуючы гэтаму прыёму перадаецца дынамізм, эмацыянальнасць, напружанасць, хуткая змена падзей, імклівы рух. У замове адчуваецца хуткае перамяшчэнне Божай Маці і Ісуса Хрыста ў прасторы. Адметнасцю гэтага тэксту з'яўляецца таксама ўжыванне розных часавых катэгорый – водзе, сядзяць (цяперашні час), правяла, пралі, выбіралі (прошлы час).

Цікава параўнаць прыведзеную вышэй замову з замовай «Ад парушэння», запісанай у в. Праходы ад Ядвігі Кажуры, 1978 г. н.: «Найсвентша Матка на камені сядзела, белы кужаль прала. Белы кужаль прала, залатнік увівала. Залатнічок, сабірай адусюль: і з касцей, і з жыллей, і з нутрэй. Стань, Божачка, да помачы, а я з Духам Святым». Абедзьве замовы ад залатніка, асноўнае дзеянне ў абедзьвюх – вымаўленне залатніка – адбываецца ў сакральным месцы – на камені, у абедзьвюх замовах дзеючыя асобы прадуць белы кужаль (як мы ўжо адзначалі, гэта асацыіруецца з «ніткай жыцця»), г.зн., прарочаць добры лёс, светлае жыццё хвораму. Вось толькі

самі персанажы-лекары – прадстаўнікі розных рэлігійных сфераў: Найсвентша Матка – каталічка, а тры дзявіцы – язычніцы. Калі глядзець на гэтыя замовы ў гістарычнай рэтраспектыве, то больш архаічнай уяўляецца першая замова «Ад залатніка», а ўся даволі значная апавядальна-наратыўная частка была далучана з прыняццем хрысціянства, тым больш, што непасрэднага ўдзелу ў тэрапеўтычных дзеяннях хрысціянскія персанажы не прымаюць. Замова захавала спаконвечны сэнс: суіснуюць у згодзе са спаконвечнымі новыя дзеючыя асобы – хрысціянскія, аднак жывуць яны па законах, даўно ўладкаваўшыхся ў прасторы замоўнага тэксту. Замова асімілявала хрысціянскія персанажы і надзяліла іх характэрнымі для жанра функцыянальнымі ўласцівасцямі, застаўшыся па сутнасці язычніцкімі.

Традыцыя замоўнага жанра абумоўлена не толькі пэўнымі мастацка-вобразнымі сродкамі, але і кампазіцыяй замовы. У Хрэстаматыйным варыянце замова складаецца з уступа-малітвы, зачыну, асноўнай часткі, закрэпкі і зааміньвання. Адметнасцю аналізуемай калекцыі з’яўляецца тое, што тэксты поўнай кампазіцыі адсутнічаюць. Найбольш прыбліжана да «ідэалу» замова «Ад залатухі» (запісана ў в. Казыры ад С. С. Ліс), якая «згубіла» толькі ўводзіны-малітву. У пераважнай большасці замовы Лагойшчыны складаюцца толькі з асноўнай часткі.

## Літаратура


1. Топоров, В. Н. Числовой код в заговорах. По материалам сборника Л. Н. Майкова «Великорусские заклинания» / В. Н. Топоров // Заговорный текст. Генезис и структура. – М.: «Индрик», 2005. – С. 194–246.

2. Топорков, А. Л. Мотив «чудесного одевания» в русских заговорах XVII–XVIII вв. / А. Л. Топорков // Заговорный текст. Генезис и структура. – М.: «Индрик», 2005. – С. 143–174.

3. Мансикка, В. Заговоры Шенкурского уезда / В. Мансикка // Живая старина, 1912. – № 1. – С. 125–136.

4. Шапарова, Н. С. Краткая энциклопедия славянской мифологии: Ок. 1000 статей / Н. С. Шапарова. – М.: ООО «Издательство АСТ»: ООО «Издательство Астрель»: ООО «Русские словари», 2003. – 624 с.

5. Ненадавец, А. М. Святло таямнічага вогнішча / А. М. Ненадавец. – Мінск: Беларусь, 1993.

6. Ильинская, В. Н. Камень Латырь и его роль в русских заговорах / В. Н. Ильинская // Этнолингвистика текста. Семиотика малых форм фольклора: тезисы и предварительные материалы к симпозиуму. – М., 1988. – С. 37–38.

# ЗМЕСТ

Новак В. *Каляндарна-абрадавы фальклор Лагойшчыны: агульнаэтнічнае і рэгіянальна-лакальнае* …… 3
Зімовыя абрады, звычаі і песні …… 9
Веснавыя абрады, звычаі і песні …… 44
Летнія звычаі, абрады і песні …… 95
Восеньскія звычаі і песні …… 122
Новак В. *Традыцыі* сямейнай абраднасці Лагойскага краю …… 125
Сямейна-абрадавая паэзія …… 128
Станкевіч А. *Вясельныя песні Лагойшчыны: моўныя сродкі стварэння выяўленчай выразнасці* …… 200
Вяргеенка С. «*У нядзельку рана солнышка ўсходзе…» (замоўная традыцыя Лагойшчыны)* …… 208

Навуковае выданне

# Благаслаўлёнай зямлі неўміручыя скарбы

***Народная духоўная культура Лагойшчыны***

У 3 кнігах

Кніга 2

Пад агульнай рэдакцыяй *В. С. Новак*

Камп'ютарная вёрстка: *С. П. Максіменка*

Подписано в печать 27.10.2013. Формат 60x84 1/8.
Бумага офсетная. Ризография. Усл. печ. л. 14,5.
Уч.-изд. л. 12,7. Тираж 30 экз. Заказ 482.

Издатель и полиграфическое исполнение :
учреждение образования
«Гомельский государственный университет
имени Франциска Скорины».
ЛИ № 02330/0549481 от 14.05.2009.
Ул. Советская, 104, 246019, г. Гомель.